Ф. Д. Кучинський

Легенди Наваграддя



SHOUT
SHARE
IT

Annotation

Кніга вядомай даследчыцы Фрыды Гурэвіч прысвечана гісторыі аднаго з найбольш старажытных і вядомых гарадоў Беларусі. Кніга – вынік археалагічных даследаванняў, якія вяліся больш за чвэрць стагоддзя. Манаграфія адкрывае малавядомыя старонкі гісторыі Навагрудка. Кожная выснова, кожная падзея пацверджаны археалагічнымі знаходкамі і крапатлівай даследчыцкай працай. У кнізе асобнымі раздзеламі разглядаюцца пачаткі існавання горада, заняткі яго жыхароў – гандаль, рамяство, сельская гаспадарка і промыслы, культурнае і духоўнае жыццё. Асобнымі раздзеламі выдзелены зброя, архітэктура, а таксама апісаны вынікі археалагічных даследаванняў, якія праводзіліся на Замкавай Гары. Праца Фрыды Гурэвіч вельмі падрабязна апісвае як сам горад, так і яго гісторыю ад з'яўлення першых паселішчаў. Кніга адрасуецца гістрыкам, даследчыкам, настаўнікм, студэнтам і людзям, якія цікавяцца гісторыяй свайго краю.

- Летапісны Новгородок
- Уступ
- Пра кнігу і яе Аўтара
- Уводзіны
- Глава 1.
- Глава 2.
- Глава 3.
- Глава 4.
- Глава 5. Зброя. Рыштунак верхавога каня і коньніка
- Глава 6. Сельская гаспадарка і промыслы
- Глава 7. Гандаль. Знешнія сувязі
- Глава 8. Духоўная культура
- Глава 9. Аб культуры і сацыяльным абліччы старажытнарускага Навагрудка
- Дадаткі

Летапісны Новгородок (старажытнарускі Наваградак) Фрыда Гурэвіч

kamunikat.org

Уступ

Выданьнем гэтай кнігі, якая прысвечана вынікам больш як 25 гадовага археалагічнага вывучэньня старажытнага Наваградка, мелася пачынаецца новая серыя — “Мінулае Наваградчыны — Istoria Novogrodensiae”. Гэтая серыя аб’яднала б работы сучасных аўтараў, якія прысвечаны розным аспектам наваградскай мінуўшчыны, а таксама перадрук (у большасьці выпадкаў і пераклад) даўніх сачыненьняў, у якіх Наваградак і яго ваколіцы фігуруюць альбо як галоўны прадмет, альбо займаюць значнае месца. Дарэчы было б сабраць у асобныя тамы датычныя гораду дзяржаўныя акты: часоў Вялікага княства Літоўскага, часоў Расійскай імперыі, перыяду другой Рэчы Паспалітай, эпохі Савецкай Беларусі. Дакументы лепш чым што паказваюць хаду гісторыі: як змяняліся межы Наваградскай зямлі — ваяводства — павету — раёну, як рос і забудоўваўся горад, як гінуў падчас пажараў і войнаў, як паўставаў і аднаўляўся. Даследваньні сучасных гісторыкаў пакажуць механізмы кіраваньня горадам і паветам (раёнам), раскрыюць ролю і значэньне захаваных помнікаў архітэктуры, раскажуць пра тое, што не захавалася. Падобныя кнігі будуць абавязковым чытаньнем не толькі школьнікаў, краязнаўцаў і аматараў гісторыі, але і тых асобаў, якія займаюць выбарныя і штатныя месцы ў гарадской і раённай адміністрацыі і самакіраваньні — бо ведаць мінулае — значыць лепш арыентавацца ў сучаснасьці. Задума серыі і пачатак яе абмяркаваньня належаць грамадскай ініцыятыве Канстанціна Аляшкевіча, Георгія Бакі, Тамары Вяршыцкай, Міколы Гайбы, Івана Грыня, Яўгена Лецкі, Міколы Нікалаева, Вячэслава Чамярыцкага. Неспрыяльнасьць умоваў пры падрыхтоўцы гэтага малатыражнага выданьня, прынамсі немагчымасьць патрэбнага паліграфічнага выкананьня, вымушаюць адкласьці (але не пахаваць) ідэю такой серыі.

Пра кнігу і яе Аўтара

Кніга Ф. Д. Гурэвіч “Летапісны Новгородок (старажытнарускі Наваградак)” з’яўляецца працягам кнігі тае ж аўтаркі “Старажытны Наваградак”, што выдадзена ў 1981 годзе ў Ленінградзе. Абедзьве манаграфіі прысвечаны гісторыі вельмі цікавага горада на Беларусі, які стаў сапраўдным археалагічным адкрыццём даследчыцы, вывучэньню якога яна прысвяціла каля трыццаці гадоў і які займае асаблівае месца ў яе творчай біяграфіі. Значэньне Наваградка як культурнага і адміністратыўнага цэнтра, а ад XII стагоддзя і як цэнтра невялікага княства Старажытнай Русі, вынікае з усяго зместу дадзенай манаграфіі. Але погляд на гэты выдатны археалагічны помнік раскрываецца яшчэ больш поўна і глыбока, калі разгледзець яго ў сувязі з агульнымі даследчыцкімі зацікаўленьнямі аўтара, якія ўзнікалі і фарміраваліся на працягу 50-ці гадоў яе жыцьця ў навуцы і якія зрабілі яе вядомым спецыялістам у галіне вывучэньня старажытнай і сярэдневяковай культуры Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі і Беларускага Панямоньня. Таму мы каротка асвятлім вехі асабістай і навуковай біяграфіі Ф. Д. Гурэвіч.

Фрыда Давыдаўна Гурэвіч нарадзілася 1 студзеня 1912 г. (19 снежня 1911 г. па старым стылі) у Рызе, у сям’і гэбрэяў-рамеснікаў, якія паходзілі з мястэчка Прэлі — на той час Дзвінскага павету Віцебскай губерні. На час яе нараджэньня сям’я была раздзелена — маці жыла ў Прэлях, а бацька ў Пецярбургу, навучаючыся рамяству абутніка. Калі пачалася Першая сусветая вайна, ў ліпені 1914 году маці з маленькім дзіцем на руках, пакінуўшы ўсё, паехала ў Пецярбург. Ад таго часу сям’я засталася ў Пецярбургу назаўсёды. Гэты горад шмат што вызначыў у лёсе Ф. Д. Гурэвіч, яна захавала любоў да яго на ўсё жыцьцё і балюча перажывала разлуку з ім у перыяд вайны, падчас эвакуацыі. Нягледзячы на тое, што пасля вайны ў яе была магчымасць застацца жыць у Маскве, яна імкнулася ў родны горад і вярнулася туды ў 1946 г. з тым, каб ужо ніколі не развітацца з ім.

Дзяцінства і юнацтва Фрыды Давыдаўны Гурэвіч прыйшліся на гады рэвалюцыі і наступныя за ёй гады голаду, разрухі, НЭП’у. Сям’я жыла бедна, да таго ж у 1917 і 1919 гг. у ёй з’явіліся яшчэ дзве дачкі. Старэйшую падкармлівалі ў спецыяльных сталоўках, якія арганізавалі амерыканцы для хворых і асабліва аслабленых дзяцей. Калі Ф.Д. Гурэвіч споўнілася 7 гадоў, яна паступіла вучыцца ў школу, якая называлася Советская единая трудовая

школа, але хутка перайшла ў 5-ю нацыянальную гэбрэйскую школу і закончыла яе ў 1929 г. Як і шматлікія яе аднагодкі, Ф.Д. Гурэвіч у юнацтве была захоплена рэвалюцыйнай стыхіяй, уступіла ў піянерскі атрад — спачатку пры Ваенна-падкоўным заводзе (былым заводзе Поселя), які знаходзіўся на Малым праспекце Васілеўскага востраў, потым пры заводзе “Красный гвоздильщик”. З вялікім захапленьнем, нават з энтузіязмам, удзельнічала яна ў грамадскіх асветных арганізацыях тыпу “Далоў непісменнасьць”, у драматычных прадстаўленьнях так званых жывых газет, такіх як “Касьцёр”, “Сіняя блуза”. Трэба сказаць, што сацыяльную актыўнасьць, грамадскі тэмперамент Ф.Д. Гурэвіч захоўвала на працягу ўсяго жыцьця — была камсамолкай, членам партыі. Ёй выпала жыць у няпростую савецкую эпоху. Фармаваньне Ф.Д. Гурэвіч як вучонага, яе творчыя гады нашмат супалі з хмурымі гадамі ідэалагічных “праработак”. Асабіста яе яны не закранулі, але ад іх пацярпела нямала яе калег і сяброў. Сама Ф.Д. Гурэвіч не прымала ўдзел у падобных кампаніях, заўсёды кіравалася ў сваіх паводзінах прынцыпамі асабістай прыстойнасьці і чэснасьці, што нярэдка прыносіла ёй горкія перажываньні. Яе жыцьцё ў пэўнай ступені можа быць прыкладам таго, як і ў вельмі неспрыяльных умовах вучоны можа захоўваць навуковую добрасумленнасьць і чалавечую годнасьць. Толькі той, хто сам перажыў гэтыя гады і прайшоў праз цяжкія выпрабаваньні, можа зразумець, як “шмат каштуе” такая жыцьцёвая пазіцыя. Страшныя падзеі нашай гісторыі не абыйшлі Ф.Д. Гурэвіч, як тысячы і тысячы людзей яе пакаленьня, але, канечне, лёс для яе быў спрыяльны — яна змагла рэалізаваць свае здольнасьці і аказалася шчаслівейшай за многіх сваіх сучаснікаў, ясна ўсведамляла і цаніла гэта, радуючыся кожнаму пражытаму дню. Былі ў біяграфіі Ф.Д. Гурэвіч і асабістыя драмы, якія яна змагла перанесьці стойка і з годнасьцю.

Але вернемся да гадоў яе юнацтва. Сям’я працягвала жыць вельмі бедна. Да таго ж пасля адмены НЭП’у Пецярбург захінула безпрацоўе. Бацька штодзень хадзіў на чорную біржу з надзеяй атрымаць хоць якую-небудзь працу, але, як правіла, надзеі былі дарэмныя. На прадукты былі ўведзены “заборныя” кніжкі, па якіх выдавалі толькі 400 г хлеба і больш нічога. І ўсё-такі, нягледзячы на жабрацкае становішча і, здавалася б, поўную безвыходнасьць, бацькі падтрымалі жаданьне дачкі працягваць сваю адукацыю. Ф.Д. Гурэвіч паступіла ў Педагагічны Інстытут ім. Герцэна, які скончыла ў 1932 г., атрымаўшы спецыяльнасьць выкладчыка гісторыі (ва ўстановах тыпу рабфака). Разам з мужам — В.Г. Рэвуненкавым, пазней вядомым гісторыкам Новага часу — яна па размяркаваньню была накіравана ў Томск, дзе працавала

асістэнтам кафедры сацыяльна-эканамічных дысцыплін у Сібірскім Горным Інстытуце. Вярнуўшыся ў Ленінград у 1934 г., Ф.Д. Гурэвіч паступіла ў аспірантуру Дзяржаўнай Акадэміі Матэрыяльнай культуры (ГАІМК) па гісторыі заходне-еўрапейскага сярэднявечча. У 1938 г. яна абараніла дысертацыю па тэме “Саксонскае паўстаньне 1073-1075 гг.” 4 снежня 1937 года Ф.Д. Гурэвіч прынялі на працу ў Інстытут Гісторыі Матэрыяльнай Культуры (пазней – Ленінградскае Аддзяленьне Інстытута Археалогіі), з якім было звязана ўсё яе жыцьцё аж да скону 2 верасня 1988 г.

У гады Вялікай Айчыннай вайны яе, як маці дваіх маленькіх дзяцей, камандзіравалі на работу ў інтэрнат, які стварылі для эвакуацыі з Ленінграда дзяцей супрацоўнікаў Акадэміі Навук. У 1941-1942 гг. інтернат размяшчаўся ў г. Цюшы Татарскай АССР, у 1942-1944 гг. разам з Ленінградскімі супрацоўнікамі ІГМКа яна жыла і працавала ў Ташкенце. У той час гэты калектыў калег прадстаўляў з сябе адну вялікую сям’ю, дзе было ўсё — і праца, і частае недаяданьне, і хваробы, і боль ад страт, але было і тое, што ва ўсіх выпадках жыцьця ратуе людзей і дапамагае ім выжыць — задорны, нязгасны гумар. Галоўным чынам, аб ім вядома з расказаў і ўспамінаў эвакуіраваных вучоных, у тым ліку і ад самой Фрыды Давыдаўны. Але захавалася і пісьмовае сведчаньне — рукапісны гумарыстычны зборнік вершаў “Ожерелье памятных дней”, датаваны 23 мая 1944 г. і прысвечаны, як напісана на тытульным аркушы, “заведуюшчей культмассовым сектором Объединенного Месткома Ленинградских Институтов Академии Наук СССР Фриде Давыдовне Гуревич”. Гэты самадзейны зборнік гумарыстычных вершаў Ф.Д. Гурэвіч захавала, таксама як і вялікую перапіску, якую яна вяла, будучы ў эвакуацыі ў Ташкенце, з роднымі і калегамі з блакаднага Ленінграду, Масквы, Фрунзэ, Уладзівастока. Усе гэтыя пісьмы — жывыя сведчаньні няспыннага ні пры якіх абставінах жыцьця ва ўсіх яго шматлікіх праявах - ад штодзённых пабытовых дробязяў да высокіх навуковых памкненьняў. Цяпер яны з’яўляюцца унікальнымі дакументамі ваеннай эпохі.

Прыехаўшы з Ташкента ў 1944 г. у Маскву, Ф.Д. Гурэвіч была прынята на працу ў маскоўскі ІГМК, дзе працавала да 1946 г. і вярнулася ў Ленінград, у родны інстытут, з якім, як ужо гаварылася, была злучана да канца жыцьця.

У гарманічнай натуры Ф.Д. Гурэвіч спалучаліся актыўны ўдзел у багатым знешнімі падзеямі жыцьці з імклівым ростам і дасканаленьнем унутранага свету. Уся яе жыцьцёвая энэргія з юнацтва была накіравана на самаадукацыю, яна інтэнсіўна ўпітвала і засвайвала культурныя каштоўнасьці, спасьцігала

навуковыя веды, якія былі цяпер у яе распараджэньні, перш за ўсё, традыцыі пецярбургскай навуковай школы. І тое, што Ф.Д. Гурэвіч стала не толькі вучоным з шырокім навуковым кругаглядам, але і надзвычай эрудзіраваным чалавекам у галіне мастацтва, літаратуры, музыкі, цікавым суразмоўцам, які мог на роўных гаварыць с любой навуковай альбо тэатральна-мастацтвазнаўчай аўдыторыяй, з'яўляецца цалкам яе асабістай заслугай, вынікам яе няўёмнай цікаўнасьці, прагі да пазнаньня розных бакоў жыцьця і людзей. Трэба сказать, што гэтую юнацкую захопленасьць і тое, што мы называем маладой душой, яна захавала да канца сваіх дзён. Дасёньня многія, хто ведаў яе, памятае яе звонкі голас, успамінае як лёгка яна збіралася, пачуўшы аб якім-небудзь цікавым мерапрыемстве — лекцыі, канцэрце, сустрэчы з пісьменьнікамі альбо журналістамі. Як і ўсіх прыстойных людзей, яе захапіла хваля дэмакратызацыі і свабоды слова ў канцы 80-х гадоў, дадала свежы струмень жыцьцёвай сілы і аптымізму ў яе адкрытую на ўсякую добрую справу душу. У гэтых адносінах яна была нашмат маладзейшая за некаторых сваіх больш маладых калег.

Пачаўшы свой шлях у навуцы як гісторык-медыевіст, які мае справу, галоўным чынам, з пісьмовымі крыніцамі, Ф.Д. Гурэвіч, дзякуючы свайму сапраўды бурнаму навуковаму тэмпераменту, скора змяніла прафесійную арыентацыю, звярнуўшыся да рэчавага матэрыялу, да археалогіі, якая стала яе сапраўдным прызваньнем. Хаця вопыт работы з пісьмовымі помнікамі, вельмі спатрэбіўся ёй пазней, значна пашырыўшы крыніцавую базу і храналагічныя рамкі яе даследваньняў, даючы большую аргументаванасьць і доказную сілу яе высновам. Супастаўленьне рэчаў з дадзенымі пісьмовых крыніц, перш за ўсё, летапіснымі звесткамі, — трывалая і характэрная рыса яе даследчыцкага падыходу, пачынаючы з першых археалагічных адкрыцьцяў.

Яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны, яна звярнулася да археалагічнага помніка славянскага паганства — Збручскага ідала, напісала падрабязны артыкул аб ім. Дасёньня гэта праца застаецца адзіным падрабязным апісаньнем славутага помніка. Пасля вайны Ф.Д. Гурэвіч канчаткова звязала сваю навуковую дзейнасьць з археалогіяй.

Папрацаваўшы некалькі палявых сезонаў на раскопках Старой Ладагі — у экспедыцыі, начале з членам-карэспандэнтам АН СССР В.І. Раўданікасам, Фрыда Давыдаўна Гурэвіч у 1949-1951 гг. звярнулася да археалагічнага даследваньня зямлі старажытных прусаў — Калінінградскай вобласьці, якая пасля вайны адышла да СССР. Яна стала першым савецкім даследчыкам, які пачаў археалагічныя пошукі ў гэтым буйнейшым регіёне і памежных з ім

тэрыторыях, адкрыла шмат невядомых раней гарадзішчаў, селішчаў, магільнікаў. Вынікам гэтага стала вялікая работа “Из истории Юго-Восточной Прибалтики в I тысячелетии н.э. (По материалам Калининградской области) (МИА. 1960. № 76. С. 328-451), дзе даецца абагульняючая характарыстыка тыпу паселішчаў, гаспадаркі, эканамічнага і сацыяльнага жыцьця старажытных прусаў. Асабліва варта вылучыць праблему этнічнай гісторыі і этнічнага складу Паўднёва-Ўсходнай Прыбалтыкі ўвогуле, у першую чаргу Ўсходняй Прусіі—Калінінградскай вобласьці. На аснаваньні матэрыялу, які яна сама здабыла і якому дае сваю інтэрпрытацыю, Фрыда Давыдаўна прыходзіць да высновы аб устойлівасьці этнічнага складу гэтага регіёну ў I і пачатку II тысячагоддзя н.э., які складаўся, галоўным чынам, з розных прускіх плямёнаў, культура якіх, развіваючыся самастойна, знаходзілася ў цесным узаемадзеяньні з культурамі як блізкіх, так і вельмі аддаленых суседзяў — балтыйскіх, славянскіх, германскіх плямёнаў, так сама, як і з культурай народаў Цэнтральнай Еўропы і Прычарнамор’я. У гэтай першай вялікай рабоце праявіліся рысы яе навукова-даследчыцкай дзейнасьці, якія адрозніваюць і ўсе наступныя яе працы, — спалучэньне філіграннага аналізу канкрэтных рэчаў з шырокімі выхадамі да праблемаў гісторыка-сацыяльнага, этнагенетычнага і культурнага значэньня. Кожную рэч яна разглядае з боку яе прызначэньня, функцыянальнага выкарыстаньня, храналагічнай прыналежнасьці, не выпускаючы з віду і фармальна-мастацтвазнаўчыя дэталі (у гэтым плане для Ф.Д.Гурэвіч не існуе нічога дробнага альбо нязначнага, усё прымаецца да ўвагі і знаходзіць сваё тлумачэньне), у сукупнасьці з іншымі матэрыяламі, часам вельмі рознароднымі, і ў супастаўленьні з матэрыяламі другіх археалагічных арэалаў і комплексаў. Такім чынам, яна адкрывае цэлыя гісторыка-культурныя пласты, якія ў суадносінах з пісьмовымі крыніцамі як бы самы па сабе выводзяць аўтара да заключэньняў, што маюць абагульняючае тэарэтычнае значэньне. Іншымі словамі, Ф.Д. Гурэвіч прадстаўляе сабой той рэдкі тып вучонага, які аднолькава валодае майстэрствам канкрэтнага аналізу матэрыялу і яго глыбіннай інтэрпрэтацыяй, разглядам асобнай рэчы ў розных гістарычных, этнічных і культурных вымярэньнях і розных зрэзах часу. І ў выніку ёй удаецца аднавіць нейкую бачную панараму жыцьця людзей далёкіх ад нас эпох з іх заняткамі, гандлёвымі і культурнымі сувязямі, рэлігійнымі прадстаўленьнямі.

Як ужо адзначалася, археалагічныя даследваньні ў Калінінградскай вобласьці ўключалі ў сябе нашмат больш шырокі рэгіён. Ф.Д. Гурэвіч многа займалася праблемамі прыбалтыйскага

ўплыву і месцам прыбалтыйскіх плямёнаў у фарміраваньні насельніцтва старажытнай Прусіі. Менавіта ў гэты час, г.зн. у пачатку 50-х гадоў, у яе ўсталяваліся навуковыя кантакты з вучонымі Прыбалтыйскіх рэспублік СССР — гэтыя кантакты сталі трывалымі і ператварыліся ў сяброўскія, яны не перарываліся до самага апошняга часу. Перш за ўсё, з Х.А. Моора і М.Х. Шмідэльхельмам з Эстоніі, Э.Д. Шнорэ, Э.С. Мугурэвічам з Латвіі, П.З. Кулікаўскасам, Р.К. Кулікаўскене, А.З. Таўтавічусам з Летувы. Пастаянны абмен думкамі з прыбалтыйскімі вучонымі, рэцэнзіі на іх працы, прафесійная арыентацыя ў матэрыяльнай культуры балтаў значна пашырылі кругагляд даследваньняў Ф.Д Гурэвіч. Гэты вопыт вельмі дапамог ёй у далейшых даследваньнях — яна адкрыла ўзаемаўплыў багатай металічнай культуры Прыбалтыкі і залатарства ў Наваградку і ў іншых гарадах Беларускага Панямоньня. Праблемы археалагічнага вывучэньня Калінінградскай вобласьці і Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі неразрыўна звязаны з добра вядомай нарманскай тэорыяй, даследчыца ўключаецца ў гэту праблему з уласным поглядам на яе. Яна рэгулярна ўдзельнічае ў канферэнцыях, што прысвечаны Скандынаўскім краінам, друкуе артыкулы ў Скандынаўскіх зборніках, у якіх раскрывае ролю скандынаўскіх калоній і культуры на тэрыторыі старажытных прусаў і славян.

Гэтай мініяцюрнай жанчыне быў уласьцівы сапраўдны навуковы азарт, які кідаў яе на вывучэньне новых, невядомых яшчэ археалагічных комплексаў і які вызначаў павароты яе навуковага лёсу. Так было з Калінінградскай вобласьцю, а ў 1956 г. яна зацікавілася Заходняй Беларуссю, якая таксама адкрылася для палявых работ расійскіх вучоных толькі пасля Другой Сусветнай вайны. З тых часоў гэты рэгіён стаў асноўнай сферай навуковых інтарэсаў Ф.Д. Гурэвіч. У басейне Верхняга Нёмана яна знайшла шэраг гарадзішчаў, неўмацаваных паселішчаў, курганных і грунтовых магільнікаў I тысячагоддзяя н.э. і Х1-Х1У стст. Выхад ў свет манаграфіі “Древности Белорусского Понеманья” (М-Л., 1962) і навукова-папулярнай кнігі “Древние города Белорусского Понеманья” (Минск, 1982), раздзелены перыядам у дваццаць гадоў, але тым не меньш абедзьве кнігі цесна звязаны паміж сабой, іх можна разглядаць разам. Абедзьве прысвечаны гарадам Панямоньня, усе звесткі аб гісторыі якіх абмяжоўваліся вельмі скупымі ўспамінамі ў летапісах канца Х11 стагоддзя. Уважліва прааналізаваўшы матэрыялы археалагічных помнікаў вельмі вялікага храналагічнага дыяпазону - ад апошніх стагоддзяў н.э. да сярэдзіны I-га тысячагоддзя н.э., супаставіўшы іх з дадзенымі археалагічных раскопак Х1-Х1У стст. і з пісьмовымі сведчаньнямі, аўтар прыходзіць да важных высноваў

этнагенетычнага характару. Яна паказвае, што засяленьне Беларусі ад старажытных часоў да ўтварэньня беларускай народнасьці ішло неперарыўнымі хвалямі, якія складаліся з розных этнічных кампанентаў, якія змешваліся, зліваліся і ўзаемадзейнічалі адзін з другім, а таксама адны з іх асімілявалі другіх. Гэта былі першабытныя плямёны, падобныя да насельніцтва суседніх тэрыторый — верхняга Падняпроўя, паўднёвай Прыбалтыкі, г.зн. славянскія і ўсходне-літоўскія плямёны. Ф.Д. Гурэвіч пераканаўча паказала, наколькі памылковая ўстойлівая думка гісторыкаў аб тым, што славяне з'явіліся на гэтай тэрыторыі не раней X1 стагоддзя. Археалагічны матэрыял сведчыць, што ўжо ў канцы I тысячагоддзя н.э. у Беларускім Панямоньні выразна ўстанавілася славяна-літоўская этнічная мяжа, якая захоўвалася на працягу некалькіх стагоддзяў. Ужо з канца X - пачатку X1 стст. Беларускае Панямоньне прадстае як адзін з выразных асяродкаў старажытнарускай культуры, які ўвабраў у сябе шматлікія элементы культуры як суседняй паўднёва-заходняй Русі, так і Заходняга і Балтыйскага ўплыву.

У навукова-папулярнай кнізе "Древние города Белорусского Понеманья" таксама шмат месца аддадзена характарыстыкам інтэнсіўнага культурнага абмену. Тут сьцісла, у вельмі лаканічнай форме падведзены вынікі археалагічных даследваньняў старажытных гарадоў — Ваўкавыска, Гродна, Навагрудка. Аўтар пераносіць ўглыб на 100-200 гадоў у параўнаньні з летапіснымі звесткамі час іх узнікненьня, аднаўляе этнічнае і сацыяльнае аблічча гэтых гарадоў, падкрэслівае, што гэта былі цэнтры высокаразвітага рамяства і культуры, якія ажыццяўлялі сувязі як з суседнімі гарадамі Кіеўскай Русі і Прыбалтыкі, так і з вельмі аддаленымі регіёнамі, аж да Візантыі, мусульманскага Усходу, Закаўказьзя. Прадставіўшы гарады Панямоньня ва ўсім багацьці іх гаспадарчага і культурнага развіцьця, Ф.Д. Гурэвіч зрабіла неацэнны ўклад у вывучэньне старабеларускай гарадской культуры X11-X111 стст, надала ёй новыя фарбы і новае гучаньне.

Археалагічнае даследваньне Заходняй Беларусі стала стымулам для ўсталяваньня навуковых кантактаў з польскімі вучонымі, якія адгукаюцца на яе публікацыі, яна, у сваю чаргу, друкуе рэцэнзіі на працы польскіх археолагаў у савецкіх навуковых выданьнях. Ф.Д. Гурэвіч прымала актыўны ўдзел у розных канферэнцыях і кангрэсах, што прысвечаны гісторыі і культуры славян, шэраг яе работ надрукаваны ў беларускіх, польскіх і амерыканскіх часопісах.

У кожнага даследчыка ёсьць свае навуковыя сюжэты і помнікі, якія маюць асаблівую прыцягальную сілу і праца над іх вывучэньнем выклікае стан вялізнага творчага ўздыму. Безумоўна

такім помнікам стаў для Ф.Д. Гурэвіч Наваградак — адзін з найцікавейшых старажытных гарадоў, аб'ект напружанай барацьбы паміж самаўладцам Літоўскай зямлі Міндоўгам і выдатным палітычным дзеячам Русі Данііламу Галіцкім яшчэ ў XIII ст. Раскопкі гэтага археалагічнага помніка пад кіраўніцтвам Ф.Д. Гурэвіч праводзіліся з 1956 да 1985 г. Ужо першыя разведачныя доследы паказалі, што Наваградак рэзка адрозніваецца па асноўных археалагічных параметрах ад тыповых гарадскіх пасадаў лясной паласы XI-XIII стст. Пазнейшыя сістэматычныя стацыянарныя археалагічныя даследваньні шматкрат толькі падцвярджалі першапачатковыя назіраньні. Кніга Ф.Д. Гурэвіч "Старажытны Наваградак" характэрызуе гэты непаўторны ў многіх адносінах помнік.

У першай частцы кнігі чытачу прадстаўляецца крыніцавая база, на якой будуецца далейшае даследваньне, — апісаны асаблівасьці стратыграфіі, выяўлены асобныя археалагічныя комплексы, зроблена размяркаваньне рэчавага матэрыялу, вызначаны храналагічныя рамкі асобных будаўнічых перыядаў. У другой частцы аўтар дэманструе, як гэты матэрыял працуе ў якасьці паўнавартаснай гістарычнай крыніцы, на аснове якой робіцца рэканструкцыя гаспадаркі, побыту, штодзённага жыцьця гораду X-XIII стст., перш за ўсё яго рэдкіх і вельмі незвычайных па свайму віду багатых кварталаў і жылых пабудоў з фрэскавым роспісам па сьценах. Археалагічны матэрыял Наваградка дае падставы гаварыць аб наяўнасьці ў ім своеасаблівых карпарацый рамеснікаў. І ў гэтай сваёй рабоце Ф.Д. Гурэвіч прадстала як вучоны, які мае асаблівы даследчыцкі дар, ў якім за скрупулёзным аналізам канкрэтных рэчаў прадстае жывое аблічча цэлага гораду і яго пульсуючага жыцьця. Наваградак становіцца ў адзін шэраг з выдатнымі гарадамі Старажытнай Русі, ў той жа час вылучаючыся сваёй непадобнасьцю і асаблівай спецыфікай у параўнаньні з імі. Гісторыя Наваградка, такім чынам, упісывае новую старонку ў культуру дамангольскага перыяду ў цэлым. Гісторыі Наваградскага Замку прадстаўлена ў кнізе, якую чытач трымае ў руках і якая ёсьць вынікам шматгадовых даследваньняў аўтара. Апошнюю кропку ў ёй Ф.Д. Гурэвіч паставіла літаральна напярэдадні сваёй смерці.

Гэта апошняя савецкая археалагічная кніжка па беларускай археалогіі. І хіба што адна з наілепшых савецкіх археалагічных манаграфій. Тое, што яна спазнілася амаль на пятнаццаць гадоў не змяншае вартасьці выданьня. Вынікі археалагічных раскопак Замкавай гары Наваградка нарэшце ўбачыць зацікаўлены чытач: гісторык, археолаг, культуролаг, краязнавец. Багатая эрудыцыя і велізарная працаздольнасьць аўтара, педантычнасьць і

паслядоўнасьць яе палявой работы даюць магчымасьць “загаварыць” наваградскім узвышшам, а нам пацікаваць за працай, памкненьнямі і лёсам жыхароў аднаго з самых старажытных беларускіх гарадоў.

Вартасьць археалагічных матэрыялаў, якія прадстаўлены ў кнізе, неперaходная. Што датычыць да інтэрпрэтацый і тлумачэньня тых ці іншых асобных знаходак ці комплексаў (рэчаў, пабудоў etc.), сёньня, напэўна, яны былі б трошку іншыя. Ф.Д. Гурэвіч уважліва сочыла за літаратурай па спецыяльнасьці і сумежных дысцыплінах і старалася ўлічваць усё, што дапамагае глыбей зразумець прыроду тае ці іншае з’явы, функцыі знайдзенай невядомай рэчы, прызначэньне раскапанай пабудовы. За апошнія гады, калі аўтара ўжа не было, а праца чакала свайго выдаўца — выйшла багата кніг па археалогіі Беларусі і сумежных краін — наіперш Летувы, таксама Польшчы, Расіі, Украіны. Актывізавалася работа гісторыкаў палітычнай гісторыі часоў Кіеўскай Русі і першых двух стагоддзяў існаваньня Вялікага Княства Літоўскага. Манаграфія Ф.Д.Гурэвіч стане ў гэты шэраг вельмі дарэчы. Хаця безумоўна шкада, што кнігі аднаго з галоўных апанентаў Фрыды Давыдаўны, выдатнага беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча выйшлі ўжо пасля яе смерці: Ермаловіч М. І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. Мн., 2000. Ён жа: Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Мн., 1994. Ён жа: Старажытная Беларусь. Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990., іх палеміка пабудаваная толькі на невялічкіх раньніх артыкулах Міколы Іванавіча, які, у сваю чаргу, не меў магчымасьці бачыць невыдадзены рукапіс падагульняючай манаграфіі аб раскопках старажытнага Наваградка. Мікола Ермаловіч так ніколі не прыняў Наваградак – сталіцу Вялікага Княства Літоўскага - як горад Чорнай Русі, лічыўшы апошні тапонім пазнейшым стварэньнем гісторыяграфіі.

Тэкст і ілюстрацыі гэтай кнігі падрыхтавалі да друку калегі і сябры Ф.Д. Гурэвіч — удзельнікі многіх палявых сезонаў у Наваградку — Марыяна Ўладзіміраўна Малеўская, Клаўдзія Васілеўна Паўлава, якая яшчэ са студэнцкіх часоў пачала ездзіць з Ф.Д. Гурэвіч у экспедыцыі ў Прыбалтыку і потым працавала і ў Навагрудку, нарэшце дзьве дачкі Ф.Д.Гурэвіч — Натальля Ўладзіміраўна Рэвуненкава і Лена Ўладзіміраўна Герцэнберг. Пераклад на беларускую мову зрабіў вучань Ф.Д.Гурэвіч і ўдзельнік раскопак у Наваградку напрацягу 15 палявых сезонаў, доктар філалагічных навук Мікалай Віктаравіч Нікалаеў. Першым вопытам перакладу тэкстаў Фрыды Давыдаўны быў для яго артыкул аб раскопках Замкавай гары для наваградскай раённай газеты “Новае жыцьцё”: артыкул замовіў тагачасны рэдактар,

энтузіяст-краязнаўца Іван Іванавіч Казачонак. Фрыда Давыдаўна сама прапанавала Івану Іванавічу беларускі варыянт і папрасіла супрацоўніка экспедыцыі, мясцовага школьніка Колю Нікалаева зрабіць як скарэй гэту работу, сказаўшы, што навагрудцы павінны лепш чым хто валодаць беларускай мовай. Бедалага ў тое лета першы раз спазнаў, што ведаць мову і быць перакладчыкам — розныя рэчы. І яшчэ — што свой патрыятызм трэба не толькі дэкляраваць, але і адрабляць цяжкай працай. Працуючы над апошняй кнігай аб раскопках Навагрудка, перакладчык імкнуўся як мага бліжэй перадаць стыль Ф.Д. Гурэвіч, якая пісала вельмі вобразнай і жывой мовай, а таксама захаваць асаблівасьці мысленьня яе і як жанчыны-вучонага: “заходнееўрапейскі пярсьцёнак трапіў у Навагрудак разам са сваёй уладальніцай” [sic! - не ўладальнікам!], і як савецкага вучонага: “Аналогіі да іх [шкляных бранзалетаў-пер.] сустракаюцца на поўдні нашай краіны (Саркел, Тмутаракань, Херсанэс).” — Дзе тая наша краіна!

Працу па падрыхтоўцы рукапісу рухала не толькі прызнаньне вялікай навуковай значнасьці апошняй кнігі Ф.Д. Гурэвіч і пачуцьцё абавязку, але і шчырая любоў і ўдзячнасьць да яе аўтара. Гэта пачуцьцё зведалі тыя, кто працаваў з Ф.Д. Гурэвіч, і не толькі ў навуковым асяроддзі. Яна была па-сапраўднаму дэмакратычная і ў кожным чалавеку, незалежна ад яго ўзросту ці прафесіі, паважала яго асобу і гонар. Кругом яе заўсёды была атмасфера шчырасьці, высокай добразычлівасьці. Фрыда Давыдаўна з вялікай павагай ставілася да беларускай культуры, частыя госьці Навагрудскай экспедыцыі былі нацыянальна арыентаваныя беларускія вучоныя і дзеячы культуры. Шмат увагі яна ў свой час аддала маладому аспіранту-археолагу Міхасю Ткачову, якому потым дапамагала і ў Ленінградзе. У яе на раскопе некаторы час працаваў малады Фэлікс Янушкевіч, цяперашні Прэзідэнт беларускай Акадэміі мастацтваў — з якім кранаючым цярпеньнем слухала яна безапеляцыйныя гістарычныя цьверджаньні гэтага вучня мінскай мастацкай школы і з якім захапленьнем разглядала ягоныя эцюды! А падчас разведак у Навагрудскім раёне разам з Міхасём Чарняўскім, яна не саромелася (будучы ўжо тытулаваным і паважаным вучоным) па-добраму зайздросьціць уменьню маладога Міхала Міхалавіча вызначаць па сьпеву пароды птушак а па лістах альбо зрэзу дрэва — пароду дрэва. Сама яна была чалавекам шчодрай душы — шчодра дзялілася сваімі адкрыцьцямі ў навуцы, была шчодрая ў сяброўстве з людзьмі розных пакаленьняў. Яна была адкрытая для сумоўя, ёй было шмат што цікава ў жыцьці ўвогуле, не толькі ў навуцы, яе пазнаньні ў літаратуры і мастацтве здзіўлялі многіх, з ёй было лёгка і весела працаваць і жыць. Калі ж гаварыць аб галоўным яе

захапленьні, то гэта, канечне, была навука. Карыстаючыся высокім стылем, можна было б сказаць, што яна была выключна адданая навуцы, чэсна служыла ёй. Але высокі стыль не быў уласьцівы Ф.Д. Гурэвіч. Проста навука была яе жыцьцё, яе шчасьце, так сама была неабходная для адчуваньня радасьці быцьця як дом, сям'я, дзеці, унукі. Па паходжаньню яна не належала да асяроддзя інтэлігенцыі, але будучы чалавекам вельмі адукаваным, далікатным і чулым да людзей, яна несумненна належала да таго "культурнага слою", да тае асаблівай пароды людзей, якую звычайна называюць пецярбургскімі інтэлігентамі і якая ўжо амаль адыходзіць у нябыт. Гэта не можа не выклікаць тугі, і ў той жа час, многія сябры і калегі Ф.Д. Гурэвіч і зараз адчуваюць вельмі светлыя пачуцьці ад таго, што лёс падараваў ім сустрэчу з гэтым незвычайным чалавекам.

Спіс навуковых прац Ф. Д. Гурэвіч

1. Средневековая немецкая империя в фашистской историографии // Борьба классов. 1936. № 10. С. 92-102: іл.

2. Саксонское восстание 1073-1075 гг.: Афтореф. дис. ...канд. ист. наук. Л., 1938.

3. Збручский идол //МИА. 1941. № 6. С.279-287: іл. Рэз.фр.

4. Каменные могилы на границе Литвы и Белоруссии (к вопросу о ятвягах) // Рефераты научно-исследовательских работ за 1945 г. (АН СССР, ОИФ). М-Л., С. 94.

5. Обряды погребения в Литве // КСИИМК. 1947. Вып. 18. С.31-37.

6. Украшения со звериными головами из прибалтийских могильников: к вопросу о культе змеи в Прибалтике // КСИИМК.1947. Вып. 15. С. 68-76: іл.

7. Древние верования народов Прибалтики по данным "Хроники Ливонии" Генриха Латвийского // СЭ. 1948. № 4. С.70-77.

8. Древнейшие бусы Старой Ладоги // СА. 1950. №14. С. 170-186: іл.

9. К вопросу об археологических памятниках летописных ятвягов // КСИИМК. 1950. Вып. 33. С. 110-120: іл.

10. Древние поселения Калининградской области // КСИИМК. 1951. Вып. 38. С. 91-98: іл., карт.

11. Из истории раннего Гродно // СА.1951. № 15. С.82-95: іл.

12. Поселения Калининградской области в I тыс. н.э. по данным работ 1949-1950 // Тезисы докладов на пленуме ИИМК

АН СССР, посвященные вопросам археологии Прибалтики 1951г. М. 1951. С. 43-44.

13. Рагинянский могильник // КСИИМК. 1951. Вып. 36. С. 56-61: іл.

14. Археологические работы в Калининградской области в 1950 г. // КСИИМК. 1952. Вып. 47. С. 93-100: іл.

15. Древние памятники Юго-Восточной Прибалтики и задачи их изучения // КСИИМК. 1952. Вып. 42. С.13-23 : іл.

16. Раскопки на городище Грачевка // КСИИМК.1953. Вып. 52. С. 80-86: іл.

17. Каменные идолы Себежского музея // КСИИМК. 1954. Вып.54. С. 176-179: іл.

18. Пилкалнис // БСЭ. 2 изд. Т. 33. С. 37-38.

19. Рагинянская культура // БСЭ. 2 изд. Т.35. С.467.

20. Юго-Восточная Прибалтика в I тысячелетии н.э. // Тезисы докладов на объед. конф. по археологии. этнографии и антропологии Прибалтики. М. 1955. С.30-32.

21. Археологические памятники Великолукской области // КСИИМК. 1956. Вып. 62. С. 95-107: іл.

22. К истории древних пруссов в 1 тысячелетии н.э. // КСИИМК. 1957. Вып. 70. С.40-48: іл.

23. Рэц. на кн. Шмидельхельм М.Х. Археологические памятники периода разложения родового строя на сев.-востоке Эстонии 1У в. до н.э. - У в. н.э. Таллин. 1955. 268 С. // СА. 1957. №1. С. 279-283.

24. Латышские и литовские племена Прибалтики в первой половине 1 тысячелетия // Очерки истории СССР. Т. 2. М., 1958. С. 111-124: іл.

25. О длинных и удлиненных курганах в Западной Белоруссии // КСИИМК. 1958. Вып. 72. С. 54-65.: іл., карт.

26. Племена Прибалтики: (во второй пол. I тыс.) // Очерки истории СССР. Т.2. М., 1958. С. 643-657: іл.

27. Археологическая разведка 1955г. в Понеманье // Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции. Т.1. М., 1959. С. 233-253, 1л. іл.: іл.

28. Некаторыя дадзеныя аб паселішчах і гарадзішчах Самбіі // Rocznik Olsztynski.

1959. Т. 2. S. 205-220: ill. На польскай мове. Рэз. рус., англ.

29. Работы Славяно-литовского отряда Прибалтийской экспедиции в 1956 г. // КСИИМК. 1959. Вып. 74. С. 89-91.

30. Верхнее Понеманье в I тысячелетии и начале II тысячелетия н.э. // КСИА.1960.

Вып. 81. С. 13-24: іл., карт.

31. Из истории Юго-Восточной Прибалтики в I тысячелетии

н.э. : (По материалам Калининградской области) // МИА. 1960. №76. С.328-451, 2л. іл.: іл., карт.

32. Славяно-литовский отряд Прибалтийской экспедиции // КСИИМК.1960. Вып.79. С. 95-96.

33. Этнический состав населения Верхнего Понеманья по археологическим данным второй половины I тысячелетия н.э. // Исследования по археологии СССР. Л., 1961. С. 174-181: іл.

34. Древности Белорусского Понеманья. М., Л.: Изд-во АН СССР, 1962. 222с.: іл., 5 л. карт.

35. К истории древнего Новогрудка // Swiatowit. 1962. Т.24. S. 557-575: ill.

36. О жилищах окольного города древнего Новогрудка // КСИА.1962. Вып.87. С. 70-77: іл.

37. Об окольном городе летописного Новогрудка X-X111 вв. // СА. 1962. №1. С. 241-252: іл.

38. Древнерусский Новогрудок // Тезисы докладов на заседании, посвященном итогам полевых исследований 1962 г. М., 1963. С.53-54.

39. Норманский могильник у дер. Вишнево // Скандинавский сб. 1963. Т.6. С. 197-210: іл. Рэз. эст., швед.

40. Раскопки в Новогрудке (1960-1961) // КСИА. 1963. Вып. 96. С. 51-54: іл.

41. Стеклянный резной бокал из Новогрудка // СА. 1963. №2. С. 243-246: іл.

42. Древние пруссы и норманны //Тезисы докладов научной конф. по ист., экономике, языку и литературе Скандинавских стран и Финляндии. Тарту, 1963. С. 39-40.

43. Gurievicz F.D. Badania archeologyczne w Nowogrudku na obszarze BSSR w latach 1956-1961 // Rocznik Bialostocki. 1963. T. 4/ S. 341-354: ill.

44. Рэц. на кн.: Шноре Э.Д. Асотское городище. Рига, 1961.// СА. 1963. №4. С. 282-283.

45. Дом боярина X11 в в древнерусском Новогрудке // КСИА. 1964. Вып.99. С. 97-102: іл.

46. Изображение музыкантов Древней Руси // СА. 1965. № 2. С. 276-281: іл.

47. Древний Новогрудок. Тезисы докладов на I Международном конгрессе славянской археологии в Варшаве. М., 1965. С. 48-49.

48. Древний Новогрудок. I Miedzynarodowy Kongress archeol. slowianskiej. Komunikaty. Warszawa. 1965. T.4. S. 376-389.

49. Сельское хозяйство и промыслы древнерусского Новогрудка // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 77-84: іл.

50. Прибалтийский импорт в Понеманье X-X111 вв. // От

эпохи бронзы до раннего феодализма. Таллин. 1966. С. 52-59: іл.

51. Древний Новогрудок //Археологические открытия 1965 г. М., 1966. С. 163-165.

52. Древний Новогрудок по данным раскопок 1965 г. // Тезисы докладов на пленуме Института Археологии 1966 г. М., 1966. С. 10-11.

53. По поводу статьи Б.А. Шелковникова “Русское стекло домонгольского периода, расписанное эмалями” // СА. 1966. № 1. С. 312-315.

54. Польско-советский симпозиум, посвященный балто-славянским отношениям // Сов. славяноведение. 1966. № 4. С. 109-110.

55. Внешние связи древнерусских городов на территории Белоруссии в X11-X111вв. // Древности Белоруссии. Минск, 1967. С. 281-283.

56. Археологические работы в Новогрудке // Археологические открытия 1966 г. М., 1967. С. 268-270: іл.

57. К истории Новогрудка X-X1 вв. //Культура и искусство Древней Руси. Л., 1967. С.26-30.

58. Ювелиры древнего Новогрудка // КСИА. 1967. Вып. 110. С. 14-20: іл.

59. Восточное стекло в Древней Руси Л.: Наука, 1968. 28с.; 9 л. іл. На рус. і англ. мовах. (Разам з Р.М. Джанполадян, М.У. Малеўскай).

60. Ближневосточные изделия в древнерусских городах Белоруссии // Славяне и Русь. М.: Наука, 1968. С. 34-36: іл.

61. Исследования в Новогрудке // Археологические открытия 1967 г. М., 1968. С. 252-254.

62. Новогрудская экспедиция // Археологические открытия 1968 г. // М., 1969. С. 353-354.

63. Новые материалы по истории Новогрудка // КСИА. 1969. Вып. 120. С. 114-119: іл.

64. Об этническом составе населения древнего Новогрудка // Acta baltico-slavica. 1969. № 6. S. 219-222.

65. О времени возникновения городов на территории Белоруссии // Studia archaeologica in memoriam Harri Moora. Tallinn, 1970. С. 69-73. Рэз. эст., нем.

66. Об углубленных жилищах на территории Черной Руси // МИА. 1970. № 176. С. 117-119: іл.

67. Раскопки Новогрудского детинца // Археологические открытия 1969 г. М., 1970. С. 23-24.

68. О восточной ориентировке славянских погребений // КСИА. 1971. Вып. 125. С. 17-22.

69. Итоги работ Новогрудской экспедиции //Археологические

открытия 1970 г. М., 1971. С. 311-312.

70. Находки в Копыси // Шахматы в СССР. 1971. № 7. С.9

71. Ремесленная корпорация древнерусского города по археологическим данным // КСИА. 1972. Вып. 129. С. 31-36.

72. Археалагічныя даследаванні Навагрудка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1972. № 1. С. 18-22.: іл.

73. К истории заселения Новогрудского детинца // Тезисы докладов на сессии, посвященной итогам полевых археологических исследований 1971 г. М., 1972. С. 393-394.

74. Происхождение городов Черной Руси // Беларускія старажытнасці. Мінск, 1972. С. 191-192.

75. Раскопки Новогрудского детинца //Археологические открытия 1971 г. М., 1972. С. 29-31.

76. Грамотность горожан древнерусского Понеманья // КСИА. 1973. С. 28-34: іл.

77. Города Черной Руси // Этногенез белоруссов. Тезисы... Минск, 1973. С. 34-37.

78. К истории культурных связей городов Западной Руси со странами мусульманского Востока // Тезисы докладов, посвященных итогам полевых археологических исследований 1972 г. в СССР. Ташкент, 1973. С. 260-261.

79. К истории культурных связей древнерусских городов Понеманья с Киевской землей: (по материалам ювелирного ремесла) // Культура средневековой Руси. Л., 1974. С. 22-25: іл.

80. Некоторые итоги археологического исследования детинца древнего Новогрудка // КСИА. 1974. Вып. 139. С. 93-99: іл.

81. Культурный облик и социальная дифференциация горожан Понеманья в X-XIII вв. // Реконструкция общественных отношений по археологическим материалам. Краткие тезисы Л., 1974. С. 49-50.

82. Работы в Новогрудке //Археологические открытия 1973 г. М., 1974. С. 370-371.

83. Рэц. на кн. Musianowicz K. Drohiczyn we wczesnym sredniowieczu. Warszawa, 1969. // СА. 1974. № 1. С. 254-258.

84. Города Понеманья и южнорусские земли в X-XIII вв. // Новейшие открытия советских археологов. Тезисы. Ч.3. Киев, 1975. С.72-74.

85. Новогрудская экспедиция // Археологические открытия 1974 г. М., 1975. С.384-385.

86. Рамеснікі старажытнарускіх гарадоў Понямоння // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1975. № 3. С. 34-38: іл.

87. Два этапа в истории древнерусских городов Понеманья // КСИА. 1976. Вып. 146. С. 25-31: іл.

88. Древние города Понеманья и южнорусские земли в конце

X-X111 вв. // Средневековая Русь. М., 1976. С. 25-28: іл.

89. Тезисы докладов 7 Всесоюзной конференции по изучению истории, экономики, литературы и языка Скандинавских стран и Финляндии. Ч.1. М.-Л., 1976. С. 153-155.

90. Рэц. на кн.: Nowakowski A. Gorne Pobuze w wiekach VIII-IX, 1972 // СА. 1977. № 1. С. 296-302.

91. Скандинавская колония на территории древних пруссов // Скандинавский сб. 1978. Т.23. С. 167-174. Рэз. швед.

92. Новогрудская экспедиция в 1977 г. //Археологические открытия 1977 г. М., 1978. С. 411-412.

93. Старажытны Ваўкавыск. Рэц. на кн.: Зверуго Я.Г. Древний Волковыск X-X1У вв. Минск, 1975 // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1978. № 3. С.42-44.

94. Детинец и окольный город древнерусского Новогрудка в свете археологических работ 1956-1977 гг. // СА. 1980. № 4. С. 87-101: іл.

95. Каменные могилы Подляшья и древний Дрогичин // КСИА. 1980. Вып. 160: іл.

96. Старажытныя гарады Панямоння // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1980.

№ 1. С. 30-31.

97. Древний Новогрудок : Посад - окольный город. Л.: Наука. 1981. 160 с.: іл.

98. Поливная керамика Новогрудского детинца // СА. 1981. С. 99-109 : іл. Рэз. англ.

99. Культурные взаимоотношения древнерусских городов на территории Белоруссии с Прибалтикой // Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. Тезисы докладов. Вильнюс. 1981. С. 17-21.

100. Древние города Белорусского Понеманья. Минск : Полымя. 1982. 48с.: іл.

101. Внешние связи древнерусских городов Понеманья // КСИА. 1982. Вып. 171. С. 43-49.: іл.

102. Новые данные о стеклянных иконах-литиках на территории СССР // ВВ. 1982. 43. С. 178-182.: іл.

103. New Finds of Glass Medallions in the U.S.S.R. // Journal of Glass Studies. 1982/ V. 24. P. 44-47.: ill.

104. Каму належаў абразок-літык? // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. № 3. С. 42-43.: іл.

105. Жилые и хозяйственные постройки городов Черной Руси // Проблемы изучения древнего домостроительства в У111-Х1У вв. в Северо-Западной части СССР. Рига. 1983. С. 12-16.

106. О формировании городов Черной Руси по данным археологии // СА. 1983. №3. С. 61-71 : карт. Рэз. англ.

107. Погребальные памятники жителей Новогрудка: (Конец X - 70-е годы X111 в.) // КСИА. 1983. Вып. 175. С. 48-54: іл.

108. Связи древних городов Белоруссии с Причерноморьем и Средиземноморьем //Древнерусское государство и славяне. Минск. 1983. С. 63-66: карт.

109. Знайдзена ў Навагрудку // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 2. С. 22-24 : іл. Рэз. русск.

110. Города Черной Руси и Киевская земля в X11-X111вв. // Древнерусский город. Киев. 1984. С. 31-33.

111. Застройка Новогрудского детинца в X11-X111вв.// КСИА. 1984. Вып. 179. С. 53-59: іл.

112. Культурные связи древнерусских городов на территории Белоруссии с Прибалтикой // Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. Вильнюс. 1985. С. 91-101: іл., карт. Рэз. нем.

113. Заснаванне Навагрудка: (па пісьмовых і археалагічных дадзеных) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1985. № 3 С. 71-76.

114. О Новогрудском стеклоделии (по поводу книги М.М. Яницкой “Истоки стеклоделия Белоруссии”. Минск. 1980) // СА. 1985. № 4. С. 260-264.

115. Об особенностях культуры городов Белорусского Понеманья в X11-X111 вв. // Тезисы докладов советской делегации на 5 Международном конгрессе славянской археологии. М., 1985. С. 80-81.

116. Византийский импорт в городах Западной Руси в X11-X111 вв. //ВВ. 1986. Т.47. С. 65-81: іл.

117. О времени постройки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке // КСИА. 1986. Вып. 187. С. 36-40: іл.

118. Alsengemmen from Ancient Russian Towns // J. Glass Studies/ 1986. V. 28. P. 24-29: ill.

119. На дзядзінцы і вакольным горадзе // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1986. № 3. С. 20-21: іл.

120. Работы в Новогрудке //Археологические открытия 1984 г. М., 1986. С. 340.

121. Скандинавские находки 1X-X1 вв. на территории Белоруссии // Тезисы докладов X Всесоюзной конференции по изучению истории, экономики, литературы и языков Скандинавских стран и Финляндии в 1986 г. Ч. 1. М., 1987. С. 171-173.

122. Г.Ф. Корзухина. К 80-летию со дня рождения //СА. 1987. № 2. С. 291-293.

123. О “кубках Ядвиги” // Культура и история средневековой Руси. Тезисы докладов. М., 1987. С. 19-21.

124. Об одной группе стеклянных гемм из древнерусских

городов // ПКНО - 1985. М., 1987. С. 515-521: іл., карт.

125. Раскопки на территории детинца древнего Новогрудка // Археологические открытия 1985 г. М., 1987. С. 447.

126. Западная Русь и Византия в X11-X111 вв. // СА. 1988. № 3. С. 130-144: іл., карт. Рэз. англ. Бібліягр. 142-143.

127. Об особенностях культуры городов Белорусского Понеманья в X11-X111 вв. // Труды 5 МКАС. Киев. 1988. Т.2. секция 3-4. С. 56-60.

128. Жилые и хозяйственные постройки городов Черной Руси // КСИА. 1989. Вып. 195. С. 57-62: іл.

129. Скандинавские находки X-XI вв. на территории Белоруссии // Скандинавский сборник. Т. 33. Tallinn, 1990. С. 100-121.

130. Аб культурных сувязях Заходняй Русі з Херсанэсам // Археалогія. 1991. № 2. С. 76-82 : іл. Укр. мова. Рэз. руск., англ.

131. О планировке и застройке древнего Новогрудка // КСИА. 1991. Вып. 205. С. 45-52: іл.

Уводзіны

У 1981 годзе выйшла кніга “Старажытны Наваградак (пасад-вакольны горад)”. У яе першай частцы апублікаваныя матэрыялы Наваградскай археалагічнай экспедыцыі ЛАІА[1], што былі здабытыя пры раскопках на ўзвышшы Малы Замак у 1957-1967 гг. Другая частка кнігі прысвечана пытаньням домабудаўніцтва, гісторыі рамяства і знешніх сувязяў з канца X да канца XIII стст., якія можна было паставіць і часткова вырашыць на падставе атрыманых археалагічных матэрыялаў. У кароткім заключэньні адзначалася, што заключныя высновы аб старажытнарускім Наваградку можна будзе зрабіць тады, калі дадзеныя археалогіі яго пасада-вакольнага гораду будуць дапоўнены матэрыяламі наваградскага дзяцінца, з далучэньнем пісьмовых звестак. Гэта мэта пастаўлена ў нашай цяперашняй працы. У ёй падрахоўваюцца вынікі шматгадовых археалагічных даследваньняў не толькі на тэрыторыі Наваградка, але і ў яго навакольлі.

Кампазіцыя гэтай работы адрозніваецца ад пабудовы папярэдняй. У асноўным тэксьце абагульнены ўсе археалагічныя матэрыялы, што атрыманы пры даследваньні Наваградка і яго навакольля, выкарыстаны пісьмовыя помнікі аб ім і зроблена спроба ўзнавіць гісторыю культуры гэтага заходнерускага гораду аж да канца XIII ст. Матэрыялы раскопак Замкавай гары — дзяцінца старажытнарускага Наваградка змешчаны ў дадатку да працы. Тамсама выкладзены звесткі лабараторных аналізаў наваградскіх знаходак.

У кнізе “Старажытны Наваградак” сьцісла пададзена гісторыя археалагічнага вывучэньня старажытнага гораду[2]. Спынімся на ёй больш падрабязна, уключыўшы гісторыю вывучэньня помнікаў Наваградскага навакольля.

Першыя звесткі аб курганах Наваградчыны з’явіліся ў сярэдзіне мінулага стагоддзя і звязаны з імёнамі А.І. Дзьмітрыева і К. Тышкевіча[3]. У сувязі з падрыхтоўкай да IX Археалагічнага з’езду, Н.П. Аверыюс у 1890 г. раскапаў тры курганы каля в. Маруліны, а М.А. Цыбішаў у 1892 г. даследаваў два курганы на Карэліцкім тракце паблізу гораду і яшчэ два курганы каля вёскі Гардзілоўка (тады яе называлі Гарадзілаўка)[4].

Глухія звесткі аб раскопках курганных магільнікаў паблізу Наваградка існуюць для 20-30-х гг. нашага стагоддзя, калі ён уваходзіў у склад другой Рэчыпаспалітай. Шукалі скарбы: каля вёскі Гарадзечна і, па ўсёй верагоднасьці, каля вёсак Каменка і Кашалева[5].

Славутасьцю Наваградка з'яўляецца яго Замкавая гара, на якай да сярэдзіны 20-х гг. нашага стагоддзя былі дзве каменныя вежы — Шчытоўка і Касьцельная (мал. 1)[6]. У 1906 годзе абрушылася Касьцельная вежа. Намаганьнямі мясцовага краязнаўцы Т. Карвана, яна ў 1909-1910 гг. была ўмацавана. Падчас Першай сусветнай вайны абвалілася паўднёвая сьцяна Шчытоўкі.[7] Гэта стала прычынай звароту мінскага губернатара (Наваградак уваходзіў у склад Мінскай губерні) да наваградскага гарадскога упраўленьня з просьбай вылучыць сродкі для падтрыманьня "редкого памятника истории прошлого"[8]. Аднак, Замкавую гару ўзялі пад ахову толькі ў 1922 г. Тады ж была эскарпіравана Касьцельная вежа[9].

Значныя работы па рэстаўрацыі і кансервацыі наваградскай Замкавай гары былі праведзены польскімі даследчыкамі-рэстаўратарамі пад кіраўніцтвам С. Лорэнца і Ю. Рэмера. Вынікі гэтых работ каротка прадстаўлены ў кнізе аб пасадзе-вакольным горадзе Наваградка. Яны заслугоўваюць таго, каб спыніцца на іх больш падрабязна.

Работы па рэстаўрацыі і кансервацыі Замкавай гары пачаліся ў сувязі з тым, што на суседнім узвышшы Малы Замак, дзе пазней былі адкрыты рэшткі пасада-вакольнага гораду старажытнага Наваградка, пачалі насыпаць памятны курган Адаму Міцкевічу. Зямлю для яго бралі з пляцоўкі Замкавай гары, што была ў XIX стаг. месцам гарадской звалкі. Пры зямляных работах на Замкавай гары былі адкрыты раней невядомыя помнікі манументальнага дойлідства. У паўднёвай частцы пляцоўкі гэта мураваная Брамная вежа, арганічна звязаная з адкрытай каменнай сьцяной, што атачае пляцоўку. На паўднёвым схіле Замкавай гары знаходзіліся рэшткі Калодзезнай вежы, што прыкрывала праход да вады. З замкам яе звязвала сьцяна. У паўночна-заходняй частцы пляцоўкі адкрыліся рэшткі Вуглавой вежы.

У выніку зямляных работ паміж Шчытоўкай і Касьцельнай вежай былі расчышчаны камяні фундаменту палаца, які архітэктары датавалі канцом XVI альбо пачаткам XVII стст. На паўднёвы захад ад Шчытоўкі знаходзіўся развал царквы і руіны касьцёлу XVII ст., аб якім вядома, што ён яшчэ ў 1850 г. стаяў без даху.

У выніку даследваньня Шчытоўкі былі адкрыты рэшткі больш раньняй вежы, якая пабудавана, па мяркаваньню даследчыкаў, адначасова з царквой. Знайдзеныя абвугленыя бярвеньні дазволілі прыйсьці да высновы, што першапачаткова Замкавая гара мела драўляную сьцяну і адну вежу.

Польскія архітэктары рэстаўравалі Касьцельную вежу, па

сутнасьці, пераклаўшы яе нанова і ўмацавалі абарончую каменную сьцяну, вышыня якой складае 2,40 м.

Па краях і ў цэнтры пляцоўкі былі закладзены шэсьць траншэй і выяўлена наступная стратыграфія: на глыбіню да 1,90 м. прасочваўся глініста-пяшчаны слой з развалам цэглы. Пад ім адзначана цёмная зямля з невялікім развалам цэглы, а яшчэ ніжэй (на глыбіні да 3,20 м.) ляжала шэрая зямля з рэшткамі гарэлага і гнілога дрэва. Знаходкі манетаў і каменных ядраў прывялі даследыкаў да заключэньня, што ў гісторыі Замкавай гары вылучаюцца два этапы, першы з якіх адносіцца да першай паловы XV стаг., а другі да пачатку XVI стаг.[10]

Работы польскіх архітэктараў-рэстаўратараў заслугоўваюць самай высокай адзнакі. Дзякуючы іх працы Замкавая гара Наваградка выглядае як магутнае шматвежавае абарончае збудаваньне, а кансервацыя вежаў і сьцяны захавала іх ад делейшага разбурэньня. Разам з тым гэтыя даследваньні давалі ўяўленьне толькі аб Замку позняга Сярэднявечча. Ніякіх дадзеных аб больш раньнім існаваньні гэтага помніка не было зафіксавана.

У 1956 г. у Навагрaдку пачала працаваць археалагічная экспедыцыя ЛАІА (на той час — Ленінградскага аддзяленьня Інстітута гісторыі матэрыяльнай культуры). На тэрыторыі Замкавай гары была зачышчана сьцяна ямы, што знаходзілася на 10 м. на поўдзень ад камянёў фундаменту палаца. Зачыстка выявіла такую ж стратыграфію, якая была зафіксавана спецыялістамі з Польшчы. Калі ж на глыбіні 3 м. паказаліся негарэлыя дошкі, сярод якіх знаходзіліся кераміка, сякера і іншыя рэаліі XII-XIII стст., можна было з упэўненасьцю сьцвярджаць, што на Замкавай гары існавала пасяленьне гэтага часу. Тады ж быў адкрыты культурны слой на ўзвышшы Малы Замак[11]. Вынікі гэтых раскопак вакладзены ў кнізе “Старажытны Навагрaдак”.

У 1959 г. на Замкавай гары, паблізу Брамнай вежы, быў закладзены раскоп плошчай 24 кв. м. Культурны слой магутнасьцю да 5 м. быў даследваны толькі ў 1962 г. Па меры паглыбленьня раскоп паступова скарачаўся і на ўзроўні мацерыка работы выконвалі на вельмі абмежаванай плошчы. Тым не менш, на матэрыяле гэтага раскопа падцвердзілася заключэньне, што зрабілі пры зачыстцы сьценкі ямы ў 1956 г. Рэшткі будаўніцтва і знаходкі рэчаў сведчылі на карысьць таго, што тут існавала пасяленьне старажытнарускага часу[12].

Сістэматычныя раскопкі на Замкавай гары пачаліся ў 1968 г. Раскоп плошчай 320 кв. м. быў закладзены ў 20 м. на захад ад Шчытоўкі. Паўднёва-Заходнюю частку раскопа займалі руіны познесярэдневяковых манументальных помнікаў, у тым ліку царквы. Гэта вымусіла прырэзаць да раскопу яшчэ 104 кв. м., у

выніку чаго ён шчыльна прыдвінуўся да валу і яго каменнай сьцяны.

Даследваньні гэтага паўночнага раскопу працягвалася да 1973 г. Падчас работ прыходзілася прыразаць асобныя кавалкі. У выніку, там была раскапана тэрыторыя плошчай 1250 кв. м., з якіх 850 кв. м. займалі рэшткі архітэктурных збудаваньняў познесярэдневяковага гораду[13].

У 1974 г. у паўднёвай частцы пляцоўкі, у 20 м. на ўсход ад раскопаў 1959 і 1962 гг. быў заложаны раскоп плошчай 140 кв. м., даследваньне якога закончылася ў 1977 г. Культурны слой старажытнарускага часу там быў разбураны позняй забудовай. Яго існаваньне падцвярджалася знаходкамі масавай керамікі, абломкамі амфар, фрагментамі шкляных бранзалетаў і іншымі характэрнымі рэчамі[14].

Пасля значнага перапынку, работа Навагрaдскай экспедыцыі аднавілася ў 1983 г. сумесна з Аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР, пры ўдзеле беларускага археолага Л.Г. Панічавай. Побач з раскопамі 1974 і 1977 гг. быў закладзены раскоп плошчай 100 кв. м. Старажытнарускі слой гэтага раскопу даследваўся пад кіраўніцтвам аўтара у 1984-1985 гг.[15]

Акрамя нашых работ, на тэрыторыі Замкавай гары Навагрaдка працавалі і іншыя даследчыкі-археолагі; яны вывучалі абарончыя збудаваньні і помнікі манументальнага дойлідства. У 1959 г. П.А. Рапапорт прарэзаў вал у паўночнай частцы пляцоўкі, [16] а ў 1969-1970 гг. М.А. Ткачоў даследаваў абарончыя збудаваньні, істотна дапоўніўшы назіраньні польскіх архітэктараў[17]. У пачатку 70-х гадоў са складу Навагрaдскай экспедыцыі вылучыўся архітэктурны атрад пад кіраўніцтвам М.У. Малеўскай. Гэты атрад раскапаў рэшткі царквы XIV ст. і храма XVII ст. Надзвычай цікавыя рэшткі грамадзянскай пабудовы другой паловы XIV ст. — адзінае для гэтага часу манументальнае жыльлё феадала на тэрыторыі Беларусі[18].

На тэрыторыі Навагрaдка даследваньні праводзіліся таксама на ўзвышшы, што прыляжыць да Малага Замка з паўднёвага захаду. Тут у 1961, 1962 і 1965 гг. М.К. Каргер адкрыў і раскапаў рэшткі старажытнарускага храма, якія знаходіліся пад царквой Баріса і Глеба, пабудаванай у XVI ст.[19]

За гады, пакуль праводзілася даследваньне Навагрaдка, выяўляліся і раскапваліся археалагічныя помнікі паблізу гораду[20]. Вялікая праца па вывучэньню курганаў Навагрaдскай акругі зроблена К.В. Паўлавай. З 1963 па 1972 гг. пад яе кіраўніцтвам раскапаны 75 курганоў у магільніках каля вёсак Гардзілоўка, Сялец, Мольнічы, Суляцічы і Батароўка[21].

У выніку археалагічных работ на тэрыторыі Навагрaдка была

даследвана плошча больш за 3000 кв. м. Сабраная пры гэтам калекцыя налічвае больш за 23500 нумароў керамікі і каля 11000 нумароў індывідуальных знаходак. Акрамя таго мы маем звесткі аб старажытнарускім храме і 105 пахаваньнях на хрысьціянскіх могілках, размешчаных на тэрыторыі Малага Замка, а для ваколіц гораду — матэрыяламі шэрагу паселішчаў і каля 100 курганаў[22].

Вынікі археалагічнага вывучэньня Наваградка, у святле якіх па новаму ўспрымаюцца нешматлікія пісьмовыя крыніцы аб гэтым горадзе, дазваляюць ставіць праблемы паходжаньня гісторыі гэтага помніка з канца X да канца XIII стст.[23] Матэрыялы Наваградка ва ўсіх выпадках, калі гэта магчыма, мы параўноўваем з дадзенымі іншых заходнерускіх гарадоў. Гэта спрыяе акрэсленьню таго месца, якое займаў Наваградак сярод іншых гарадоў Заходняй Русі.

Напісаньню работы аб Наваградку спрыяла праца многіх даследчыкаў. У кнізе аб пасадзе-вакольным горадзе ўспамянуты археолагі, якія кіравалі раскопамі на Малым Замку. Пры даследваньні Замкавай гары такімі былі: М.У. Малеўская, І.Д. Зільмановіч, К.В. Паўлава, Т.С. Панамарова, К.Т. Кавальская, Л.Г. Панічава і М.В. Нікалаеў. Наша праца пачалася і здзейснілася ў аддзеле славяна-фінскай археалогіі (раней — група славяна-рускай археалогіі ЛАІА). Напрацягу трох дзесяцігоддзяў аўтар карыстаўся нязменнай сяброўскай падтрымкай сваіх калег па аддзелу. Сваю працу аўтар з удзячнасьцю прысвячае ўсім, хто дапамагаў яе здзяйсненьню.

Спасылкі:

[1] Гуревич Ф.Д. Древний Новогрудок (Посад-Окольный город). Л., 1981. (далей: ДН. Спіс скарачэнняў глядзі ў канцы кнігі.)

[2] ДН. С. 4-5.

[3] ИАО. 1859. Т 1. с. 307-308; Тышкевич К. О курганах в Литве и Западной Руси. Вильно, 1865. С.61.

[4] Авериус Н.П. Заметка о раскопках в минской губернии // Труды Виленского отделения Предварительного комитета по устройству IX АС. -Вильно. - 1893. - С. 42-43; Цыбишев М.А. Раскопка в конце 1892 г. некоторых курганов близ г. Новогрудка Минской губернии // Каталог предметов, доставленных на археологическую выставку пры IX АЗ в Вильно в 1893 г. - Вильно. - 1893. - С.73-76.

[5] Поболь Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. С.126, 131, 132.

[6] Źmigrodzki J. Nowogródek i okolice. Nowogródek, 1931. S.

24; Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII ст. Мінск, 1978. С. 52.

[7] Źmigrodzki J. Op. Cit. S. 24.

[8] ИАК. 1914. Вып.56. С. 95.(Прибавления)

[9] Źmigrodzki J. Op. Cit. S. 24.

[10] Gurtler R. Roboty konserwatorske na Górze Zamkowej w Nowogródku (sprawozdanie ogolne). Ochrona zabytków sztuki, 1930-1931, S. 181-188.

[11] Гуревич Ф.Д. К истории древнего Новогрудка. Smiatowit. Warszawa, 1962, XXIV, С. 558-559,564.

[12] Зильманович И.Д. Раскопки детинца в Новогрудке в 1962 г. //КСИА. - 1965. - Вып. 104. - С. 93-98.

[13] Гуревич Ф.Д. Некоторые результаты археологического исследования детинца древнего Новогрудка // КСИА.-1974.-Вып. 139. С. 94: мал. 32.

[14] Гуревич Ф.Д., Ковальская К.Т., Николаев Н.В., Пономарева Т.С. Новогрудская экспедиция // АО 1974 года. - 1975. - С. 384-385; Гуревич Ф.Д., Николаев Н.В., Паничева. Новогрудская экспедиция // АО 1977 года. - 1978. - С. 411-412.

[15] Паничева Л.Г. Раскопки в Новогрудке // АО 1983 года. - 1985. - С. 402; Гуревич Ф.Д. Работы в Новогрудке // АО 1984 года. - 1986. - С. 340; Гуревич Ф.Д. Новогрудская экспедиция // АО 1985 года. - 1987. - С. 447.

[16] Рапапорт П.А. Военное зодчество западнорусских земель X-XIV вв. // МИА. - 1967. - Вып. 147. - С. 122.

[17] Ткачев М.А. Исследования памятников военного зодчества Белоруссии // АО 1969 года. - 1970. - С. 312; Ткачев М.А. Исследования памятников оборонного зодчества Белоруссии //АО 1970 года. - 1971. - С. 307-308.

[18] Малевская М.В., Шолохова Е.В. Раскопки культовых сооружений новогрудского детинца // АО 1973 года. - 1974. - С. 376-377; Малевская М.В. Архитектурный комплекс новогрудского детинца XIII-XIV вв. // ДГС. - С. 122.

[19] Каргер М.К. Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке. // КСИА. - 1977. - Вып. 150. - С. 79-85.

[20] Гуревич Ф.Д. Древности Белорусского Понеманьня. М., 1962. С. 179, 184-186, 194-195, 203, 204; Шаблюк В.В. Исследования в Белорусском Понеманьне. // АО 1983 года. - 1085. - С. 413.

[21] Павлова К.В. Погребальные памятники окрестностей Новогрудка // КСИА. - 1981. - Вып. 166. - С. 78-83.

[22] У апрацоўцы разнастайных матэрыялаў Наваградскай экспедыцыі вялікую дапамогу аказалі прадстаўнікі дакладных і прародазнаўчых навук, а таксама археолагі, якія спецыяльна

займаліся даследваннем пэўных катэгорый рэчаў. Гэта - М.У. Малеўская (кераміка), В.А. Галібін і Д.В. Наумаў (каляровыя металы, шкло), Г.А. Вознесенская і Л.С. Хомутова (жалезныя вырабы), Ю.Л. Шчапава (шкло), Е.І. Оятева (скураныя рэчы), І.Л. Ногід і Н.Б. Селіванова (кераміка, вырабы з камяню, растворы, фрэскі), Н.А. Кірьянава, В.А. Калеснікаў і М.М. Якубцінер (сельскагаспадарчыя культуры), Н.М. Ермолава і В.И. Цалкін (косці жывелы, птушак і рыб), Л.М. Казей і І.І. Салівон (антрапалагічныя матэрыялы). Аўтар сардэчна ўдзячны гэтым спецыялістам, праца якіх дазволіла даць больш поўную атрыбуцыю старажытнасцям Наваградка.

[23] Ілюстрацыі прадстаўлены матэрыяламі, якія атрыманы пры раскопках Замкавай гары і тымі старажытнасцямі Малага Замка, якія не былі ўключаны ў раней выдадзеную кнігу.

Глава 1.
Пісьмовыя крыніцы і іх атрыбуцыя ў працах гісторыкаў

У Іпацеўскім летапісе пад 1235 г. успамінаецца Ізяслаў Новгородский “Па том же лете Даниил возведе на Кондрата Литву Миндовга, Ізяслава новгарадского”[1]. У 30-я гады XIII ст. польскі князь Конрад Мазавецкі спрабаваў заключыць саюз з крыжакамі, каб абараніць сябе ад Валыні і Літвы, а ў стане Данііла быў наваградскі правіцель Ізяслаў, імя якога ў летапісе больш не сустракаецца.

Галоўныя пісьмовыя сведчаньні аб Наваградку (Новгородок, Новгород, Новый город) змяшчаюцца ў Галіцка-Валынскім летапісу, які захаваўся ў выглядзе асобнай часткі Іпацеўскага і паведамляе аб падзеях 1238-1292 гг. Гэта важнейшая крыніца па гісторыі Заходняй і Паўднёва-Заходняй Русі, як паказалі яго даследчыкі, у сваёй першай частцы была напісана па заказу Данііла Галіцкага, верагодна, у г. Холм, а ў пазнейшы час атрымаў дапаўненьні і перарабляўся пры яго браце Васільку Раманавічу[2].

Першыя ўспаміны аб Наваградку адносяцца да паходаў Данііла ў Панямоньне. Пад 1252 г. паведамляецца, што “Данила же и Василко поидоста к Новоугораду”. Адначасова валынскія князі заваявалі і іншыя гарады гэтай зямлі — Ваўкавыск і Слонім, а таксама Здзітаў. Вартая ўвагі фраза, якой заканчваюцца звесткі аб гэтым паходзе: “и поимаше грады многы и звратиша у домы”[3].

Заваяваньне гарадоў Панямоньня было не трывалае, бо ўжо пад наступным 1253 г. летапісец паведамляе аб новым паходзе Данііла. У ім, акрамя Васількa, удзельнічалі сын Данііла Леў, сват Цягак “з половци” і пінскія князі. Кампанія апісана вельмі выразна. Раць валынскіх князёў дайшоўшы да ракі Шчары — прытока Нёмана, не захацела рухацца далей. Данііlу прыйшлося прыкласьці шмат намаганьняў, каб закончыць паход. “Мудростью речи створи” гаворыцца ў летапісу аб князі “яко срамоту имяешь от Литвы и всех земель, аще не дойдем и вратим”. Паход быў закончаны і яго заканчэньне адзначана наступнымі словамі: “наутрея же плениша всю землю Новгарадскую”[4].

Трэці паход на Наваградак таксама праходзіў пад главенствам князя Данііла. Ён вядомы пад 1255 г.: “Даниил же пошедшоу на воину, на Литву, на Новъгородок”.[5]

Дзеяньні Данііла па авалоданьню Наваградкам, якія праявіліся ў паходах 1252, 1253 і 1255 гг. павінны былі адлучыць цэнтр Наваградскай зямлі ад Літвы, якая ў асобе князя Міндоўга, пранікла туды некалькі раней. Ваеннымі сродкамі гэтага не ўдалася дасягнуць і ў той жа год, калі адбыўся трэці паход на Наваградак, паведамляецца аб мірных дагаворах Літвы і Валыні. Міндоўг, праз пасрэдніцтва свайго сына Войшалка выдае сваю дачку замуж за Шварна — сына Данііла, а Войшалк ад імя Міндоўга перадае Наваградак яшчэ аднаму з сыноў Данііла Раману, а ад сябе “Восляным и Волковыеск”[6]. Перадачу Наваградка Раману праз Войшалка летапісец другі раз адзначае пад 1257 г.[7]

Сеўшы ў Наваградку, Раман, па прозьбе бацькі, прыходзіць да яго на дапамогу для барацьбы з яцьвягамі. “И посла по Романа в Новъгарадок и приде к немоу Роман со всими Новогродци”[8]. Аб залежнасьці Рамана, князя Наваградскага ад Міндоўга, можна гаварыць на падставе яго слоў да Данііла: “И прислаша Миндовг к Данилу пришлю к табедзьве Романа и Новгородце абы пошел ко Возвяглю отоуда и к Кіеву”[9].

Пасля забойства Міндоўга (пад 1262 г.) “Войшчулк нача княжити у Новегороде”. Маецца даволі вялікае апісаньне таго, як гэты князь язычнік прымае хрысьціянства ў Наваградку “и крестися тут у Новегородцы” і яго актыўных дзеяньнях як неафіта[10]. Праз год Войшалк “поиде с Линяны к Новоугородоу а оттоле поя з собой новгородце и поиде у Литвоу княжить”[11].

Пад 1268 г. летапісец паведамляе, што у Наваградку правіць Шварн. “Тогда же Шварнови соущи у Новегороде”. Адтуль “вборзе” князь ідзе на Валынь дапамагаць сваім сваякам у барацьбе супраць Польшчы[12].

Адзін з апошніх і самых яркіх успамінаў аб Наваградку захаваўся пад 1274 г. Валынскі князь Леў — сын Данііла, збіраючыся ў паход на Наваградак, просіць дапамогі ў татарскага хана Менгіцімура і апошні дае войска на чале з Ягурчынам. У валынскай раці было шмат і рускіх князёў. Летапісец адзначае ваяводу Задняпроўскага, Рамана дабранскага з сынам Алегам, Глеба, князя Смаленскага, “иных князи много тогда бо бяхоу, вси князи у воли у Тотарской. И тако поидоша вси вборзе к Новоугородку”. Аб’яднане войска прыбыло ў Панямоньне. Начлег быў на рацэ Сервеч — прытоку Нёмана. На досвітку “начаша изряживать полкы и тако идоша к городу”. Зправа ішлі татары са сваім палком, побач з імі Леў са сваім палком, а злева князь Уладзімір са сваім палком. “І тако придоша к городу и сташа около его”. Паход был зімой і з наваградскіх узгоркаў падымаўся пар ад бягучай вады. Леў абхітрыў саюзнікаў “взя окольны град

ни з татары, а детинец остася". Гэта выклікала гнеў астатніх князёў, якія лічылі "токо оже бы им вземше Новъгородок также потом пойти у землю Литовскую, але не идоша гневом про Льва и тако возвратишася во свояси тако же от Новогородка"[13].

Праз тры гады да валынскіх князёў даходзяць звесті, што горад зваявалі татары. "Мьстислав, Володимир, Юрьи тако рекоушче "оже поидем к Новоугородку, а там оуже татарове извоевали все"[14].

Весткай ад 1277 г. заканчваюцца пісьмовыя сведчаньні, якія бясспрэчна датычаць старажытнага Наваградка, і якія зафіксаваныя Галіцка-Валынскім летапісам. Звесткі аб "новгородцах", якія аплаквалі разам з немцамі, суражанамі і іншымі смерць князя Ўладзіміра Васільевіча,[15] маглі і не адносіцца да жыхароў нашага гораду.

Запісы ў Галіцка-Валынскім летапісе аб Наваградку паведамляюць аб падзеях гісторыі гораду на працягу чвэрці XIII стагоддзя (1252-1277 гг.) і прысвечаны памкненьням Валыні і Літвы ваеннымі і мірнымі сродкамі авалодаць гэтым горадам. Расказ аб хрышчэньні язычніка Войшалка ў Наваградку таксама паказвае яго жаданьне замацавацца ў хрысьціянскім горадзе.

Сведчаньні Галіцка-Валынскага летапісу аб Наваградку не асабліва абільныя. Ён успамянуты 11 разоў, але пры ўсшм гэта наібольш каштоўная крыніца аб старажытным Наваградку, да якой прыйдзецца неаднаразова вяртацца.

З больш позніх сведчаньняў, якія прадстаўляюць цікавасьць для ўзнаўленьня гісторыі старажытнага Наваградка, заслугоўвае ўвагі ўпамінаньне ў "Спісе гарадоў бліжніх і дальніх" — помніку XIV стагоддзя, дзе ён успамянуты ў ліку літоўскіх гарадоў[16]. Пётр Дюсбург — крыжацкі святар, піша што ў 1314 г. магістр Генрых фон Плоцке аблажыў і спрабаваў узяць горад Ногардзію, які знаходзіцца ў краіне крывічоў[17]. Цікавае пасланьне князя Гедыміна, які ў 1323 г. запрашае на Літву жыхароў Любека, Штральзенда і іншых нямецкіх гарадоў. Абяцаючы ім свабоду веравызнаньня, князь паведамляе, што ён пабудаваў храмы Ордэну мінарытаў у Вільні і Наваградку[18].

Не пазбаўлены цікавасьці звесткі аб старажытным Наваградку, прыведзеныя ў познім летапісаньні і ў польскага храніста Мацея Стрыйкоўскага (XVI ст.). Гэтыя помнікі, канечне не могуць быць крыніцай для зацікавіўшага нас часу, але ў іх маглі захавацца водгукі старадаўніх падзей, якімі можна карыстацца пры крытычных да іх адносінах.

У адным з заходнерускіх летапісаў XVI ст. паведамляецца аб міфічным князі, які са сваім войскам " ...перешли реку Немон и нашли у четырех милях от реки Немна гору красноую и

сподобалася им и вчинили у ней горад и назвали Новгарадок и вчинил себе князь великий у нем столець и назывался князем великим Новгородским”[19].

Прыкладна такімі самымі фразамі апісвае падзеі М. Стрыйкоўскі: “І так пераправіліся праз Нёман і знайшлі ў чатырох мілях гору красную і высокую, на якой знаходзіўся першы сталічны горад рускага княства Наваградак, што разбураны царом Батыям. Там Эрдзівіл залажыў сваю сталіцу... І без праліцьця крыві (небыло каму абараняць) заняў большую частку рускай зямлі, пачаў называцца Вялікім князям Наваградскім”[20].

З абодвух апісаньняў відавочна, што гутарка ідзе менавіта аб Наваградку, які ляжыць ў 28 км. ад Нёмана (чатыры мілі) і размешчаны на высокіх узгорках. Несумненна таксама, што горад па сваім значэньні вылучаўся сярод іншых гарадоў Панямоньня, што вынікала і са сведчаньняў Галіцка-Валынскага летапісу.

У Густынскім летапісе (XVII ст.), у першай частцы якога маецца шмат запазычаньняў з Іпацеўскага летапісу пад 1252 г. паведамляецца: “В то же лето великий князь Литовскій Миндовг коронован бысть на кролевство Литовское в Новогрудку за благословеніем папы Іннокентія през Генрика бискупа Хелмского, у Прусех кардинала Папежского”[21].

Прадстаўленьні аб пісьмовых крыніцах, з якімі некаторыя вучоныя звязвалі Наваградак былі б не поўныя, калі не ўспомніць IV Ноўгародскі і Сафійскі летапісы, у якіх пад 1044 г. гаворыцца: “Ходи Ярослав на Литву, а на весну заложі Новгород и сделал и”[22].

Пісьмовыя звесткі аб Наваградку выкарыстоўвалі рускія даследчыкі як у агульных працах па гісторыі Расіі, так і ў спецыяльных работах аб заходнерускіх землях. Гэта быў галоўным чынам выклад летапісных і іншых дадзеных, радзей аналіз і высновы, што зробленыя на падставе іх вывучэньня.

Ацэньваючы звесткі летапісаў аб заснаваньні Яраславам Ноўгараду ў 40-я гг. XI ст., першы рускі гісторык В.Н. Таціщчаў піша: “Сіе, разумеетца о литовском Новгородке, але паче мнитца о Северском ибо от сего часу о нем упоминаться началось”[23]. У Таціщчава ёсьць сумнеў адносна расказа Стрыйкоўскага аб тым, што Наваградак быў заснаваны на месцы разбуранага Батыям гораду, і ён піша: “Батый не токмо в Литве, но и у Смоленска не был”[24].

Асобныя сведчаньні аб Наваградку прыведзены ў капітальнай працы Н.М. Карамзіна. “Кім быў пабудаваны Наваградак - задает пытаньне аўтар - мы не ведаем. Верагодна Расіянамі”[25].

У 80-90-х гг. мінулага стагоддзя з’яўляецца шэраг прац, у якіх адлюстравана гісторыя заходнерускіх земляў. У іх, як правіла,

выкарыстоўваліся крыніцы па гісторыі Навагрудка. Некаторыя з іх ацэньваліся крытычна. Так Н.П. Барсаў і В.Б. Антановіч не бачылі ў звестках IV ноўгарадскага і Сафійскага летапісаў за Ноўгарадам Навагрудка[26]. Антановіч знаходзіў у заходнерускіх летапісах кампілятарскія прыёмы, але верыў у праўдзівасьць сведчаньня Густынскага летапісу аб вянчаньні Міндоўга ў Навагрудку ў 1252 г.[27] З гэтым сведчаньнем згодны П.М. Бацюшкаў і П.Д. Бранцаў[28]. Па заключэньню вядомага гісторыка М.К. Любаўскага, Навагрудак становіцца галоўным горадам Чорнай Русі і постаянным месцам перабываньня Міндоўга[29].

Пытаньне аб тым, дзе знаходзілася першая сталіца Літвы працягвала займаць гісторыкаў і ў пазнейшы час. У 1910 г., калі У.І. Пічэта пісаў, што гэта быў Навагрудак,[30] прафесар Пецярбургскага універсітета Э.А. Вольтэр лічыў, што яе трэба шукаць у карэннай Летуве[31].

Сярод даследваняў савецкіх гісторыкаў адзначым мяркаваньні М.Н. Ціхаміра, які адносіў узнікненьне Навагрудка да 1212 г. Пад гэтым годам аўтар прыводзіць паведамленьне Іпацеўскага летапісу, у якім паведамляецца: “Лесьтка же сжаліся аб срамоте своей і послау к Новоугораду па Мстіслава і рекі “брать мі есі поіді і сяді у Галіче”.[32] Аднак, падзеі, аб якіх гаворыцца ў летапісу адбываюцца ў галіцкай зямлі і гутарка, верагодна, ідзе аб якімсьці іншым Ноўгарадзе.

Сур’ёзны аналіз пісьмовых крыніц аб Навагрудку робіць У.Ц. Пашута, які разгледзеў іх у сувязі з іншымі сведчаньнямі аб Чорнай Русі і яе гарадах. Аўтар адзначае, што Ноўгарад IV Наўгародскага летапісу нельга атаесамляць з Навагрудкам. Цікавыя дапушчэньні гісторыка аб тым, што звесткі пра Міндоўга і іншых літоўскіх князях маглі знаходзіцца ў асобым летапісе, які напісаны ў адным з праваслаўных монастыроў Панямоньня, магчыма, у тым, які заснаваў князь Войшалк у Навагрудскай зямлі.[33]

У 1972 г. выйшаў у свет артыкул беларускага гісторыка М.І. Ермаловіча аб гісторыі раньняга Навагрудка, у якім аўтар адраджае адмоўленае ў літаратуры мяркаваньне аб ідэнтычнасьці “Новгорода” IV Наўгародскага і Сафійскага летапісаў і Навагрудка. Ермаловіч лічыць, што Яраслаў Мудры заснаваў там горад для барацьбы з Літвой[34].

Каб умацаваць свае погляды аўтар перамяшчае летапісную Літву з той тэрыторыі, якую яна займала ва Ўсходняй частцы Літоўскай ССР да непасрэднага суседства з Навагрудкам. “Літва” рускага летапісу, як мяркуе Ермаловіч, жыла на тэрыторыі, абмежаванай з усходу на захад Мінскам і Навагрудкам, а з поўначы на поўдзень — Маладзечнам і Ляхавічамі. Перасяленьне

“Літвы” не падмацоўваецца ніякім археалагічным матэрыялам. Толькі ў адным выпадку, акрэсліваючы граніцу літоўска-рускага памежжа, аўтар адзначае, што лінія тапонімаў супадае з паўднёвай мяжай культуры штрыхаванай керамікі, г.зн. з мяжай рассяленьня балтаў, да якіх належала і “Літва”[35]. Інакш кажучы, для падзей XI стагоддзя Ермаловіч карыстаецца дадзенымі, датычнымі да першай паловы 1 тысячагоддзя н.э.

Каб даказаць, што летапісная “Літва” жыла пад Наваградкам, аўтар спрабуе выкарыстоўваць летапісныя дадзеныя аб паходах на яе[36]. Аднак сведчаньні, на якія ён спасылаецца, адлюстроўваюць накірункі гэтых паходаў. Тэрыторыя, што занята “Літвой” рускага летапісу знаходзіцца не вельмі далёка ад Наваградка, але не па суседству з ім. Гэта відавочна, па словах летапісца аб Войшалку, які пад 1263 г., сабраўшы пінян прыйшоў у Наваградак, “а оттоле, поя з собой новгородце и поиде в Литвоу княжить”[37].

Цяжка пагадзіцца са сьцвярджэньнем Ермаловіча, што тапонім “Літва”, які сустракаецца ў Верхнім Панямоньні, паказвае на пражываньне там усёй народнасьці[38]. На нашу думку гэта сведчыць аб тым, што асобныя групы балтыйскага насельніцтва, якія там жылі, адрозніваліся ад карэнных жыхароў гэтай зямлі.

Ермаловіч перасяліў “Літву” 40-х гадоў XI ст. на славянскую тэрыторыю. Тут знаходзіўся старажытны Ізяслаўль, аб якім “Повесть временных лет” успамінае пад канцом X ст. Пад горадам знаходіўся вялікі магільнік (344 курганы), пераважна крывіцкі[39]. В.В. Сядоў паказвае, што тэрыторыя, адведзеная Ермаловічам “Літве” — гэта славянская зямля, заселеная дрыгавічамі, аб чым сведчаць іх паселішчы і пахавальныя помнікі[40]. Што датычыць зямляў, сапраўды занятых “Літвой”, то яны добра акрэсліваюцца па археалагічных матэрыялах усходняй часткі Літоўскай ССР. Даследчыкі А.З. Таўтавічус і Р.К. Валкайтэ-Кулікаўскене паказалі неперарыўнае засяленьне дадзенай тэрыторыі балтыйскім насельніцтвам, пачынаючы з першых стагоддзяў н.э. да сярэднявечча і аднароднасьць яго матэрыяльнай культуры з культурай латгалаў, земгалаў і іншых балтыйскіх плямёнаў[41]. Гэта заключэньне добра стасуецца са словамі летапісу аб плямёнах, што жылі па суседству з Русьсю, сярод якіх былі “Литва, Зимегола, Корсь и Летьгола”.[42]

Наваградак нельга разглядыць як горад, што заснаваны ў 40-я гг. XI ст. для барацьбы з Літвой яшчэ і таму, што ў гэты час, як паказалі археалагічныя работы, ён складаўся з неўмацаваных паселішчаў, у якіх амаль не было зброі. У пару сваёй раньняй гісторыі Наваградак не быў баявой крэпасьцю[43]. Сьціплыя паселішчы, якія яго складалі, не маглі быць вядомыя аўтарам

Наўгародскага і Сафійскага летапісаў, якія жылі далёка ад Панямоньня.

Ермаловіч піша, што Ноўгарад XI ст., закладзены ў 1044 г. суадносіў з Наваградкам В.М. Таціщчаў[44]. Як было паказана вышэй, Таціщчаў схіляўся да думкі, што пад гэтым горадам трэба бачыць Ноўгарад Северскі. Словы Таціщчава аб падзеях 1119 г. “Глеб Минский князь з полочаны паки начал воевать области Владимировых детей Новгородскую и Смоленскую”[45] беларускі гісторык трактуе такім чынам, што пад Наўгародскай зямлёй бачыць зямлю Наваградка[46]. Тая акалічнасьць, што Наўгародская зямля разглядаецца побач са Смаленскай, сведчыць аб тым, што пад землямі Уладзіміравых дзяцей меліся на ўвазе вялікія тэрыторыі і, у першую чаргу, уладаньні Ноўгарада Вялікага.

Разгледзім яшчэ адно сведчаньне Таціщчава, якое Ермаловіч спрабуе звязаць з гісторыяй Наваградка. У “Гісторыі Расійскай” пад 1130 г. напісана: “Великий князь Мстислав ходил з войском на Литву и разоря многие жылисча со многим полоном возвратился у Новгарад и заложил у пирагосчи царква святые Богарадице. А оттуда прышел у Киев”[47]. На думку Ермаловіча, гутарка тут ідзе аб Наваградку, а царква, аб якой піша Таціщчаў, гэта, па ўсёй верагоднасьці, храм, рэшткі якога былі адкрыты і даследваны М.К. Каргерам[48]. Словы Таціщчава, датычныя апісаных падзей таксама да Наваградка дачыненьня не маюць. У тэкст гісторыка трапіла памылка. Царква Багародзіцы Пірагошчай была пабудавана не ў Ноўгарадзе, а ў Кіеве. “В се же лето (пад 1132 г. Ф.Г.) заложена бы црква камяна святая Богородица, рекомая Пирагоща”[49]. Раскопкі гэтага храма рабілі ў Кіеве ў 1976-1979 гг.[50]

Як можна пераканацца, крыніцы не падцвярждаюць імкненьне М.І. Ермаловіча знайсьці ўспамінаньне аб Наваградку ў летапісах, калі гутарка ідзе аб падзеях XI і XII ст. Мы падрабязна разабралі артыкул беларускага гісторыка таму, што гэта адна з нешматлікіх работ, прысвечаных гісторыі цікавага нам гораду. Да таго ж, у пачатку 70-х гадоў, калі быў надрукаваны дадзены артыкул, назбіраўся немалы археалагічны матэрыял па Наваградку і яго рэгіёну, які Ермаловіч не выкарыстаў.

Даўняя тэма аб месцазнаходжаньні першай літоўскай сталіцы не знікла і ў савецкай літаратуры, але стала прадметам зацікаўленьня літоўскіх гісторыкаў і археолагаў, якія лакалізуюць гэту сталіцу на тэрыторыі Літвы[51]. Пісьмовыя сведчаньні аб Наваградку не абышла сваёй увагай польская гістарычная навука. У 1759 г. у Львове выйшла кніга І. Пазоўскага, у якой па лацінску былі выкладзены звесткі аб гэтам горадзе, узятыя з хронікі

Стрыйкоўскага і таксама гісторыка XVII В. А. Каяловіча, які таксама абапіраўся на дадзеныя польскага храніста[52].

Гісторык і публіцыст Т. Нарбут, які выдаваў у 30-я гады XIX ст. шматтамовую гісторыю Літвы, для гісторыі Наваградка карыстаўся звесткамі Галіцка-Валынскага летапісу, мяркуючы, што менавіта ў Наваградку была рэзідэнцыя Міндоўга[53].

Сярод работ польскіх гісторыкаў, у якіх трактуюцца пісьмовыя звесткі аб Наваградку, заслугоўвае ўвагі даследваньне І. Ляткоўскага. Высока ацэньваючы Галіцка-Валынскі летапіс, ён лічыў летапіс Быхаўца, якім карысталіся многія даследчыкі “блытаным і памылковым”. Ляткоўскі імкнуўся адлучыць праўдзівых літоўскіх князёў ад міфічных, да якіх ён, у прыватнасьці, залічаў князя Рынгольда, якога лічаць бацькам Міндоўга. На думку аўтара, Наваградак быў адзін з важнейшых гарадоў Міндоўга, але нельга сабе ўявіць каб тут у 1252 г. праходзіла вянчаньне князя, таму што пад гэтым годам адзначаецца паход князя Данііла на гарады Панямоньня. Відавочна дадзенае дзейства праходзіла ў Літве, у Варуце, якая была резідэнцыяй Міндоўга[54].

Работа Ляткоўскага, які рэзонна адмовіў Наваградак як сталіцу Літвы пры Міндоўгу, зрабіла ўплыў на наступныя працы польскіх гісторыкаў, хаця часам, як гэта мела месца ў працы А. Прахаскі, і ў больш позні час, Наваградак аб’яўляўся месцам каранацыі Міндоўга[55]. Пошукі сталіцы Літвы працягваліся. У. Кентржынскі прапанаваў лічыць за яе ўмацаваньні Уруты ў басейне ракі Дубісы (прыток Нёмана)[56]. Называлі Кернаў і іншыя пункты.

У 1931 г. у Наваградку была надрукавана невялікая кніжка аб горадзе і яго навакольлі. У ёй прыводзіліся дадзеныя рускіх летапісаў аб легендарных правіцелях гораду. Наібольш каштоўныя ў гэтай кнізе былі звесткі аўтара, інжэнера па спецыяльнасьці, аб ахоўных работах, што праводзіліся на Замкавай гары Наваградка да 30-х гадоў нашага стагоддзя[57].

Вядомы польскі гісторык Г. Лаўмяньскі яшчэ ў 30-я гады выдаў капітальнае даследваньне па гісторыі Літвы. Пэўнае месца ў ім адзьведзена старажытнаму Наваградку. Вучоны абвяргае высновы тых даследчыкаў, якія ў Новагорадзе 40-х гадоў XI ст., адзначанага ў летапісах, бачылі Наваградак. Аўтар далучаецца да думкі Ляткоўскага аб немагчымасьці каранацыі Міндоўга ў Наваградку і прапануе шукаць сталіцу Міндоўга на ўласна літоўскай зямлі, тым больш, што ў 30-я гады XIII ст. Наваградкам кіраваў рускі князь Ізяслаў. Што датычыць гарадоў Чорнай Русі, то Лаўмяньскі лічыў іх старажавымі пунктамі, якія належалі князям Палесся, а тэрыторыю Панямоньня беднай і слаба

каланізаванай зямлёй, якая не магла даць Міндоўгу значных сродкаў[58].

Польскі гісторык-эмігрант Г. Пашкевіч лічыў Наваградак цэнтрам, з якога Літва магла рабіць набегі на Паўдзённа-Заходнюю Русь[59].

Такая, далёка не поўна прадстаўленая атрыбуцыя пісьмовых крыніц аб Наваградку, што фігуе ў гістарычнай літаратуры на працяг амаль стагоддзя. З-за абмежаванасьці пісьмовых дадзеных, думкі гісторыкаў засяродзіліся, галоўным чынам, на праблемах адпаведнасьці Наваградка і гораду 40-х гадоў XI ст., што ўспамянуты ў летапісах — ці з'яўляецца ён першай літоўскай сталіцай. У рэшце рэшт на абодва пытаньні быў дадзены адмоўны адказ.

Сапраўднае значэньне Наваградка стала ясным у выніку шматгадовых археалагічных работ, якія праводзіліся на яго тэрыторыі і ў наваколі гораду.

Спасылкі:

[1] ПСРЛ. М., 1962. Т.11, С. 776.

[2] Черепин Л.В. Летописец Даниила Галицкого // Исторические записки. - 1941. - Вып. 12. - С. 232-252; Пашуто В.Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. М., 1950. С. 113-121; Пашуто В.Т. Образование Литовского государства. М., 1959. С. 18-43; Еремин И.П. Волынская летопись 1289-1290 гг. // Труды отдела древнерусской литературы. - 1957. - Т. XIII. - С. 102-117.С

[3] ПСРЛ. Т. 11. Стб. 816.

[4] Тамсама, стб. 818-819.

[5] Тамсама, стб. 828-829.

[6] Тамсама, стб. 830-831.

[7] Тамсама, стб. 838.

[8] Тамсама, стб. 831.

[9] Тамсама, стб. 838.

[10] Тамсама, стб 858-859.

[11] Тамсама, стб. 861.

[12] Тамсама, стб. 864-865.

[13] Тамсама, стб. 871-874.

[14] Тамсама, стб. 876-877.

[15] Тамсама, стб. 920.

[16] НПЛ. М-Л., 1950. С. 476.

[17] Scriptores Rerum Prussicarum. T.1, Leipzig, С. 180-181.

[18] Пашуто В.Т., Шталь И.В. Послания Гедемина. Вильнюс, 1966. С. 30.

[19] ПСРЛ, Т. XVII, СПб. 1907, стб. 231.

[20] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Źmódska и

wszystkiej Rusi. T.1. Warzavawa, 1846. S. 235.

[21] ПСРЛ. Т.11, СПб. Стб. 342.

[22] Софийская летапись. Л., 1925. Вып. 1. С. 129; Новгородская IV летопись. Петроград, 1915. Вып. 1. С. 116.

[23] Татищев В.Н. История Российская. М-Л., 1963. Т. 11. С. 79, 243.

[24] Татищев В.Н. Op. cit. М-Л., 1964. Т.11. С. 268.

[25] Карамзин Н.М. История государства Российского. СПб, 1842. Т. IV. С. 39, 51,52, 76.

[26] Барсов Н.П. Очерки русской исторической географии. Варшава, 1885. С. 40; Антонович В.Б. Монографии по истории Западной и Юго-Западной Руси. Киев, 1885. Т. 1. С. 11.

[27] Антонович В.Б. Op. cit. С. 14-15,31.

[28] Батюшков П.Н. Белоруссия и Литва. СПб, 1890. С. 57-60; Брянцев П.Д. Очерк истории древней Литвы и Западной России. Вильно, 1891. С. 16.

[29] Любавский М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого литовского статута. М., 1893. С. 3. Аб назве “Чорная Русь” гл.. ДН, С. 3-4.

[30] Пичета В.И. Литовско-русское государство // Русская история в очерках и статьях. - М. - 1910. - Т. 2. - С. 341.

[31] Вольтер Э.А. Где искать Летовию XIII в.? // ИОРЯС. - 1910. - Вып. 3. - С. 95-103.

[32] ПСРЛ. Т. 11, стб. 731; Тихомиров М.Н. Древнерусские города. М., 1956. С. 42.

[33] Пашуто В.Т. Образование ..., С. 11, 34-40, 42, 251-260, 367-380.

[34] Ермолович Н.И. Из истории Новогрудка (С середины XI в. до конца XIII в.) // БС. - С. 343-344.

[35] Ермаловіч М.И. Дзе была летапісная Літва? ТДКПБ. С.235.

[36] ПСРЛ. Т.11. Стб. 861.

[37] Ермаловіч М.І. Op. cit. С. 233-234.

[38] Там же, С. 234-235.

[39] Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли. Минск, 1978. С. 83; Заяц Ю.А. Курганны могильник Изяславля. ДГС, С. 36-40.

[40] Седов В.В. Восточные славяне в VI-XIII вв. М., С. 113-119.

[41] Таутавичюс А.З. Восточная Литва в первом тысячелетии н.э. Автореферат канд. Дисс. Вильнюс, 1954. С. 17; Волкайте-Куликаускене Р.К. Литва накануне образования Литовского государства // Материальная культура литовцев в IX-XIII вв. Вильнюс, 1978. С. 125.

[42] ПСРЛ. М., 1962. Т. 1. Стб. 4.

[43] Гл. : гл. 2.
[44] Ермолович Н.И. Из истории ... С. 343.
[45] Татищев В.Н. Op. cit. Т. 11. С. 133.
[46] Ермолович Н.И. Op. cit. С. 344.
[47] Татищев В.Н. Op. cit. С. 149.
[48] Ермолович Н.И. Op. cit. С. 344.
[49] ПСРЛ. Т. 11. С. 294.
[50] Рапапорт П.А. Русская архитектура X-XIII вв. // САИ. - М., - 1982. - С. 19.
[51] Батура Р.К. К вопросу о столице Литвы XIII в. // Труды АН Лит. ССР. - 1966. - Сер. А - С. 141-165; Лухтан А.Б., Ушинскас В.А. К вопросу о столице Литвы до 1323 года // ТДСД. С. 132.
[52] Pazowski J. Novogradecum... ex monumentis descriptum. Leopolis, 1759.
[53] Narbut T. Dzieje starozytne narodu Litewskiego. Wilno, 1838. T. 4. C. 100, 128, 162-163, 180-184.
[54] Latkowski J. Mendog// Rozprawy Akademii umejętnosci. Kraków, 1892. Seria 11. S. 307-406.
[55] Prochaska A. Dwie koronacye. - Przegląd Historyczny, 1, Warszawa, 1905. S. 274.
[56] Ketrzynski W. Najdawniejsza stolica litewska // Kwartanik historyczny. Lwów, 1907. XXI. S. 604-611.
[57] Źmigrodzki J. Nowogródek i okolice. Nowogródek, 1931.
[58] Lowmiański H. Studia nad poszątkami spoleczeństwa i panstwa Litewskiego. Wilna, 1932. Kn. 2. S. 109, 272, 277, 346, 352.
[59] Pazskiewicz H. The origin of Russia. London, 1954. p. 205.

Глава 2.
Аб паходжаньні Наваградка і яго раньняй гісторыі (да канца XI ст.)

Пытаньне станаўленьня старажытнарускіх гарадоў з'яўляецца прадметам ажыўленых дыскусій гісторыкаў і археолагаў і стала особным раздзелам савецкай урбаністыкі[1]. Ацэньваючы дасягненьні савецкай навукі ў вывучэньні паходжаньня старажытнарускіх гарадоў, А. В. Куза лічыў, што чарговымі задачамі даследчыкаў з'яўляецца вывучэньне працэсу станаўленьня гарадоў у розныя перыяды і на розных тэрыторыях, выяўленьне агульных заканамернасьцяў і лакальных асаблівасьцяў[2].

Аўтар дадзенай работы не аднойчы звяртаецца да праблемы ўзнікненьня Наваградка[3]. Аднак, яна такая цяжкая і шматпланавая, што прыходзіцца ізноў звяртацца да яе, абапіраючыся на новыя матэрыялы, а часам па новаму інтэрпрэтуючы раней вядомыя крыніцы.

Цяжкія пытаньні ўзнікненьня кожнага старажытнарускага гораду. У вывучэньні гісторыі паўстаньня нашага гораду існуюць дадатковыя цяжкасьці. Летапісны Новгородок уваходзіць у групу тых старажытнарускіх гарадоу (М.Н. Ціхаміраў налічвае 47 такіх цэнтраў),[4] першы ўспамін аб якіх у пісьмовных крыніцах належыць да XIII ст., г.зн. да таго часу, калі пераважная частка гарадоў Старажытнай Русі была ўжо засведчана помнікамі пісьменства. Па ўскосных дадзеных, як гаварылася ў пачатку нашай работы, аб існаваньні Наваградка можна мяркаваць па ўспамінаньню пад 1235 г. князя Ізяслава Новгородского. Непасрэдны ж успамін аб горадзе вядомы пад 1252 г. у сувязі з паходам Данііла галіцкага ў Панямоньне.

Па так познім першым успаміне аб Наваградку і іншых чорнарускіх гарадах, для зацікавіўшага нас пытаньня, можна зрабіць выснову, што да сярэдзіны XIII ст. гэта былі значныя і важныя паселішчы, якія вабілі да себе валынскіх князёў. Асабліва гэта датычыць Наваградка, які Данііл спрабаваў падпарадкаваць і год і тры гады пасля свайго першага паходу на Чорную Русь. Археалагічныя матэрыялы паказалі, што гэта было сапраўды так. Паселішчы на яго тэрыторыі з'яўляюцца ў канцы X ст., і да часу першага ўспаміну Наваградка у летапісе, гэта быў старажытнарускі горад з яркай і самабытнай культурай.

Кожны даследчык, які вывучае станаўленьне таго ці іншага

гораду прагне паказать, што ўяўляла з сябе тэрыторыя, на якой ён паўстаў. Нажаль, Навагрaдская зямля, у гэтым плане, дае вельмі мала. Археалагічныя матэрыялы першага тысячагоддзя н.э. і асабліва яго трэцяй чвэрці і IX-X стст., папярэднія ўзнікненьню Навагрaдка, вядомыя толькі па дадзеных разведачных работ. У гэтым плане Навагрaдская зямля, як і іншыя землі Беларускага Панямоньня, значна саступае другім старажытнарускім тэрыторыям.

Некаторае ўяўленьне аб старажытнасьцях гэтай зямлі, датаваных 1-м тысячагоддзем н.э., даюць матэрыялы селішча Чарэшля, што размешчана каля зліцьця ракі Беланожкі з Нёманам. На паўночнай ускраіне вёскі, ва ўрочышчы “Замэчэк” знаходзіцца пасяленьне. Раскоп плошчай 16 кв. м., закладзены нашай экспедыцыяй, меў культурны слой са штрыхованай керамікай ад рабрыстых пасудзін, абломкі шэрахаватай керамікі, паралелі якой вядомыя на паселішчах Літвы, фрагменты ляпных прафіляваных гаршкоў і патэльняў, падобных да славянскай керамікі VIII-IX стст. і старажытнарускія кружальныя гаршкі з рыфленьнем, часам ў спалучэньні з хваляй. Узноўлены гаршчок з гэтага паселішча, мае падабенства да керамікі X ст. з Навагрaдка[5]. На паселішчы Чарэшля таксама працаваў археолаг Л.Д. Побаль, які адзначае там кераміку, характэрную для позняга этапа Зарубінецкай культуры і для Банцэраўскай культуры[6].

Кераміка з Чарэшлі ў розных спалучэньнях вядомая ў розных пунктах Навагрaдскай акругі. Так штрыхаваная кераміка, фрагменты познезарубінецкіх пасудзін і посуду Банцэраўскай культуры знайдзены каля в. Талкуны. Ляпная кераміка VII-IX стст. каля вв. Агароднікі, Гарадкі, Скрундзі і інш. Такая ж кераміка ў спалучэньні з раньнекружальным посудам у паселішчах ля вв. Радагошча, Селішча, Маруліна і інш.[7]

Спынімся больш падрабязна на двух помніках, што знаходзяцца паблізу Навагрaдка. Адзін з іх, гэта гарадзішчы каля в. Байкі, 6 км. на паўночны захад ад гораду. У 1 км. ад вёскі на высокім узгорку, які не меў абарончыхых збудаваньняў, адкрыты культурны слой таўшчынёй 30 см. У ім знайдзены адзінкавыя абломкі штрыхованай керамікі. Вялікая частка знаходак належала да керамікі Банцэраўскай культуры. Тут былі абломкі цюльпанападобных пасудзін і фрагмент пасудзіны з заглажаным рабром.

Другі помнік звязаны з даследваньнямі мінулага стагоддзя. Звесткі аб ім урыўкавыя, але прадстаўляюць вялікую цікавасьць. У 1892 г. М.А. Цыбішаў адзначыў каля Карэліцкага тракту, на ўсходняй ускраіне Навагрaдка, прадаўгаватыя і круглыя курганы, з якіх ён раскапаў два прадаўгаватых. На грунце адкрытыя

кастрышчы, кальцыніраваныя косьці і абломкі посуду. У адным з курганоў, у насыпе стаялі дзевяць ляпных пасудзін, у адной з іх ляжалі чалавечыя косьці, у другой — косьці каня. У курганах знайдзены таксама: нож з тоўстым абушком, ножніцы, тачыльны камень, красала, спражка, бронзавая спіралька і бубеньчык[8]. Важнасьць гэтых матэрыялаў заключаецца ў тым, што паблізу гораду, акрамя круглых курганоў, былі падоўжаныя, несумненна больш раньнія за першыя. Набор рэчаў з жалеза і бронзы падобны да інвентара першапачатковага паселішча ў Наваградку і толькі вялікая колькасьць ляпнога посуду адрозьнівае курганны комплекс ад той керамікі, якоя характэрная для раньняга Наваградка.

Робячы спробу вызначыць склад насельніцтва на тых тэрыторыях, якія пазней назавуць Наваградчына, трэба даць этнічную атрыбуцыю наяўным археалагічным матэрыялам 1 тысячагоддзя н.э. Вышэй адзначана знайдзеная на дадзенай тэрыторыі славянская ляпная кераміка. Што ж тычыць керамікі Банцэраўскай культуры V-VII, а часам і VIII стст., то шмат хто з даследчыкаў (П.М. Трэцякоў, А.Г. Мітрафанаў, В.В. Седов), звязвае яе з балцкім насельніцтвам. Разам з тым В.В. Сядоў лічыць, што на землі, занятыя носьбітамі Банцэраўскай культуры і роднаснай ёй Тушэмлінска-Калочынскай, пачынаючы з VI ст. пранікаюць групы славянскага насельніцтва[9]. Іншага погляду трымаецца Л.Д. Побаль, які лічыць, што помнікі Банцэраўскай культуры блізкія славянскім[10].

Мяркуючы па археалагічных дадзеных, землі Наваградчыны ў другой палове і апошніх стагоддзях 1 тысячагоддзя н.э. не пуставалі. Малая колькасьць помнікаў, канечне, не адлюстроўвае сапраўднай карціны засяленьня гэтай тэрыторыі ў разгледжаны час і яшчэ раз сведчыць аб малой вывучанасьці гэтай часткі Панямоньня. У правільнасьці гэтай высновы можна пераканацца, звярнуўшыся да археалагічнай карты суседняй Слонімшчыны, дзе ў выніку актыўных і сістэматычных работ археолага В.Р. Супруна, выяўлена шмат помнікаў VI-IX стст. у басейне верхняга і сярэдняга цячэньня ракі Шчары, сярод якіх было багата старажытнарускіх паселішчаў канца 1 і пачатку II тысячагоддзяў. [11]

Позняе ўспамінаньне Наваградка ў летапісе і беднасьць археалагічных дадзеных аб наваградскай зямлі ў 1 тысячагоддзі н.э., вымушае ставіць праблему паходжаньня нашага гораду, выключна, на аснаваньні дадзеных самога гораду, яго магільніка і помнікаў Наваградскай акругі X-XI стст.

Археалагічныя работы паказалі, што з канца X і ў першай палове XI стст., былі заселены тры ўзвышшы ў паўночнай частцы сучаснага гораду. Гэта ўзвышшы — Замкавая гара і Малы Замак,

дзе сярод раньнекружальнага посуду знайдзена ляпная кераміка, а таксама некаторыя формы пацерак, у тым ліку мазаічныя пранізкі, якія датуюцца IX-X ст.[12] і ўзвышша на паўднёвы захад ад Малага Замка.

У паселішчы на Замкавай гары — самым высокім узвышшы, пад старажытным, пзней перанесеным валам быў адкрыты культурны слой з керамікай, якая з'явілася на тэрыторыі Малага Замка не раней першай паловы XI ст. Гэта акалічнасьць быццам бы дае магчымасть мяркаваць, што паселішча на Малым Замку існавала паперад паселішча Замкавай гары. Разам з тым, на Замкавай гары, у перадмацерыковым слоі знайдзены ляпны слабапрафіліраваны гаршчок — адзіны цэлы ляпны гаршчок у Навагрaдку.

Трэцяе паселішча было адкрыта на ўзвышшы, што на паўднёвы захад ад Малога Замка, на якім у XII ст. была пабудавана царква. У закладзеным там шурфе адкрыты культурны слой магутнасьцю да 1 м. з камянямі і глінянай абмазкай. Сярод керамікі сустракаюцца абломкі пасудзін са штампаваным арнаментам X-XI стст. Кераміка XI ст. была знайдзена ў культурным слоі, пры раскопках храма. Сярод іншых знаходак — утульчаты двушыпны наканечнік жалезнай стралы[13].

Узвышшы Навагрaдка, такім чынам, былі заселены адначасова і складалі своеасаблівае гняздо з трох паселішчаў. Пры гэтым Малы Замак быў заселены як па краях так і ў цэнтры, у той час як Замкавая гара напачатку засялялася толькі па краях пляцоўкі.

Ні адно з трох паселішчаў у гэты раньні перыяд не мела абарончых збудаваньняў. Іх бяспека забяспечвалася вышынёй узгоркаў, сярод якіх вылучалася Замкавая гара, якая ўзвышалася над далінай на 20 м. і належыць да наібольш высокіх кропак Навагрaдскага ўзвышша. У першыя дзесяцігоддзі другой паловы XI ст. на ёй быў узведзены вал, пабудаваны ў 10 м. ад краю пляцоўкі. Значыць, больш як паўстагоддзя на навагрaдскіх паселішчах штучныя ўмацаваньні адсутнічалі, што не дае аснаваньняў лічыць іх у гэты час гарадскімі.

У насельніцтва, якое засяляла навагрaдскія ўзвышшы, была ўжо добра сфарміраваная культура. Рэшткі домабудаўніцтва на Малым Замку дазваляюць мяркаваць, што там пераважалі наземныя зрубныя пабудовы, хаця сустракаліся і заглыбленыя. Сярод керамікі пераважалі гаршкі з адагнутым венчыкам, частка якіх была толькі ў верхняй частцы абточана на ганчарным крузе. Сярод шматлікіх знаходак ляпнога посуду цікавыя фрагменты тоўстасьценных патэльняў, якія служылі навершыям печаў[14].

Першыя насельнікі Малага Замка займаліся і металургіяй жалеза. Выплаўка яго практыкавалася ў гаршках у межах жылых пабудоў. Знаходкі крыц, а таксама разнастайных жалезных вырабаў (прылады працы і побыту, прадметы ўбора), дазваляюць адзначыць пэўнае развіцьцё кавальства і слясарства[15].

З апрацоўкай каляровых металаў першымі пасяленцамі Навагрaдка дазваляюць азнаёміцца ямы, адкрытыя ў паўднёвай частцы пляцоўкі Малага Замка. У іх захаваліся сляды выплаўкі бронзы. Многія з ямаў мелі гаспадарчае прызначэньне і былі запоўнены керамікай і касьцямі жывёлы.

У матэрыялах раньняга паселішча на Малым Замку адбіліся заняткі жыхароў сельскай гаспадаркай і разнастайнымі промысламі, а таксама дамашняй вытворчасьцю. Аб апошнім сведчаць шматлікія гліняныя і больш рэдкія каменныя прасліцы, касьцяныя прылады і іншыя знаходкі[16].

Знешнія сувязі першых пасяленцаў праявіліся ў асобных металічных знаходках з Прыбалтыкі і шкляных пацерках усходняга паходжаньня[17].

Пры даволі разнастайным інвентары, мясцовыя жыхары амаль не мелі зброі. Адзінай знаходкай гэтага віду, з'яўляецца абкоўка ад калчана, знайдзенная ў адной з наібольш старажытных пабудоў[18].

Пахавальным помнікам жыхароў канца X ст. з'яўляўся курганны магільнік у 1,5 км. на паўночны ўсход ад сучаснага гораду. Пахаваньні гэтага часу зроблены па абраду трупаспаленьня на месцы альбо на старане. Ад спаленьняў на месцы захаваліся рэшткі пахавальнага кастра, у якім знаходзіліся кальцыніраваныя косьці, кераміка і абломкі жалезных і бронзавых вырабаў. Пры спаленьні на старане, перапаленыя косьці ляжалі ў ямцы, якая вырыта ў мацерыку[19].

Такой была матэрыяльная культура пад час засяленьня тэрыторыі Навагрaдка ў канцы X ст., яна ўзнаўляецца па комплексах і асобных знаходках паселішча на Малым Замку і наібольш старажытным пахаваньням курганнага магільніка. У пачатку XI ст. засяляецца Замкавая гара, аб чым сведчыць культурны слой пад першапачатковым валам і матэрыялы ўзвышша на паўднёвы захад ад Малага Замка.

У другой палове XI ст. на паселішчы Замкавай гары насыпалі вал, які ператварыў яе ў дзяцінец, а Малы Замак і суседняе ўзвышша зрабіліся пасадамі. На змену паселішчам дагарадскога характару з'яўляецца горад, у матэрыяльнай культуры якога прасочваюцца галоўныя рысы. Занятак бронзаліцействам перамяшчаецца ў жылыя памяшканні, што стане асабліваcьцю гэтага віда рамяства ў пазнейшы час. З'яўляюцца новыя тыпы

ўпрыгожанняў, у прыватнасьці бронзавыя і срэбныя скроневыя кольцы са спіральным завітком.[20] Сярод жыхароў распаўсюджваюцца прадметы ўзбраення, галоўным чынам, жалезныя наканечнікі ўтульчатых стрэлаў. У ліку пастаўшчыкоў прывазных вырабаў з'яўляецца Кіеўская зямля, адтуль прывозяць шыферныя прасліцы[21].

Ад крэмацыі жыхары перайшлі да абраду трупаспалення. У адным з курганоў гэты пераход зазначаны тым, што касьцяк, які ляжаў на грунце галавой на Захад, был часткова абпалены. У астатніх пахаваннях па абраду інгумацыі, шкілеты знаходіліся ў тым жа становішчы, на ўзроўні старажытнай паверхні. Рукі іх выцягнутыя, альбо складзены на грудзях. На пахавальных пляцоўках захаваліся плямы попелу і вугельчыкі, часам камяні, якія ляжаць безпарадкава. Каля ног пахаваных альбо побач з імі стаялі гаршкі. Астатні інвентар прадстаўлены ўпрыгожваннямі альбо некаторай колькасьцю бытавых рэчаў. У адным з курганаў знайдзена баявая сякера[22].

З пачаткам засялення наваградскіх узгоркаў, актыўна фарміруецца яго акруга. Па берагах безымяннай рэчкі, што ўпадае ў раку Валоўку, у 3-4-х км. ад Наваградка вядомыя наступныя помнікі: 1) курганны магільнік каля в. Сялец, складаецца з 50 курганоў дыяметрам 6-10 м.; 2) селішча на беразе рэчкі каля в. Гардзілоўка, што занімала плошчу 130х125 м. і 13 курганоў паблізу ад яго дыяметрам 5-12 м. (Гардзілоўка 1); 3) курганны магільнік, складаўся з 42 курганаў дыяметрам 5-10 м. на захад ад магільніка пры паселішчы (Гардзілоўка II); 4) гарадзішчы каля в. Гарадзечна на правым беразе рэчкі. Пляцоўка яго, што ўзвышалася на 3,5 - 4 м. густа парасла лесам; 5) на заходняй ускраіне вёскі, на полі відаць сляды распаханных курганаў. Верагодна з гэтых курганаў паходзяць рэчы, што захоўваюцца ў Археалагічным музее Кракава[23].

У 1 км. на поўдзень ад Наваградка існаваў магільнік па абодва бакі рэчкі Чэмярэўкі. У 1956 г. там было 9 курганаў, а ў 5 км. на поўнач ад гораду нашай экспедыцыяй былі адкрыты 23 курганы дыяметрам 5-15 м. каля в. Ладзейнікі[24].

У радыюсе да 10-12 км. ад Наваградка вядомыя пасяленні і курганныя магільнікі каля вв. Суляцічы, Мольнічы, Маруліны і інш.[25]

Археалагічныя работы праводзіліся на селішчы каля в. Гардзілоўка, дзе адкрыта плошча ў 160 кв. м., у невялікай колькасьці сустрэлася ляпная кераміка. Там жа была кераміка кружальнага вырабу. Гэта гаршкі з атагнутым скругленым венчыкам з лінейна-хвалістым і хвалістым арнаментам, падобныя ёсьць на раннім пасяленні Наваградка[26].

Пры закладцы шурфоў на гарадзішчы каля в. Гарадзечна, у культурным слоі, таўшчынёй да 60 см., у невялікай колькасьці знайдзена ляпная кераміка, але пераважала кружальная[27]. Такім чынам, дадзенае гарадзішча сінхроннае, як да гарадскога паселішча Наваградка, так і гораду, што ўзнік на яго тэрыторыі.

У раскапаных курганах наваградскай ваколіцы пахаванні па абраду трупаспалення адкрыты ў магільніку Гардзілоўка 1 і ў Ладзейніках. Перапаленыя косьці ляжалі, часьцей за ўсё, у насыпе. У Ладзейніках на грунце і ў насыпе былі знайдзены гарэлыя плахі — рэшткі дамавін. У насыпе сустракаліся вуглі і камяні. Мяркуючы па матэрыялах курганаў Гардзілоўка 1, пахаванні па абраду трупаспалення адбываліся там і ў XI ст., аб чым можна мяркаваць па лірападобнай спражцы і некаторых іншых вешчах. Упускное трупаспаленне адкрыта ў адным з курганаў ля в. Сялец[28].

Пераход ад крэмацыі к абраду трупапакладання ў Наваградскай акрузе адзначаецца ў адным з курганаў ля в. Мольнічы, дзе верхняя частка касьцяка была трошку абпалена, а чэрап абвуглены. Звычай паліць нябожчыкаў у сельскай мясцовасьці працягваў існаваць і ў больш позні час. Курганы з кальцыніраванымі касьцямі сустракаюцца ў магільніку каля в. Суляцічы XII- XIII стст.[29]

У курганах з абрадам трупапакладання касьцякі ляжалі выцягнутыя, галавой на Захад. Усходняя арыентаванасьць адзначана аднойчы ў кургане каля в. Мольнічы. У гэтым жа магільніку былі рэшткі дамавін — бярвенчатых яшчыкаў, пакрытых накатам. Часам у курганах сустракаліся камяні. Пад пахаванымі і над імі была падсыпка з попелу.

Каля касьцякоў знаходзіліся рэшткі гаршкоў. Нярэдка абломкі керамікі знаходзіліся ў насыпе. Інвентар курганаў не багаты. Гэта бытавыя знаходкі (нажы, рэшткі драўлянага вядра). Цікавымі знаходкамі былі дзьве баявыя сякеры. У жаночых пахаваннях прадметы ўбору і ўпрыгожванні[30]. Усе вырабы з курганаў Наваградскай акругі, за выключэннем двух пярсьцёнкападобных кольцаў з кургана Гардзілоўка 1, аналагічныя рэчам з наваградскіх паселішчаў. У сельскую мясцовасьць траплялі рэчы, якія альбо зрабілі ў гэтых паселішчах, альбо, калі яны былі прывазныя, праз пасяленні на ўзгорках. Яшчэ не стаўшы горадам, пасяленні, аб якіх гутарка, былі эканамічным цэнтрам акругі, фарміраванне якой праходзіла сінхронна з засяленнем наваградскіх узвышшаў.

Такія ёсьць археалагічныя матэрыялы, што паказваюць развіцьцё Наваградка ад гнязда паселішчаў дагарадскага тыпу канца X - першай паловы XI стст. да гораду, існаванне якога

пачынаецца з другой паловы XI ст. Дагарадскі перыяд у гісторыі Наваградка был раней недаацэнены аўтарам, Мы выдзялялі два этапа існаваннія гораду, з якіх адзін ахоплівaў час з канца X ст. (ад заснавання першага паселішча на Малым Замку) да канца XI ст., а другі прыпадаў на XII-XIII стст.[31] У сапраўднасьці, першы этап павінен быць расчленены на два перыяды — дагарадскі (з канца X да сярэдзіны XI ст.) і другі, раннегарадскі, абмежаваны другой паловай XI ст.

Культура помнікаў Наваградка і яго навакольля канца 1 і пачатку II тысячагоддзя н.э. — тыпова славянская, у якой, як мы пісалі раней, захаваліся племенныя асаблівасьці дрыгавічоў.[32] Этнавызначальныя прыкметы іх праяўляюцца па-рознаму. У 80-я гады мінулага стагоддзя В.З. Завітневіч, які раскапаў наібольшую колькасьць дрыгавічскіх курганаў, бачыў гэтыя прыкметы ў тым, што хавалі на ўзроўні аснавання курганных насыпаў[33]. Таксама ў 60-я гады нашага стагоддзя лічыў Е.І. Цімафееў[34]. А.А. Спіцын мяркаваў, што для дрыгавічоў характерныя драўляныя зрубы і дамкі ў курганах, а ва ўборы — пярсьцёнкападобныя скроневыя кольцы і металічныя зярнёныя пацеркі[35]. А.В. Успенская падтрымлівае погляды Спіцына прымяняльна да ўпрыгожванняў дрыгавічоў[36]. Па В.В. Седову самай важнай этнавызначальнай прыкметай дрыгавічоў з'яўляюцца металічныя зярнёныя пацеркі, у той час як іншыя асаблівасьці іх культуры, што прыпісваюць даследчыкі, сустракаюцца і ў іншых славянскіх плямёнаў[37].

У наваградскім магільніку і курганах, даследаваных у навакольлі Наваградка маюцца ўсе рысы культуры дрыгавічоў. У пахаваннях гэта падцвярджаецца размяшчэннем касьцей на грунце і збудаваннем дамавін, а ў інвентары знаходкамі пярсьцёнкападобных скроневых кольцаў (Гардзілоўка II, Мольнічы, Каменка) і металічных зярнёных пацерак. Пацеркі вядомыя ў Наваградскім магільніку, а таксама ў курганах Гардзілоўка II, Гарадзечна, Мольнічы і Каменка[38]. Асобныя зярнёныя пацеркі паходзяць з культурнага слоя Замкавай гары і Малага Замка[39].

Касьцякі наваградскага магільніка і курганоў у ваколіцах гораду вывучала Л.М. Казей у сувязі з фізічным развіцьцём старажытных насельнікаў Наваградчыны. Па дадзеных І.І. Салівон, шкілеты з могілак XII-XIII стст. на тэрыторыі Малага Замка па краніалагічных асаблівасьцях і памерах, падобныя на антрапалагічныя паказчыкі дрыгавічоў[40].

Этнавызначальным прыкметам дрыгавічоў не супярэчаць наваградскія наземныя жылыя дамы з глінабітнымі печкамі альбо печкамі-каменкамі.

Пры безумоўнай перавазе славянскага насельніцтва, якое па

сваёй культуры было нашчадкамі дрыгавічоў, у раннім Наваградку захаваліся сляды перабывання іншых груп славянскага насельніцтва. Да такіх адносяцца рэшткі заглыбленых пабудоў і патэльняў - навершшаў печак, якія ўласьцівыя паўднёвым групам усходняга насельніцтва, а таксама кераміка, блізкая да валынскай. Гэтыя акалічнасьці трэба звязать з пранікненнем у Наваградак пэўнай часткі насельніцтва з Ваўкавыска, які стаіць на 100 км. на паўдзённы захад ад нашага помніка. У Ваўкавыску ў другой палове X ст. аселі выхадцы з паўдзённа-заходніх земляў, адзінай формай домабудаўніцтва якіх да канца XI ст. былі паўзямлянкі з печамі каменкамі. На старажытнейшым паселішчы Ваўкавыска “Шведскай гары” вядучым тыпам керамікі ў другой палове X - пачатку XI стст. былі гаршкі валынскага тыпу[41].

У невялікай колькасьці ў Наваградак трапляе кераміка, арнаментаваная штампам і характэрная для заходніх славян. Адзінкавыя фрагменты гаршкоў так званага драгічынскага тыпу, з’яўленне якіх М.У. Малеўская звязвае альбо з жыхарамі Валыні, альбо Бужскага Падляшша, дзе такі посуд характэрны для помнікаў IX-XI стст.[42]

Некаторыя матэрыялы даюць падставы бачыць у акруге Наваградка сляды перабывання крывічоў. У гэтым плане цікавы курганны магільнік на Карэліцкім тракце, аб якім гаварылася вышэй. Як вядома, доўгія курганы, раскапаныя ў гэтым пункце, уласьцівыя пахавальным помнікам крывічоў. У кургане 10-га наваградскага магільніка кальцыніраваныя косьці ляжалі ў прамавугольнай яме, вырытай амаль у цэнтры курганнай пляцоўкі[43]. У дрыгавічоў падобная форма абраду трупаспалення невядомая, але ў крывічоў яна сустракаецца[44]. Некаторае падабенства з магільнікам у Заслаўлі, галоўная частка якога належала крывічам[45]. У апошнім, у адрозненне ад магільнікаў дрыгавічоў, пахаваныя абгараджваліся камянямі. Камяні змяшчалі таксама блізка вяршыні курганаў[46].

Звяртаюць на сябе ўвагу бронзавыя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі з кургана Гардзілоўка 1[47]. Гэта паменьшаныя копіі крывіцкіх бранзалетападобных калец. Падобныя ўпрыгожанні знайдзены таксама ў другой і трэцяй групе магільніка ў Заслаўлі[48].

З неархеалагічных матэрыялаў аб пранікненні крывічоў на тэрыторыю Наваградчыны паказвае назва вёскі “Крывічы” недалёка Нёмана[49]. Такі тапонім выдзяляе этнічны склад гэтага паселелішча ад карэннага насельніцтва зямлі. Нагадаем таксама звесткі Пятра Дюсбурга аб тым, што магістр Ордэну спрабаваў захапіць Наваградак, які аўтар змяшчае ў кране крывічоў. Гэтыя

словы напісаны чалавекам недастаткова дасведчаным у тым, што прадстаўляла з сябе насельніцтва Панямоння, куды прыйшлі крыжакі. Аднак цікава, што яшчэ ў XIV ст. да храніста дайшлі нейкія звесткі аб прабыванні ў гэтых зямлях крывічоў.

Прылічваючы навагрудскія курганныя магільнікі да помнікаў дрыгавічоў, В.В. Седоў лічыць, што ў Верхнім Панямонні яны не склалі галоўнаго ядра насельніцтва і за лінгвістамі (К. Буга, Я. Развадоўскі, В.Н. Тапароў і інш.) адзначае, што прышлыя славяне засталі на гэтай тэрыторыі балтаў[50]. Ці жылі на ранніх паселішчах Навагрудка і ў яго вясковым навакольлі балты? У пахавальных помніках Навагрудчыны няма знакаў іх прабывання. Бліжэйшыя ўсходне-літоўскія курганы зафіксаваны толькі на правым беразе Нёмана. Каменныя курганы, у якіх В.В. Седоў бачыць славянізаваных нашчадкаў яцвягаў, таксама сканцэнтраваны досыць далёка ад цікавых нам зямляў[51]. Магчыма, што балтам належалі курганы, раскапаныя пад Навагрудкам у мінулым стагоддзі. У іх былі знойдзены гаршкі, наканечнікі коп'яў, серп, срэбная пляцёная грыўна, пласцінкавы абруч і пярсьцёнак[52]. Аб блізкасьці да каменных курганаў сведчыць покроў з камянёў аднаго з курганаў магільніка каля в. Суляцічы пад Навагрудкам і асобныя камяні на пахавальных пляцоўках[53].

Больш падстаў бачыць уплыў балтаў у культуры паселішчаў Навагрудка і, у першую чаргу, у распаўсюджанні ўпрыгожанняў і прадметаў убору. Побач з вырабам агульнаславянскіх і некаторых спецыфічна навагрудскіх вырабаў (скроневыя кольцы са спіральным завітком), залатары выраблялі ўпрыгожанні, уласьцівыя Прыбалтыцы. Гэта падковападобныя спражкі, спіралькі, трапецэпадобныя прывескі і інш.[54] Не выключана, што гэта адлюстроўвае прысутнасьць у раннім Навагрудку выхадцаў з Прыбалтыкі, у першую чаргу з Літвы.

На пытанні паходжання і ранняй гісторыі Навагрудка, у святле наяўных матэрыялаў, можна на сённяшні час адказаць наступным чынам: паселішчы, што ўзніклі на навагрудскіх узвышшах у канцы X і ў пачатку XI ст. трэба звязваць з дрыгавіцкім насельніцтвам, у складзе якога былі невялікія групы другога славянскага насельніцтва — крывічы, валыняне, жыхары Подляшша і Мазовіі. Тут на Навагрудчыне заканчваўся іх рух з усходу, захаду і паўднёвага захаду. Што тычыцца карэннага насельніцтва — дрыгавічоў, то застаецца няясна наколькі іх культура канца 1 тысячагоддзя н.э. звязана з культурай тых нешматлікіх паселішчаў са славянскай ляпной керамікай, аб якой успаміналася напачатку гэтай главы. Немагчыма патлумачыць вытокі культуры балтаў, што праяўляюцца ў ранніх паселішчах.

Толькі пры больш поўным вывучэнні помнікаў трэцяй чвэрці 1 тысячагоддзя н.э. і IX-X стст. можна будзе вырашыць дадзеныя пытанні.

Незалежна ад вырашэння праблемы пераемнасьці Наваградка і яго акругі з раней існаваўшымі тут помнікамі, несумненна, што карціна, якая ўзнікае на дадзенай тэрыторыі ў канцы X стагоддзя, звязана з карэннымі пераўтварэннямі ў гаспадарцы насельніцтва.

Засяленне наваградскіх узгоркаў і навакольля, верагодна трэба звязываць з прагрэсам зямляробства, што прывяло да засваення мясцовых сяредне і многа ападзоленых зямляў. Глеба дадзенай тэрыторыі адрозніваецца сваёй пладавітасьцю. Яшчэ ў пачатку XX ст. землі Уселюба, Шчорсаў і іншых мястэчак і вёсак Наваградчыны славіліся сваёй пладавітасьцю[55]. У канцы X ст. тут адбываецца тое, што характэрна для многіх славянскіх зямляў, насельнікі якіх канцэнтраваліся на незанятых лясамі частках, прыгодных для земляробства[56]. У сувязі з пытаннем, у якой меры нашы раннія паселішчы звязаны з помнікамі папярэдняй пары, звяртае на сябе ўвагу, што пад Маской пераважная частка паселішчаў X-XI стст. была заснавана на раней неабжытых месцах[57].

Культура ранняга гораду, існаванніе якога звязваецца з пабудовай валу на Замкавай гары, шмат чым звязана з культурай дагарадскога паселішча. Гэта праяўляецца ў характары домабудаўніцтва і ў занятках насельніцтва. Месцам пахавання гаражан застаецца стары курганны магільнік, на якім сустрэта нават пахаванне XII ст.[58] Толькі перад канцом XI ст. у культуры гораду з'яўляюцца новыя рысы — вялікія дамы, шкляны посуд, паліваная кераміка і іншыя асаблівасьці, уласьцівыя пазнейшаму Наваградку[59].

У агульнарускай культуры першапачатковых паселішчаў і ранняга гораду прасочваюцца пэўныя архаічныя рысы. Гэта адсутнасьць маёмаснай і сацыяльнай дыферэнцыацыі жыхароў, што праявілася ў абліччы дамоў, інвентары, а таксама пахавальным абрадзе. Сярод курганаў наваградскага магільніка амаль не было пахаванняў, у якіх можна прасочыць прывіліраванае становішча нябожчыка. Да таго ж, наваградскія курганы па наборы і характары рэчаў не адрозніваюцца ад адпаведных пахавальных помнікаў Наваградскай акругі. Вядомае адставанне культуры праяўляецца ў працяглым пабытаванні язычніцтва (да канца XI ст.).

Магчыма, што ў першых паселішчах Наваградка можна убачыць племянны цэнтр дрыгавічоў, падобны да Турава, які быў такім з пачатку свайго існавання[60]. На думку В.В. Седова, самыя старажытныя гарады на Русі выраслі галоўным чынам з

племянных цэнтраў, якія знаходзіліся ў зоне канцэнтрацыі зямляробства і з'яўляліся цэнтрамі рамяства і гандлю[61]. Прыведзеныя вышэй матэрыялы пераконваюць у тым, што паселішчы ў Навагрaдку ўзнікаюць у зоне пладародных зямляў і з'яўляліся пунктамі, дзе былі развіты рамяство і гандль, а таксама былі цэнтрамі сваёй акругі.

Чаму ж наш горад атрымаў у летапісе найменне Новага гораду? У адносінах да якога паселішча ён быў новы? Ці сведчыць гэта аб існаванні нейкага папярэдняга паселішча ў іншым месцы ці гэта найменне тлумачыцца тым, што горад змяніў першапачатковае паселішча, што было тут, недалёка? Як вядома, шмат якія са старажытнарускіх гарадоў насілі наіменне "Новгород". Аднак толькі прымяняльна да Ноўгарада Вялікага ў літаратуры ставілася пытанне аб прычыне падобнага наймення. Папярэднікамі Ноўгорада на Волхаве лічыліся гарадзішчы ("Рюрыкава гарадзішча") у 2 км. ад Ноўгораду, Старая Руса, Старая Ладага і іншыя месцы. З пачатку 70-х гадоў даследчыкаў прывабліваюць погляды У.Л. Яніна і М.Х. Алешкоўскага, згодна якім паперад Ноўгораду існавалі тры паселішчы славянскіх плямёнаў крывічоў і славен і чудскай мері. Пасля пабудовы агульных ўмацаванняў стаў існаваць Ноўгарад[62].

У апошнія гады пытаннямі паходжання Ноўгораду займаецца Е.Н. Носаў. Шырока карыстаючыся матэрыяламі ноўгарадскай акругі і Гарадзішча, якое ён раскапвае, Носаў прыходзіць да высновы, што ў IX-X стст. галоўным ваенна-гандлёвым і адміністратыўным паселішчам было Гарадзішча і толькі ў пазнейшы час гэтыя функцыі перайшлі да Новага гораду[63].

Па ўсёй верагоднасьці, не заўсёды найменне "Ноўгарад", азначае перанос больш ранняга паселішча на новое месца. Так пры раскопках Ноўгарада Северскага, упершыню вядомага летапісу пад 1096 г., высветлена, што гэты горад узнік на стагоддзе раней на месцы існавання паселішча роменскай культуры[64]. Такім чынам, найменне "Ноўгарад", у гэтым выпадку, паказвае змену характару раней існаваўшага на гэтым месцы паселішча.

Археалагічныя матэрыялы Навагрaдка і яго навакольля не даюць магчымасьці паказаць помнік — папярэднік пасяленню на навагрaдскіх узгорках[65]. Старажылы Навагрaдка лічылі, што горад раней быў каля в. Гарадзечна, у 4-х км. ад гораду. Па матэрыялах, што прыведзены раней, можна ўпэўніцца, што Новым горадам наш помнік стаў называцца адносна папярэдне існаваўшых дагарадскіх паселішчаў на навагрaдскіх узгорках.

Узнікненне Навагрaдка было часткай працэсу гарадаўтварэння, што праходзіў у Панямонні ў канцы 1 пачатку II

тысячагоддзя н.э. У свой час мы спрабавалі паказаць падабенства гістарычнага лёсу Навагрудка і Ваўкавыска, хаця апошні меў трошку іншы этнічны склад насельніцтва.[66] Негледзячы на гэту розніцу, этапы развіцьця абодвух гарадоў так падобныя, што не выключана паходжанне Ваўкавыска таксама з племяннога центру.

Па ўсёй верагоднасьці, некалькі іначай пачынаўся старажытны Слонім, у 1 км. ад якога знаходзяцца гарадзішча і селішча на Косавым тракце. У культурным слоі гарадзішча знайдзена шмат ляпной керамікі. Там жа знайдзены кружальны посуд X-XIII ст. Археалагічныя работы ў Слоніме даюць магчымасть аднесьці пачатак яго існавання да другой паловы XI - пачатку XII ст.[67] Магчыма, што паселішча на Косаўскім тракце было папярэднікам Слоніму, а пасля ўзнікнення гораду існавала і далей.

Станаўленне Гродна на Нёмане ў канцы XI ст. разглядаецца, звычайна, як крэпасьці, што паступова прыцягвала да сябе рамеснае насельніцтва[68]. Археалагічныя работы апошніх гадоў выявілі на тэрыторыі гродзенскага дзяцінца — Старога Замка, даволі шмат раннекружальнай керамікі X ст.,[69] што адсоўвае ўглыб дату заснавання там паселішча.

Старажытнарускія гарады Панямоння ўзніклі рознымі шляхамі. Адзін з іх — гэта перарастанне дагарадскога, верагодна, племяннога центра ў паселішча гарадскога тыпу. Так паўстаў Навагрудак.

Спасылкі:

[1] Куза А.В. О происхождении древнерусских городов (история изучения) // КСИА. - 1982. - Вып. 171. - С. 9-15.; Котляр Н.Ф. Формирование территории и возникновения городов Галицко-Валынской Руси IX-XIII вв. Киев., 1985. С. 5-17.; Происхождение и эволюция раннесредневекового города // ТДСД. - С. 51-77.

[2] Куза А.В. Op. cit. С. 15.

[3] Гуревич Ф.Д. К истории Новогрудка // Культура и искусство Древннай Руси. Л., 1967. С. 26-30.; Детинец и окольный город древнеруского Новогрудка в свете археологических работ 1956-1977 гг. // СА. - 1980. - Вып. 4. - С. 87-100.; Формирование городов Черной Руси по данным археологии.// СА. - 1983. - Вып. 3. - С. 61-64.

[4] Тихомиров М.Н. Древнерусские города. М., 1956. С. 42.

[5] Гуревич Ф.Д. Древности Белорусского Понеманьня. Л., 1962. С. 151.

[6] Поболь Л.Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Минск, 1983. С. 329.

[7] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 169, 170, 173, 175.; Поболь Л.Д. Op. cit. С. 318-319.

[8] Цыбишев М.А. Раскопка в конце 1892 г. некоторых курганов паблизости г. Новогрудка Минской губернии. // Каталог предметов доставленных на археологическую выставку при IX Археологическом съезде в Вильно. Вильно, 1893. С. 73-74.

[9] Третьяков П.Н. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге. Л., 1966. С. 280.; Митрофанов А.Г. Жалезный век средней Белоруссии. Минск, 1978. С. 152.; Седов В.В. Восточные славяне в VI-XIII вв. М., 1982. С. 39-40.

[10] Поболь Л.Д. Op. cit. С. 53-54.

[11] Поболь Л.Д. Op. cit. С. 333-341.

[12] ДН., С. 11.

[13] Гуревич Ф.Д. К истории древнего Новогрудка. Switowit, Warszawa, 1962. Вып. XXIV. С. 568.; Овсянников О.В. Дневник раскопок церкви Бориса и Глеба в 1965 г. (Архіў ЛАІА ф. 35, КП 1434/ 182, Л. 12.)

[14] Малевская М.В. Некоторые исторические связи Новогрудка в X в. (По материалам керамики)// КСИА. - 1972. - Вып. 129. - С. 14-20.; ДН. С. 14-15.

[15] ДН. С. 18, 20.

[16] ДН. С. 11-12.

[17] ДН. С. 11.

[18] ДН. С. 20.

[19] Павлова К.В. Погребальные памятники окрестностей Новогрудка. // КСИА. - 1981. - Вып. 166. - С. 79.

[20] ДН. С. 20, 4.

[21] ДН. С. 148.

[22] Павлова К.В. Раскопки могильника близ Новогрудка. // КСИА. - 1965. - Вып. 104. - С. 100-105.

[23] Гуревич Ф.Д. Древности .... С. 184-185, 203; Шаблюк В.В. Исследования в Белорусском Понеманьне. //АО 1983 г. - 1985. - С. 413.; Поболь Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. С. 126. Рэшткі раскапаных курганаў каля в. Гарадзечна адзначыў М.В. Нікалаеў.

[24] Гуревич Ф.Д. Древности... С. 194-195.

[25] Тамсама С. 179, 173, 169, 204.

[26] Гуревич Ф.Д. Отчет о работе Новогрудской экспедиции в 1984 г. (Архиў ЛАІА. КП 3080, л. 9-10).

[27] Гуревич Ф.Д. Древности ... С. 185.

[28] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 186.; Павлова К.В. Раскопки курганов у деревень Селец и Батаровка. //КСИА. - 1977. - Вып. 148. - С. 85.

[29] Павлова К.В. Могильники у деревень Мольничи и

Сулятичи. // КСИА. - 1974. - Вып. 135. - С. 62; Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 204.

[30] Павлова К.В. Погребальные памятники ... С. 80.

[31] Гуревич Ф.Д. Два этапа в истории древнерусских городов Понеманьня. // КСИА. - 1976. - Вып. 146. - С. 25-26.

[32] Гуревич Ф.Д. Об этническом составе населения древнего Новогрудка. // Acta Baltico-Slavica. Bialystok, 1969. С. 220.

[33] Завитневич В.З. Формы погребальных обрядов в могильных курганах Минской губернии. // Труды IX Археологичного съезда. М.,1895. Т. 1. С. 221-225.

[34] Тимофеев Е.И. Расселение Юго-Западной группы восточных славян по материалам могильников X-XIII вв. // СА. - 1961. - Вып. 3. - С. 65.

[35] Спицын А.А. Расселение древнерусских племен по археологическим данным. // Журнал Министерства народного просвещения. - 1899. - Вып. VIII. - С. 120-121.

[36] Успенская А.В. Курганы Южной Белоруссии X-XIII вв. // Труды ГИМ. - 1953. - Вып. 22. - С. 120-121.

[37] Седов В.В. Op. cit. С. 114.

[38] Павлова К.В. Погребальные памятники ... С. 80; Поболь Л.Д. Op. cit. Мал. 81, 5-9.

[39] ДН. Мал. 66, 6.

[40] Казей Л.Н. К вопросу о физическом развитии жителей Новогрудчины XI-XIII веков новой эры. // ЭБ. С. 95-98; Саливон И.И. Краниологична характеристика середньовичного населення м. Новогрудка. // Материали з антропології України. Київ, 1971. С. 100.

[41] Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 22-24, 69.

[42] Малевская М.В. Op. cit. С. 19; Малевская М.В. некоторые исторические связи городов Черной Руси в X-XI вв. (Материалы изучення керамики)// ЭБ. С. 39.

[43] Седов В.В. Op. cit. С. 44.

[44] Павлова К.В. Раскопки могильника ... С. 100.

[45] Заяц Ю.А. Курганны могильник Изяславля. // ДГС. С. 40.

[46] Заяц Ю.А. Op. cit. С. 38.

[47] Гуревич Ф.Д. Древности ... Мал. 90, 7, 8.

[48] Заяц Ю.А. Op. cit. Мал. 9.

[49] Гуревич Ф.Д. Древности ... С. 209.

[50] Седов В.В. Op. cit. С. 119.

[51] Седов В.В. Op. cit. Карта 15.

[52] Тышкевич К. О курганах в Литве и Западной Руси. Вильно, 1865. С. 61.

[53] Гуревич Ф.Д. Древности ... С. 204; Павлова К.В. Балтские

элементы в погребальном обряде курганов окрестностей Новогрудка.// ПИЭБ. С. 38-40.

[54] ДН. С. 128.

[55] Россия: пад рэд. Семенова В.В. СПб., 1905. Т. IX. С. 230, 429.

[56] Риер Я.Г. Феодальная деревня Могилевского Поднепровья: Автореферат канд. дис. Вильнюс, 1979. С. 14.

[57] Розенфельдт Р.Л. Древнейшие горада Подмосковья и процесс их возникновения (по археологическим данным) // Русский город. М., 1979, С. 10-11.

[58] Павлова К.В. Раскопки ... С. 103.

[59] ДН. С. 28.

[60] Лысенко П.Ф. Города Туровской земли. Минск, 1975. С. 69.

[61] Седов В.В. Начало городов на Руси. // ДГС. С. 54.

[62] Янин В.А., Алешковский М.Х. Происхождение Новгорода (к постановке проблемы). // История СССР. М., 1971. Т. 2. С. 32-61.

[63] Носов Е.Н. Проблемы изучення погребальных памятников Новгородской земли (к вопросу о расселении славян) // Новгородский исторический сборник. Л., 1982. Вып. 1(11). С. 3-78; Носов Е.Н. Новгород и новгородская округа IX-X вв. в свете новейших археологических данных (к вопросу возникновения Новгорада). // Новгородский исторический сборник. Л., 1984. Вып. 2(12). С. 3-38.

[64] Коваленко В.П. Новые исследвания летаписных городов Чернигово-Северской земли. // ДГ. С. 50-51.

[65] Заўвага перакладчыка: праведзеныя ўжо пасля смерці Ф.Д.Гурэвіч даследванні даюць магчымасць назваць іншых папярэднікаў старажытнага Наваградка: Піваварчык С.А. Гарадзішча Радагошча – магчымы папярэднік Наваградка// Белорусский сборник. Вып. 2. Санкт-Петербург, 2002. С. 172-173.

[66] Гуревич Ф.Д. Формирование городов ... С. 63-64.

[67] Супрун В.Р. Гарадзішча каля Слоніма. // ПГКБ. 1979. Вып. 4. С. 39-40; Зверуго Я.Г. О начальном периоде истории г. Слонима. // ЭБ. С. 63.

[68] Воронин Н.Н. Древее Гродно. // МИА. 1954. Вып. 41. С. 197.

[69] Звесткі ласкава паведаміў А.А. Трусаў.

Глава 3.
Абарончыя збудаванні. Планіроўка і домабудаўніцтва

Пытанні тапаграфіі Наваградка разгледжаны ў кнізе “Старажытны Наваградак”[1]. Абмяжуемся некалькімі дадатковымі заўвагамі, датычнымі гэтай праблемы. Добрай акалічнасьцю для гісторыі нашага гораду з’яўляецца тое, што яго двухчасны падзел быў занатаваны ў летапісе, калі пад 1274 г. былі ўспамянуты яго “вакольный град”, які захапіў князь Леў Данілавіч і дзядзінец, які валынскаму князю заваяваць не ўдалася[2].

Як ужо адзначалася, вакольны град і дзядзінец, што размешчаныя на наваградскіх узгорках, Малым Замку і Замкавай гары, з’яўляюцца галоўнымі часткамі старажытнага гораду, дзе праводзіліся археалагічныя работы. Дамінуючая на мясцовасьці Замкавая гара самой прыродай была прызначана, каб гарадская крэпасьць была закладзена менавіта тут. Першапачатковая крэпасьць, што ўзнікла з узвядзеннем вала, была вельмі невялікая. Вал быў збудаваны ў 10 м. ад края пляцоўкі, плошча якой складае 0,75 га. Толькі пачынаючы з першых дзесяцігоддзяў другой паловы XII ст. вал пераносіцца на край пляцоўкі.

Малы Замак — летапісны “вакольны град” саступае па вышыні Замкавай гары, але плошча яго амаль у тры разы большая. Пляцоўка Малага Замка заставалася неўмацаванай да пачатку XII ст.

Памеры ўмацаванай часткі гораду ў перыяд яго росквіту не перавышалі 2,5 га. Гэта ставіць Наваградак у шэраг малых гарадоў са складанай сістэмай абароны, так як і Ваўкавыск, Тураў, Холм, Тэрэбоўль і некаторыя іншыя[3].

У папярэдняй главе адзначалася, што адначасова з Малым Замкам быў заселены ўзгорак, што прытыкае да яго з паўдзённага захаду, на якім у XII ст. была пабудавана царква Барыса і Глеба. Магчыма, што заселены былі і нізіны, як гэта мела месца ў Ваўкавыску, тапаграфія якога падобная да тапаграфіі Наваградка[4]. Пры закладцы шурфа з напольнага боку наібольш позняга вала, што збудаваны каля схілу Замкавай гары і Малага Замка на паўночны ўсход ад іх, была знайдзена кераміка, а таксама наканечнік жалезнай стралы, абломкі шкляных бранзалетаў і некаторыя рэчы XII-XIII стст.[5] Аднак наўрад ці гэта былі рэшткі паселішча. Скарэй за ўсё, гэтыя знаходкі трапілі

туды з культурным слоем з паселішчаў на ўзгорках, пры збудаванні гэтага вала. У 1983 г. аўтар і М.В. Нікалаеў заклалі нескалькі шурфоў на поўдзень ад Малага Замка і Замкавай гары. Знайдзены там культурны слой быў не старэйшы за XIV ст.[6] Нажаль, шчыльная забудова сучаснага Навагрудка пазбавіла магчымасьці даследваць тэрыторыю, непасрэдна прылеглую з захада да Замкавай гары і Малага Замка, вуліцы якога мелі ў мінулым найменне Кавальскай, Бандарскай і Рымарскай.

Такім чынам, з пачатку свайго існавання і на працягу старажытнарускага перыяду сваёй гісторыі, Навагрудак быў паселішчам на ўзгорках. У яго, па ўсёй верагоднасьці, уваходзіла ўзвышша на паўднёвы ўсход ад Замкавай гары, на якім стаіць фарны касьцёл і могілкі ля яго сьценаў. Археалагічныя работы там правесьці не ўдалася.

Стратыграфія Малага Замка, як і тапаграфія гораду, разглядалася раней[7]. Што датычыць стратыграфіі Замкавай гары, то падрабязна з ілюстрацыямі яна выкладзена ў дадатку да гэтай кнігі. Інтэнсіўная забудова Замкавай гары ў эпоху позняга сярэдневечча пакінула там больш магутныя напластаванні XIV-XVII стст. У старажытнарускі час стратыграфія абодвух узвышшаў ідэнтычная.

Як ужо адзначалася раней, першапачатковыя пасяленні на наваградскіх узгорках не мелі абарончых збудаванняў. У першыя дзесяцігоддзі другой паловы XI ст. узводзіцца вал на Замкавай гары. У паўночнай частцы пляцоўкі рэшткі старажытнага вала былі адкрыты пад гумусам, які падсьцілаў гаспадарчыя пабудовы XII ст. Вал вышынёй 2,5 м. насыпаны з пяску, а ў верхняй частцы — з пяску, змяшанага з камянямі. Да насыпу тыльнага боку валу прытыкала згарэлае бервяно, умацаванае каламі і камяні. Бервяно і камяні ляжалі на слоі вугалю таўшчынёй 40 см., пад якім захаваліся згарэлыя гродні. Ад апошніх ацалела два паралельныя бервяна дыяметрам 20 см. і кароткія папярэчныя бярвенні. Усе арыентаваныя з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Прастора паміж паралельнымі бярвеннямі (1,30 м.), і паміж папярэчнымі (1,10 м.) была запоўнена гарэлым дрэвам, камянямі і залой. Двойчы адзначаны згарэлыя слупы дыяметрам 20 см. Гродні ляжалі на насыпной зямлі, таўшчынёй да 1 м., якая прытыкала да насыпу вала і пазбаўлена знаходак. Пад падсыпкай ляжаў культурны слой неўмацаванага паселішча.

У насыпе вала і пры разборцы гародняў знайдзена кераміка XI ст., жалезны двушыпны наканечнік стралы, абломкі нажоў і невызначаны жалезны выраб.

Відавочна, рэшткі такога ж вала, які першапачаткова ахоўваў паселішча, былі адкрыты ў паўднёвай частцы пляцоўкі. У сьцяне

раскопа адлюстраваўся пяшчаны насып, у які былі запушчаны нахіленыя бярвенні. Гэты насып аддзяляў слой са знаходкамі XI ст. ад пабудовы з рэчамі XII ст.

Значныя вынікі пры даследванні абарончых збудаванняў Замкавай гары атрымаў Міхась Ткачоў. На ўсходняй частцы пляцоўкі аўтар выявіў тры этапы гісторыі ўмацаванняў, што адносяцца да старажытнарускага гораду, якія ляжалі пад каменнай сьцяной. Рэшткі старажытнага вала адкрыты на глыбіні 5,5 - 5,3 м. Ад яго захаваліся абвугленыя плахі, што ляжалі паралельна і перпендыкулярна насыпу. Верагодна, што дадзеныя будаўнічыя рэшткі сінхронныя той частцы вала, якая была адкрыта намі ў паўночнай частцы пляцоўкі. На глыбіні 4,63 м. М.А. Ткачоў адкрыў рэшткі двайнога частаколу з дубовых бярвенняў дыяметрам 22-25 см., над якімі была гумусірaваная праслойка з украпленнямі вугляў, абпаленай гліны і попелу. Нарэшце, на глыбіні 2,44 м. знаходзіліся рэшткі абвугленага дрэва, верагодна рэшткі зрубнай канструкцыі. Галоўная частка яе ішла пад фундамент каменнай сьцяны.

Па мяркаванню Ткачова, вышыня першапачатковага вала была каля 1 м., а на момант узвядзення мураваных сьценаў XIV ст. — каля 4 м. Наібольш ранні вал аўтар адносіць да канца X ст., а наступныя да XI — пачатку XII і XIII стст.[8]

Канечная дата існавання абарончых збудаванняў Замкавай гары, якую прапанаваў М.А. Ткачоў, бясспрэчная. Што датычыць часу заснавання вала на Замкавай гары, то наўрад ці ўсходняя частка пляцоўкі была ўмацавана раней за паўночную і паўднёвую частку. Да таго ж, вал з усходу быў адразу збудаваны на краі пляцоўкі і стаяў там, аж да ўзвядзення каменных сьценаў. Відавочна, што і з усходу, як з поўначы і полудня, вал быў насыпаны адначасова, г.зн. у другой палове XI ст.

Такім чынам, старажытны вал Замкавай гары, які ператварыў неўмацаванае паселішча ў дзяцінец Навагрaдка, з поўначы і палудня агараджваў толькі частку пляцоўкі, у той час як з усходу ён адразу быў насыпаны на яе краі. Вал з яго драўлянымі канструкцыямі не быў аднолькавы па вышыні. З поўдня насып узвышаўся на 0,8 м., з усходу вышыня яго была каля 1 м., а з поўначы — наібольш небяспечнага напрамку — вышыня вала дасягала 2,5 м.

У канцы XII ці на мяжы XII-XIII стст. вал у паўночнай частцы пераносяць на край пляцоўкі. П.А. Рапапорт, які яго праразаў, адзначае, што вышыня дасягала 6 м. Вал быў цалкам насыпаны з пяску з дамескам рачнога жвіру. На вонкавым баку вала пясок быў больш шчыльны[9].

Па дадзеных Ткачова, вал у паўночнай частцы быў умацаваны

гароднямі, а пазней на ім быў пастаўлены частакол. Аўтар высветліў, што з поўначы вал меў дадатковае ўмацаванне ў выглядзе вежы. Пры даследванні цэнтральнай вежы познесярэдневяковага гораду, вядомай пад назвай “Шчытоўка”, датаванай XIV ст. Ткачову ўдалася высветліць, што да яе існавала вежа, якая ішла ўглыб на 7,5 м. і стала фундаментам для Шчытоўкі. Гэта больш ранняя, амаль квадратная вежа складзена з буйных абчасаных камянёў. Яе фундамент, вышынёй 3,5 м. ляжаў на падушцы з раствору і жвіру і заканчваўся цокалем вышынёй 0,3 м. Кладка сьцяны захавалася на 4 м. Яна складзена з добра апрацаваных камянёў, прасветы паміж імі заложаны дробна паколатымі камянямі і абломкамі цэглы-пальчаткі, прамазанай вапнавым растворам. Па заключэнню Ткачова, старажытная вежа стаяла ў паўночнай частцы, як бы замыкаючы кальцо зямлянога вала і некалькі выступаючы ўперад. Аўтар датуе збудаванне гэтай вежы 60-мі альбо 70-мі гадамі XIII ст., і лічыць яе блізкай да валынскіх[10].

Яшчэ адным абарончым збудаваннем быў вал, што насыпалі каля падножжа Замкавай гары ў XIII ст., а відавочна, у XIV ст. ён быў падоўжаны, агарожваючы таксама Малы Замак. Гэты быў вал з пяску і гліны шчыльнай структуры[11].

Замкавую гару ад Малага Замка аддзяляў роў. Яго запаўняла вада. Паведамляючы аб паходзе Льва Данілавіча пад 1274 г. на Наваградак, летапісец пісаў: “паря идяшеть съ истоковъ текоущихъ из горъ, зане морозе бяхоуть велице”[12]. Гэты пар ішоў ад вады, якая сьцякала з гары і запаўняла роў[13].

Вал на Малым Замку Ткачоў характэрызаваў як дрэваземляное ўмацаванне. У заходняй частцы вала адкрыты рэшткі ахоўнай вежы, складзенай з камяню і цэглы. Гэтая вежа, як і на Замкавай гары, належыць да тыпу валынскіх[14].

Абарончыя збудаванні Наваградка ўдасканальваюцца напрацягу ўсяго перыяду яго старажытнарускай гісторыі. Старажытны вал Замкавай гары, які ператварыў неўмацаванае паселішча ў маленькую крэпасьць, абкружаў не ўсю пляцоўку. Гэта адбудзецца пазней, калі ранні вал будзе засыпаны, а новы збудаваны на краю пляцоўкі. З узвядзеннем вала на Малым Замку ў пачатку XII ст. жыхары ствараюць другую лінію абарончых збудаванняў і фарміруецца вакольны горад Наваградка. У XIII ст. ля падножжа Замкавай гары насыпаецца дадатковы вал, які абараняў горад з паўночнага ўсходу.

Дрэвазямляная канструкцыя характэрная для шэрагу гарадоў на тэрыторыі Беларусі (Пінск, Давідгарадок). Разнастайныя драўляныя канструкцыі мае вал крэпасьці ў Мінску[15]. Такая канструкцыя валоў тыповая для гарадоў Валыні і Галіцкай зямлі,

дзе яна зафіксавана ў помніках пачынаючы з канца 1 тысячагоддзя[16].

Адкрыццё ў Навагрудку каменных вежаў уключае яго ў лік гарадоў Старажытнай Русі, у якіх існавалі вежы валынскага тыпу. Істотныя змяненні ў тактыцы аблогі, якія адбыліся ў XIII ст. і праяўляліся ў актыўным штурме, адлюстраваліся ў змене і арганізацыі абароны. Менавіта ў гэты час у Заходняй Валыні і Панямонні з'яўляюцца каменныя вежы (Камянец Літоўскі, Столп'е, Белавіна блізка Холма, Чартарыйск і інш.)[17]. Навагрудак з'яўляецца другім горадам на тэрыторыі Беларусі, дзе рэальна захаваліся сляды валынскіх вежаў. У іншых гарадах (Гродна, Брэст, Тураў) звесткі аб існаванні такіх вежаў вядомыя толькі па пісьмовых крыніцах[18].

Магчыма, што ўзвядзенне вежы на Замкавай гары было звязана з уладараннем у Навагрудку валынскага князя Рамана Данілавіча. Будаўніцтва каменных вежаў спачатку на гарадскім дзяцінцы, а пазней на тэрыторыі вакольнага гораду, паказвае на тое, што ваенна-інжэнерныя збудаванні Навагрудка былі падрыхтаваны да актыўнай абароны пры штурме гарадскіх умацаванняў. Не выключана, што словы летапісца "а детинец остася", якія адносяцца да 1274 г. — часу спробы Льва Данілавіча захапіць Навагрудак, адлюстроўваюць непрыступнасьць гарадской крэпасьці з існаваўшай ужо ў той час вежай.

Інтэнсіўнае ўдасканаленне абарончых збудаванняў ператварае Навагрудак у канцы старажытнарускага перыяду яго гісторыі ў выдатна ўмацаваны горад. Гэта спрыяла актыўнаму ўмацаванню Замкавай гары, якое пачалося ў XIV ст. і прывяло да таго, што ў XVI ст. тут узнік сямівежавы Замак — адзін з самых магутных на тэрыторыі Беларусі.

Перш чым спыніцца на праблемах планіроўкі і домабудаўніцтва Навагрудка, якія ў папярэдніх работах аўтара разглядаліся паасобна для абедзьвух частак гораду, трэба каротка асвятліць некаторыя пытанні, прымяняльна да старажытнарускіх гарадоў.

Вялікім дасягненнем у вывучэнні культуры старажытнарускага гораду з'явілася адкрыццё і даследванне на яго тэрыторыі сядзіб, на якіх размяшчаліся жылыя, гаспадарчыя, вытворчыя і іншыя памяшканні, абмежаваныя плотам-тынам. Па дадзеных Ноўгараду вылучаюцца сядзібы простых гараджан, плошча якіх не перавышала 465 кв. м. і баярскія сядзібы, што займалі тэрыторыі да 1400 кв. м.[19] Наібольш выразныя сядзібы Кіева адкрыты на Падоле, памер іх да 700 кв. м. Сядзібны характар забудовы прасочваецца і ў Верхнім горадзе, дзе некалькі сядзіб стварылі асобны квартал[20].

Параўнальна нядаўна выяўленныя сядзібы ў Кіеве адкрыты таксама ў Кіеўскай зямлі (Юр'еў на Росі, Вышгарад, Іван-горад) [21].

Цікавая вясковая сядзіба XI ст., раскапаная каля в. Чарноўцы. Яна была абмежавана прыроднымі схіламі і ўзвышшамі і складалася з паўзямляначнага жыльля і астаткаў сямі пабудоў слупавой канструкцыі[22].

Да нядаўняга часу наібольш старажытныя сядзібы на тэрыторыі Старажытнай Русі адносілі да X ст. Да гэтага часу належаць сядзібы Ноўгарада і кіеўскага Падолу[23]. Больш ранняя дата з'яўлення сядзіб з'явілася з новай атрыбуцыяй вялікіх дамоў Старай Ладагі, а менавіта — VIII-IX стст. Дамы, да якіх належалі гаспадарчыя пабудовы займалі плошчу да 1000 кв. м. [24] Я.А. Рябінін адкрыў у Старай Ладаге сядзібу, каторую складалі малы дом і гаспадарчыя памяшканні, агароджаныя частаколам. Па дадзеных дэндрахраналогіі, сядзіба датавалася 810 г.[25] Такім чынам, у святле стараладажскіх матэрыялаў, сядзібная забудова ўзнікае ў дагарадскі перыяд рускай гісторыі.

Вывучэнне сядзіб Ноўгараду, які доўгі час быў адзінным горадам, дзе яны былі адкрыты, і дзякуючы берасьцяным граматам, у шэрагу выпадкаў, знайшлі імёны сваіх гаспадароў, знаменавала новы этап у даследванні гэтага гораду. У іншых гарадах Старажытнай Русі сядзібы, галоўным чынам, толькі фіксаваліся і прыцягвалі да сябе значна меньш увагі чым жылішчы. Доследаў, у якіх была б разгледзжана сядзібная забудова прымяняльна да ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі не было. Таму прыцягвае да сябе ўвагу невялікі артыкул на гэту тэму, які належыць А.І. Куставу. Ужо з самой назвы работы вынікае, што аўтар разглядае сядзібы як элементы горадабудаўнічай культуры, якія ўласьцівыя ўсім старажытнарускім гарадам. "Падабенства ў характары планіровачнай арганізацыі жылых кварталаў гарадоў розных земляў Русі - піша аўтар - сведчыць аб адзінстве горадабудаўнічай культуры гэтага перыяду"[26]. Аднак фактычны матэрыял не падцьвярджае такое катэгарычнае заключэнне.

Калі звярнуцца да планіроўкі стольных гарадоў Старажытнай Русі, то далёка не ўсе з іх мелі сядзібную забудову. Акрамя Ноўгарада і Кіева, бязспрэчныя рэшткі сядзіб адкрытыя ў Суздалі, Старай Рязані і Смаленску[27]. Што датычыць Полацка, які Кутаў уключае ў склад гарадоў з сядзібной забудовай, то, як піша Г.В. Штыхаў, матэрыялаў галоўнага раскопа на Полацком Верхнім Замку "недастаткова, каб гаварыць аб прынцыпах сядзібнай забудовы. Можна толькі мяркаваць, што адкрытыя раскопкамі пабудовы, уваходзілі ў склад гаспадарчых комплексаў, абнесеных

частаколам”[28]. Астатнія стольныя старажытнарускія гарады ў гэтым плане мала вывучаны.

Паказальныя суадносіны старажытнарускіх гарадоў (за выключэннем стольных), якія па дадзеных А.В. Кузы, мелі сядзібную забудову альбо былі такой пазбаўленыя. З 64 помнікаў, якія можна прылічыць да гарадскіх і дзе праводзіліся стацыянарныя археалагічныя работы, сядзібна-дваровую забудову мелі толькі 22 пасяленні[29]. Пры гэтым у ліку такіх двароў былі не толькі сядзібы, якія мелі пэўныя зямельныя дзялкі, але і звычайныя дваровыя комплексы. Значыць, горадабудаўнічая культура гарадоў Старажытнай Русі была не такая адзіная, як пра гэта піша А.І. Кутовой.

З усіх старажытнарускіх гарадоў, на тэрыторыі якіх не развілася сядзібная забудова, тлумачэнне ёсьць толькі для Берасьця і Ізборска. Аўтар раскопак у Бярэсьці П.Ф. Лысенка тлумачыць гэта цеснай забудовай, а У.В. Сядоў мяркуе, што шчыльная вулічная забудова вышэй успамянутых гарадоў, нагадвае планіроўку заходнееўрапейскіх гарадоў[30]. Аднак гэта праблема яшчэ чакае свайго даследвання. Няясна з прычыны якіх сацыяльных альбо іншых умоў гарады адной і той самай зямлі мелі розную планіроўку. Так у Полацкай зямлі, дзе не толькі ў Полацку, але і ў Віцебску[31] не развілася сядзібная забудова, у Мінску тэрыторыя дзяцінца была падзелена на сядзібы плошчай 220-250 кв. м.[32] У Смаленскай зямлі, акрамя Смаленска невялікія сядзібы адкрыты ў Мсьціславе, але іх не было ў Таропцы[33]. У Ноўгарадскай зямлі сядзібы былі амаль ва ўсіх гарадах (Ладага, Пскоў, Руса)[34], але ў Ізборску не развіліся. Прыклады можна памнажаць. Асаблівасьці планіроўкі гарадоў патрабуюць адпаведнага тлумачэння.

Планіроўка і забудова Навагрудка не падыходзіць пад тыпы забудовы старажытнарускіх гарадоў. Да таго ж, пры сістэматычных археалагічных работах на тэрыторыі Малага Замка і Замкавай гары, высветлілася, што кожная частка гораду забудоўвалася па-свойму. Нават арыентацыя збудаванняў па старанах свету ў двух частках гораду розная: на пасадзе-вакольным горадзе — старанамі пабудоў, а на дзяцінцы — іх вугламі. У выпадку калі вуглы будынкаў альбо іх сьцены не захаваліся, аб арыентацыі збудаванняў сведчылі бярвенні альбо дошкі, якія ляжалі in situ. Так, выяўлена, што на дзяцінцы ў раскопе 1, дошкі насьцілаў мелі той жа напрамак, што і дошкі пабудоў.

Арыентацыя пабудоў вугламі па краях свету, распаўсюджаная рыса ва ўсходнеславянскім і старажытнарускім домабудаўніцтве. Яе звычайна звязваюць альбо з адносінамі пабудоў да ракі, на

якой стояў помнік, альбо сувязьзю з валамі на яго пляцоўцы. Для Навагрaдка падобныя тлумачэнні не прымальныя. Ракі ля падножжа навагрaдскіх ўзгоркаў не было, а трывалая арыентацыя пабудоў адзначаецца ўжо ў першых насельнікаў Малага Замка ў канцы X ст., калі абарончых збудаванняў у Навагрaдку яшчэ не было. У далейшым, арыентацыя пабудоў вугламі па краях свету — на дзяцінцы і бакамі — на вакольным горадзе, утрымлівалася напрацягу ўсяго старажытнарускага перыяду гісторыі гораду. Разгледзім характар забудовы абедзьвух частак гораду паасобна.

Наібольш старажытныя насельнікі Малага Замка ў канцы X ст. жылі, галоўным чынам, па краях пляцоўкі. Паўднёвая яе частка пры гэтым, выкарыстоўвалася для гаспадарчых і вытворчых патрэбаў. Тут стаяў сьвіран (пабуд. 38), паблізу якога, відавочна, стаяла яшчэ адна такая пабудова. Тут жа былі адкрыты ямы, вырытыя ў мацерыку (55, 90 і інш.) з несумненнымі слядамі бронзаліцейных работ. Першапачаткова жылішчы знаходіліся ў паўночнай частцы пляцоўкі (15, 20, 24). У адной з жылых пабудоў рабілі цэментацыю жалеза.

Аддаленыя ад краю часткі пляцоўкі былі меньш засвоеныя. Тут былі адкрыты заглыбленая пабудова, названая “паўзямлянкай”, рэшткі каменнай печкі з крыцай і асобныя ямы ў мацерыку з керамікай X ст.

У першай палове XI ст. жылыя пабудовы з’яўляюцца ў паўднёвай частцы пляцоўкі і ў яе центры. Ад другой половы XI ст. яны ўсё больш звязваюцца з рамесніцкай дзейнасьцю. Так, пабудову 22, у якой было знайдзена больш за 100 жалезных крыц і, якая стаяла ў паўночнай частцы пляцоўкі, можна лічыць кузняй. Ярка вылучаецца залатарства ў пабудове 22. Бронзаліцейнымі работамі займаліся ў вялікім доме — пабудове 13[35].

Замкавая гара, што пуставала ў той час, калі першыя пасяленцы з’явіліся на Малым Замку, засяляецца ў пачатку XI ст. Жыцьцё ў гэты час фіксуецца выключна па краі пляцоўкі. З узвядзеннем вала на Замкавай гары, забудова яе пляцоўкі застаецца нязменнай. Сляды жыцьця другой паловы XI ст. тут вельмі інтэнсіўныя. Сярод будаўнічых астаткаў гэтага часу знайдзены малавыразнае вогніска і асобныя ямы. Верагодна, у гэты час, пляцоўка, агароджаная валам, служыла як крэпасьць і сховішча для жыхароў пасаду, што размяшчаўся на Малым Замку.

У планіроўцы і забудовае абедзьвух частак Навагрaдка з канца X да канца XI ст. цяжка ўбачыць якую-небудзь сістэму. Замкавая гара, нават стаўшы дзяцінцам, была амаль незабудавана, а на Малым Замку пераважала свободная забудова. У жылых пабудовах паўсюдна сустракаецца рамесніцкая дзейнасьць, але ні пры адной з іх не было звычайных для

старажытнарускіх паселішчаў гаспадарчых памяшканняў.

З пачатку XII ст. навагрaдскі пасад абнесены валам. Другая лінія абарончых збудаванняў ператварае пасад Навагрaдка ў ягоны вакольны горад. Пераважаючай формай домабудаўніцтва на раскапанай намі тэрыторыі, сталі вялікія і багатыя дамы. Планіроўка тэрыторыі вакольнага гораду дастаткова своеасаблівая. Нашчыльна да валу, на месцы старых дамоў будуюцца новыя. Пабудова 12 змяняе пабудову 13, а пабудовы 18 і 19 узводзяцца на месцы раней існаваўшай пабудовы 21.

Другая лінія дамоў займала цэнтральную частку пляцоўкі, прыкладна ў 10 м. ад прывальных пабудоў. Там паўсталі заглыбленая пабудова 6 і наземная пабудова 3. Наўрад ці можна лічыць прастору паміж двума лініямі дамоў вуліцай. Для гэтага яна была занадта шырокая. Да таго ж не было ніякіх слядоў замашчэння прасторы паміж лініямі дамоў, хаця праход паміж імі захаваўся і ў далейшыя часы.

Паўднёвая частка пляцоўкі ў першай палове XII ст. была занята хрысьціянскімі могілкамі, што можа сведчыць аб з'яўленні на тэрыторыі вакольнага гораду царквы.

Максімальны росквіт вакольнага гораду прыпадае на другую палову XII ст. На месцы дамоў першай паловы, што стаялі пры вале, узводзяцца дамы 7, 10, 16. Новыя жылыя пабудовы будуюцца і на раней незабудаваным прывальным участку. У цэнтры пляцоўкі над заглыбленым домам узводзіцца жылішча 5, а на пустуючых дзялках дамы 1, 2 і 28. Багатыя дамы займаюць тэрыторыю могілак (32, 35). Там жа ўзнікаюць два звычайныя жылішчы (26, 27), якія адрозніваюцца сваёй арыентацыяй. Ямы ад слупоў у паўднёвай частцы пляцоўкі з керамікай XII ст. і абломкі амфар могуць сведчыць на карысьць таго, што ў гэты час там рабілі пабудовы аблегчанай канструкцыі.

У пачатку XIII ст. на тэрыторыі вакольнага гораду адзначаецца рэзкі заняпад будаўніцтва. Паўднёвую частку пляцоўкі ізноў займаюць могілкі, на гэты раз, амаль выключна занятыя дзіцячымі пахаваннямі. Жылых пабудоў гэтага часу налічваецца толькі тры. Гэта дом 9, які змяніў пабудову 10 ля вала, жылішча 4, якое прыйшло на змену дому 5 і пабудова 17, якая збудавана на раней пустым месцы[36]. У такім выглядзе вакольны горад існуе да 70-х гадоў XIII ст., калі ён быў заваяваны Львом Данілавічам.

Археалагічныя матэрыялы дазваляюць прыйсці да высновы, што забудова Малага Замка калі ён быў першапачатковым паселішчам, а потым пасадам і вакольным горадам Навагрaдка, была выключна свабадная і рэгламентацыя не мела. Невялікая колькасьць гаспадарчых памяшканняў ранняга паселішча, пазней

знікае. Выключэннем была пабудова 11, якая ўваходзіла ў сьцяну раскопа і, верагодна, прадстаўляла з сябе падсобнае памяшканне багатага дома 10.

Такім чынам, да таго часу, калі наваградскі пасад ператварыўся ў вакольны гарад, на яго тэрыторыі не было пабудоў, якія можна было б лічыць свірнамі, клунямі, хлявамі і іншымі пабудовамі, звычайнымі каля жылых памяшканняў. Застаецца мяркаваць, што ўсе гэтыя, неабходныя для жыцьця пабудовы, знаходзіліся на спецыяльна вылучанай тэрыторыі, якая не трапіла ў наш раскоп. Археалагічныя работы на Замкавай гары паказалі, што ў Наваградку мела месца выдзяленне асобнай гаспадарчай зоны.

Раскапаная намі тэрыторыя вакольнага гораду XII-XIII стст. была амаль цалкам занятая вялікімі і багатымі дамамі залатароў. У выніку даследваняў старажытнарускіх гарадоў знайдзена шмат багатых жылішчаў, але такой канцэнтрацыі іх, якая аказалася ў Наваградку, пакуль не сустракалася. У Кіеве, на тэрыторыі гораду Яраслава аткрыты дамы з багатым інвентаром. Па мяркаванню даследчыкаў, яны размяшчаліся ўздоўж адной вуліцы і належалі багацейшым кіянам XI-XIII стст.[37] У Наваградку ж, багатыя дамы займалі ўсю ўсходнюю частку вакольнага гораду, складаючыся ў асобны квартал. Да таго ж яны пераўзыходзілі кіеўскія як па характару домабудаўніцтва, так і па інвентару.

Звернем увагу на характар забудовы Замкавай гары. Малазасвоеная з пачатку існаваня на ёй паселішча і перыяду ўзвядзення на ёй вала, яна пачынае інтэнсіўна забудоўвацца з пачатку XII ст. Забудова Замкавай гары — наваградскага дзяцінца — таксама незвычайная, як і забудова вакольнага гораду Наваградка, хаця своеасаблівасьць забудовы іншая.

У паўночным раскопе намі былі адкрыты пабудовы толькі гаспадарчага прызначэння. Гэта свірны і клуні, якія будавалі напрацягу пяці будаўнічых перыядаў. Ад наібольш ранняга з іх захаваліся рэшткі сатлеўшых пабудоў. Астатнія дайшлі да нас згарэўшыя, часьцей за ўсё запоўненыя згарэлым зернем.

Пасля пераносу старажытнага валу на край пляцоўкі, зона, занятая клунямі і свірнамі пашыраецца, прымыкаючы да зноў пабудаванага валу. Для кожнага будаўнічага перыяду выяўлена дзве-тры пабудовы, аднак мяркуючы па скапленню згарэлага зерня на плошчы 260 кв. м. іх, верагодна, было больш. Сатлелыя пабудовы, мяркуючы па знайдзеных у іх рэшткам бочак, абломкам амфар, косткам жывёлы і птушкі, таксама выкарыстоўваліся ў якасьці гаспадарчых памяшканняў.

У паўночным раскопе з адкрытых 15 пабудоў XII-XIII стст. не было ні адной жылой і гэта дае падставы лічыць, што ў гэты час

на дзяцінцы вылучаецца асобная зона, у якой былі сканцэнтраваны толькі пабудовы гаспадарчага прызначэння, што стаялі спачатку пад прыкрыццём старажытнага вала, а потым пад абаронай зноў пабудаванага вала.

У гарадах лясной зоны, да якой належыць наш помнік, падобная канцэнтрацыя гаспадарчых памяшканняў невядомая. Звычайна, яны стаялі паблізу жылых. Прыкладна, такая ж забудова характэрная і для паўднёвых старажытнарускіх гарадоў-крэпасьцяў (Райкі, Каладзяжын, Воін, Ізяслаўль і інш.), дзе гаспадарчыя памяшканні перамяжаліся з жылымі[38].

З паўднёвага захаду да гаспадарчых пабудоў прытыкалі насьцілы, да атрыбуцыі якіх мы звернемся ніжэй. Бронзавыя матрыцы і іншыя інструменты залатароў, а таксама нарыхтоўкі з каляровых металаў і срэбра, паказываюць на тое, што на полудзень ад гаспадарчай зоны працавалі рамеснікі-залатары, хаця самі майстэрні адкрыть не ўдалася.

У паўднёвай частцы пляцоўкі да XII-XIII стст. належаць рэшткі наземных жылішчаў, часам спалучаныя з гаспадарчымі памяшканнямі. Гэта былі наземныя рубленыя дамы з глінабітнымі печкамі, іх гісторыя раскладаецца на чатыры будаўнічыя перыяды. Сярод вырабаў гэтага часу — характэрная кераміка, жалезныя і драўляныя вырабы, абломкі шкляных бранзалетаў і інш.[39]

Мяркуючы па інвентары, пабудовы паўднёвага раскопу сінхронныя сьвірнам і клуням паўночнага раскопа. Гэтая частка пляцоўкі дзяцінца была заселена залежнымі ад феадала гараджанамі.

Сляды забудовы XII-XIII стст. аткрыты ў паўднёва-усходнім баку пляцоўкі. На адным з кавалкаў гэтай часткі дзяцінца культурны слой старажытнарускага часу быў разбураны познесярэдневяковым будаўніцтвам, аднак аб тым, што ён тут быў, можна мяркаваць па знаходках адпаведнай керамікі, абломках амфар, шкляных бранзалетаў, шыферных прасліцаў і іншых тыпаў рэчаў[40]. Сляды забудовы старажытнарускага часу засталіся і на іншых частках пляцоўкі Замкавай гары.

У выніку раскопак на тэрыторыі наваградскага дзяцінца для XII-XIII стст. выяўлена зона гаспадарчых збудаванняў, частка, дзе жылі простыя гараджане, тэрыторыя, дзе працавалі залатары і некаторыя другія часткі. Застаецца невысветленым, дзе жыў гаспадар дзяцінца і яго атачэнне, тыя каму, несумненна, належала зона гаспадарчых пабудоў. Засноўваючыся на ўласьцівай для Наваградка пераемнасьці ў домабудаўніцтве, можна мяркаваць, што жыльлё знаці размяшчалася ў паўночнай частцы пляцоўкі ля вала. Там, у XIV ст. стаяў каменны дом феадала[41] і палац XV-XVI стст., што прытыкаў да Шчытоўкі. Цікава пры гэтым

заўважыць, што вялікая частка багатых дамоў вакольнага гораду таксама шчыльна прытыкала да валу.

У XII-XIII стст. наваградскі дзяцінец робіцца магутнай крэпасьцю. Аб гэтым сведчаць яго абарончыя збудаванні і шматлікая зброя, знайдзеная падчас раскопак. Не выпадкова, злучаная раць валынскага князя Льва, у якой акрамя старажытнарускіх воінаў былі мангола-татары начале з Ягурчынам не змаглі яго заваяваць.

Археалагічныя матэрыялы Замкавай гары XII-XIII стст. даюць падставы лічыць, што наваградскі дзяцінец — гэта цытадэль старажытнарускага гораду прадстаўляе з сябе своеасаблівы феадальны двор[42]. Некаторы падзел па сацыяльнаму стану можна адзначыць на дзяцінцы старажытнага Друцка, дзе ў паўднёвай частцы пляцоўкі сялілася залежнае насельніцтва, а ў заходняй частцы, відавочна, стаялі княжаскія харомы. Цэнтральная ж частка пляцоўкі была незаселенай[43]. Больш блізка наваградскі дзяцінец нагадвае дзяцінец старажытнага Любіча XI ст., у якім, па Б.А. Рыбакову, быў палацавы комплекс, які ўваходзіў у лінію сьцяны, драўляная царква, участак, заняты гаспадарчымі пабудовамі, жыльлё чаляднікаў і іншыя комплексы, характэрныя для феадальнага двара[44].

Падагульняючы назіранні аб забудове Навагрудка, можна адзначыць, што калі дзяцінец XII-XIII ст. у нейкай ступені нагадвае дзяцінец Любеча XI ст., то вакольны горад, забудаваны багатымі дамамі, што ўтварылі асобны квартал, у іншых старажытнарускіх гарадах не мае паралеляў.

У спецыфічнай планіроўцы і забудове Навагрудка, а таксама іншых гарадоў, пазбаўленых сядзібна-палацавай забудовы, адлюстроўваецца не адзінства горадабудаўнічай структуры старажытнарускіх гарадоў, як лічыць А.І. Кутовой, а яе разнастайнасьць, якая пакуль яшчэ не мае тлумачэння.

Жылыя і гаспадарчыя пабудовы падрабязна апісаны ў нашай кнізе, прысвечанай пасаду-вакольному гораду Навагрудка. Там жа маецца глава, у якой прааналізавана домабудаўніцтва гэтай часткі гораду[45]. Адпаведныя матэрыялы дзяцінца — Замкавай гары прыведзены ў гэтай працы. Задачай дадзенай часткі главы з'яўляецца сістэматызацыя дадзеных домабудаўніцтва старажытнарускага Навагрудка.

Рэшткі заглыбленых пабудоў сустракаюцца толькі на тэрыторыі Малага Замка. З трох будынкаў гэтага тыпу, два адносяцца да дагарадскога перыяду ў гісторыі паселішча. Яны знаходзіліся ў цэнтральнай частцы пляцоўкі. Адзін з іх умоўна названы "паўзямлянкай". Плошча яго каля 18 кв.м. Сьценкі ўмацаваныя камянямі, каля ўсходняга вугла захавалася яма ад

слупа. Для аціплення “паўзямлянкі” было вогніска з камянёў. Гэты заглыблены на 0,7 м. у мацярык комплекс вельмі недасканалы, вуглы яго непрамыя. Аднак у адрозненне ад гаспадарчых ям, сьценкі яго роўныя, а знайдзены там інвентар — кераміка, прылады працы і ўпрыгожванні цалкам адпавядаюць запаўненню жылой пабудовы. Плошча другой заглыбленай пабудовы вызначыць не ўдалася. Яна, відавочна, мела ўпушчаны зруб, ад якога захаваліся сгарэлыя бярвенні і дошкі. Печка-каменка гэтай пабудовы мела дзве глінабітныя падлогі, якія змянілі адна другую[46].

З’яўленіе ў Наваградку заглыбленых дамоў можна ўпэўнена звязаць з перасяленцамі з Ваўкавыска, дзе, як адзначалася ў папярэдняй главе, да канца XI ст. будаваліся, выключна, заглыбленыя дамы. На ўсход ад Наваградка паўзямлянкі вядомыя ў Заслаўлі і Мінску[47]. З паўднёвай домабудаўнічай традыцыяй звязана знаходка патэльні ў пабудове 31 - сярод астаткаў печы, ад якой захаваліся гліна і попел[48]. Фрагменты патэльняў сустракаліся ў культурным слоі паселішча X-XI стст. на Малым Замку. Патэльні з’яўляюцца яшчэ адным доказам пранікнення ў ранні Наваградак жыльля паўднёварускага тыпу. Падобныя патэльні служылі як навершыя печаў; яны вядомыя ў паўднёварускіх зямлях з VIII ст. і сустракаюцца на паселішчах аж да XII-XIII стст. (Плеснеск, Іван-Гара, Перэяслаўль)[49].

Заглыбленыя дамы, што былі ў Наваградку напачатку ранняй яго гісторыі даволі хутка знікаюць. Аднак у пачатку XII ст., з фарміраваннем вакольнага гораду Наваградка, там з’яўляецца адзіны заглыблены дом зусім іншага характару. Гэта пабудова 6, падрабязна апісаная ў нашай кнізе. Нагадаем яе галоўныя асаблівасьці. Рэшткі жылой пабудовы знаходзіліся ў катлаване, які вырыты ў цэнтры пляцоўкі. Гэта быў зрубны двухкамерны дом, плошчай 77 кв. м., заглыбленая частка якога складала каля 1 м. У вялікім, квадратным у плане памяшканні, знаходзілася прамавугольная печка з глінабітным подам і зводам. Падлога з дошак была насьцелена на лагі[50]. Заглыбленая ў мацярык пабудова 6, несумненна, мела наземную частку, знішчаную пры пабудове наступных па часу дамоў.

У пабудове 6 цяжка бачыць працяг будаўнічай традыцыі заглыбленых жылых дамоў ранняга Наваградка. Ад іх дадзеную пабудову аддзяляла цэлае стагоддзе, калі на Малым Замку не будавалі жылых заглыбленых дамоў. Тым не меньш, пабудова 6 належыць да тыпу паўднёвых жылых комплексаў. У кнізе “Старажытны Наваградак” паралелі ей паказаны ў Кіеве і Белгарадзе[51]. Далучым да іх дадзеныя з раскопак на Залатым току ў Галічы. У 1980-1981 гг. там былі адкрыты заглыбленыя

жылыя дамы, у тым ліку пабудова з багатым інвентаром. Падлога яе была пакрыта тканінай, на думку аўтара раскопак, дываном. Цікава, што побач з гэтым домам была кладоўка ліцейшчыка-залатара з багатым інструментарыям[52].

Багатыя заглыбленыя дамы з поўдня пранікалі і ў лясную паласу. У Суздалі адкрыты такі комплекс, ён складаўся з трох памяшканняў. На падлозе аднаго з іх, пакрытай берастой, сярод знаходак ёсьць шкляны посуд і паліваны збанок усходняга паходжання[53]. У заглыбленым доме Старой Рязані, на падлозе, якая выкладзена драўлянымі плахамі, знайдзены два скарбы, а таксама срэбрны пярсьцёнак, фрагменты візантыйскай паліванай талеркі і інш.[54]

Вярочаючыся да наваградскай заглыбленай пабудовы 6, трэба адзначыць, што яна аднесена да катэгорыі багатых не толькі па сваіх памерах, але і па характару інвентара. Тут былі знайдзены абломкі трох амфар і двух шкляных пасудзін. Разам з тым, дадзеная пабудова была адным з самых ранніх багатых дамоў вакольнага гораду. У ёй яшчэ не было шкляных бранзалетаў, якіх пачынаючы з 30-х гадоў XII ст. у вакольным горадзе было вельмі шмат. Цікава, разам з тым, што ў дадзеным комплексе не было слядоў заняткаў залатарствам, што тыпова як для ранніх жылых пабудоў дзяцінца Замкавай гары, так і для багатых дамоў вакольнага гораду.

Вялікая жылая пабудова 6 — гэта адзінае пранікненне ў пачатку XII ст. паўднёвага домабудаўніцтва, якое не атрымало далейшага развіцця. Дом, які пабудавалі на гэтым месцы наступныя гаспадары, быў наземны, крыху заглыблены ў катлаван.

У Наваградку пераважала наземнае домабудаўніцтва. У абедзьвух частках гораду адкрыта і даследвана каля 15 наземных жылых пабудоў, якія належалі простым гараджанам. На працягу ўсяго разгледжанага перыяду яны даволі падобныя. Жылішчы былі зрубныя, узведзены з бярвенняў дыяметрам 20-22 см. Пабудовы рабіліся на месцы, аб чым можна мяркаваць па слою шчэпак, які асабліва выразна выяўлены на Замкавай гары. Зрубы рабіліся “у абло”. Чашку, звычайна, высякалі ў верхнім бервяне. Сьцены асобных жылішчаў на Малым Замку прамазвалі глінай. Не заўсёды можна было вызначыць плошчу жытла, але мяркуючы па межах падлогі, некаторыя дамы мелі плошчу да 40 кв. м. Усе шэраговыя пабудовы былі аднакамерныя з дашчатай падлогай. Падлога (з дошак шырынёй 20-22 см.) лепш захавалася ў дамах Замкавай гары.

Амаль ва ўсіх дамах былі глінабітныя печы. У некаторых пабудовах ад печаў захаваўся толькі тонкі слой гліны з залой. У

самай старажытнай пабудове Малага Замка (15) выяўлены калы ад каркасу печы. Там, дзе печы захаваліся лепш, знайдзены рэшткі глінабітных скляпеністых зводаў (пабудова 23 на Малым Замку, пабудовы 2, 3 на Замкавай гары), а таксама рэшткі ад аднаго да чатырох глінабітных подаў. Часам удавалася прасочыць печкі, ад якіх ацалелі цясіны, пастаўленыя на рабро, а таксама слупы, што прылягалі да аднаго з вуглоў печы. Аб патэльнях, якія былі заканчэньнем печаў, гаварылася вышэй. Рэшткі печы-каменкі знайдзены толькі ў адной з наземных пабудоў Малага Замка.

Звычайныя наземныя дамы Наваградка тыповыя для домабудаўніцтва лясной паласы - яны прадстаўлены зрубнымі пабудовамі з глінабітнымі печамі і дашчатай падлогай. Вуглавыя слупы пры печах, падобныя да тых, якія былі адкрыты на Замкавай гары, былі падпорай для падыходзячых да іх бэлек; некаторыя з такіх бэлек служылі аснаваннем ляжанкі[55]. Уплыў паўднёвай традыцыі ў домабудаўніцтве абмяжоўваецца існаванніем у гэтага тыпу будынкаў асобных печаў з заканчэньнем у выглядзе патэльняў.

Асобныя вогнішчы і вялікая колькасьць ямаў, што знайдзены на абодвух узвышшах Наваградка, даюць падставу мяркаваць, што як у раннюю пару яго гісторыі, так і ў перыяд росквіту ўзводзіліся аблегчаныя, магчыма сезонныя пабудовы.

Пры вывучэнні вялікіх і багатых дамоў вакольнага гораду Наваградка ў свой час,[56] нам не ўдалася выявіць некаторыя іх асаблівасьці і неабходна ізноў вярнуцца да гэтых цікавых комплексаў. Як паказана, вялікі заглыблены дом 6 не атрымаў працягу ў домабудаўніцтве Наваградка. Усе астатнія вялікія дамы былі наземныя і ўзніклі як працяг мясцовай будаўнічай традыцыі.

Самы ранні вялікі дом быў пабудаваны яшчэ да афармлення на тэрыторыі Малага Замка вакольнага гораду. Гэта пабудова 13, датуецца канцом XI альбо мяжой XI і XII стст. Мяркуючы па рэшткам сатлеўшай і згарэлай падлогі, плошча яе была каля 70 кв. м., а мяркуючы па накірунку валокнаў падлогі, дом быў двухкамерны. Паблізу паўднёвай сьценкі знаходіліся рэшткі печы. Цяжка сказаць з якога матэрыялу былі сьцены гэтага дома. Рэшткі неабпаленай гліны, асабліва масіў яе ў паўночнай частцы пабудовы, відавочна, адносіліся да верхніх частак дома. Інвентар пабудовы сьціплы ў параўнанні з тым наборам рэчаў, які запаўняў больш познія вялікія дамы[57]. Разам з тым пабудова 13 з'яўляецца папярэдніцай багатых наземных дамоў вакольнага гораду Наваградка. Над ёй пазней была пастаўлена пабудова 126, выдатная сваім фрэскавым роспісам і цудоўнымі знаходкамі.

У пабудове 216 сінхроннай пабудове 13, таксама можна ўбачыць комплекс, папярэдні багатым дамам Наваградка, хаця ад

яе захаваліся толькі рэшткі сатлелай і згарэлай падлогі. У дадзенай пабудове, больш выразна, чым у іншых дамах, выяўлена, што гаспадары займаліся залатарствам,[58] такім характэрным для ўладальнікаў багатых дамоў XII-XIII стст. рамяством.

Не ўсе багатыя дамы былі пабудаваныя на развале жытла папярэдняй пары. Амаль палова іх пастаўлена на культурным слоі XI ст., а пабудова 5, як гаварылася, узнікла над заглыбленым домам 6.

У тых выпадках, калі ўдавалася абазначыць граніцы дамоў, выявілася, што яны займалі плошчу ад 76 да 110 кв. м. Рэшткі зрубаў знайдзены пры даследванні пабудоў 10 і 33. У апошняй рубка зроблена ў абло. Гліна, якой прамазвалі толькі асобныя пабудовы ранняга паселішча, у будынках XII-XIII стст. мела вялікае значэнне. Паўсюдна сустракаліся кавалкі глінянай абмазкі з адбіткамі дрэва. У багатых дамах гліна выкарыстоўвалася па-рознаму. Дашчатая падлога пабудовы 4 ляжала на слоі неабпаленай гліны. Завалы неабпаленай гліны значнай таўшчыні, што ляжалі ў два і нават у тры слоі, мелі непасрэднае дачыненне да сьценаў дамоў. Абваленая частка сьцяны пабудовы 9 складвалася з вапняковых плітаў, устаўленых у гліну. У пабудове 1 знайдзены рэшткі двух ваконных праёмаў з абпаленай гліны з уключэннем цэглы.

У вялікіх дамах вакольнага гораду ў якасьці будаўнічага матэрыялу ўжывалі цэглу. Развал яе знайдзены ва ўсходняй частцы пабудоў 18, 7, 28 і інш. Вельмі многа дробных абломкаў цэглы знайдзена пры разборцы рэшткаў пабудовы 10. У тых выпадках, калі ўдавалася цэглу замерыць, яна мела памеры: 24-30x15-20x4-5 см. Зрэдку побач са звычайнай цэглай сустракалася лекальная. У развалах пабудоў сустрэлася даволі многа камянёў.

Такім чынам, будаўнічы матэрыял вялікіх дамоў вакольнага гораду дастаткова разнастайны. Гэта дрэва, аб распаўсюджанні якога, акрамя сатлелых і згарэлых бярвенняў і дошак, сведчыла вялікая колькасьць цьвікоў, важнае значэнне мелі гліна, цэгла і камяні. Сярод апошніх толькі аднойчы знайдзена сьцяна складзеная з вапняку.

Шмат якія вялікія дамы былі двухкамерныя. Такой была пабудова 5, збудаваная над заглыбленым домам 6, яна паўтарыла яго план. Верагодна дзве камеры мела пабудова 4, якая змяніла пабудову 5, хаця печ у ёй была пастаўлена іначай, чым у абодвух ніжэй ляжаўшых дамах. У іншых дамах няма археалагічнага абаснавання таго, што яны мелі дзве камеры, але, верагодна, гэта было так. Тым больш, калі гутарка ідзе аб пабудове 12, сьцены якой былі атынкаваныя і пакрыты фрэскавым роспісам.

У старажытнарускіх гарадах раскапана не мала багатых дамоў, якія былі, як звычай, цэнтральнымі аб'ектамі сядзіб. Такія дамы, сярод якіх вылучаецца цудоўны комплекс мастака XII ст., ёсьць ў Ноўгарадзе. Зрубны багаты дом, упрыгожаны карнізамі з разным арнаментам, датаваны XI ст. адкрыты ў Старай Русе. Багатыя зрубныя дамы адкрыты ў Серэнску, Белаозеры, Яраполчы Залескім і іншых гарадах. Дамы заможных гараджан горада Яраслава ў Кіеве былі зрубнымі і каркасна-слупавымі з часткова альбо цалкам заглыбленым аснаваннем[59]. Разнастайнасьць будаўнічага матэрыялу ў багатых дамах Наваградка, нехарактэрная для жылых будынкаў сацыяльных вярхоў іншых старажытнарускіх гарадоў. Бліжэй другіх да наваградскіх жылішчаў вакольнага гораду падыходзяць харомы баярына XIII ст. са Старай Рязані, якія прадстаўлялі з сябе наземны зруб плошчай каля 100 кв. м. Бярвенні яго былі абмазаны глінай. У якасьці будаўнічага матэрыялу былі выкарыстаны абломкі цэглы. У адрозненне ад наваградскіх дамоў з дошчатай падлогай, пабудова Старай Рязані мела гліняную падлогу, з уключэннем вугельчыкаў, абломкаў цэглы і абломкаў керамікі[60].

Частка печаў вялікіх дамоў нагадвала глінабітныя печы пабудоў X-XI стст. Адтуліны ад калоў каркаса печы адзначаны ў глінабітнай печы пабудовы 7. У наібольшай па плошчы пабудове (16) акрамя глінабітнай падлогі захавалася аснаванне зводу печы. У пабудове 1 адкрыты пры печы квадратны драўляны насьціл і падпечная яма.

Печы вялікіх дамоў складзены, галоўным чынам, з прымяненнем цэглы. Лепш за іншыя захавалася печ пабудовы 5, у ніжняй частцы яна складзена з камянёў змацаваных глінай, а на вышыні 6 м. была выкладзена радам цэглы, змацаванай растворам. Звод печы быў з камянёў, а падлога з пяці радоў цэглы. Печка пабудовы 4, якая змяніла пабудову 5, складзена з гліны з уключэннем цэглы, а яе драўляная апалубка была прамазаная глінай. У астатніх вялікіх дамах ад печаў захаваліся развалы цэглы, абломкі гарэлага дрэва, попел і вугольле[61].

У старажытнарускіх помніках нярэдка карысталіся цэглай пры ўзвядзенні печаў. Для X-XI стст. гэта назіраецца ў Кіяве, Вышгарадзе і на гарадзішчы Цымлянскім[62]. Значна ўзрастае выкарыстанне цэглы для печаў у XII ст. у лесастэпавай зоне, акрамя Кіева, гэта назіраецца ў Белгарадзе і Юр'еве на Росі, а ў лясной — ва Ўшчыжы, Старай Разані, Пронску, Яраполчы Залескім, Мураме, Тураве, Бярэсьці, Гродне і іншых гарадах. У Тураве пракладка з цэглы выкарыстоўвалася ў склепе, а ў Гродне плінфай быў выкладзены ганак і з яе было складзена часовае вогнішча[63].

П.А. Рапапорт апраўдана звязвае прымяненне цэглы ў домабудаўніцтве з развіццём на паселішчы манументальнага дойлідства[64]. Тым больш дзіўна, што ў Ноўгарадзе з яго развітай архітэктурай цэгла пры ўзвядзенні жылых пабудоў, у прыватнасьці печаў, не выкарыстоўвалася аж да канца XIV ст. Таму выкладзеная цэглай падлога ў падклеці дома мастака XII ст. разглядаецца як выключная з'ява[65]. Што датычыць Навагрaдка, то шырокае выкарыстанне цэглы ў багатых дамах яго вакольнага гораду, несумненна, звязана са з'яўленнем у горадзе манументальных пабудоў, у першую чаргу, царквы Барыса і Глеба ў другой чвэрці XII ст. на ўзвышшы, суседнім з вакольным горадам[66].

Шмат у якіх старажытнарускіх гарадах і нават у Ноўгарадзе печы палілі па-чорнаму. Багатыя дамы Навагрaдка наўрад ці абагравалі такім чынам. Доказам гэтаму служыць тое, што на фрэсках такога дома зусім не было слядоў сажы. Пры раскопках некаторых паселішчаў (Кіеў, Кічкас, Райкі, Пліснеск) знайдзены фрагменты гліняных трубаў, магчыма, астаткаў дымаходаў. Больш пераканаўчыя фрагменты дымаходу Ленкавецкага гарадзішча. Гэта трохсьценныя жалабы з абпаленай гліны, унутраная паверхня якіх была пакрыта сажай[67].

У дзевяці багатых дамах знайдзены абломкі ваконнага шкла з борцікамі. Дыяметр шыбаў 19-22 см. Сустрэліся больш 300 фрагментаў такога шкла. У адным з двух ваконных праёмаў пабудовы 1, вышынёй 45 см., шырынёй 25 см. былі абломкі двух ваконных дыскаў. Відавочна, і астатнія вокны мелі па два акруглых шкла. Да раней вядомых ваконных рамаў, якія названыя ў кнізе "Старажытны Навагрaдак"[68], далучым дадзеныя аб ваконніцы XI ст. з кіеўскай Сафіі. Яна прадстаўляла з сябе прамавугольную раму з акруглым верхам. Вышыня яе 1,45 м., шырыня - 0,92 м. Рама мела вертыкальныя і гарызантальныя брусы, у якія ўстаўлялі шкляные дыскі дыяметрам 22 см., і прымацоўвалі замазкай. Усяго ў ваконніцы было 14 кавалкаў шкла[69]. Ваконніца Кіеўскай Сафіі сваімі памерамі і колькасьцю дыскаў нашмат пераўзыходзіла тое, што прадстала перад намі ў вакольным горадзе Навагрaдка, але памеры ваконных дыскаў у нашым горадзе былі такія ж, як у храме стольнага Кіева.

Ваконнае шкло даволі шырока вядома ў старажытнарускіх гарадах. Так, у Кіяве, дзе ў майстэрні Лаўры, бясспрэчна, выраблялі ваконныя дыскі[70], знаходкі яго, акрамя палацавага комплексу, адзінкава адзначаны толькі ў развале аднаго з жылішчаў гораду Яраслава[71]. Глуха ўспамянуты знаходкі ваконнага шкла ў Старай Рязані, Суздалі, Яраполчы Залескім, Шэстовіцах і іншых пунктах[72]. Цікавыя знаходкі ваконных

шыбаў з вялікіх дамоў у навакольлі Галіча з бардзюрам і каляровым роспісам[73]. Даволі многа дадзеных аб знаходках ваконных дыскаў у гарадах Заходняй Русі (Тураў, Пінск, Ваўкавыск, Гродна)[74]. Аднак паўсюды гэта былі адзінкавыя знаходкі, і толькі ў вакольным горадзе Наваградка вялікія дамы былі паўсюдна зашклёныя.

Характэрызуючы інтэр'ер багатых жылішчаў вакольнага гораду трэба зноў звярнуцца да такой унікальнай з'явы як фрэскавы роспіс пабудовы 12. У свой час Ю.П. Спегальскі, які рабіў рэканструкцыю гэтага роспісу, змясьціў яго над лаўкамі, паколькі, па яго мяркаванню, дом абпальваўся па чорнаму[75]. Як гаварылася вышэй, цяжка пагадзіцца з тым, што багатыя дамы вакольнага гораду не мелі дымаходаў і роспіс, на якім не было знакаў сажы, мог займаць вялікую прастору сьценаў пабудовы.

Фрэскі жылой пабудовы ў шэрагу выпадкаў падобныя да фрэскавага роспісу наваградскага Барысаглебскага храма. Гэта адзначаецца ў тых выпадках, калі роспіс зроблены "пад камень". Пры гэтым у царкве мазкі па зялёным фоне нанесены карычневай фарбай, а ў пабудове — карычневай і чырвонай. Захаваныя графіці паказваюць на тое, што ў царкве фрэскі былі і на вышыні чалавечага росту. В.А. Галібін, які супастаўляў красіцелі роспісаў жытла і царквы, давёў, што яны ідэнтычныя. Такім чынам, няма сумневу ў тым, што храм і сьцены пабудовы 12 распісвалі адны і тыя ж майстры. Сьцены храма і жылога дому маглі быць распісаны толькі пасля таго, як было закончана іх будаўніцтва. Гэта адбылося альбо адначасова, альбо сьценапіс жылой пабудовы быў нанесены адразу, пасля таго як закончылі роспіс Барысаглебскай царквы[76].

Нешматлікія паралелі распісаных сьценаў у жылых пабудовах старажытнарускіх гарадоў і іншых помнікаў мы, у свой час прыводзілі[77]. Далучым да іншага жылую пабудову, адкрытую на Уладзімірскай вуліцы Кіева, дзе ў завале печы знайдзены фрагменты фрэскавага роспісу белага, цёмна-шэрага, карычневага, зялёнага і жоўтага колераў на глінянай аснове[78]. Роспіс на сьценах пабудоў гарадішчаў Латвіі (Тэрветэ, Ерсіка) быў таксама нанесены на гліну[79].

Пры разборы інвентара пабудовы 16 было знайдзена шэсьць паліваных плітак. Тры з іх (квадратныя, старана 2,2 см.), пакрывала жоўтая паліва. Такая ж паліва была на прамавугольнай плітцы, а дзве пліткі, са стараной 5 см. былі пакрыты зялёнай палівай[80]. Можа быць, гэтыя пліткі засталіся ад майолікавай падлогі. У Звенігарадзе (галіцкім) пры даследванні наземных жылішчаў знайдзены абломкі керамічных плітак ад падлогі. Паліваныя пліткі знайдзены таксама ў наземных жылішчах

Ноўгарада Северскага[81].

У інвентары двух змяніўшых адна другую пабудоў знайдзены часткі бронзавых люстр-хорасаў[82]. Магчыма, яны належалі да аднаго асвятляльнага прыбора багатага дома. Хорасы і іх часткі добра вядомыя як у стольных, так і малых старажытнарускіх гарадах (Кіеў, Мінск, Ваўкавыск, Тарапец, Юр'еў на Росі і інш.) [83]. Яны звычайна разглядаюцца як сведчанне аб наяўнасьці храма на тэрыторыі паселішча. Радзей хорасы звязваюць з жылымі пабудовамі. Гэта мела месца пры раскопках багатага дому ва Ўшчыжы, а таксама дома мастака ў Ноўгарадзе[84]. У нашым выпадку бронзавая люстра напэўна належыць да інтэр'еру жылой пабудовы.

Даследчыкі старажытнарускага жыльля часта спрабуюць ўзнавіць мэблю дамоў па ямках у падлозе. Такія ямкі вядомыя амаль ва ўсіх пабудовах вакольнага гораду. З інтэр'ерам пабудовы 33 звязана абрушаная абгарэлая паліца, на якой знаходзіўся акруглы драўляны прадмет дыяметрам 40 см.[85] Верагодна, такія паліцы былі і ў іншых дамах. Прыгожы паліваны, фаянсавы і шкляны посуд, які ў вялікай колькасьці сустракаецца ў багатых дамах вакольнага гораду Наваградка, меў не толькі утылітарнае, але і эстэтычнае значэнне і павінен быў красавацца на паліцах і пастаўцах.

Да інвентара багатых жылых дамоў належалі амфары. На тэрыторыі вакольнага гораду знайдзена больш за 25000 абломкаў, ад прыкладна 75 пасудзін. У жылішчах захоўвалася адначасова да 10 пасудзін, якія, мяркуючы па пабудове 12, стаялі па кутах дома[86]. Захаванне амфар у жыльлі вядома ў Кіеве і Пронску, дзе ў цэнтральнай частцы жылой пабудовы стаялі тры, укапаныя ў зямлю амфары [87].

Трэба думаць, што вялікія і багатыя, з зашклёнымі вокнамі дамы вакольнага гораду Наваградка не былі аднапавярховыя, хаця археалагічных доказаў гэтаму цьверджанню няма. Строгая пераемнасьць у домабудаўніцтве прыводзіла да таго, што пры збудаванні новага жыльля на месцы старога, пляц раўнялі і ўсё, што магло належаць да верхняга яруса памяшкання знікала. Так над пабудовай 12 была пастаўлена пабудова 10, над якой у сваю чаргу, узвялі пабудову 9. Такая ж паслядоўнасьць назіралася ў пабудове дамоў 6, 5 і 4. У тых выпадках, калі жылішчы будавалі не на рэштках папярэдняга дома (пабудовы 1, 3, 8 і інш.), яны дайшлі ў такім стане, што вялікая частка будаўнічых астаткаў увогуле не захавалася.

Магчыма, што дзверы ў паўночнай частцы пабудовы 18[88] маглі весьці на другі паверх. Упёртыя ў вал, гэтыя дзверы не маглі служыць для ўваходу, але праз іх можна было трапіць на другі

ярус гэтага дому.

Па П.І. Засурцаву ўсе вялікія дамы ў Ноўгарадзе былі двухпавярховыя. У дамах Кіеўскага Падолу адкрыты рэшткі цокальнага паверха, жылога яруса і падстрэшнага памяшкання[89]. Двухпавярховымі былі дамы не толькі ў Кіеве, але і ў Старай Руссе, Ўшчыжы і Звенігарадзе[90]. Усё аблічча багатых дамоў вакольнага гораду схіляе да думкі, што яны былі двухпавярховыя.

З развіццём вывучэння жылых і гаспадарчых пабудоў старажытнарускіх гарадоў, фарміруецца яго асобны раздзел — домабудаўніцтва сацыяльных вярхоў гораду. Калі для рэканструкцыі аблічча звычайных гарадскіх дамоў, даследчыкі звяртаюцца да дадзеных этнаграфіі, заснаваных на вывучэнні сялянскіх дамоў, то багатыя гарадскія дамы павінны супастаўляцца з іншымі відамі крыніц, прынамсі ў пісьмовых крыніцах і былінах захаваліся звесткі не толькі аб палацах Старажытнай Русі, але і аб домабудаўніцтве заможнага гарадскога насельніцтва[91].

У Наваградку адкрыта вельмі мала вытворчых комплексаў. На першапачатковым паселішчы Малага Замка — гэта ямы са слядамі бронзаліцейства, а ў больш пазні час кузня, якая працавала ў паўночнай частцы пляцоўкі. У XII-XIII стст. багатыя гараджане займаліся рамеснай дзейнасьцю галоўным чынам у жылых памяшканнях. Уласна майстэрняй залатара была толькі пабудова 17[92]. Аб майстэрнях залатароў XII-XIII ст. на Замкавай гары можна мяркаваць толькі па знайдзеных там інструментах і незакончаных вырабах з каляровага метала і срэбра.

У Наваградку адкрыта шмат ямаў гаспадарчага прызначэння. На тэрыторыі Малага Замка вялікая частка ямаў належала да ранняга паселішча. У вялікіх і маленькіх акруглых і авальных ямах, якія часам запоўнены камянямі, была кераміка X-XI ст. і косьці жывёлы. Сярод ранніх ямаў Замкавай гары наівялікшую цікавсьць прадстаўляе вялікая (4,8х2,5 м.) яма глыбінёй 0,8 м., запоўненая тленам дрэва, вуглістым слоем і гумусам, у якой знайдзена шмат керамікі X-XI стст., кавалкі срэбных бранзалетаў і злітка.

На тэрыторыі Малага Замка, пакуль ён быў вакольным горадам, гаспадарчых ямаў было даволі мала, а на Замкавай гары ў XII ст. іх было шмат. Сярод знаходак у гэтых ямах сустракаюцца кераміка, асобныя фрагменты амфар. У адной з ямаў знайдзена згарэлае зерне.

Спынімся на асаблівастях наземных гаспадарчых будынкаў. Гумно канца X ст. падрабязна характэрызавана ў кнізе “Старажытны Наваградак”. Відавочна, такое ж было прызначэнне

пабудовы 37, якая знаходзілася побач з гумном[93]. Гаспадарчая пабудова другой паловы XII ст. на Малым Замку выглядала іначай, але, нажаль, вялікая частка яе аказалася за межамі нашага раскопа. Яна была зрубнай. Рубка праведзена ў абло і спрэс завалена дробнымі кавалкамі абпаленай гліны, якая ляжала на падлозе. Да знаходак у ёй належалі невялікая колькасьць керамікі, лубяная вяроўка і нож[94]. Прыбудаваная да багатага дому (10) гэта пабудова з'яўлялася яго гаспадарчым памяшканнем — адзінай пабудовай гэтага тыпу на вакольным горадзе.

З гаспадарчымі будынкамі простых гараджан наваградскага дзяціна XII-XIII ст. звязаны пляцень, які адгарожваў замошчаны двор і рэшткі невялікага хлява. У паўночнай частцы пляцоўкі, на змену шматлікім гаспадарчым ямам, паблізу старажытнага вала ўзводзяцца гаспадарчыя пабудовы, якія дайшлі да нас сатлелымі. Амаль упрытык да валу стаялі тры будынкі. Трошку воддаль цягнуўся другі шэраг сатлелых пабудоў. Сатлелыя пабудовы, рубленыя ў абло з драўлянай падлогай, ляжалі на слоі гліны; іх неаднаразова абнаўлялі.

Над сатлелымі пабудовамі, знаходзіліся рэшткі згарэлых гаспадарчых будынкаў. Наібольш раннія з іх прытыкалі да ранняга валу, а з пераносам апошняга на край пляцоўкі, занялі вызваленую пасля засыпкі вала тэрыторыю. Згарэлыя свірны і гумны былі двух'ярусныя. Ад ніжніх частак пабудоў захаваліся бярвенчатыя зрубы, усярэдзіне якіх на слоі з залой ляжала згарэлае зерне і рэшткі іншых сельскагаспадарчых культур, а таксама донцы бочак, рэшткі лыкавых кашоў і іншыя знаходкі. У пабудове 9/14 сустракаюцца таксама бронзавыя матрыцы, вагавыя гіркі, верацёны, клубкі нітак і іншыя знаходкі[95]. У пабудове 15 знайдзены магчыма рэшткі дзверы. Верхні ярус пабудоў прадстаўляў з сябе насланыя на лагах дошкі. Насьцілы пакрывала бераста. Знаходак на верхніх насьцілах было вельмі мала.

Высьціланне падлогі берастой у Мінску адзначана ў жылой і ў гаспадарчай пабудовах. На Валыні, на помнікў XI ст. была адкрыта гаспадарчая яма. Дно ў яе было выслана берастой, ў яме сустракаюцца зёрны ячменю і пшаніцы, а таксама гарох[96]. Аднак прамых паралеляў гаспадарчым двух'ярусным пабудовам наваградскага дзяцінца пакуль няма. Праўда, на Целіжэнецкім гарадзішчы адзначаны рэшткі двух'ярусных клецяў[97], але ў якой меры яны падобныя да нашых сказаць цяжка. Некаторае падабенства з гаспадарчымі пабудовамі Наваградка назіраецца ў адным з будынкаў кіеўскага Падолу. Яго падклет быў хлявом, а на другім ярусе хавалі зерне і другія прадукты. Адзначым этнаграфічныя матэрыялы з поўначы, дзе ставілі двух'ярусныя

свірны. У верхніх ярусах захоўвалі муку, а ўнізе абмалочанае і правеянае зерне[98].

На заканчэннне неабходна спыніцца на прызначэнні двух насьцілаў, якія раскапаныя на паўднёвым захадзе ад гаспадарчых пабудоў дзяцінца, з іх адзін знаходзіўся над другім. Ніжні насьціл ляжаў на мацерыку, займаў плошчу каля 36 кв. м. і ўяўляў з сябе сатлеўшыя дошкі шырынёй 20 см. і тлен дрэва. Асобныя часткі насьцілу абнаўляліся. Знаходак там не было. Толькі ў адным месцы сустракаюцца дробныя абломкі шкляных бранзалетаў.

Насьціл над ім выкладзены дошкамі шырынёй 22-25 см. Зношаныя дошкі былі месцамі пакрыты плахамі. На насьціле зрэдку сустракалася шкарлупа гарэхаў.

Прызначэнне насьцілаў высвятляецца ў сувязі з тым, што над насьціламі старажытнарускага часу ляжалі яшчэ тры насьцілы XIV ст. Наібольш позні насьціл складалі згарэўшыя дошкі і гарбылі. На ім былі знайдзены абломкі цэглы, вапнавы раствор, чарапіца, а таксама гарэхавая шкарлупа. Гэты насьціл ішоў шчыльна да вымасткі храму XIV ст., не заходзячы пад яе. Такім чынам, дадзены насьціл быў замошчанай пляцоўкай перад царквой, таксама як і два насьцілы, што ляжалі пад ім. Ідэнтычнасьць насьцілаў XIV ст. і насьцілаў старажытнарускага часу дазваляе лічыць апошнія часткай пляцоўкі перад храмам, які існаваў у часы Старажытнай Русі. Паколькі тут не сустракаюцца рэшткі манументальнага дойлідства XII альбо XIII стст., можна мяркаваць, што царква гэтага часу на Замкавай гары была драўлянай[99].

Матэрыялы, што разгледжаны ў гэтай главе, сведчаць на карысьць таго, што ў планіроўцы і домабудаўніцтве Наваградка, побач з агульнарускімі рысамі адзначаюцца асаблівасьці, уласьцівыя толькі гэтаму гораду.

Спасылкі:

[1] ДН., С. 7.

[2] ПСРЛ. М, 1962. Т.11. Стб. 873.

[3] Рапапорт П.А. Военное зодчество заходнерусских земель X-XIV вв. // МИА. 1967. Вып. 140. С. 189.

[4] Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 20; Гуревич Ф.Д. О формировании городов Черной Руси по данным археологии.// СА. 1983. Вып. 3. С. 64.

[5] Гуревич Ф.Д. Отчет славянско-литовского отряда. (Архіў ЛАІА. Ф. 35. Вопіс)

[6] Нікалаеў М.В. Справаздача аб разведках на тэрыторыи Наваградка ў 1983 г. (Архіў аддзела археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР).

[7] ДН. С. 8-15.

[8] Ткачев М.А. Исследования памятников военного зодчества Белоруссии.// АО 1969 г. М., 1970. С. 312; Ткачев М.А. Военное зодчество Белоруссии XIII-XVIII вв.: Автореферат канд. дис. Минск. С.21.

[9] Рапапорт П.А. Op. cit. С. 122.

[10] Ткачев М.А. Исследования памятников оборонного зодчества Белоруссии.//АО 1970 г. М., 1971. С. 307-308; Ткачоў М.А. Вежы валынскага тыпу і іх распаўсюджванне на Беларусі.// БС. С. 322-324.

[11] Ткачоў М.А. Op. cit. С. 307.

[12] ПСРЛ. Т. 11. Стб. 873.

[13] Ткачоў М.А. Абароннае дойлідства ... С. 21.

[14] Ткачев М.А. Работа отряда по изучению военного зодчества Белоруссии.//АО 1973 г. М., 1974. С. 382.

[15] Лысенко П.Ф. Города Туровской земли. Минск, 1974. С. 81,121; Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Минск, 1982. С.153-157.

[16] Рапапорт П.А. Op. cit. С.122-127; Тимощук Б.А. Древнерусские города Северной Буковины// Древнерусские города. М., 1981. С. 117,119,121-123,126.

[17] Рапопорт П.А. Оборонные сооружения Западной Волыни в XIII-XIV вв.//Swiatowit, Warszawa, 1962. Т. XXIV. С. 619-624; Военное зодчество ... С. 141-149.

[18] Ткачоў М.А. Вежы валынскага тыпу ... С. 315-328.

[19] Колчин Б.А., Янин В.Л. Археологии Новгорода 50 лет. // Новгородский сборник. М., 1982. С. 72.

[20] Новое в археологии Киева. Киев, 1981. С. 114; Килиевич С.Р. Детинец Киева IX - первой половины XIII вв. Киев, 1982. С. 121; Боровский Я.Е., Сагайдак М.А. Археологичные исследования Верхнего Киева в 1978-1982 гг. // Археологические исследования Верхнего Киева в 1978-1983 гг. Киев, 1985. С. 38-51.

[21] Орлов Р.С., Моця А.П., Пакульс П.М. Исследования летописного Юрьева на Роси и его окрестностей.// Земли Южной Руси в IX-XIV вв. Киев, 1985. С. 36-37; Толочко П.П. Исследования древнерусского Вышгорода.// АО 1979 г. М., 1980. С. 345-346; Толочко П.П., Блажевич Н.В. Раскопки Иван-города.// АО 1982 г. М., 1984. С. 114.

[22] Филипчук М.А. Исследования крестьянской усадьбы XI в. у с. Коростовата.// АО 1983 г. М., 1985. С. 367.

[23] Засурцев П.И. Новгород, открытый археологии. М., 1967. С. 79-83; Новое в археологии Киева. С. 114.

[24] Кирпичников А.Н. Раннесредневековая Ладога (результаты археологического изучения).// Средневековая

Ладога. М., 1985. С. 14,15.

[25] Рябинин Е.А., Черных Н.Б. Стратиграфия, хронология и застройка нижнего слоя Старой Ладоги в свете новых открытий. //СА. 1981. N 1. С. 72-100.

[26] Кутавой А.И. Усадьбы как главные элементы градостроительной культуры древнеруского города.//ДГ. С. 67.

[27] Седова М.В. Работы Владимиро-Суздальской экспедиции.// АО 1983 г. С. 81-82; Даркевич В.П. Раскопки на южном городище Старой Рязани (1966-1969).// Археология Рязанской земли. М., 1974. С. 19-28; Даркевич В.П. Раскопки в Старой Рязани.// АО 1975 г. - АО 1976 г. С. 61; Авдусин Д.А., Асташева Н.И., Юркина Т.В. Смоленская экспедиция. // АО 1974 г. М., 1975. С. 52.

[28] Кутовой А.И. Op. cit. С. 66; Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Минск, 1975. С. 50.

[29] Куза А.В. Малые города в Древней Руси X- XIII вв. // ДГ. С. 64.

[30] Лысенко П.Ф. Берестье. Минск, 1985. С. 176; Седов В.В. Изборск - горад крепость XII-XIII вв.// ДГ. С. 119.

[31] Звесткі аб Вицебску ласкава паведамілі М.А. Ткачоў і Т.С. Бубенька.

[32] Загорульский Э.М. Op. cit. С. 191-186.

[33] Алексеев Л.В. Смоленская земля. М., 1980. С. 173; Малевская М.В., Фоняков Д.И. Постройки древненого Торопца. // СА. 1985. Вып. 4. С. 79.

[34] Гроздилов Г.П. Раскопки древненого Пскова (1956,1958-1960). // АСГЭ. 1962. Вып. 4. С. 19-39; Медведев А.Ф., Смирнова Г.П. Раскопки в Старой Русе. // АО 1974 г. М., 1975. С. 24-25.

[35] ДН. С. 18-32.

[36] ДН. С. 32-101.

[37] Боровский Я.Е., Сагайдак М.А. Op. cit. С. 51.

[38] Ганчаров В.К. Райковецкое городище. Киев, 1950. С. 29; Юра Р.О. Древний Колодяжин // АП УРСР. 1962. Вып. 12. С. 65-81; Довженок В.И., Юра Р.О., Ганчаров В.К. Древньоруське мисто Воинь. Киев, 1966. С. 36-53; Пескова А.А. Древний Изяславль. // КСИА. 1981. Вып.164. С. 67.

[39] Зильманович И.Д. Раскопки детинца в Новогрудке в 1962 г. // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 93-98.

[40] Гуревич Ф.Д., Николаев Н.В., Паничева Л.Г. Новогрудская экспедиция. // АО 1977 г., М., 1978. С. 412.

[41] Малевская М.В. Архитектурный комплекс новогрудского детинца XIII-XIV вв. // ДГС. С. 124-125.

[42] Гуревич Ф.Д. Застройка новогрудского детинца в XII-XIII

ст. // КСИА. 1984. Вып. 179. С. 54-59.

[43] Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966. С. 153-157.

[44] Рыбаков Б.А. Любеч - феадальны двор Ольговичей. // КСИА. 1964. Вып. 99. С. 67.

[45] ДН. С. 18-101, 119-126.

[46] ДН. С. 20, 22, 26.

[47] Рапопорт П.А. Древнерусское жилище. // САИ Е 2-32. 1975. С. 63.

[48] ДН. С. 26.

[49] Рапопорт П.А. Op. cit. С. 147, 154.

[50] ДН. С. 32-36, 120-121.

[51] ДН. С. 120.

[52] Аулих В.В. О детинце древненого Галича. ДГ. С. 13; Аулих В.В. Раскопки древнерусского Галича. // АО 1981 года. М., 1983. С. 239-240.

[53] Куглюковский П.И. Исследования древненого жилища в Суздале. // АО 1979 г. М., 1980. С. 60-61.

[54] Даркевич В.П. Исследования Старорязанской экспедиции. // АО 1979 г. М., 1980. С. 52-53.

[55] Спегальский Ю.П. Жилище Северо-Западной Руси IX-XIII вв. Л., 1972. С. 68-71; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 180-181.

[56] ДН. С. 120-125.

[57] ДН. С. 26-28.

[58] ДН. С. 28.

[59] Колчин Б.А., Хороше У А.С., Янин В.Л. Усадьба новгородского художника XII ст. М., 1981. С. 69; Медведев А.Ф. Раскопки в Старой Руссе. // АО 1972 г. М., 1973. С. 25; Никольская Т.Н. К истории древнерусского градостроительства. ДГ. Мал. 3; Рапапорт П.А. Op. cit. С. 108; Седова М.В. Ярополч Залесский. М., 1978. С. 51; Боровский Я.Е., Сагайдак М.А. Op. cit. С. 51.

[60] Даркевич В.П. Раскопки на Южном городище Старой Рязани (1966-1969 гг.) // Археология Рязанской земли. М., 1974. С. 19-21.

[61] ДН. С. 36, 44, 86, 93.

[62] Новое в археологии Киева. С. 91; Зоценко В.Н. Раскопки в древнерусском Вышгороде. //АО 1981 г. 1983. С. 250; Рапапорт П.А. Op. cit. С. 60.

[63] Орлов Р.С., Моця А.П., Пакульс П.М. Op. cit. С. 37; Рыбаков Б.А. Вщиж удельный город XII в. // КСИИМК. 1951. Вып. XII. С. 58; Даркевич В.П. Op. cit. С. 22-24; Тухтина Н.В. Раскопки на Николобережном селище в г. Муроме. // АО 1971 г. М., 1972. С. 99; Седова М.В. Op. cit. С. 54; Раппопорт П.А. Op. cit. С. 103; Лысенко П.Ф. Городища Туровской земли. Минск, 1975. С. 49-50;

Лысенко П.Ф. Изучение Берестья. // АО 1977 г. М., 1978. С. 419-420; Воронин Н.Н. Древнее Гродно. // МИА. 1954. Вып. 41. С. 46.

[64] Рапапорт П.А. Op. cit. С. 154.

[65] Колчин Б.А., Янин В.Л. Op. cit. С. 73; Колчин Б.А., Хорошев А.С., Янин В.Л. Op. cit. С. 112.

[66] Гуревич Ф.Д. О времени постройки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке. // КСИА. 1986. Вып. 187. С. 36-40.

[67] Рапапорт П.А. Op. cit. С. 156.

[68] ДН. С. 123.

[69] Высоцкий С.А. Виконна рама та шибки з Киивской Софии. // Киивска старовина. Щоричник. Київ, 1972. С. 54.

[70] Богусевич В.А. Мастерские в XI ст. по изготовлению шкла и смальты в Кияве. // КСИА УРСС. 1954. Вып. 3. С. 14-15.

[71] Хойновский И.А. Раскопки великокняжеского двора древненого града Киева. Киев, 1893. Табл. X, 32; Боровский Я.Е., Сагайдак М.А. Op. cit. С. 43.

[72] Щапова Ю.Л. Стеклянные изделия из Старой Рязани (па материалам раскопок 1966-1968 гг.) // Археология Рязанской земли. С. 90; Седова М.В. и др. Раскопки в Суздале. // АО 1977 г. М., 1978. С. 82; Седова М.В. Op. cit. С. 51; Коваленко В.П., Моця А.П., Шекун А.В. Работы Шестовицкой экспедиции. // АО 1983 г. М., 1985. С. 288.

[73] Рапапорт П.А. Op. cit. С. 71.

[74] Полубояринова М.Д. Раскопки древненого Турова. // КСИА. 1963. Вып. 96. С. 47; Лысенко П.Ф. Города ... С. 111; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 79; Яніцкая М.М. Вытокі шкларобства Беларусі. Мінск, 1980. Мал. 20, 43.

[75] Спегальский Ю.П. Op. cit. С. 149-159.

[76] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 40.

[77] ДН. С. 121.

[78] Кисилевич С.Р. Op. cit. С. 78.

[79] ДН. С. 121.

[80] ДН. С. 81-82.

[81] Ратич А.А., Шеломенцев-Терский В.С. О работах Звенигородской экспедиции. // АО 1973 г. М., 1974. С. 334; Коваленко В.П., Куза А.В., Моця А.П. Раскопки в Новгородзе-Северском. // АО 1980 г. М., 1981. С. 259.

[82] ДН. Мал. 51,1; 76,8.

[83] Каргер М.К. Op. cit. Мал. 84, 85; Загорульский Э.М. Op. cit. Мал. 187; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 12, 1-6; Малевская М.В. Раскопки на Малом Торопецком городище в 1961 г. // КСИА. 1961. Вып. 110. С. 58; Орлов Р.С., Моця А.П., Пакульс П.М. Op. cit. Мал. 8, 13.

[84] Рыбаков Б.А. Op. cit. С. 58; Колчин Б.А., Хорошев А.С., Янин В.Л. Op. cit. С. 111.

[85] ДН. Мал. 71,6.

[86] Килиевич С.Р. Раскопки на территории монастырского двора в Киеве. // АО 1983 г. М., 1985. С. 281; Мальм В.А., Фехнер М.В. Археологичныя исследования древненого Пронска и городища на горе Гневне. // Археология Рязанской земли. С. 197.

[87] ДН. С. 38.

[88] ДН. С. 45.

[89] Засурцев П.И. Усадьбы и постройки древненого Новгорода. // МИА. 1963. Вып. 123. С. 68; Новое в археологии Киева. С. 133-139.

[90] Медзведев А.Ф., Смирнова Г.П. Раскопки в Старой Руссе. // АО 1974 г. М., 1975. С. 24-25; Рыбаков Б.А. Op. cit. С. 58; Свешников И.К. Раскопки в Звенигороде на Белке. // АО 1982 г. М., 1984. С. 328.

[91] Шамбинаго С.К. Древнерусское жилище по былинам. // Юбилейный сборник в честь В.Ф. Миллера. М., 1900. С. 128-149; Рыбаков Б.А. Древняя Русь. Сказания, былины, летописи. М., 1963. С. 136.

[92] ДН. С. 101.

[93] ДН. С. 20.

[94] ДН. С. 81.

[95] Павлова К.В. Хозяйственные постройки XII-XIII ст. на детинце древнего Новогрудка.// КСИА. 1972. Вып. 129. С. 77-83.

[96] Загорульский Э.М. Указ.Соч. С. 176-177; Кучинко М.М. Исследования древнеруского городища на Волыни. // АО 1983 г. М., 1985. С. 303.

[97] Якубовский В.И. Раскопки Тележенецкого городища. // АО 1979 г. М., 1980. С. 355.

[98] Гуревич Ф.Д. Застройка ... С. 55.

[99] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 55, 57.

Глава 4.
Рамяство

У апублікаваных матэрыялах Малага Замка адлюстравана разнастайная рамесная дзейнасьць яго жыхароў у старажытнарускі час[1]. Надзвычай інтэнсіўным развіццё рамяства прадстае ў маштабе ўсяго гораду. Непасрэдныя сведчанні аб мясцовым характары рамяства ў Наваградку (майстэрні, інструменты, нарыхтоўкі вырабаў і інш.) захаваліся для нешматлікіх яго галінаў. Як і для большасьці паселішчаў, галоўнымі крыніцамі для высвятлення гэтай праблемы з'яўляюцца масавыя археалагічныя матэрыялы. Разглядаць іх мы пачынаем з прадукцыі жалезаапрацоўкі.

1. Жалезныя вырабы.

Матэрыялы, якія сведчаць аб металургіі жалеза ў Наваградку знаходзяцца толькі на раннім паселішчы на Малым Замку. Гэта крыцы, у тым ліку і ў развале печы і іх скапленне ў кузні[2]. Жыхары пачатковага наваградскага паселішча, (пазней пасаду) валодалі прыёмамі гарачай і холаднай апрацоўкі жалеза, умеючы пры гэтым упрыгожваць жалезныя вырабы каляровым металам[3]. На Замкавай гары напрацяг усяго старажытнарускага перыяду яе гісторыі не захавалася ніякіх слядоў апрацоўкі жалеза. Знайдзеныя там крыцы, з'яўляюцца на дадзенай тэрыторыі не раней за XIV ст.

Колькасьць жалезных вырабаў старажытнарускага Наваградка даволі значная. У культурным слоі Малага Замка зроблена больш за 1700 знаходак. На Замкавай гары — іх больш за 400. Уяўленне аб тым, які асартымент жалезных вырабаў і як яны размяркаваліся, дае ніжэйпрыведзеная табліца.

Табліца 1. Жалезные вырабы Наваградка і яго акругі.

Віды вырабаў	Колькасць		
	Малы Замак	Замкавая гара	Акруга
1. Прылады працы. Нарыхтоўкі	217	13	1
2. Сельскагаспадарчы і прамысловы інвентар	28	4	-
3. Зброя	225	193	10
4. Упрыгожванні. Прадметы ўбору	66	16	2
5. Бытавыя рэчы	1045	155	30
6. Прадметы нявызначанага прызначэння	96	55	48
Усяго	1677	436	48

Агульная колькасць жалезных вырабаў з канца X да, прыкладна, канца XIII ст. складае больш за 2160 знаходак. Да канца XI ст. усе работы па металургіі жалеза і яго апрацоўцы праводзіліся на тэрыторыі пасаду, а пачынаючы з XII ст., відавочна, былі сканцэнтраваны за межамі раскапанай намі тэрыторыі.

Для 53 жалезных вырабаў быў зроблены мікраструктурны аналіз, праведзены Л.С. Хамутовай і Г.А. Вазнесенскай. Важная выснова апошняй аб тым, што тэхналогія вырабу і якасць жалезных вырабаў абедзьвух частак гораду аднастайныя. Абедзьве даследчыцы адзначаюць, што жалезныя вырабы Навагрудка вырабляліся па некалькіх техналагічных схемах. Адны з іх былі цалкам са сталі, у іншых адзначаліся наварное сталёвае лязо на жалезную аснову з наступнай тэрмаапрацоўкай гатовага вырабу. На двух нажах Л.С. Хамутова адзначыла складаны звараны узор клінкоў, якія імітуюць дамаскую сталь. Мікраструктурны аналіз паказаў складаную тэхніку вырабу амаль усіх даследаваных вырабаў, які можа сведчыць аб майстэрстве і высокім вытворчым вопыце кавалёў.

Як у шэрагу невялікіх старажытнарускіх гарадоў, апрацоўка жалеза ў Навагрудку была на агульнарускім узроўні. Вельмі разнастайны і асартымент жалезных вырабаў гэтага гораду. У X-XI стст. ён складаўся з рэчаў 26 найменаванняў, а ў XII-XIII стст. налічваў каля 60.[4]

У гэтай главе разглядаюцца не ўсе навагрудскія жалезные вырабы, а толькі прылады працы, бытавыя рэчы, упрыгожанні і прадметы ўбору. Што датычыць астатніх рэчаў з жалеза (зброі, сельскагаспадарчы і прамысловы інвентар, прадметы, звязаныя з гандлем і інш.), то іх мы разгледзім у адпаведных главах.

У савецкую археалогію трывала ўвайшлі тыпалогія і храналогія ноўгарадскіх старажытнасьцей, што распрацаваў Б.А. Колчын. Асабліва шмат гэты аўтар зрабіў для вывучэння жалезаапрацоўчага рамяства і сістэматызацыі як ноўгарадскіх, так і агульнарускіх жалезных вырабаў. На працы Б.А. Колчына

абапіраюцца ўсе даследчыкі старажытнарускіх старажытнасьцей і, у прыватнасьці, аўтары манаграфій, прысвечаных культуры старажытнарускіх гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Мы, у сваю чаргу, карыстаемся іх матэрыяламі для супастаўлення з дадзенымі Наваградка.

Інструментарый кавалёў прадстаўлены знаходкамі зубілаў (8 экзэмпляраў), што паходзяць з Малага Замка. Цалкам захаваныя зубілы маюць даўжыню 8-10,5 см. Аналогіі ім вядомыя ў Ваўкавыску, Полацку, Пінску і Браціславе[5].

Больш жалезных прыладаў-інструментаў належаць да залатарства. Яны таксама знайдзены толькі на Малым Замку. Поўны комплекс такіх знаходак паходзіць з пабудовы 10[6].

Жалезны інструментарый залатароў вакольнага гораду прадстаўлены наступнымі знаходкамі:

Клешчы (2 экзэмпляры). Ад адных кляшчэй захавалася палова даўжынёй 25 см., ад другіх толькі верхняя частка. Падобнымі кляшчамі карысталіся залатары ў Ноўгарадзе[7].

Шчыпцы даўжынёй 11 см., на губах якіх быў знак у форме буквы Х. Яны выкарыстоўваліся для кляймення вырабаў[8].

Залатарскія ножніцы (2 экзэмпляры). Даўжыня іх да 25 см. Яны нагадваюць бытавыя шарнірныя ножніцы, але рабочая частка іх пашырана. Падобныя ножніцы вядомыя ў Ноўгарадзе[9].

Малаточкі (2 экзэмпляры). Даўжыня іх 7-7,5 см. Залатарскія малаточкі знайдзены ў Полацку і Друцку[10].

Накаваленкі (3 экзэмпляры). Адна вышынёй 9,5 см. пірамідальнай формы. Другая з выступам для пракоўкі ўтульчатых рэчаў, вышынёй 5 см. Трэцяя, вышынёй 4,7 см. з выступаючымі краямі. Аналагі першым двум накаваленкам ёсьць ў Ноўгарадзе[11]. Трэцяя паралеляў не мае.

Напільнікі (5 экзэмпляраў). Адзін мініяцюрны плоскі з вастрыём, даўжыня яго 5 см. Астатнія ў сячэнні прамавугольныя даўжынёй да 21 см. з простай і крыжовай насечкай. Аналогіі ім вядомыя ў шэрагу старажытнарускіх гарадоў, а на тэрыторыі Беларусі ў Друцку[12]. Пінцэт даўжынёй 6 см. з Г-падобнымі губамі. Аналагічныя вядомыя ў Тураве, Бярэсьці і Мінску[13].

Скрабкі (2 экзэмпляры), даўжынёй 8-9,5 см. Аналогіі невядомыя, таксама як для квадратнага вырабу з углубленнем (старана роўная 2,5 см.). Знайдзены разам з адным са скрабкоў сярод залатарскага інструмента.

Штампік пяцічастны паходзіць з пабудовы з фрэскамі[14].

Даволі знайдзена прыладаў для апрацоўкі дрэва. Да іх належаць:

Сякеры (15 экзэмпляраў), якія выкарыстоўваліся таксама ў якасьці зброі. Гэта тры сякеры з апушчаным лязом, што знайдзены

ў курганах і “цяжкія” сякеры, знайдзеныя каля в. Кашалева разам з наканечнікам кап’я і чэрапам чалавека[15]. На абедзьвух наваградскіх узгорках знайдзены чатыры сякеры з сіметрычным лязом і тры сякеры “цяжкага” тыпу. Астатнія знаходкі дайшлі ў абломках. Наваградскія сякеры маюць паралелі ў Полацку, Мінску, Ваўкавыску, Бярэсьці[16].

Піла. Абломак пілы знайдзены пры разборцы пабудовы 16 Малага Замка[17]. Пілы даволі рэдкія ў старажытнарускіх гарадах. У Заходняй Русі яны вядомыя толькі ў Ваўкавыску, дзе сярод абломкаў трох піл, адна была лучковай. Абломак пілы паходзіць таксама з гарадзішча Індура Гродзенскай вобласьці[18]. Далата (19 экзэмпляраў). Даўжыня цэлых далот да 21 см. Падобныя знаходкі шырока распаўсюджаны ў старажытных гарадах на тэрыторыі Беларусі (Полацк, Мінск, Бярэсьце і інш.) [19].

Стамескі (10 экзэмпляраў). Знайдзены толькі на Малым Замку. Гэтыя прылады, даўжынёй 8-11 см. — рэдкія знаходкі не толькі ў гарадах на тэрыторыі Беларусі, але і ў старажытнарускіх гарадах увогуле.

Пёрападобныя свёрлы (3 экзэмпляры). Даўжыня іх 8-9 см. Аналагі знайдзены ў Полацку, Мінску, Ваўкавыску, Бярэсьці і Пінску[20].

Скобелі двуручныя (2 экзэмпляры). Даўжыня 10-10,5 см. Падобныя прылады добра вядомыя ў Полацку, Мінску, Ваўкавыску і Бярэсьці[21].

Разцы (2 экзэмпляры). Даўжыня 8,5-12,5 см. Адна са знаходак паходзіць з селішча Гардзілоўка. Паралелі нашым разцам маюцца ў Полацку, Мінску, Ваўкавыску, Давідгарадку[22].

Незвычайная прылада знайдзена паблізу печы пабудовы 5 на Малым Замку. Зламаная надва, яна мела ў даўжыню 1,07 м. і прадстаўляла з сябе стрыжань дыяметрам 3 см. Рабочая частка яе ў форме пірамідальнага вастрыя. Другі канец стрыжня меў адтуліну для рукаяткі. У свой час гэту прыладу мы атрыбутавалі як бураў. Аднак у гэтым ёсьць сумнені. Бураў, які знайдзены ў Маскоўскім Крамлі мае іншую форму[23].

Жалезныя прылады для апрацоўкі дрэва выкарыстоўваліся шматфункцыянальна. Сякеры маглі быць зброяй, а іншыя прылады і інструменты акрамя цяслярскіх і сталярных работ, выкарыстоўвалі пры апрацоўцы косьці, бурштыну і іншых матэрыялаў.

Бытавыя знаходкі:

Нажы (261 экзэмпляр). На Малым Замку знайдзены 241 нож, на Замкавай гары 26. Астатнія паходзяць з курганных магільнікаў і селішча Гардзілоўка. Жыхары Малага Замка адначасова

карысталіся некалькімі нажамі розных памераў. Такі ж малюнак можна бачыць і ў курганным матэрыяле.

Пераважаюць нажы гаспадарчага прызначэння з даужынёй ляза 7-10 см. і шырынёй да 1,5 см. Больш як 30 нажоў з падоўжанымі памерамі ляза відавочна былі сталовымі, некаторыя з іх мелі касьцяныя рукаяткі[24].

Сярод нажоў спеціяльнага прызначэння адзначым нож для кастарэзных работ, лязо якога ў тры разы карацей чаранка і два мініяцюрныя ножычкі, што знайдзены ў яме пад печкай пабудовы 1 на Малым Замку[25]. Нажы з сагнутай рукаяткай маглі выкарыстоўвацца ў сталярстве. Асобнае прызначэнне павіен мець нож з вузкім лязом і двайной кручанай металічнай рукаяткай. Такі ж нож знайдзены ў Ваўкавыску[26].

15 наваградскіх нажоў арнаментаваны нарэзкай, часам у спалучэнні з бронзавым дротам. Арнамент нанесены па абушку, а часам па лязу сталовых і рабочых нажоў і блізкі арнаменту нажоў Полацка і гарадзішча Асотэ ў Латвіі[27].

Ножніцы (8 экзэмпляраў). Знайдзены толькі на Малым Замку. Амаль усе ножніцы спружынныя даўжынёй 12-24 см. Стрыжні некаторых ножніц упрыгожаны нарэзкай. Падобныя ножніцы знайдзены ў Полацку і Мінску[28]. Адзіныя шарнірныя ножніцы мелі даўжыню 17 см. Яны нагадваюць знаходкі з Полацка і Бярэсьця[29].

Шылы (12 экзэмпляраў). Даўжыня іх 6-12 см. Шылы — звычайныя знаходкі для заходнерускіх гарадоў. Асабліва шмат знайдзена іх у Ваўкавыску[30].

Іглы (23 экзэмпляры). Даўжынёй да 5 см. Нагадваюць сучасныя іглы, падобныя знаходкам з Полацка і Ваўкавыска[31].

Ключы (59 экзэмпляраў). 40 ключоў былі ад падзвесных замкоў, з іх па адным знайдзена на селішчы Гардзілоўка і ў магільніке каля в. Корастава[32].

Ключы тыпу А (па Б.А. Колчыну) прадстаўлены двума экзэмплярамі з прамавугольнай лопасьцю. Даўжыня іх 7 і 12 см. Адзін з такіх ключоў пакрыты ліставой бронзай і ўпрыгожаны нарэзкай. Падобныя ключы сустракаюцца ў гарадзішчы на Менцы, Лагойску, Браславе і Ваўкавыску[33]. Да тыпу А належаць таксама ключы з акруглай лопасьцю, даўжынёй 7-12 см. Асобныя ключы ўпрыгожаны нарэзкай. Аналагі ім сустракаюцца амаль ва ўсіх старажытнарускіх гарадах на тэрыторыі Беларусі.

Ключы тыпу Б (8 экзэмпляраў). Даўжыня іх 7-190 см. Асобныя знаходкі ўпрыгожаны нарэзкай. Вылучаецца сваімі памерамі (даўжыня 18 см.) ключ з раздвоеным стрыжнем, пакрытым меднымі пласцінкамі[34]. Ключы такога тыпу шырока распаўсюджаны ў старажытнарускіх помніках, у тым ліку ў

гарадах заходняй Русі[35].

Ключы тыпу В (6 экзэмпляраў). Даўжыня 7,5 - 9,5 см. Падобныя знайдзены ў гарадах Полацкай зямлі, а таксама ў Бярэсьці, Гродне і ў Ваўкавыску[36].

Ключы тыпу Г (6 экзэмпляраў). Даўжыня іх 7-10 см., аналагічныя ў гарадах Беларусі невядомыя.

Ключы тыпу Д (6 экзэмпляраў). Даўжыня - 9-14 см. Знайдзены па-за комплексамі. Па матэрыялах Ноўгарада і Ваўкавыска датуюцца XIV ст.[37]

На тэрыторыі Малага Замку знайдзены ключ даўжынёй 12 см. з раздвоеным стрыжнем і атагнутымі канцамі. Б.А. Колчын лічыць такія ключы індывідуальнымі вырабамі XII ст.[38]

Замкі (7 экзэмпляраў). Акрамя таго, знайдзена 36 дэталяў замкоў (спружыны, дужкі і інш.). Адзінкавай знаходкай з'яўляецца замок прамавугольнай формы з доўгім стрыжнем, што знайдзены ў пабудове першай паловы XI ст. Аналогія яму вядомая ў Бярэсьці[39]. Астатнія замкі цыліндрычныя, часам абмедненыя. Даўжыня іх 6-10 см., у адным выпадку знайдзены замок з уторкнутым у яго ключом. Аналогіі цыліндрычным замкам вядомыя ў шэрагу заходнерускіх гарадоў[40].

Асобную групу складаюць ключы ад унутраных замкоў. Сярод іх:

Каленчатые запоры (4 экзэмпляры). Даўжыня іх 6-7 см.[41] Такія шырока распаўсюджаныя ў Старажытнай Русі запоры ад драўляных замкоў, на тэрыторыі старажытных гарадоў Беларусі знайдзены ў Тураве, Пінску, гарадах Полацкай зямлі і ў Ваўкавыску[42]. Сагнуты запор даўжынёй больш чым 20 см., знайдзены разам з замком прамавугольнай формы, аналогій не мае[43].

Ключы з полымі стрыжнямі (7 экзэмпляраў). Даўжыня іх 11-12 см. Адзін ключ меў даўжыню 15 см. На лапасьцях нярэдкія прарэзы. Падобныя ключы з прарэзамі на лапасьцях і без іх вядомыя ў Полацку, Мінску, Ваўкавыску і Бярэсьці[44].

Стрыжневыя ключы (6 экзэмпляраў). Даўжыня 11-12 см. Сустракаюцца ключы з прарэзанай лопасьцю. Адзін ключ з вакольнага гораду быў пакрыты белым металам. Стрыжневыя ключы сустракаюцца ў заходнерускіх гарадах (Полацкая зямля, Гродна, Ваўкавыск, Бярэсьце)[45]. Да гэтага тыпу ключоў належыць маленькі (даўжыня 4 см.), верагодна ад скрынкі. Такія мініяцюрныя ключы знайдзены ў Полацку, Лагойску, Гродне, і Ваўкавыску[46].

У Наваградку знайдзена таксама 4 ключы з полым стрыжнем і акруглым верхам, пакрытым бронзай, якія, мяркуючы па знаходцы іх у Гродне, належаць да XIII-XIV стст.[47]

З унутранымі замкамі і ключамі да іх звязана квадратная накладка з прарэзьзю. Такія ж накладкі паходзяць з Гродна і Лагойска[48].

Красалы (8 экзэмпляраў). Даўжынёй 6-8 см. Шэсьць красалаў з язычкамі альбо без іх датуюцца X-XIII стст. Два красалы авальнай формы. Падобныя распаўсюджваюцца не раней XIII ст. [49] Авальныя красалы — тыповыя знаходкі заходнерускіх гарадоў.

Цьвікі (каля 700 экзэмпляраў). У дамах знайдзена ад аднаго да 40 цьвікоў даўжынёй 6-11 см. Нескалькі цьвікоў мелі даўжыню 17 см.

Скобы (50 экзэмпляраў). Даўжыня іх 6-10 см. Прабоі (11 экзэмпляраў). Даўжыня 6-13 см. Дзвярныя кольцы (4 экзэмпляры) дыяметрам 5,5-11 см. з язычкамі[50], а таксама некалькі пракладак і пласцінак, што мацаваліся на дзвярах альбо скрынях, якія шырока распаўсюджаны ў заходнерускіх гарадах.

Сярод жалезных рэчаў адзначым абломак жалезнага катла[51], рэдкай знаходкі ў рускіх старажытнасьцях, а таксама дужкі і вушкі ад вёдраў і ланцугі. Паралелі ім адзначым у Ваўкавыску і Бярэсьці[52].

Значная частка прыладаў, бытавых знаходак і дамашніх рэчаў засталася нявызначанай. Гэта авальная ручка з меднымі заклёпкамі, што знайдзена ў старой пабудове Малага Замка,[53] прамавугольныя жалезные зліткі даўжынёй да 10 см., таўшчынёй 1,2 см., плоскія кольцы дыяметрам да 15 см.[54] і інш. На Малым Замку знайдзены тонкі стрыжань даўжынёй 11 см., які заканчваецца вастрыём, над якім узвышаецца пласцінка. Падобную знаходку ў Латвіі В.А. Уртанс, супастаўляючы з этнаграфічнымі матэрыяламі, вызначае як інструмент для кровапускання[55].

Упрыгожанні і прадметы ўбору.

Спражкі (20 экзэмпляраў). Часьцей за ўсё сустракаюцца падковападобныя са спіральна загнутымі канцамі. Дыяметр іх 4-6 см. Стрыжні такіх спражак разнастайнага сячэння (прамавугольнае, авальнае, трохвугольнае, рамбічнае). Часам спражкі маюць стрыжань з нарэзкай. Падковападобныя спражкі так папулярныя ў Старажытнай Русі і суседніх з ёй землях, што няма неабходнасьці спасылацца на паралелі гэтым рэчам.

Прамавугольныя спражкі са шпеньком і без яго (4 экзэмпляры) былі розных памераў (2,5-6 х 1, 5-4,5 см.). Падобныя знайдзены ў Ваўкавыску і Бярэсьці[56]. Знайдзены спражкі індывідуальных формаў. Сярод іх прамавугольная з фігурным шчытком.

Часткі паяснога набору (каля 40 экзэмпляраў). У адной з

пабудоў Малага Замка знайдзена 25 прамавугольных пласцінак з адтулінамі, гэты набор можна разглядаць як часткі поясу[57]. На Замкавай гары сустракаюцца фігурныя пласцінкі, якія таксама маглі быць часткаю паяснога набору. Ад паяснога набору, відавочна, захаваліся міндалепадобная бляшка і вялікі (даўжынёй 7 см.) язычок.

Булаўкі з кальцавой галоўкай (7 экзэмпляраў). Даўжыня іх 9-18 см., дыяметр галовак 1,8-3,5 см. Кольцы асобных булавак упрыгожаны нарэзкай. Асабліва прыгожая булаўка, частка стрыжня і кольцы якой інкруставаныя бронзавым дротам. Такія булаўкі даследчыкі заходнерускіх гарадоў Старажытнай Русі, за Б.А. Колчыным, лічаць за дэталі касьцюма[58]. У свой час мы адзначалі, што ў польскай і савецкай літаратуры асобныя археолагі разглядаюць іх як універсальныя прылады[59]. Такая атрыбуцыя падцьвярджаецца матэрыяламі Кастрамскога Паволжжа, дзе жалезныя булаўкі з кальцавой галоўкай сустракаюцца выключна ў мужчынскіх пахаваннях і звычайна ляжалі каля поясу разам з нажамі і красаламі[60].

У заключэнні адзначым падколкі для абутку (4 экзэмпляры), якія добра вядомыя па знаходкам у многіх старажытнарускіх гарадах.

Як паказана вышэй, жалезныя вырабы мясцовага паходжання, якія служылі зброяй, прыладамі для сельскай гаспадаркі, а таксама былі культавымі вырабамі, будуць разгледжаны ў адпаведных главах.

2. Апрацоўка каляровых і шляхетных металаў.

Матэрыялы аб мясцовым бронзаліцействе і залатарстве прадстаўлены ў Наваградку лепш чым другія віды рамяства. Пытанні, што датычаць апрацоўкі каляровых і шляхетных металаў на тэрыторыі Малага Замка, разгледжаны ў кнізе “Старажытны Наваградак”[61]. Пры характэрыстыцы гэтага віду рамяства прымяняльна да ўсяго гораду, натуральна, з’яўляецца неабходнасьць ізноў звярнуцца да матэрыялаў Малага Замка, выкарыстаўшы як раней вядомыя, так і некаторыя новыя матэрыялы.

Самымі старажытнымі комплексамі, у якіх займаліся бронзаліцействам, былі ямы канца X ст., выкапаныя ў мацерыку паўднёвай часткі пляцоўкі Малага Замка. Такой была яма 55 (4х3,4 м.), заглыбленая ў мацярык на 40 см., у заходняй частцы яе адкрыты развал камянёў і слаі попелу, абпаленых камянёў,

вугалю і попелу. У запаўненні ямы знайдзены цэлы тыгель і абломкі яшчэ пяці тыгляў, кавалак бронзы, калачавіднае красала і кераміка, тыповая для канца X ст. Яма 90 была авальная 1,10х0,90 м., глыбінёй каля 30 см. з адвеснымі сьценкамі і роўным дном. У яме знайдзены абпаленыя і патрэсканыя камяні, кавалкі абпаленай гліны, абломкі тыгелькоў і кераміка. Для бронзаліцейства выкарыстоўваліся таксама размешчаныя непадалёку ямы 8-9 і 54, аб чым сведчыла іх запаўненне[62].

Пачынаючы з першай паловы XI ст. бронзаліцейныя работы пераносяцца ў жылыя пабудовы Малага Замка, дзе знайдзены абломкі тыгелькоў, кавалкі аплаўленай бронзы і бронзавыя абрэзкі. У гэтым плане вылучаецца пабудова 21 (другая палова XI ст.), у якой былі: ліцейная формачка, абломкі пяці цігелькоў і кавалкі аплаўленай бронзы[63].

З ператварэннем наваградскага пасаду ў вакольны горад апрацоўка каляровых і шляхетных металаў робіцца наібольш характэрнай асаблівасьцю і галоўным заняткам гаспадароў вялікіх і багатых дамоў. Амаль у кожным з багатых дамоў былі знайдзены інструменты бронзаліцейшчыкаў і залатароў, абломкі і абрэзкі бронзы і свінца, а ў асобных дамах сустракаюцца бясспрэчныя сляды апрацоўкі золата[64]. Гэта акалічнасьць дазволіла нам у свой час разглядаць сканцэнтраваныя вялікія і багатыя дамы вакольнага гораду як квартал залатароў[65].

На дзяцінцы аж да канца XI ст. бронзаліцейнымі і залатарскімі работамі не займаліся. Нешматлікія знайдзеныя тут вырабы з бронзы і срэбра былі альбо зроблены на тэрыторыі Малага Замка, альбо з'яўляліся прывазнымі вырабамі. Тое самае можна сказаць аб адпаведных рэчах наваградскага магільніка і курганах Наваградскай акругі — помніках, якія былі насыпаны да канца XI ст.

Залатарства на Замкавай гары пачынае развівацца толькі ў XII ст. Майстэрні тут адкрыць не ўдалася, але існаванне апрацоўкі каляровых металаў і срэбра ў гэтай частцы гораду падцвярджваюць знайдзеныя інструменты, загатоўкі, спецыфічная сыравіна і некаторя асаблівасьці гатовых вырабаў.

У старажытных гарадах на тэрыторыі Беларусі, дзе захаваліся бязспрэчныя матэрыялы аб работе залатароў, амаль не вядомыя іх майстэрні. Толькі ў Мінску адкрыта пабудова, у якой адліваліся бронзавыя вырабы[66].

Інструментарый наваградскіх залатароў досыць разнастайны. Жалезныя прылады і інструменты гэтых рамеснікаў разглядаліся вышэй. Аб мясцовым ліцьці каляровых і шляхетных металаў і іншых відах залатарскіх работ можна мяркаваць па наступных знаходках:

Вогнеупоры — тыглі і льячкі (каля 40 экзэмпляраў). У Наваградку пабытавалі розныя іх тыпы. З ямы першапачатковага паселішча паходзіць тыгель вышынёй 11 см. з акруглым дном. Абломкі такіх самых тыгляў знайдзены і ў гэтай і ў іншых ямах. Аналагі дадзеным тыглям вядомыя на паўночным захадзе[67]. Вялікая частка огнеупораў — гэта мініяцюрныя тыгелькі (вышынёй 3-4 см.). Пераважаюць вострадонныя, часам з ручкамі. Сустрэліся два плоскадонных тыгелькі і тры льячкі — нізкія плоскія вогнеупоры з ручкамі. Маленькія тыглі і льячкі — частыя знаходкі ў гарадах Беларусі. Асабліва многа знайдзена іх у Полацку, дзе на ўсходнім раскопе знайдзены 53 тыглі[68]. Большы тыгель з “грабенчыкам” нагадвае знаходку з Кіева[69].

Ліцейныя формачкі (4 экзэмпляры). Знайдзеныя, выключна, на Малым Замку, яны апублікаваныя[70]. Тры формачкі былі каменныя, адна гліняная. У наібольш раннюю формачку метал залівалі зверху. Астатнія мелі літнікі. Наваградскія формачкі прызначаліся для вырабу нескладаных вырабаў — бубеньчыкаў, гузікаў, бляшак, калец і крыжыкаў. Формачкі для адліўкі такіх самых рэчаў знайдзены ў Полацку і Бярэсьці[71].

Матрыцы (13 экзэмпляраў). Выразная серыя бронзавых матрыц паходзіць з Замкавай гары. Усе яны знайдзены ў паўночным раскопе. Дзве матрыцы ўваходзілі ў інвентар адной з гаспадарчых пабудоў. Астатнія сустракаюцца на поўдзень ад астатніх. Пераходзім да іх апісання:

Матрыца для колта дыяметрам 4 см. На яе выпуклай старане выразаны фігуры двух сапастаўленых грыфонаў, раздзеленых пляцёнкай.

Матрыцы для ліліяпадобных пласцінак-крынаў (2 экзэмпляры). Даўжыня іх 4 см. Адна з матрыц гладкая, другая рубчатая.

Матрыцы для бляшак (3 экзэмпляры). Дзве квадратныя (старана 1,5 см.), трэцяя прамавугольная 2х1,7 см. з раслінным арнаментам.

Матрыца для калодачак даўжынёй 1,5 см.

Матрыца для бранзалетаў з галавой жывёліны (даўжыня 3,5 см.).

На тэрыторыі Беларусі матрыцы для колтаў з выявай грыфона, крынападобных прывесак і калодачак знайдзены на гарадзішчы Вішчын Гомельскай вобласьці[72]. Аднак галоўная маса такіх матрыц паходзіць з паўднёварускіх і некаторых іншых гарадоў і паселішчаў. Гэта — Княжая гара, Вышгарад, Райкі, Ізяслаўль, Сахноўка, а таксама Ўшчыж і Сярэнск[73]. Арнамент Наваградскай матрыцы для колта даволі блізкія да выявы на колце з Церахава, былой Арлоўскай губерні, а рубчатую матрыцу

да крынападобнай прывескі, подобную на нашу, апублікаваў Б.А. Рыбакоў[74].

На тэрыторыі Беларусі, на ўспамянутым гарадзішчы Вішчын, знайдзены скарб, у якім былі колты, крынападобныя прывескі і другія ціснёныя ўпрыгожванні. Адзначым таксама знаходкі срэбнага колта ў Бярэсьці і двух колтаў і крынападобнай прывескі ў Мінску[75]. Аднак, скарбы і асобныя упрыгожанні, ціснёныя з матрыц, аналагічныя да наваградскіх, вядомыя, пераважна, з Кіева, Кіеўскай зямлі, а таксама ў Чарнігаўскай, Пераслаўскай і некаторых іншых зямлях[76].

Вярнуўшыся да серыі наваградскіх матрыц, нельга не адзначыць, што ўсе яны былі сканцэнтраваны на тэрыторыі дзяцінца і зусім адсутнічалі ў вакольным горадзе з яго развітым залатарствам. Дзве бронзавыя матрыцы знайдзеныя на Малым Замку, значна адрозніваюцца ад матрыц Замкавай гары і выкарыстоўваліся для ціснення фігурных бляшак.

Бронзавыя пінцэты (2 экзэмпляры). Даўжыня іх 6 см. Знаходкі пінцетаў з бронзы, якія служылі, як і жалезныя, як маленькія ціскі, даволі рэдкія. У заходнерускіх гарадах пінцэты, былі, галоўным чынам, з жалеза. Бронзавы пінцэт знайдзены толькі ў Мінску[77].

З інструментарыем залатароў можна звязаць і некаторыя іншыя знаходкі. Цікавы бронзавы трохвугольны выраб даўжынёй 7 см., адзін канец якога закруглены, а другі сплошчаны і на ім нанесены зарубкі. Гэты выраб, верагодна, з'яўляўся накаваленкай, аб чым сведчаць сляды шматлікіх удараў на яго паверхнях. На выпуклым баку яго можна было пракоўваць полыя рэчы. Медная пасудзіна з тонкімі сьценкамі, атагнутым венчыкам і пераплеценымі краямі сьценак і донца мае прамую паралель у Кіеве, у "майстэрні мастака". На думку М.А. Каргера, такая пасудзіна патрэбная была для падагравання нейкага рэчыва[78]. Для залатарскіх работ мог выкарыстоўвацца і бронзавы песьцік дыяметрам 2 см. (захаваўся не цэлы)[79]. З інструментарыем залатарства мы звязваем таксама вялікую (даўжыня 12 см.) бронзавую іглу, якой можна было рабіць гравіроўку і тачыльныя камяні з жалабком, каб заточваць подобныя іглы[80].

Па шматлікіх знаходках інструмента бронзаліцейшчыкаў і залатароў, можна мяркаваць аб работе з ім. Так сьценкі тыгляў аплаўленыя, у некаторых з іх захаваліся рэшткі каляровых металаў, а ў сярэдзіне тыгля пабудовы 5 на Малым Замку былі кроплі аплаўленага золата[81]. У абедзьвух частках гораду, а таксама ў магільніках і селішчы Гардзілоўка знайдзены вырабы, адлітыя ў формачках Малага Замка, якія будуць разгледжаны ніжэй. Знайдзеныя на Замкавай гары срэбная прывеска-крын, была адціснута з адпаведнай матрыцы. Пры жаночым шкілеце,

даследваным на могільніку Малага Замка знаходзіліся 12 квадратных бляшак з срэбра, пакрытага золатам[82]. Гэтыя бляшкі зроблены з матрыцы Замкавай гары.

Аб мясцовай апрацоўцы каляровых металаў сьведчаць нарыхтоўкі[83] і бракаваныя вырабы. У значнай колькасьці знайдзены зліткі, абломкі і абрэзкі бронзы і іншых каляровых металаў, а таксама бронзавага дроту. На Малым Замку такіх знаходак было каля 150, на Замкавай гары больш за 60. Памеры і форма іх разнастайныя: ад дробных застылых кропель і абрэзкаў металу да буйных пласцінак, зліткаў і скруткаў дроту[84]. Сыравіна для вырабу срэбных вырабаў сустракаецца адзінкава. Адзначым срэбны злітак у выглядзе лентападобнага бранзалета з дзяцінца Замкавай гары. Аналогіі яму маюцца ў скарбе XI ст. з Ладургі (Латвія) і пахаванні залатара XII ст. у магільніку Граўжай Літоўскай ССР[85]. Зрэдку сустракаюцца абломкі срэбных рубленных грыўнаў[86]. Сляды работы з золатам захаваліся толькі на Малым Замку. Там мела месца выплаўка гэтага металу, аб чым сведчыць запаўненне тыглю, аб якім успаміналася, і кропля золата весам 5,4 грама. Аб выкарыстанні золата для вырабу нелітых вырабаў сведчаць асобныя знаходкі золата і яго абломкі[87].

У лабараторыі археалагічнай тэхналогіі ЛАІА зроблены хімічны аналіз разнастайных знаходак, связаныя з залатарствам Наваградка. Матэрыялы Малага Замка аналізаваў Д.В. Навумаў, а Замкавай гары В.А. Галібін. З пяці тыгляў Малага Замка ў запаўненні чатырох аказаліся металы з меднай асновай і з розным дамескам волава, свінца і цынку. Аналіз золата, што знойдзена ў пятым тыглі, паказаў, што гэта быў двухкампанентны сплаў золата і срэбра, састаўлены, прыкладна, у аднолькавых суадносінах, з незначным дамескам іншых элементаў. Аплаўленыя кавалкі металу аказаліся па хімічным складзе блізкія металу тыгляў. Такім чынам, можна заключыць, што ў Наваградку перапрацоўвалі і пераплаўлялі металы рознага хімічнага складу — медзь, сплавы медзі з волавам, свінцом і цынкам, а таксама золата са срэбрам. Сярод 55 прааналізаваных вырабаў, шмат якія па сваім хімічным складзе аказаліся блізкія да металу ў тыглях і аплаўленых кавалках. Разам з тым сустракаліся вырабы з даволі складаным хімічным складам. Па заключэнню Д.В. Навумава, майстэрні на тэрыторыі Малага Замка былі невялія. Тут выраблялі прадметы побыту і ўпрыгожанні, пераплаўляючы выйшаўшыя з абіходу рэчы. Ізноў атрыманыя вырабы не заўсёды супадалі з тымі, якія ішлі на пераплаўку, што надае ім незвычайнасьць хімічнага складу.

Хімічны аналіз зроблены для 40 знаходак з Замкавай гары.

Вельмі цікавае заключэнне В.А. Галібіна аб тым, што 26 з іх, у тым ліку ўсе матрыцы, злітак, а таксама культавыя вырабы былі з аднаго сплаву алавяністай бронзы. Іх адрознівае таксама падабенства іншых прымесяў — свінцу, цынку і інш., што дазваляе мяркаваць аб адным паходжанні гэтых рэчаў.

У выніку раскопак вядома каля 600 знаходак з каляровых і шляхетных металаў, якія можна звязвать з мясцовым рамяством. На Малы Замак іх прыходіцца 412, на Замкавую гару 158, а на акругу каля 50. Вышей разглядаліся інструменты, прылады працы, нарыхтоўкі і адходы вытворчасьці. Вырабы, што зроблены ў Навагрaдку і адносяцца да гандлю і духоўнага жыцьця, будуць характэрызаваны ў адпаведных главах. Зараз жа гутарка пойдзе аб упрыгожваннях і прадметах убору і бытавых вырабах, якія можна разглядаць як прадукцыю навагрaдскіх рамеснікаў.

Наібольш шматлікай катэгорыяй знаходак з'яўляюцца ўпрыгожванні і прадметы ўбора (больш за 260). На Малым Замку такіх знайдзена 187, на Замкавай гары 26, у акрузе больш за 50. Пераходзім да іх разгляду.

Павязка са срэбраных пазалочаных бляшак (12 экзэмпляраў). Аб гэтых бляшках, ціснёных з матрыцы Замкавай гары, успаміналася вышэй. Яны знайдзены на чэрапе жаночага касьцяка, адкрытага на могілках Малага Замка. Падобныя бляшкі вядомыя ў Панямонні, у магільніку Дварчаны Скідзельскага раёна Гродзенскай вобласьці, дзе яны таксама ляжалі на чэрапе жаночага пахавання[88].

Паўкольцы ад ачельля (2 экзэмпляры). На Замкавай гары знайдзены бронзавыя бракаваныя паўкольцы. Знешняя паверхня іх аформлена ў выглядзе паўшароў, аддзеленых на адным з паўкалец паяскамі, "пад зернь". Даследчык гэтых знаходак В.А. Назарэнка, лічыць іх часткай ачэльля і мяркуе, што прататыпам для іх маглі служыць "аграфы" скарбу, што знайдзены ў Полацкай зямлі. Разам з тым, навагрaдскія знаходкі блізкія дужкам кіеўскіх ачэльляў[89].

Вісочныя (скроневыя) кольцы (46 экзэмпляраў). Характерны 9 бронзавых і срэбных кольцаў са спіральным завітком, знайдзеныя ў першапачаковым паселішчы Малага Замка і навагрудскім магільніку. У апошнім, акрамя целых экзэмпляраў, знайдзены і абломкі падобных калец. На тэрыторыі Беларусі такія кольцы вядомыя ў курганным магільніку старажытнага Ізяслаўля. Вісочныя кольцы са спіральнымі завіткамі цікавыя сваім падабенствам з агульнаславянскімі ўпрыгожваннямі трэцяй чвэрці і канца 1 тысячагоддзя н.э.[90]

Палутараабаротныя кольцы з бронзы і срэбра (19 экзэмпляраў). Гэтыя ўпрыгожванні былі распаўсюджаны ў

Наваградку напрацягу ўсяго старажытнарускага перыяду і з'яўляліся наібольш частымі ўпрыгожваннямі жыхароў акругі. У заходнерускіх гарадах такія кольцы вядомыя ў Гродне і Бярэсьці[91].

Пярсьцёнкападобныя вісочныя кольцы з зыходзячыміся канцамі (10 экзэмпляраў) зроблены з бронзы і таксама пабытавалі напрацягу ўсяго старажытнарускага перыяду як у Наваградку, так і ў ваколіцы. Гэтыя шырока распаўсюджаныя вырабы ў заходнерускіх гарадах рэдкія. Аналогіі ім у цікавых для нас гарадах паходзяць з Бярэсьця[92].

Кольцы з крукападобнымі канцамі (2 экзэмпляры). Бронзавыя. Знайдзены ў раннім паселішчы Замкавай гары і ў наваградскім магільніку. Такія ж сустракаюцца ў магільніку Ізяслаўля (пад Мінскам)[93].

Кольцы з завязанымі канцамі (2 экзэмпляры). Бронзавыя. Знайдзены толькі ў магільніку Гардзілоўка 1. Паралелі вядомыя ў магільніку Ізяслаўля і ў Полацку[94].

Кольцы з напускнымі пацеркамі, апошнія не захаваліся (2 экзэмпляры)[95]. Характэрныя старажытнарускія ўпрыгожванні.

Кальцо, аплеценае бронзавым дротам. Падобна да знаходкі ў магільніку ў Ізяслаўлі[96].

Завушніца залатая драцяная гнутая[97]. Аналогіі невядомыя.

Прывеска-крын срэбная, ціснёная з мясцовай матрыцы. Разгледжана вышэй.

Пацеркі залатыя (9 экзэмпляраў). За выключэннем адной знайдзены на Малым Замку. Па форме - біканічныя, авальныя, шарападобныя. Даўжыня альбо дыяметр 5-8 мм. Адна пацерка прымацавана на залатым дроціку, другая да залатога ланцужка. Вытворчасьць іх адзначана ў пабудове 10, дзе побач з інструментамі залатара знайдзены ліставое золата і мініяцюрны залаты шарык[98].

Бубеньчыкі бронзавыя (17 экзэмпляраў). У ваколіцы знайдзены толькі ў магільніку каля в. Суляцічы. Дыяметр бубеньчыкаў 0,7 - 1,5 см. Чатыры з іх маюць крыжападобную прарэзь. Астатнія шчылепадобную. Тулавы бубеньчыкаў са шчылепадобнай прарэзьзю часам упрыгожаны нарэзкай[99].

Гузікі бронзавыя (18 экзэмпляраў). Дыяметр іх рэдка перавышае 0,5 см. Знайдзены гузікі, адлітыя ў формачцы на тэрыторыі Малага Замка[100]. Бубеньчыкі і гузікі надзвычай папулярныя вырабы Старажытнай Русі. У гарадах на тэрыторыі Беларусі вядомыя ў Полацку, Ваўкавыску і Мінску. У апошнім знайдзена не меньш за 200 формачак для адліўкі гузікаў[101].

Прывескі бронзавыя (9 экзэмпляраў). Пяць з іх памерамі 1,2-3,5 см., прадстаўлены трапецэпадобнымі арнаментаванымі

цісненнямі і гравіроўкай. Мяркуючы па нарыхтоўкам з Малага Замка, прывескі былі каваныя. Трапецэпадобныя прывескі — традыцыйныя ўпрыгожванні жыхароў Прыбалтыкі, нярэдкія ў гарадах Заходней Русі. Вялікім прывескам Наваградка даволі блізкая знаходка з Лукомля[102].

Манетападобныя прывескі (2 экзэмпляры). Знайдзены ў адной пабудове, маюць дыяметр 3 см. На адной прывесцы выява сяміпялёсткавай разеткі, другая з геаметрычным арнаментам. Такія прывескі па арнаменту блізкія знаходкам з Гродна і Полацка. У апошнім, а таксама ў Ваўкавыску знайдзены формачкі для адліўкі манетападобных прывесак[103].

Фігурны стрыжань даўжынёй 5,5 см. з адтулінай, верагодна, з'яўляўся часткай булаўкі з кольцавой галоўкай, падобнай да знаходак з Ваўкавыска і Бярэсця[104]. Адзначым таксама літую бронзавую дыскападобную прывеску з вушкам (дыяметрам 2 см.). Да мясцовых вырабаў златакавальства трэба далучыць частку залатога авальнага медальёна (даўжынёй 1 см.), запоўненага па вызначэнню Т.І. Макаравай чырвонай і зялёнай перагародчатай эмаллю. Гэта знаходка паходзіць з пабудовы 10 Малага Замка і знайдзена разам з залатымі пацеркамі і адходамі вытворчасьці[105].

Сярод спражак, якія ўсе былі зроблены з бронзы, больш за ўсё падковападобных са спіральна загнутымі канцамі (8 экзэмпляраў). Дыяметр іх 3-4,5 см. Гэтыя спражкі, акруглыя, паўкруглыя і трохвугольныя ў сячэнні, аналагічныя жалезным спражкам такой жа формы. Сустракаюцца яны як у Наваградку, так і ў курганных магільніках[106]. Паралелі ім ёсьць амаль ва ўсіх заходнерускіх гарадах.

Ліпападобныя спражкі (3 экзэмпляры). Знайдзены толькі ў курганных магільніках. Вышыня спражкі 3,5 см. Адна са знаходак была з жалезным шпеньком. Аналагічныя знайдзены ў Мінску і Ваўкавыску[107].

Прамавугольныя (4 экзэмпляры). Адна з выступамі па краях. У магільніку ля в. Маруліны такая спражка была ў інвентары мужчынскага пахавання. Памеры знаходак 1-2, 5х1-2 см. Падобныя сустракаюцца ў Ваўкавыску, Мінску і Бярэсьці[108].

Паўкруглыя (3 экзэмпляры). Дзве знайдзены ў пабудовах другой паловы XII ст. на Малым Замку. Вышыня іх 1,5-2 см. Спражкі такіх і большых памераў ёсьць ў Мінску[109].

Кольцападобныя пласцінкавыя (7 экзэмпляраў). Адна паходзіць з селішча Гардзілоўка. Спражкі дыяметрам 2,5-3 см., упрыгожаны кропкавым абадком, цісненнямі і рыфленнем. У асобных выпадках захаваліся іх іглы. Наваградскім знаходкам наібольш блізкія спражкі з Бярэсьця, якія датуюцца часам не

раней за XIII ст.[110]

Знаходка ў Бярэсьці зашпількі, якая была зробленга з двух бронзавых дыскаў, змацаваных раменьчыкам, дазволіла па-новаму інтэрпрэтаваць дыск з Навагрaдка дыяметрам 8,5 см., як частку падобнай зашпількі. Раней гэту знаходку разглядалі як частку падсвечніка[111].

Бронзавыя кольцы (8 экзэмпляраў), дыяметрам 2,5-3 см., арнаментаваныя нагадваюць адліўкі з Навагрaдскай формачкі. У курганах кольцы знайдзены ў мужчынскіх пахаваннях. Арнаментаваныя кольцы нагадваюць адну са знаходак Бярэсьця[112].

Бляшкі-шкарлупкі (10 экзэмпляраў). Адна знайдзена на селішчы Гардзілоўка. Дыяметр іх 0,5 см. Асобныя бляшкі адліты ў навагрaдскіх формачках. Бляшкі, верагодна, прымацоўваліся квадратнымі пласцінкамі (старана 1 см). Мяркуючы па формачках Полацка і Бярэсьця бляшкі шкарлупкі выраблялі ў гэтых гарадах[113].

Бляшкі прамавугольныя з перахватам (2 экзэмпляры). Адносяцца да інвентара пабудовы 5 Малага Замка. Памер 2х1,5 см. Зроблены са срэбра і пакрыты ліставым золатам. Бляшкі інкруставаны сэрцападобнымі ўстаўкамі з зялёнага шкла. Маюць некаторае падабенства са срэбнымі бляшкамі скарбу з Разані[114].

Бляшкі індывідуальных формаў (6 экзэмпляраў). Амаль усе з заклёпкамі для прымацавання да адзежы. Сярод іх: бронзавая сяміпялёсткавая з кропкавым арнаментам. Дыяметр яе 1 см., чатырохпялёсткавая такога ж памера, зробленая з белага метала, акруглая з латуні, дыяметрам 0,7 см. з адціснутым мальтыйскім крыжом і кропкамі. Разам з апошняй знайдзена бронзавая міндалепадобная з кропкавым арнаментам. Даўжыня яе 1,7 см. Адзначым таксама бронзавую квадратную з чатырохпялёсткавым і штрыхавым арнаментам, (старана бляшкі 1,1 см.). У кургане магільніка Гардзілоўка 1 знайдзена бронзавая бляшка ў форме шчыта з цісненнямі ў выглядзе паўкруглых ліній. Вышыня бляшкі 1,5 см.[115]

Да індывідуальных знаходак належаць таксама тры бронзавыя фігурныя язычкі ад паясоў. Адзін з іх з дзяцінца. Даўжыня знаходак 1,8-2,5 см. і дзве бронзавыя аправы для шкла альбо камяню, знайдзеныя ў пабудове 5 вакольнага гораду[116].

Пярсьцёнкі (34 экзэмпляры). За выключэннем двух срэбных, зроблены з бронзы. Сярод іх:

Кругладрацяныя з патаўшчэннем (2 экзэмпляры). Адзін з магільніка Каменка. Такі ж пярсьцёнак знайдзены ў Бярэсьці[117].

Спіральны. Знайдзены ў навагрaдскім магільніку.

Аналагічныя адзначым у Тураве і Мінску[118].

Шырокія пласцінкавыя з несамкнутымі канцамі (3 экзэмпляры). Упрыгожаны гравіроўкай. Пабытавалі да сярэдзіны XII ст. Падобныя пярсьцёнкі вядомыя ў Ноўгарадзе і шэрагу курганных магільнікаў[119].

Шырокія з завязанымі канцамі (4 экзэмпляры). Два з іх знайдзены ў курганах. Упрыгожаны кропкамі і штрыхамі. У Наваградку былі распаўсюджаны да сярэдзіны XII ст. Пярсьцёнкі гэтага тыпу шырока распаўсюджаны ў помніках Паўночна-усходняй Еўропы.[120]

Вузкія пласцінкавыя з несамкнутымі пашыранымі канцамі (2 экзэмпляры). Аналогія вядомая ў Ваўкавыску[121].

Кругладрацяныя замкнутыя (2 экзэмпляры). Такія ж пярсьцёнкі знайдзены ў Полацку[122].

Вузкапласцінкавыя незамкнутыя (4 экзэмпляры). Арнаментаваны кропкамі альбо штрыхамі. Аналогіі вядомыя ў Лукомлі і Ваўкавыску[123].

Рубчатыя (5 экзэмпляраў). На патоўшчанай частцы кругладрацянога пярсьцёнка зроблена насечка. Тры пярсьцёнкі паходзяць з курганаў. Рубчатыя пярсьцёнкі знайдзены ў Гродне, Полацку і Мінску[124].

Срэбны плецены пярсьцёнак з разкляпанымі канцамі знайдзены ў магільніку Батароўка XII-XIII стст. Блізкі да знаходак Ноўгараду[125].

Пярсьцёнкі з авальнымі і шасьцівугольнымі шчыткамі. Пярсьцёнак з авальным шчытком знайдзены ў Бярэсьці[126].

Пярсьцёнкі са шклянымі ўстаўкамі (2 экзэмпляры). Падобныя былі ў Полацку[127].

Бранзалеты (15 экзэмпляраў). Усе бронзавыя. Знайдзены, галоўным чынам, на Малым Замку у культурным слоі да канца XI ст. У ваколіцы толькі адзін бранзалет паходзіць з кургана і, верагодна, абломак такога з селішча Гардзілоўка.

Вялікая частка бранзалетаў у абломках. Пераважаюць пласцінкавыя, літыя і каваныя. Сярод знаходак, тып якіх можна вызначыць, знайдзены авальнаканечны і шырокаканечныя бранзалеты. Апошнія аналагічныя вырабам з Полацка і Турава[128].

Вузкамасіўныя (2 экзэмпляры) з круглымі канцамі. У сячэнні трохвугольныя. Арнаментаваны па краях лініямі. Падобныя бранзалеты маюцца ў Ваўкавыску.[129]

На тэрыторыі Малага Замка і на селішчы Гардзілоўка знайдзены бранзалеты ў абломках, канцы якіх былі звужаны. У Ваўкавыску такія знаходкі датуюцца XII ст.[130]

Сярод абломкаў бранзалетаў маюцца: з тонкай пласцінкі,

упрыгожаны перакрэснымі лініямі і фрагмент літога паўкруглага ў сячэнні з пашыраючыміся канцамі.

Булаўкі з акруглымі галоўкамі (2 экзэмпляры). Зроблены з бронзы. Даўжыня 2,5-4 см. У Ноўгарадзе падобныя з'яўляюцца з пачатку XIV ст. Іх выкарыстоўвалі для прыкалвання жаночых хустак[131]. Магчыма, што адзежнай булаўкай быў не цалкам захаваны бронзавы выраб з вітым стрыжнем і сплошчаным арнаментаваным верхам.

Колькасьць навагрaдскіх упрыгожванняў мясцовай вытворчасьці трэба павялічыць за кошт такіх знаходак як бронзавыя і тонкія залатыя ланцужкі, металічныя петлі, вушкі, абоймачкі і іншыя дэталі невялікіх рэчаў[132], а таксама тых упрыгожванняў, для адліўкі і ціснення якіх прызначаліся ліцейныя формачкі і матрыцы, але самі ўпрыгожванні да нас не дайшлі.

Сярод прадукцыі навагрaдскіх рамеснікаў мяецца каля 30 пласцінак, галоўным чынам з бронзы, але сустракаюцца таксама са свінца, латуні, волава і срэбра. Памеры і форма іх розныя. Шмат арнаментаваных. На асобных пласцінках прабіты адтуліны для мацавання да тканіны альбо другіх матэрыялаў. Адна бронзавая ажурная пласцінка ўпрыгожвала скураны выраб[133].

У Навагрaдку выраблялася нямала рэчаў бытовога характару з каляровых металаў. Прынамсі іглы (5 экзэмпляраў), якія не адрозніваліся ад жалезных. Да гэтай жа катэгорыі знаходак можна аднесьці востраканечнікі (4 экзэмпляры). Даўжыня іх 3,5-4 см. [134] Не зусім зразумела прызначэнне стрыжняў (5 экзэмпляраў), дыяметр якіх 3 мм., а даўжыня да 10 см. З домабудаўніцтвам звязаны масіўныя ручкі і накладкі з заклёпкамі.[135] Акрамя жалезных вушкаў для драўляных пасудзін ужывалі бронзавыя[136]. Нярэдкімі знаходкамі былі бронзавыя пасудзіны, абломкі якіх знайдзены на абедзьвух частках гораду.

Стрыжневые ключы (2 экзэмпляры). Адзін захаваўся цалкам — ён мае даўжыню 4,8 см. Такія ключы, як і жалезныя, маглі выкарыстоўваць непасрэдна па прызначэнню. У каменных магілах Беларускага Панямоння, Літве і зямлі прусаў бронзавыя і срэбныя ключы, што знайдзены ў пахаваннях, з'яўляліся нагруднымі ўпрыгожваннямі[137].

Цьвікі (10 экзэмпляраў), даўжынёй да 2 см. з даволі шырокай шляпкай, сустракаліся, пераважна, на Замкавай гары. Адтуль жа паходзіць масіўны літы выраб у форме ножкі і ажурныя пласцінкі.

На заканчэнні адзначым бронзавыя знаходкі з вакольнага гораду: фігурную накладку з вузкіх палос[138] і выраб даўжынёй 18 см. у выглядзе гнутага стрыжня з пятлёй. Прызначэнне шмат якіх вырабаў з каляровых металаў з абедзьвух частак гораду не

ўдалася вызначыць. Як адзначалася вышэй, рэчы, што зроблены ў Наваградку, якія мелі адносіны да знешніх сувязяў і духоўнага жыцьця, будуць разгледжаны ў адпаведнай частцы работы. У дадзеным выпадку мэтазгодна адзначыць, што такія знаходкі, як весавыя гіркі і кніжные зашпількі на Замкавай гары прадстаўлены серыямі.

Прадукцыя рамеснікаў Малага Замка, што разыходзілася ў Наваградскай акруге і пачатковым паселішчы Замкавай гары, трапляе на тэрыторыю апошняй і ў XII-XIII стст. Адзіную знайдзеную там залатую пацерку немагчыма адрозніць ад адпаведных знаходак вакольнага гораду. Гэта ж можна сказаць аб некаторых іншых знаходках (бубеньчыкі, гузікі і інш.), што выраблялі ў майстэрнях вакольнага гораду і рэдка сустракаюцца на дзяцінцы.

Да вырабаў, што зроблены на Замкавай гары і трапілі ў другую частку гораду належаць срэбныя бляшкі, ціснёныя з матрыцы дзяцінца. Як аб гэтым пісалася вышэй, яны знайдзены ў жаночым пахаванні Малага Замка. Правда, на могілках, што прымыкалі да багатага кварталу вакольнага гораду і якія былі прывеліраваныя, магчыма, папросту, пахавана жыхарка Замкавай гары. Што датычыць залатарскіх вырабаў Наваградскай акругі XII-XIII стст., то яны нешматлікія і маглі быць зроблены ў абедзьвух частках гораду.

Археалагічныя матэрыялы паказваюць старажытнарускі Наваградак як центр развітай апрацоўкі каляровых і шляхетных металаў. Яго рамеснікам былі даступныя ліцьцё, коўка, цісненне і валачэнне. Яны практыкавалі злучэнне ўпрыгожванняў з каляровых і шляхетных металаў з устаўкамі са шкла і інкруставалі жалезныя вырабы бронзай, волавам і срэбрам. Адзіная знаходка часткі залатога медальёна з перагародчатай эмальлю наўрад ці дае аснаванне бачыць у Наваградку вытворчасьць эмальерных работ. Разам з тым, дадзеная рэч была знайдзена сярод матэрыялаў, над якімі працавалі златакавалі.

Прыгадаем асаблівасьці развіцьця залатарства на тэрыторыі Малага Замка, якія каротка прыводзяць да наступных палажэнняў: існаваўшае ад пачатку на паселішчы, гэтае рамяство з XII ст. робіцца вядучым. Разам з апрацоўкай каляровых металаў і срэбра, практыкуюцца золатакавальскія работы — выраб літых і каваных залатых вырабаў. У выніку, на тэрыторыі вакольнага гораду Наваградка фарміруецца квартал багатых залатароў, у якім можна бачыць зародак аб'яднання рамеснікаў[139].

Іначай выглядае залатарства на дзяцінцы, з'явіўшыся тут толькі ў XII ст. Аб'ём яго невялікі. Наібольш характэрным для дзейнасьці рамеснікаў наваградскага дзяцінца з'яўляецца

цісненне з матрыц, якое, мяркуючы па гатовых вырабах, рабілася па срэбру. Тут выраблялiся таксама літыя і каваныя вырабы.

У залатарстве дзяцінца, у адрозненні ад дадзенай галіны рамяства вакольнага гораду, выразна прасочваецца ўздзеянне кіеўскага мастацкага рамяства. Гэта, перш за ўсё, праяўляецца ў форме матрыц, а таксама ў форме некаторых літых вырабаў. З падобнымі з'явамі мы маем справу і на іншых помніках Заходняй Русі. У свой час М.М. Варонін, інтэпрытуючы, так званыя імітацыйныя ліцейныя формачкі Старога Замка Гродны, выказаў думку, што яны альбо прывезены з Кіева, альбо гродзенскія рамеснікі зрабілі іх на ўзор кіеўскіх для адліўкі ўпрыгожванняў, падобных да багатых нелітых вырабаў[140]. Імітацыйныя ліцейныя формачкі знайдзены ў Полацку, дзе яны былі зроблены мясцовымі рамеснікамі[141], хаця яны, несумненна, паўтаралі адпаведныя кіеўскія формачкі. Аб матрыцах з Вішчына, з якіх маглі быць адціснуты паўднёварускія ўпрыгожванні (колты, прывескі-крыны і інш.) пісалася вышэй.

Інструменты заходнерускіх залатароў ідэнтычныя альбо падобныя да кіеўскіх, знайдзены на тых частках паселішчаў, дзе жылі феадалы. У Гродне, Полацку і Навагрaдку гэта гарадскія дзяцінцы. Феадальным замкам з'яўляўся Вішчын[142].

Для высвятлення спецыфікі залатарства на дзяцінцы Навагрaдка істотным з'яўляецца назіранне В.А. Галібіна аб аднолькавасьці сплаваў матрыц і заведама кіеўскіх па паходжанню, знайдзеных тамсама энкалпіёнаў і мяркаванне аналітыка аб агульным іх паходжанні. Іначай кажучы, матрыцы Замкавай гары былі разам з другімі вырабамі прывезены з Кіева. Гэта дазваляе мяркаваць, што ў Навагрaдак у XII ст. прыбылі кіеўскіе рамеснікі са сваім інструментам, якія на дзяцінцы працавалі разам з мясцовымі залатарамі. Бронзаліцейшчыкаў і залатароў Замкавай гары, якія абслугоўвалі феадальны двор, трэба разглядаць як вотчынных рамеснікаў.

Такім чынам, для Навагрaдка XII-XIII стст. вымалёўваюцца дзве сацыяльные групы адной галіны рамяства — аб'яднанне свабодных рамеснікаў у вакольным горадзе і залежныя ад феадала залатары на дзяцінцы.

3. Ганчарства.

Масавая кераміка, сабраная падчас раскопак Навагрaдка, прадстаўлена калекцыяй з каля 24000 адзінак. Амаль увесь посуд зроблены з дапамогай ганчарнага круга. Ляпная кераміка

адзінкавая. Адзіная цэлая ляпная пасудзіна прадстаўляла з сябе гаршчок з прамым горлам, на сьценках якога прачэрчаны рыскі.

Кераміку, што знайшлі ў выніку раскопак 1967-1968 гг. на тэрыторыі Малага Замка, даследвала М.У. Малеўская. Вывучыўшы больш за 13 тысяч фрагментаў непаліванага посуду, аўтар вылучае гаршкі з атагнутым венчыкам, якім належыць 94% матэрыялаў, гаршкі з вертыкальным горлам, міскі, збанкі і іншыя формы. Класіфікація і тыпалогія наваградскай керамікі, што зрабіла М.У. Малеўская, выкарыстаны ў кнізе “Старажытны Наваградак”[143].

Новыя керамічныя матэрыялы, атрыманыя раскопкамі наступных гадоў, падцвердзілі дадзеную ёй характэрыстыку. Высветлілася таксама, што масавы посуд Малага Замка і Замкавай гары не мелі адрозненняў, за выключэннем таго, што на тэрыторыі апошняй не знайдзены патэльні і жароўні, характэрныя для першапачатковага пасеішча на Малым Замку.

Старажытныя насельнікі Наваградка выраблялі гліняны посуд на ганчарным крузе. Аднак, яны сталі ім карыстацца незадоўга да засялення Малага Замка. Аб гэтым можна мяркаваць не толькі па абломках ляпных пасудзін, але і па тым, што наібольш раннія гаршкі з атагнутым венчыкам абточаны на крузе толькі ў верхняй частцы, радзей цалкам[144].

Развіццё формаў і тыпаў непаліванага посуду добра прасочваецца па комплексах, што паказвае і табліца з матэрыялам атрыманым на Малым Замку.

Табліца 2. Масавая кераміка з жылішчаў на тэрыторыі Малага Замка.

Дата дамоў	Формы і тыпы керамікі
Да 70-х гадоў XIII	Пераважаюць гаршкі VIII-IX тыпаў
Другая палова XII ст.	Гаршкі III-IX тыпаў, гаршкі з вертыкальным горлам, міскі I і III тыпаў, дробны сталовы посуд, карчагі.
Першая палова XII ст.	Гаршкі I-VIII тыпаў (пераважаюць гаршкі V тыпу), гаршкі з вертыкальным горлам, сталовы посуд, міскі I і II тыпаў, крышкі I тыпу.
Другая палова XI ст.	Гаршкі I-V тыпаў.
Першая палова XI ст.	Гаршкі I-V тыпаў (пераважаюць гаршкі II тыпу), гаршчок з вертыкальным горлам, мініацюрны сасуд, патэльня.
Канец X ст.	Гаршкі I і II тыпаў, гаршчок з вертыкальным горлам, патэльня.

Для Замкавай гары, кераміка, знайдзеныная ў комплексах паказвае наступнае: у першапачатковым паселішчы (пад старажытным валам) знайдзены гаршкі I, III і V тыпаў і абломак гаршка з вертыкальным горлам. У вялікай яме, выкапанай у мацерыку, палову керамікі складалі гаршкі V тыпу, тамсама знайдзены гаршкі I і III тыпаў і нешмат фрагментаў гаршкоў I

тыпу. У сатлеўшых гаспадарчых пабудовах кераміка прадстаўлена гаршкамі V-VI тыпаў, у ранніх згарэўшых свірнах сустракаюцца гаршкі V-VIII тыпаў, а ў свірнах, што адносіліся да канца гісторыі старажытнарускага Наваградка — гаршкі V-IX тыпаў. У курганах, як адзначалася ў свой час, знайдзены, амаль выключна, гаршкі II тыпу, аднойчы гаршчок III тыпу і міска II тыпу[145]. На селішчы Гардзілоўка пераважалі гаршкі V тыпу. Сустракаюцца абломкі карчаг[146].

Як у многіх старажытнарускіх гарадах, у Наваградку не захаваліся рэаліі, якія б паказвалі на мясцовае ганчарства. Ідэнтычнасьць керамікі вакольнага гораду і дзяцінца сведчаць на карысьць таго, што абедзьве часткі гораду абслугоўвалі адны і тыя ж ганчарныя майстэрні. Кераміку, што знайдзена ў курганах, таксама трэба аднесьці да прадукцыі наваградскіх мйстроў. Верагодна, яны ж выраблялі посуд, што знайдзены на селішчы Гардзілоўка.

Набор посуду Наваградка, характэрны для старажытнарускага гораду, бліжэй за ўсё да масавага посуду Ваўкавыска, хаця ў Ваўкавыску больш адчуваецца пранікненне заходнеславянскай керамікі[147].

Прадукцыяй наваградскіх ганчароў былі таксама тыгелькі і льячкі, а таксама гліняная ступка, відавочна, звязаная з залатарствам. Адзначым знаходкі шарыкаў з неабпаленай гліны.

Асобнай галіной ганчарства быў выраб паліванай керамікі. Паліванай кераміке Малага Замка прысвечана работа М.У. Малеўскай, Замкавай гары — работа аўтара[148]. Наша задача зараз — даць уяўленне аб тым, што прадстаўляла з сябе паліваная кераміка Наваградка як галіна гарадскога рамяства.

На Малым Замку было ўлічана 180 фрагментаў паліванага посуду. Да іх трэба дадаць яшчэ каля 20 абломкаў, знайдзеных пры больш позніх работах. Больш за 140 фрагментаў такога посуду паходзяць з Замкавай гары. Больш за 340 абломкаў належалі прыкладна да 110 пасудзін, з якіх цалкам можна аднавіць форму для 17, а часткова для 70 пасудзін.

10% паліванай керамікі Замкавай гары і 38% Малага Замка зроблены з белай гліны. Мы лічым іх за прывазныя і разгледзім у главе аб імпарце. Мясцовыя паліваныя вырабы мелі пасля абпалу чырвоны альбо шэры колер і, як паказаў петраграфічны аналіз, цеста іх, у шэрагу выпадкаў, па складу супадала са складам цеста непаліваных пасудзін.

Суадносіны паліванай керамікі, якая мае пасля абпалу шэры альбо чырвоны колер у абедзьвух частках гораду рознае. На тэрыторыі Малага Замка пераважалі знаходкі з чырвоным колерам чарапка, на Замкавай гары з шэрым. Вялікая частка

керамікі Замкавай гары (84 %) пакрыта палівай толькі звонку. На Малым Замку такой керамікі 57%. Зрэдку паліва пакрывала сасуд толькі з сярэдзіны. Астатнія знаходкі маюць двухбаковую паліву.

Ніжэй прыводзіцца колеравая гама палівы Навагрудка, якая, згодна аналізам, зроблена па свінцова-крэмнезёмным рэцэпце.

Табліца 3. Колер паліванай керамікі (у %).

Колер палівы	Малы Замак	Замкавая гара
Зялёны	58	91
Жоўты	10,4	5
Карычневы	31,6	3
Цёмна-чырвоны	адзінкава	1

Галоўную групу гаршкоў Малага Замка складаюць гаршкі вышынёй 8-9 см. з двубаковай жоўтай, зялёнай і карычневай палівай. На Замкавай гары ў слоі XIII ст., знайдзены гаршчок па плечыках якога нанесены валік з насечкай. Такія валікі з насечкай характэрныя для сінхроннай непаліванай керамікі Навагрудка. Паліваныя гаршкі былі распаўсюджаны ў Любечы і іншых старажытнарускіх гарадах[149].

Больш як 40 % усіх абломкаў паліванай керамікі Замкавай гары належалі збанкам. Рэстаўраваны збанок з гаспадарчай пабудовы XII ст., вышынёй 28 см., меў венчык у форме шырокага раструба, шыйку, акруглае тулава, шырокае дно і гранёную ручку. Збанок пакрыты бура-зялёнай, месцамі карычневай палівай. З абломкаў з зялёнай палівай удалася ўзнавіць большую частку збанка: яго акруглены венчык з плоскім валікам пераходзіць у акруглае тулава, ручка з валікамі па краях. Збанок арнаментаваны гарызантальнымі лініямі, хваляй і акруглымі зацiскамі. Пасудзіна знайдзена ў культурным слоі XIII-XIV стст., але і паперад пабытавалі аналагічныя збанкі, датаваныя XII-XIII стст., ад якіх захаваліся сьценкі, ручкі і іншыя фрагменты. Збанкі падобнай формы, прапорцый і арнаменту вядомыя ў Кіяве, Мсьціслаўлі і гарадзішчы Асавік Рагнедзінскага раёна Бранскай вобласьці[150]. Сярод знайдзенай на Малым Замку паліванай керамікі зробленай з каляровай гліны, збанкоў не было зусім. Абломкі паліваных збанкоў, падобных да посуду з Замкавай гары на тэрыторыі Беларусі вядомыя ў Друцку, Тураве і Мсьціслаўлі[151].

У абедзьвух частках гораду сустракаюцца абломкі чараў, сярод якіх цікавы посуд Малага Замка — паўтор візантыйскіх узораў. Гэта адкрытае блюда з адагнутым краем і нізкім паддонам

і чара на паддоне, пакрытая звонку блакітна-зялёнай, а ў сярэдзіне цёмна-чырвонай палівай.

Сярод паліванай керамікі Малага Замка ёсьць крышкі ад вялікіх гаршкоў, якія нагадваюць крышкі непаліваных пасудзін. Падобна да апошніх, паліваныя крышкі часам упрыгожаны хваляй. Там жа пабытавалі біканічныя пасудзіны і паддоны — полыя конусападобныя аснаванні, верхнія часткі якіх не захаваліся[152].

На Малым Замку і Замкавай гары сустракаюцца пасудзіны з вертыкальнымі сьценкамі. Знайдзены фрагмент падобнай пасудзіны з штампаваным арнаментам. Сярод паліванай керамікі маюцца абломкі мініяцюрных збаночкаў з двухбаковай зялёнай палівай, якія, магчыма, служылі для лекавых альбо касметычных начыньняў[153]. Трошку сагнуты венчык з рыфленнем і аднабаковай палівай рэканструіруецца ў форме кубка. Аналогіі яму ёсьць у Любечы, а таксама на хутары Палавецкім[154]. Ад сасуда на Замкавай гары захавалася частка гранёнай ручкі, пакрытая зялёнай палівай.

Цікавая група паліванага посуду належыць да знаходак з Малага Замка і прадстаўлена шасьцю пасудзінамі. Лепш за іншыя захаваўся невысокі збанок з шырокім дном. Яго полая ручка ніжняй часткай, раструбам была прымацавана да прыдоннай часткі, а верхняй, верагодна, уваходзіла ў горла. Звонку сасуд пакрыты карычневай палівай, а па плечыках нанесена хваля[155]. На Замкавай гары знайдзены раструб ад такога сасуда, пакрыты зялёнай палівай.

На Замкавай гары знайдзены выраб у выглядзе галавы жывёліны з прадалгаватай мордай, акруглымі вачамі і кароткімі рагамі. Выраб пакрыты зялёнай палівай. Па вызначэнню Н.М. Ермолавай гэта фігурка аленя, што скінуў рогі. Знаходка была цацкай. Гліняныя паліваныя цацкі вядомыя ў Гродне. Там знайдзены конік цёмна-жоўтай палівы з карычневымі плямамі, у Мсьціслаўлі (паліхромная ўкропка) і Кіеве, адкуль паходзіць галоўка аленя, пакрытая светла-зялёнай палівай[156]. Пры адначасовым з'яўленні паліванай керамікі на Малым Замку і Замкавай гары ў XII ст. і пэўным падабенстве вырабаў абедзьвух частак гораду, відавочна і іх адрозьнне. На дзяцінцы паліваную кераміку выраблялі, пераважна, з каляровай гліны, у той час як на вакольным горадзе доля каляровай гліны складае няшмат больш за 60 % паліваных рэчаў. У адной частцы гораду ганчары рабілі, галоўным чынам, чырвонагліняны посуд, а ў другой цеста пасле абпалу мела, часьцей за ўсё, шэры колер. У наборы прадукцыі абедзьвух гарадскіх узвышшаў больш розьніцы чым падабенства. Аднолькавы колер палівы не выключае таго, што адны і тыя ж

колеры на Малым Замку і на Замкавай гары прадстаўлены па рознаму.

Адрозненні, якія назіраюцца ў тэхналогіі і асартыменце паліваных вырабаў, даюць магчымасць мяркаваць, што ў горадзе было не меньш як дзве майстэрні па вырабу паліванай керамікі, з якіх адна абслугоўвала багатае насельніцтва вакольнага гораду, а другая ўладальніка дзяцінца. Пераважанне шэра-гліняных пасудзін з Замкавай гары збліжае іх з паўднёварускай паліванай керамікай, дзе такая пераважае. Папулярнасьць на дзяцінцы збанкоў, характэрных для паўднёварускай зямлі, а таксама знаходка кубка, аналагі якога вядуць туды ж, магчыма, сведчаць аб тым, што для наваградскага дзяцінца, разам з мясцовымі ганчарамі, маглі працаваць прышлыя паўднёварускія рамеснікі. Рэальнасьць падобнага мяркавання падмацоўваецца фактамі пранікнення ў Наваградак залатароў з Кіева. Актыўныя культурныя сувязі, што існавалі паміж Наваградкам і Кіеўскай зямлёй, аб чым яшчэ неаднаразова будзе сказана ніжэй, маглі спрыяць пранікненню ў наш горад не толькі княжацкіх залатароў, але і княжацкіх ганчароў з Кіева, апошнія працавалі сумесна з тутэйшымі рамеснікамі. У гэтым плане цікавае заключэнне Т.І. Макаравай, згодна якому паліваныя вырабы ў заходнерускіх землях з'явіліся пад уплывам Кіева[157].

У Наваградку паліванай керамікі шмат больш, чым у іншых гарадах на тэрыторыі Беларусі і ў іншых старажытнарускіх гарадах. На тэрыторыі вакольнага гораду яна, разам з прывазным шкляным і фаянсовым посудам, упрыгожвала дамы багатых гараджан, а на дзяцінцы была прызначана для феадальнай знаці.

А.Л. Якабсон, які шмат гадоў даследваў паліваную кераміку Паўночнага Прычарнамор'я і Закаўказьзя, бачыць у ёй прадукцыю выключна гарадскіх майстроў, якая сведчыць аб вялікім росквіце гарадскога рамяства[158]. Старажытнарускі паліваны посуд нашмат больш сьціплы, але і ён адлюстроўвае тыя ж з'явы ў гарадской культуры. Гэта палажэнне падыходзіць і да Наваградка.

З вытворчасьцю паліванага посуду звязаны выраб плітак з палівай. Пры даследванні храма Барыса і Глеба ў Наваградку, (раскопкі М.К. Каргера), у сярэднім нефе была знайдзена дастаткова добра захаваная частка майолікавай падлогі. Квадратныя пліткі пакрывала карычневая, зялёная і жоўтая паліва[159]. Пліткі, як адзначана ў главе аб жылішчах, былі знайдзены ў запаўненні аднаго з багатых дамоў вакольнага гораду. Гэтыя пліткі розных памераў і формаў пакрыты жоўтай і зялёнай палівай. Гліняная ліцейная формачка з Малага Замка, прызначаная для адліўкі званочкаў, з адваротнага боку пакрыта палівай. Відавочна, у тых жа майстэрнях, дзе выраблялі паліваны

посуд, наладзілася вытворчасьць майолікавых плітак. Для Гродны сувязь вытворчасьці такіх плітак з вытворчасьцю іншых вырабаў звязвае М.М. Варонін[160].

Разам з вытворчасьцю паліванага посуду і плітак у Наваградку пачынаецца выраб цэглы. У першую чаргу, цэгла прызначалася для будоўлі храма. Адначасова, у першай палове XII ст., яна становіцца будаўнічым матэрыялам для багатых дамоў.

З заканчэннем будаўніцтва царквы, вытворчасьць цэглы ў Наваградку не спыняецца. Яе выкарыстоўвалі пры выкладанні печаў, ваконных праёмаў і, магчыма, сьценаў вялікіх дамоў вакольнага гораду аж да 70-х гг. XIII ст. Памеры цэглы, якая выкарыстоўвалася ў домабудаўніцтвве наступныя (у см.): 17x11x4,5; 24x20x4; 27x20x5; 27x21x4,5; 28x20x5; 30x15x4; 30x27x4. Апошні адзначаны для адзінай цагліны, пакладзенай у падпечку пабудовы другой паловы XII ст.

Такім чынам, выраб цэглы ў Наваградку, што распачаты ў пачатку XII ст., працягваецца напрацягу ўсёй гісторыі гораду старажытнарускай пары. Можа быць крыху пазней у Наваградку ўзводзілі яшчэ адну царкву, якая наібольш верагодна, павінна была стаяць на ўскрайку Малага Замка, дзе ў першай палове XII і XIII стст. знаходзіліся могілкі. Не выключана, што цэглу выраблялі спецыяльна для багатых дамоў. Цагельства, што нарадзілася ў старажытнарускім Наваградку, атрымаў у спадчыну познесярэдневяковы горад, для якога характэрна актыўнае манументальнае будаўніцтва.

Галіной ганчарства быў выраб гліняных прасліц. З 53 такіх прасліц, 50 знайдзены на Малым Замку, у яго наібольш ранніх комплексах. У свірне знайдзена 12 прасліц, у сінхроннай яму яме 11. Прасліцы сустракаюцца і ў ранніх жылых пабудовах. Форма прасліц, дыяметр якіх да 4 см., высата да 2 см., разнастайная. Пераважаюць біканічныя (24 экзэмпляры). Паверхня некаторых заглажана і нават залошчана. Частка знаходак арнаментавана кропкамі, лініямі і хваляй[161]. Зонныя прасліцы (15 экзэмпляраў) маюць як гладкую так і шарахаватую паверхню. Астатнія былі бочкападобныя з гранёнымі бакамі[162].

Пераважанне біканічных прасліц у ранніх комплексах Малага Замка дае падставы лічыць, што першыя насельнікі Наваградка карысталіся вырабамі такой формы яшчэ да засялення Малага Замка. Астатнія формы іх з'явіліся пазней.

Гліняныя прасліцы нядоўга пабытавалі ў Наваградку і да канца XI - пачатку XII стст. былі заменены прывазнымі шыфернымі і мясьцовымі з камяню. Падобная змена характэрная для многіх старажытнарускіх гарадоў, а на тэрыторыі Беларусі адзначана ў Полацкай зямлі[163]. Рэдкімі знаходкамі ў

Навагрaдку з’яўляюцца прасліцы са сьценак гаршкоў і амфар.

4. Апрацоўка косьці, камяню і іншых матэрыялаў.

Пераважаючым матэрыялам для кастарэзаў Навагрaдка былі рогі і косьці дзікай жывёлы. Па вызначэнню Н.М. Ермолавай, з 50 касьцяных вырабаў, толькі 10 зроблены з плюсневай, пястной і берцовай косьці авечкі (у адным выпадку, магчыма, казы) і грыфельнай косьці каня. Для ўсіх астатніх матэрыялам служылі рогі і косьці лася альбо шляхетнага аленя.

У першапачатковым паселішчы Малага Замка косьці і, у меньшай меры, рогі апрацоўвалі хатнім спосабам. Характар рамяства кастарэзная справа набывае толькі напачатку XII ст., будучы пры гэтым падсобнай галіной апрацоўкі каляровых і шляхетных металаў. Інструменты залатароў выкарыстоўваліся пры рабоце з косьцю і рогам, калі роля апошняго значна ўзрастае. Рост майстэрства навагрaдскіх кастарэзаў адлюстроўваецца, у прыватнасьці ў тым, што яны выраблялі наібольш цяжкія для работы вырабы — двухбаковыя грэбні. Разам з тым нават у рамесную пару сваёй гісторыі кастарэзы Малага Замка не дасягнулі тае дасканаласьці ў вырабе сваіх рэчаў, якая характэрна для іншых гарадоў на тэрыторыі Беларусі[164].

На дзяцінцы кастарэзства, у сутнасьці, так і не стала галіной рамяства. Там знайдзена 50 вырабаў з косьці і рогу (на тэрыторыі Малага Замка маецца больш за 320). Гэта рогі і косьці са слядамі апрацоўкі. Маюцца нарыхтоўкі, над якімі работа не закончана. Вырабы, амаль выключна, утылітарнага прызначэньня. Гэта праколы (10 экзэмпляраў) даўжынёй да 12 см., некалькі іглаў даўжынёй да 10 см. Знайдзены чатыры наканечнікі з завостраным альбо акругленым заканчэньнем.

Некаторыя касьцяные вырабы дзяцінца зроблены больш кваліфікавана. Гэта акруглая і граненая рукаяткі, вузкая паліраваная накладка са штыфтом, гузік-палачка з перахватамі, аналогія якой маецца ў Ваўкавыску[165] і іншыя вырабы. Аб выкарыстаньні цыркуля для кастарэзных работ сведчаць знаходкі з кружковым арнаментам. Добрай адпрацоўкай вылучаюцца наканечнікі стрэлаў. Гутарка аб іх пойдзе ў наступнай главе, што прысвечана зброі. Супастаўляючы іх, а таксама пласцінку са штыфтом і вырабы з кружковым арнаментам з астанімі прымітыўнымі вырабамі Замкавай гары, трэба мяркаваць, што лепшыя па якасьці рэчы былі зроблены на Малым Замку.

Як і для прадметаў з іншых матэрыялаў, прызначэньне

асобных касьцяных вырабаў застаецца нявясна. Такая знаходка з адтулінай для падвешваньня, адзін канец якой завостраны. З раней неапублікаваных знаходак Малага Замка адзначым вастрыё з адтулінай даўжынёй 13 см. і прасліцы з рогу.

Больш за 120 навагрудскіх вырабаў былі зроблены з мясцовага каменю — гліністага сланцу і пяшчаніку. Галоўнымі вырабамі былі тачыльныя камяні, якіх на вакольном горадзе знайдзена 65, а на Малым дзяцінцы 30. Форма і памеры іх самыя розныя. На Замкавай гары знайдзены дзве нарыхтоўкі для тачыльных камянёў даўжынёй 22 см., шырынёй 6,5 см. Пераважаюць знаходкі ў форме брусочкаў альбо плоскія, даўжынёй да 10 см. Частка тачыльных камянёў з адтулінамі, прывешвалася да поясу. Прыгадаем і камяні з жалабкамі, што выкарыстоўвалі залатары для заточкі інструменту. На Малым Замку знайдзены два вялікія круглыя тачылы[166]. Тачыльныя камяні Навагрудка тыповыя для старажытнарускіх помнікаў і ніякімі асаблівасьцямі не адрозніваюцца.

Каменныя прасліцы пабытавалі даўжэй за гліняныя. Іх вельмі мала — дзевять экзэмпляраў, знайдзены на тэрыторыі Малага Замка. Да пабудовы другой паловы XII ст. належыць нарыхтоўка для такога прасліца. У жылым доме, што існаваў на працягу астатняга этапу ў гісторыі старажытнарускага гораду, было два каменныя прасліцы — зоннае і біканічнае[167]. Каменныя прасліцы былі як грубай работы, так і адмыслова выраблены і нават запаліраваныя.

З камяню таксама былі зроблены ліцейныя формачкі і некаторыя рэчы (жорны, грузілы і інш.), аб якіх гутарка пойдзе пазней.

Асартымент і якасьць каменных вырабаў не дазваляе бачыць адрозненьні ў развіцці камнярэзства ў абедзьвух частах гораду. Асаблівасьцю вакольнага гораду было тое, што там выраблялiся каменныя формачкі. Адсутнасьць такіх на Замкавай гары, верагодна, тлумачыцца тым, што бронзаліцейства на ёй не атрымала асаблівага развіцця. Прасліца з камяню былі таксама распаўсюджаны толькі на Малым Замку.

У Навагрудку знайдзена 55 кавалкаў чырванаватага бурштыну. На некаторых з іх захаваліся сляды апрацоўкі. Вялікая частка знаходак (35) паходзіць з Замкавай гары, але гатовыя вырабы сустракаюцца толькі на Малым Замку. Гэта тры пацеркі біканічнай і зоннай формы[168] і два пярсьцёнкі — вузкі і больш шырокі са шчытком.

Пераважаньне неапрацаванага бурштыну над гатовымі вырабамі тыпова і для іншых заходнерускіх гарадоў (Полацкая зямля, Тураў, Бярэсьце, Ваўкавыск). У той час, як у іншых гарадах

Заходняй Русі з бурштыну выраблялі, галоўным чынам, крыжыкі[169], у Наваградку іх не знайдзена зусім.

Адзін з залатароў, што працаваў на Замкавай гары, займаўся не толькі апрацоўкай каляровых і шляхетных металаў, але і горнага крышталю. У паўночнай частцы пляцоўкі сустракаюцца яго асколкі. Адзіным гатовым вырабам з гэтага мінерала з'яўляецца абломак зонной пацеркі, дыяметрам 3 см.

У глебе Навагрудка кепска захоўваецца дрэва. Асабліва гэта характэрна для Малага Замка. Рэшткі дрэва там дайшлі, амаль выключна, у абгарэлым выглядзе. На Замкавай гары захавалася не гарэлае дрэво, што служыла як будаўнічы матэрыял і рэчы з яго. Аднак і для гэтай часткі гораду цяжка сабе прадставіць у поўнай меры, у якой ступені жыхары валодалі дрэваапрацоўкай. Аб маштабах выразна сведчаць прылады апрацоўкі дрэва, шматлікія цьвікі, вушкі і дужкі драўляных рэчаў і іншыя знаходкі. Дрэва, несумненна, было галоўным будаўнічым матэрыялам наваградцаў.

Драўляныя рэчы знайдзены на Замкавай гары. Гэта лапата для веяньня зярна. Бліжэйшы горад, дзе знайдзена такая самая лапата, з'яўляецца Слонім[170]. У гаспадарчых пабудовах пастаянна сустракаліся клёпкі і донцы ад бочак, а таксама рэшткі лубяных скрыняў. У 1985 годзе пад пабудовай з плятнём знайдзены рэшткі доўбленага карыта. Сярод рэчаў з Замкавай гары маецца лыжка і некалькі чараў, апрацаваных на такарным станку.

У трох выпадках захаваліся па мастацку апрацаваныя драўляныя вырабы. На Малым Замку знайдзены дзве абгарэлыя пласцінкі, адна з якіх упрыгожана перакрыжаванымі лініямі, а другая пляцёнкай[171]. На Замкавай гары знойдзены чаранок, можа быць ад лыжкі, з пляцёным арнаментам.

Выраб драўляных рэчаў быў галіной хатняй вытворчасьці, але карыстаньне такарным станком паказвае, што гэта дзейнасьць прымала рысы рамяства.

У паўднёвай і паўднёва-усходняй частцы дзяцінца знаходзілася даволі шмат абрыўкаў скуры і скураных вырабаў. Ад абутку захаваліся рэшткі галовак, задніка, абшыўкі краю і пракладкі падэшваў. З ліку іншых скураных вырабаў сустрэліся частка рукавіцы і нарыхтоўка для заплаткі. Е.І. Ояцева, якая вызначала знаходкі, бачыць у іх рэшткі ўжываных рэчаў, якія не сведчаць аб тым, што яны былі зроблены на месцы знаходкі. Аднак, наўрад ці можна сумнявацца, што скураныя вырабы былі зроблены ў самым горадзе.

У кнізе "Старажытны Навагрудак" успаміналіся хатнія заняткі жыхароў Малага Замка — прадзеньне, ткацтва і шыцьцё, аб чым

сведчаць адпаведныя знаходкі[172]. Гэтыя ж заняткі мелі месца на тэрыторыі Замкавай гары, дзе знайдзены прасліцы і іглы. Да іх трэба далучыць клубкі абгарэлых нітак і рэшткі верацёнаў з наматанымі на іх ніткамі.

Такім чынам, матэрыялы, якія характэрызуюць апрацоўку чорных, каляровых і шляхетных металаў, а таксама ганчарства, выраб касцяных і іншых вырабаў, паказываюць на вельмі рознабаковую і разам з тым своеасаблівую дзейнасць наваградцаў з канца X да амаль канца XIII ст. Жалезаапрацоўчае рамяство Наваградка немагчыма адрозніць ад такой самай галіны гарадскога рамяства старажытнарускіх гарадоў і, у прыватнасьці, гарадоў Заходняй Русі. Жыхары Наваградка стварылі свой керамічны комплекс, шмат у чым блізкі да керамікі Ваўкавыска. Развітая ў горадзе вытворчасьць паліванай керамікі нараджае, у шэрагу выпадкаў, сваю арыгінальную прадукцыю.

Спецыфічная гісторыя развіцця залатарства ў Наваградку. Яго арганізацыя, як і сацыяльнае аблічча рамеснікаў у абезьвух частках гораду розныя. На тэрыторыі Малага Замка, у вакольным горадзе, пачынаючы з XII ст. працавалі свабодныя багатыя залатары, яны прадстаўлялі сабой нейкае аб'яднаньне. Рамеснікі Замкавай гары, што абслугоўвалі феадала дзяцінца, належалі да катэгорыі вотчынных залатароў, сярод якіх, відавочна, былі выхадцы з Кіева. Не выключана, што ў складзе ганчароў, якія рабілі паліваную кераміку для насельнікаў Замкавай гары, таксама маглі быць прыбылыя паўднёварускія рамеснікі.

Апрацоўка косьці, камяню і некаторых іншых матэрыялаў у Наваградку адставалі ад кастарэзства, камнярэзства і іншых рамёстваў шэрагу старажытнарускіх гарадоў, у тым ліку, і гарадоў Заходняй Русі; у некаторых выпадках яна заставалася на стадыі хатняй вытворчасьці.

Спасылкі:

[1] ДН. С. 127-148.

[2] ДН. С. 28.

[3] ДН. С. 138-139.

[4] ДН. С. 140.

[5] Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 25; Лысенко П.Ф. Города Туровской земли. Минск, 1975. С. 104; Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли. Минск, 1978. С. 103; Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966. Мал. 41-42, 5.

[6] ДН. С. 73-74.

[7] Колчин Б.А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого. // МИА. 1959. Вып. 65. Мал. 7, 8.

[8] ДН. С. 98. Па мяркаванню С.В. Белецкага гэтыя шчыпцы

выкарыстоўвалі як буллотэрый; яны з'яўляюцца адзінай знаходкай гэдкай прылады ў Старажытнай Русі.

[9] Рындина Н.В. Технология производства городских ювелиров X-XV вв. // МИА. 1963. Вып. 11. Мал. 12.

[10] Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Минск, 1975. С. 57; Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 22, 10.

[11] ДН. Мал. 58, 8; Рындина Н.В. Op. cit. Мал. 12.

[12] Колчин Б.А. 1) Черная металлургия и металлообработка в Древней Руси. // МИА. 1953. Вып. 32. Мал. 30; 2) Железообрабатывающее ремесло ... Мал. 5, 1; Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 21, 5; ДН. С. 45. Мал. 58, 9, 10.

[13] ДН. Мал. 30, 1, 58, 5, 12; Лысенко П.Ф. 1) Op. cit. Мал. 9, 30, 32; 2) Берестье. Минск, 1985. С. 380; Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Минск, 1982. С. 213.

[14] ДН. Мал. 30, 1, 58, 5, 12.

[15] Павлова К.В. 1) Могильник близ Новогрудка. // КСИА. 1965. Вып. 104. Мал. 37, 2; 2) Раскопки кургана у д. Городиловка. // КИСА. 1973. Вып. 135. Мал. 16, 4, 9; Поболь Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. С. 132., Мал. 83, 1, 84, 1, 2.

[16] Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 29, 1, 2; Загорульский М.Н. Op. cit. Мал. 18; Лысенко П.Ф. Бересте. Мал. 147, 8.

[17] ДН. С. 82.

[18] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 29; Раскопкі К.Т. Кавальскай. Дзякую аўтару за прадстаўлены матэрыял.

[19] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 57; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. V, 1-4; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 146,1.

[20] ДН. Мал. 40,3; 72,7; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 29, 20, 21; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. IV, 4, 9; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 8, 6; Лысенко П.Ф. 1) Города ... Мал. 23, 21; 2) Берестье. Рис. 146,6.

[21] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 57; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. IV,2; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 30; Лысенко П.Ф. Берестье. Мал. 146,1.

[22] Гуревич Ф.Д. Древности белорусского Понеманьня. Л., 1962. Мал. 76,7; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 29, 22; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. IV,8; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 8, 12-14; Лысенко П.Ф. Города ... Мал. 37, 4.

[23] ДН. С. 55. Мал. 44; Шеляпина Н.С. Археологические наблюдения в московском Кремле в 1963-1965 гг. // МИА. 1971. Вып. 167. Мал. 8,7.

[24] ДН. Мал. 75,1.

[25] ДН. Мал. 41, 10.

[26] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 9,2.

[27] Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 33, 24; Шноре Э.Д. Асотское городище. Рига, 1961. Табл. XI, 12-20.

[28] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 60; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 243.

[29] Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 18; Лысенко П.Ф. Берестье. Мал. 159.

[30] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 32.

[31] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 57; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 32.

[32] Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 76,6; 96,4.

[33] ДН. Мал. 79,5; Штыхов Г.В. Города ... Мал. 38,1; 44, 10; Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 41-42; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 10,1,2.

[34] ДН. Мал. 75,7.

[35] Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 140; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. XXVI; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 34.

[36] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 105; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. XXVIII, 1-10; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 157; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 10, 14, 15; Воронин Н.Н. Древяе Гродно. // МИА. 1954. Вып. 41. Мал. 96, 14.

[37] Колчин Б.А. Хроника новгородских древностей. // Новгородский сборник. М., 1982. С. 162; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 34.

[38] Колчин Б.А. Жалезоделательное ремеслво... Мал. 69,5.

[39] ДН. Мал. 14, 5; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 239.

[40] Загорульский Э.М. Указ. соч. Табл. XXV, 1-3; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 233.

[41] ДН. Рис. 21,3.

[42] Лысенко П.Ф. Города ... Мал. 8,11; 29,5; Штыхов Г.В. Op. cit. С. 105; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 10,17.

[43] ДН. Мал. 14, 1.

[44] Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Мал. 31,19; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. XXX, 1-3; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 10, 18, 19; Лысенко П.Ф. Берестье Мал. 157,2.

[45] Штыхов Г.В. Города ...С. 105; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 12,1,2; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 10,2,23; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 157, 11, 13.

[46] Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. Мал. 31,17; 2) Города ... Мал. 38,5; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 12, 3, 4; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 10, 20.

[47] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 96, 16.

[48] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 12, 9; Штыхов Г.В. Города ... Мал. 20, 38.

[49] ДН. Мал. 20, 11; 54, 8; Колчина Б.А. Хронология ... С. 163.

[50] ДН. Мал. 46,6,8,10.

[51] ДН. Мал. 84,4.

[52] Зверуго Я.Г. Op. cit. С.37; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 166,1-16.

[53] ДН. Мал. 8,1.

[54] ДН. Мал. 34,12; 46,7,8.

[55] Уртанс В.А. Средневековые медицинские инструменты для кровопускания. // СА. 1966. Вып.2. С. 329.

[56] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 11,22; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 163,13.

[57] ДН. С. 44.

[58] Колчин Б.А. Жалезоделательное ремеслво ... С. 106; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 35, 37; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 253-254.

[59] ДН. С. 45.

[60] Рябинин Е.А. Костромское Поволжье в эпоху средневековья. Л., 1986. С. 85.

[61] ДН. С. 127-136.

[62] Гуревич Ф.Д. Отчет аб археологических работах в Новогрудку в 1967 г. (Архіў ЛАІА ф. 35 1/1967, 32, лл. 26-27, 32.)

[63] ДН. С. 22, 28.

[64] ДН. С. 133. Табл. 18.

[65] ДН. С. 131-132.

[66] Загорульский Э.М. Op. cit. С. 261-262.

[67] ДН. Мал. 20,10; Горюнова В.М. Поселок ремесленников на Ловати. // проблемы археологии. Л., 1978. С. 143.

[68] ДН. Мал. 21,1; 33,7; 7,72; 1,6; 10,77,14; Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 22,2-9; Штыхов Г.В. Древний Полоцк. С. 53.

[69] ДН. С. 143.

[70] ДН. Мал. 19,18; 45,7; 78,7; 85,11.

[71] Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 22,2; Штыхов Г.В. Города ... С. 107; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. XVIII,7,8; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 188.

[72] Загорульский Э.М. Исследования Вищинского замка. // ДГС. Минск. 1983., С. 88.

[73] Рыбаков Б.А. Ремесло Древней Руси. М., 1948. С. 306-317; Корзухина Г.Ф. Русские клады IX-XIII вв. Л., 1954. С. 71; Каргер М.К. Op. cit. С. 394-395; Пескова А.А. Древний Изяславль. // КСИА. 1981. Вып. 164. С. 68; Никольская Т.Н. Земля вятичей. М., 1981. С. 227.

[74] Гущин А.С. Памятники художественного ремесла Древненай Руси. М., 1936. Табл. XIV,3; Рыбаков Б.А. Op. cit. Мал. 81.

[75] Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 259; Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Табл. XVII,1,2,4.

[76] Гуревич Ф.Д. К истории культурных сувязяу дренерусских городов Понеманьня с Киевской зямлёй. Л., 1974. С.

23-24; Килиевич С.Р. Детинец Киева IX - первой половины XIII веков. Киев, 1982. Мал. 72.

[77] Загорульский Э.М. Возникновение Минска. С. 213.

[78] ДН. С. 105. Мал. 82.

[79] ДН. Мал. 85,5.

[80] ДН. Мал. 87,8,11.

[81] ДН. С. 56.

[82] Павлова К.В. Могильник на территорыи окольного города Новогрудка. // КСИА. 1967. Вып. 110. Мал. 10.

[83] ДН. Мал. 40,1; 45,4.

[84] ДН. Мал. 12,3; 37,9; 78,9,10.

[85] Urtans W. Senakие depoziti Latvija. Riga, 1977. Lpp. 184-185, att. 92, 6-8; Vaitskunskiene L. Grauziu auksakalis. // Труды АН Литовской ССР. 1981. Серия А. Вып. 1. рау 1, 9.

[86] ДН. Мал. 72,4.

[87] ДН. С. 45, 56. Мал. 33,5; 59,3,5.

[88] Гуревич Ф.Д. Древнености ... С. 189.

[89] Назаренко В.А. О находке очелья в Новогрудке. // Культура средневековой Руси. Л., 1974. С. 170-172.

[90] Павлова К.В. Раскопки могильника .... Мал. 38,3,7; ДН. С. 29, 32. Мал. 20,4; Заяц Ю.А. Курганный могильник Изяславля. // ДГС. С. 40. Мал. 9; Кирпичнико У А.Н. Раннесредневековая Ладога (результаты археологических даследваний). // Средневековая Ладога. Л., 1985. С. 17-18.

[91] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 99,7; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 260.

[92] Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 260.

[93] Павлова К.В. Op. cit. Мал. 38,2; Заяц Ю.А. Op. cit. Мал. 9.

[94] Штыхов Г.В. Древний Полоцк. С. 66. Мал. 33,2; Заяц Ю.А. Тамсама

[95] ДН. С. 96.

[96] Заяц Ю.А. Тамсама

[97] ДН. Мал. 76,6.

[98] ДН. С. 59, 74, Мал. 30,4; 59,1-5,16.

[99] ДН. Мал. 30,2; 15,6; 49,17; 59,13; Павлова К.В. Могильники ... Мал. 19,10.

[100] ДН. Мал. 30,7; 49,7; 69,2; 71,1.

[101] Штыхов Г.В. Города ...С. 71; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 48; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 262.

[102] ДН. Мал. 20,3; 35; Штыхов Г.В. Города ... Мал. 18,15.

[103] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 32,13; Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Мал. 34,1,14,15; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 40.

[104] ДН. Мал. 49,21; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 14, 28, 29; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 176.

[105] ДН. С. 74. Мал. 59,17.

[106] ДН. С. 26; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 90,9; Павлова К.В. Раскопки курганов у д. Городиловка. Мал. 16,8.

[107] Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 90,9; Павлова К.В. 1) Раскопки могильника ... Мал. 37,11; 2; 2) Раскопки курганов у д. Селец ... Мал. 1,2; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. XXXI,3; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 14,6.

[108] Гуревич Ф.Д Op. cit. С. 169. Мал. 90,9; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 46; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. XXXI,5; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 177.

[109] ДН. Мал. 55,12; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. XXXI,12-18.

[110] ДН. Мал. 85,8,9; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 79,1; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 265. Мал. 177, 178.

[111] ДН. Мал. 80,1; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 265. Мал. 177.

[112] ДН. Мал. 41,4,7; 83,7; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 96,1; Павлова К.В. 1) Раскопки могильника ... Мал. 37,9,10; 2) Раскопки курганов у д Селец ... С. 86 Мал. 1,2;

[113] ДН. Мал. 59,7-9; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 79,3; Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Мал. 32,16; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 188.

[114] ДН. С. 59. Мал. 49,14.

[115] ДН. Мал. 8,11; 66,7; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 90,4.

[116] ДН. Мал. 90,5; 49,8,9.

[117] Поболь Л.Д. Op. cit. Мал. 81,7; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 264.

[118] Павлова К.В. Раскопки могильника ... Мал. 37,3; Лысенко П.Ф. Города ... Мал. 9,5.

[119] ДН. Мал. 11,4; 22,2; Седова М.В. Ювелирные изделия древненого Новгорода (X-XV вв.). М., 1981. С. 129.

[120] ДН. Мал. 30,10; 16; Павлова К.В. 1) Op. cit. С. 1032; 2) Раскопки кургана у д. Городиловка. Мал. 16,2; Седова М.В. Op. cit. С. 129-130.

[121] ДН. Мал. 66,11; Зверуго Я.Г. Указ.Соч. Мал. 13,30.

[122] ДН. С. 66; Штыхов Г.В. Op. cit. С. 67.

[123] ДН. Мал. 83,2,1,4; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 13,24.

[124] ДН. Мал. 59,14; Павлова К.В. 1) Раскопки могильника ... Мал. 19, 12, 13; 2) Раскопки курганов у д. Селец ... Мал. 1,6; 2; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 31,17; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 34,17; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 227.

[125] Павлова К.В. Раскопки курганов у д. Селец ... С. 90. Мал. 1,7; Седова М.В. Op. cit. Мал. 45,16,17.

[126] Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 169,1.

[127] ДН. Мал. 66,8; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 34,22.

[128] ДН. Мал. 83,8-10; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 97,2; Штыхов Г.В. Op. cit. С. 67; Лысенко П.Ф. Города .. Мал. 9,18.

[129] ДН. Мал. 83,5; Зверуго Я.Г. Указ соч. Мал. 14,24,25.

[130] Гуревич Ф.Д Op. cit. Мал. 79,2; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 14,27.

[131] Седова М.В. Op. cit. С. 158. Мал. 61,17-20.

[132] ДН. С. 44, 59, Мал. 59,27.

[133] ДН. Мал. 59,26.

[134] ДН. Мал. 12,6.

[135] ДН. Мал. 29,12; 67,22; 78,3.

[136] ДН. Мал. 60,10.

[137] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 130. Мал. 11,22,1,6.

[138] ДН. Мал. 90,3.

[139] ДН. С. 127-137.

[140] Воронин Н.Н. Op. cit. С. 71.

[141] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 64.

[142] Загорульский Э.М. Исследования ... С. 87-89.

[143] ДН. С. 12-15.

[144] Малевская М.В. Некоторые исторические связи Новогрудка в X в. (по материалам керамики). // КСИА. 1972. Вып. 129. С. 14.

[145] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 61-70.

[146] ДН. С. 15.

[147] Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 71,2,3; 73,2.

[148] Малевская М.В. Поливная керамика древнего Новогрудка. // СА. 1969. Вып. 3. С. 194-203; Гуревич Ф.Д. Поливная керамика новогрудского детинца. // СА. 1981. Вып. 4. С. 99-107.

[149] Макарова Т.И. Поливная посуда. Из истории керамического производства Древней Руси. // САИ. 1967. Сер. Е. Вып. 1-38. Табл. XV,2,8,17; XXIII,I.

[150] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 101.

[151] Макарова Т.И. Op. cit. Табл. XXIV,8; XXV,2,11.

[152] Малевская М.В. Op. cit. С. 196, 198.

[153] Малевская М.В. Op. cit. С. 196, 199; Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 103.

[154] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 103.

[155] Малевская М.В. Op. cit. С. 198.

[156] Макарова Т.И. Op. cit. Табл. XIV,8; Воронин Н.Н. Op. cit. С. 61; Новое в археологии Киева. С. 291.

[157] Макарова Т.И. Op. cit. С. 56.

[158] Якобсон А.Л. Средневековая поливная керамика как историческое явление. // вв. 1978. Вып. 39. С. 149, 150.

[159] Каргер М.К. Раскопки церкви Бориса и Глеба в

Новогрудке. // КСИА. 1977. Вып. 150. С. 81; Архіў ЛАІА ф. 1. N 88/1965 л.6.

[160] Воронин Н.Н. Op. cit. С. 61.

[161] ДН. Мал. 8,2-4.

[162] ДН. Мал. 20,1.

[163] Штыхов Г.В. Города ... С. 111.

[164] ДН. С. 141-144.

[165] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 17,10.

[166] ДН. С. 105.

[167] ДН. С. 85, 93. Мал. 72,12,13.

[168] ДН. С. 51, 65. Мал. 35,9.

[169] Штыхов Г.В. Города ... С. 115; Лысенко П.Ф. 1) Города... С. 60; 2) Берестье. С. 325; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. XXII, 1-4,6; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 60-61.

[170] Зверуго Я.Г. Археологические работы в Слониме. // БО. Мал. 27,1.

[171] ДН. Мал. 41,5; 86,4.

[172] ДН. С. 147.

Глава 5. Зброя. Рыштунак верхавога каня і коньніка

У жыхароў раньняга Навагрaдка не было багата зброі. У дамах і за іх межамі знаходкі зброі адзінкавыя, пераважна гэта наканечнікі стрэлаў. Бедныя зброяй і курганы ваколіц гораду. Становішча карэнным чынам змяняецца з пачатку XII стагоддзя. Колькасьць зброі рэзка павялічваецца. Рыштунак уладальнікаў багатых дамоў вакольнага гораду складаўся са зброі бліжняга і дальняга бою, абарончай зброі, а таксама з прыладаў для язды конна. Шмат зброі з'яўляецца на тэрыторыі дзяцінца. Акрамя ўсяго іншага там у адным месцы былі знайдзены рэшткі доспеха з жалезных пласцінкаў, 15 бранебойных стрэлаў і цуглі. У навакольлі зброя XII-XIII стст. сусракаецца вельмі рэдка.

Ніжэй прыводзяцца дадзеныя аб размякаваньні прадметаў узбраеньня паміж двума часткамі гораду.

Табліца 4. Зброя. Рыштунак верхавога каня і коньніка

Віды вырабаў	Колькасьць	
	Малы Замак	Замкавая гара
Зброя бліжняга бою	10	1
Зброя дальняга бою	101	104
Абарончае ўзбраеньне	4	3
Рыштунак верхавога каня і коньніка	39	13
Усяго	154	121

Да гэтых знаходак трэба далучыць два жалезныя наканечнікі стрэлаў, што знайдзены ў Навагрaдку за межамі абодвух узгоркаў, а таксама зброю з ваколіц Навагрaдка. Навагрaдская калекцыя налічвае, такім чынам, каля 290 знаходак зброі і звязаных з ёй рэчаў.

Характэрызуючы прадметы ўзбраеньня, як і ў папярэдніх главах, паралелі аўтар прыводзіць, у першую чаргу, па матэрыялах гарадоў Заходняй Русі і ў выпадку адсутнасьці такіх звяртаецца да матэрыялаў другіх гарадоў Старажытнай Русі.

Зброя бліжняга бою.

Бронзавае перакрыжаваньне мяча з галовамі птушак альбо драконаў па краях знайдзена ў пабудове першай паловы XII ст. Даўжыня яго 9,5 см. Мячы з падобнымі перакрыжаваньнямі характэрныя для тэрыторыі куршаў[1].

На Замкавай гары ў слоі XII ст. знайдзены бронзавы наканечнік ножнаў мяча, вышынёй 7 см. Па П. Паульсену

падобныя наканечнікі выраблялі куршы і прусы пачынаючы з XI ст.[2]

Пляскаты бронзавы ажурны наканечнік вышынёй 3 см., археолаг Е. Антаневіч прылічыў да прадукцыі прыбалтыйскага вырабу. Аднак, аналогій гэтай знаходцы няма[3].

Перакрыжаваньне шаблі з латуні, пашыраецца ў сярэдзіне і на канцах, захавалася ў даўжыню на 6 см. Блізкае па форме жалезнае перакрыжаваньне вядома ў Мінску. А.М. Кірпічнікаў далучае Наваградскую і Мінскую знаходкі да аднаго тыпу, паралелі ёсьць у паўднёварускіх старажытнасьцях[4].

Абломак ляза ромбападобнага ў сячэньні кап'я, належыць да той самай пабудовы, дзе знайдзена перакрыжаваньне мяча. Да гэтай знаходкі блізкі наканечнік кап'я даўжынёй 22 см. з вёскі Кашалева паблізу Наваградка. Паралелі гэтым коп'ям адзначым у Гродне і Лагойску[5].

У пабудове другой паловы XII ст. на Малым Замку знайдзена кап'ё даўжынёй 19,5 см. з квадратным у сячэньні лязом і варонкападобнай утулкай. Такое ж паходзіць з Ваўкавыска[6].

Утульчатая суліца (даўжынёй 15,3 см.) на нашым абшары аналогій не мае. Па тыпалогіі А.М. Кірпічнікава належыць да другога тыпу, сустракаецца рэдка[7].

Ўтокі (3 экземпляры). Вышыня іх 5 см., дыяметр 3 см. Такія вырабы для дрэўкаў коп'яў знайдзены ў Мінску, Полацку і Бярэсьці. Э.М. Загарульскі мяркуе, што з дапамогай ўтокаў у баі выкарыстоўвалі і тыльны бок кап'я[8].

Жалезны выраб в форме стрыжня з галоўкай (галоўкай мела адтуліну) у свой час мы вызначылі як кісьцень. Аналогіі не вядомыя[9].

Са зброяй бліжняга бою мы звязваем жалезныя пласцінкі для ножнаў, верагодна, ад баявых ножнаў[10].

У Наваградскай калекцыі няма баявых сякер, але ў курганах такія былі, а ў Кашалеве дзве звычайныя сякеры знайдзены разам з кап'ём[11]. Трэба думаць, што сякеры Наваградка, аб якіх паведамлялася ў папярэдняй главе, у выпадку неабходнасьці, таксама маглі служыць як зброя.

Зброя дальняга бою.

Да гэтага віду зброі належаць 186 жалезных і касьцяных наканечнікаў стрэлаў. 73 наканечнікі з жалеза, г. зн. 40% былі ўтульчатыя. Характэрызуючы гэтыя вырабы, аўтар, як і іншыя археолагі, абапіраецца на капітальную працу А.Ф. Мядзьведзева, што прысвечана зброі дальняга бою[12].

Сярод утульчатых наканечнікаў вылучаюцца наступныя тыпы:

Двушыпныя. 16 экзэмпляраў, з якіх 10 знайдзены на Малым Замку, 5 на Замкавай гары і адзін на ўзгорку, дзе стаяла царква.

Даўжыня гэтых наканечнікаў 6-10 см. Двушыпныя наканечнікі пабытавалі ў Наваградку да сярэдзіны XII ст. Аналагічныя — частыя знаходкі ў заходнерускіх гарадах (Гродна, Лукомль, Мінск, Тураў, Пінск, Бярэсьце, Браслаў, Ваўкавыск)[13].

Ромбападобныя (2) 3 экзэмпляры. Знайдзены на Малым Замку. Даужыня іх 2,5 см. Такія ж маленькія наканечнікі знайдзены ў Гродне і Ваўкавыску[14].

Лаўралісты (5). Даўжынёй 5 см. Паралелі вядомыя на Кіеўшчыне і ў Ізяслаўлі (Украіна)[15].

Шылападобныя (8). 48 экземпялраў з вастрыём квадратнага, рамбічнага і прамавугольнага сячэньня. Сячэньне аднаго наканечніка было трохвугольнае. Даўжыня іх 2-4,5 см. Паміж двума часткамі гораду падзелены амаль пароўну. Адзін наканечнік знайдзены каля схілу ўзгоркаў. Падобныя наканечнікі ў вялікай колькасьці знайдзены ў Ваўкавыску. Вядомыя яны таксама ў Мінску і Пінску. Для трохграннага ў сячэньні наканечніка А.Ф. Мядзведзеў паказвае толькі адну аналогію ў Ізяслаўлі[16].

Пірамідальныя з кароткім масіўным вастрыём і доўгай шыйкай (9), 2 экземпляры. Знайдзены на Малым Замку. Даўжыня іх 4,5-7 см. Наканечнік гэтага тыпу знайдзены ў Мінску[17].

Ад трох наканечнікаў захаваліся толькі ўтулкі.

Наканечнікаў чарашковых стрэлаў знайдзена 117 экзэмпляраў. Яны прадстаўлены наступнымі тыпамі:

Двушыпны з упорам (30). Знайдзены ў пабудове Малага Замка другой паловы XII ст. Даўжыня яго 7 см. У заходнерускіх гарадах такія наканечнікі вядомыя ў Мінску і Лукомлі[18].

Наканечнікі з бакавымі выступамі (32), 5 экзэмпляраў. Знайдзены на Малым Замку. Даўжыня іх 8-9,5 см. Такія ж сустракаюцца ў Гродне, Лагойску і Ваўкавыску[19].

Ромбападобныя выцягнутыя (39). 2 экземпляры. З вакольнага гораду. Даўжыня іх 10-11 см. Адзін з іх належыць да інвентара пабудовы першай паловы XII ст. Аналогіі вядомыя ў Гродне, Друцку і Ваўкавыску[20].

Ромбападобныя гнёздаўскага тыпу (41). 3 экземпляры. Усе з Малага Замка. Даўжыня іх да 11 см. Сустракаюцца ў Ваўкавыску і Віцебску[21].

Ромбападобныя з пашырэньнем у сярэдзіне пяра (43). 11 экзэмпляраў. Паміж вакольным горадам і дзяцінцам размяркаваныя амаль пароўну. Даўжыня наканечнікаў 5-11 см. У заходнерускіх гарадах гэты тып зброі адзначаецца ў Тураве, Ваўкавыску, Слоніме і Лагойску[22].

Ромбападобныя наўгародскага тыпу (46). 11 экзэмпляраў. Дзевяць знайдзены на Малым Замку. Даўжыня наканечнікаў 6-7

см. Два падобных паходзяць з Ваўкавыску[23].

Рамбічныя без упору (47) 4 экзэмпляры. Усе з Малага Замка. Даўжыня іх 5-9 см. Падобныя сустракаюцца ў Ваўкавыску і Лукомлі[24].

Ромбападобныя з упорам і з наібольшым пашырэньнем у верхняй палавіне пяра (52). 8 экзэмпляраў, з іх ёсьць з тэрыторыі Малага Замка. Даўжыня наканечнікаў 5-7 см. Аналогіі вядомыя ў Ваўкавыску і Мінску[25]. Такі ж наканечнік, але без упору паходзіць з пабудовы другой паловы XII ст. на Малым Замку. Паралелі яму знайдзены ў Ваўкавыску[26].

Двурогія срэзні з упорам (60) 3 экзэмпляры. Наібольш раньні наканечнік этага тыпу знайдзены ў пабудове другой паловы XI ст. на Малым Замку і меў па краях зазубрыны. З Замкавай гары паходзіць адзін наканечнік даўжынёй 5 см. Двурогія срэзні прысутнічаюць у Ваўкавыску і Воршы[27].

Востралістыя (61) 3 экзэмпляры. Даўжыня іх 5 см. Усе знайдзены на Замкавай гары. Аналогіі ім вядомыя ў шэрагу помнікаў за межамі Беларусі[28].

Ланцэтападобны з упорам (62) 7 экзэмпляраў. Пяць з іх з Малага Замка. Даўжыня — 9-11 см. У абезьвух частках Навагрудка належаць да слаёў, якія датаваныя раней за канец XI ст. Ланцэтападобныя наканечнікі знайдзены ў Полацку, Лукомлі і Ваўкавыску[29].

Лістападобны з наібольшым пашырэньнем каля вастрыя (65). Даўжыня яго 4,5 см. Знайдзены на Малым Замку. На тэрыторыі старажытнарускіх гарадоў аналогій не мае. Па прапорцыях пяра адпавядае наканечнікам, што пабытавалі да канца XI ст.[30]

Срэзні ў выглядзе вузкай выцягнутай лапаткі (67). 16 экзэмпляраў. Пераважаюць знаходкі з Замкавай гары (13). У ліку наканечнікаў Малага Замка адзін знайдзены ў пабудове XIII ст. Даўжыня срэзняў 7-11 см. На думку А.Ф. Мядзьведзева гэтыя стрэлы з'явіліся на Русі разам з ордамі Батыя. Адзінкі такіх срэзняў сустракаюцца ў Гродне, Друцку, Полацку, Давідгарадку, Мінску і Бярэсьці[31].

Ланцэтападобныя квадратнага сячэньня з упорам (77), 3 экзэмпляры. Адзін наканечнік даўжынёй 8,5 см. знайдзены ў пабудове Малага Замка другой паловы XII ст. Аналогіі паходзяць з Мінска[32]. Пірамідальныя з масіўнай баявой галоўкай і з перахватам каля чарашка (91), 2 экземпляры даўжынёй 4-5 см. Наканечнікі гэтага тыпу маюцца ў Ваўкавыску[33].

Бранебойны з кароткай масіўнай баявой галоўкай і доугім чарашком (92). Знайдзены на тэрыторыі Малага Замка, даўжыня 4 см. Гэтаму наканечніку няма паралеляў у гарадах на тэрыторыі Беларусі. Бліжэйшае падабенства — знаходка XIII ст. з

Ноўгараду[34].

Шылападобныя квадратнага альбо рамбічнага сячэньня з перахватам каля чарашка (95). 10 экзэмпляраў, усе з Малага Замка. Частка належыць пабудовам XII-XIII ст., сярод іх вылучаецца наканечнік з насечкай на шыйцы. Такія наканечнікі сустракаюцца ў шэрагу заходнерускіх гарадоў (Ваўкавыск, Мінск, Лагойск)[35].

Асобныя наканечнікі стрэлаў не маюць паралеляў у зводзе А.Ф. Мядзьведзева: два шылападобныя квадратнага сячэньня з кароткай шыйкай, даўжыня наканечнікаў 5-7 см. Гэты тып наканечніка ёсьць у Мінску. Адзначым таксама квадратны ў сячэньні наканечнік, раскляпаны каля чарашка і наканечнік з кароткім рамбічным у сячэньні чарашком[36]. 20 зламаных наканечнікаў стрэлаў не атрыбутаваныя.

Касьцяныя наканечнікі стрэлаў (9 экзэмпляраў), з іх шэсьць знайдзены на Замкавай гары. З гэтых наканечнікаў:

Утульчатыя (5 экзэмпляраў), даўжынёй 5-6 см. Кулепадобны наканечнік, аналагічны ваўкавыскім наканечнікам і томары з гранёным вастрыём, падобныя да знаходак з Ваўкавыска і Мінска[37].

Чарашковыя (4 экзэмпляры), знайдзены толькі на Замкавай гары. Маюць рамбічнае ў сячэньні вастрыё. Даўжыня цэлага наканечніка 10 см. Яны падобныя да наканечнікаў стрэлаў успамянутых гарадоў[38].

На Малым Замку знайдзены часткі складаных лукаў — абломкі пятлі і пласцінкі з выразным арнаментам. Навагрудскую пятлю А.Ф. Мядзьведзеў залічвае да тыпу ноўгародскіх[39]. У адной з наібольш старажытных пабудоў Малага Замка знайдзена частка жалезнай акоўкі ад калчана, форма якой блізкая знаходкам з Кіеўскага некропаля і Яраслаўскіх курганаў[40].

Да зброі Навагрудка належаць наканечнікі арбалетных стрэлаў (12 экзэмпляраў), з якіх 9 знайдзены на Замкавай гары. Сярод іх:

Утульчатыя (5 экзэмпляраў). Даўжынёй 7,5-10 см. Пірамідальныя квадратнага сячэньня з шыйкай і без яе. Аналагічныя знайдзены ў Гродне і Бярэсьці[41].

Чарашковыя квадратнага сячэньня з ромбападобнай граньню (4 экзэмпляры), даўжынёй 6,5-7,5 см., паралелі якім знайдзены ў Гродне, Ваўкавыску і Бярэсьці[42].

Чарашковыя квадратнага сячэньня з ромбападобнай граньню і зрэзанымі вугламі (3 экзэмпляры). Даўжыня іх 8,5-9 см. У свой час А.Ф. Мядзведзеў адзначыў, што акрамя Навагрудка, гэты тып стрэлаў, характэрны для тэрыторыі Латвіі, на Русі невядомы. З публікацыяй ваўкавыскіх матэрыялаў всьветлілася, што яны

прымяняліся і ў гэтым горадзе[43].

Ад абарончых даспехаў захаваліся абрыўкі кальчуг і пласцінкі ад панцыраў. Абрыўкі кальчужнага пляценьня знайдзены ў абедзьвух частках гораду. Кавалак скіпелых калец на Малым Замку належаў да інвентара пабудовы другой паловы XII ст. Сустракаюцца асобныя колцы ад брані гэтага віду. Усяго ў Наваградку, відавочна, пабытавалі тры кальчугі. На тэрыторыі Беларусі ў гарадах рэшткі кальчуг прысутнічаюць у Полацку, Ваўкавыску, Мінску і Бярэсьці[44].

Пласцінчатымі доспехамі гаражане таксама карысталіся ў абедзьвух частках гораду. У Наваградку предстаўлена два тыпы гэтай абарончай зброі — пласцінчатага раменнага мацаваньня і чашуйчатага, якое мацавалася на тканіну альбо скураную аснову[45]. У пабудове XIII ст. Малага Замка было некалькі пласцінаў ад чашуйчатага панцыра[46]. Пласціны памерам 6х5 см. ад падобнага панцыра паходзяць з Замкавай гары. Выдатнай знаходкай з'яўляецца пласцінкавы даспех з Замкавай гары, да якога належалі больш за 100 пласцінак 6,5х1,5 см. Некаторыя пласціны мелі трохвугольны выступ. Па колькасці пласцін, што належаць да аднаго даспеху, наваградскі саступае толькі ноўгародскім, дзе лік пласцінаў доходзіў да 300[47]. Самы старажытны панцыр на тэрыторыі Беларусі (IX-X стст.) паходзіць з гарадзішча Хатомель, а знаходкі сінхронныя наваградскім, вядомыя в Полацку, Друцку, Мінску і Бярэсьці[48].

Ад аброці верхавога каня ў Наваградку захавалася 11 цугляў, 6 на Малым Замку і пять на Замкавай гары. Абломак цугляў знайдзены на селішчы Гардзілоўка[49]. Цэлых цугляў знайдзена 3 экзэмпляры. Яны, як і тыя, што захаваліся ў абломках, з'яўляюцца двухсастаўнымі. Цуглі з Замкавай гары з тонкімі псаліямі, (на канцах якіх канічныя шышачкі), па А.М. Кірпічнікаву належаць да другога тыпу[50]. Экземпляр з вакольнага гораду, знайдзены ў пабудове другой паловы XII ст. фігурна акаваны і інкруставаны бронзай[51]. Аналагічныя цуглі з дзяцінца ўпрыгожаны насечкай. Цуглі такога ж тыпу, з двух рухомых частак і двух кольцаў, пераважалі і сярод знаходак захаваных нецалкам. Гэта чацвёрты тып па А.М. Кірпічнікаву[52]. Сярод знаходак сустрэліся 5 псалій[53].

Двусастаўныя цуглі былі шырока распаўсюджаны ў старажытных гарадах на тэрыторыі Беларусі. Яны вядомыя ў Панямонні (Гродна, Ваўкавыск), у гарадах Полацкай зямлі (Полацк, Мінск, Віцебск, Копысь, Лагойск, Браслаў, Гарадішча на Менцы). Цуглі з Малага Замка А.М. Кірпічнікаў супастаўляе са знаходкамі з Ізяслаўля, Воішчыны і Пароська[54].

З рыштункам каня, верагодна, звязаны асобныя знаходкі з

жалеза і бронзы — гэта Т-падобная бляшка, якая магла быць часткай аброці, агалоўе ў выглядзе фігурнай жалезнай пласцінкі, якая анаментаваная бронзавымі цвічкамі[55], а таксама вялікія жалезныя спражкі, якія разглядаліся ў папярэдняй главе.

У Наваградку знайдзены тры падковы з вострымі шыпамі. Дзьве з іх на Малым Замку, адна — на Замкавай гары. А.М. Кірпічнікаў вызначае такія падковы як другі тып. Падковы з двума шыпамі знайдзены ў Ваўкавыску і Бярэсьці[56].

Да рыштунка наваградскага коньніка належаць 28 шпор. 24 шпоры знайдзены на Малым Замку, дзе яны пабытавалі пачынаючы з XII ст. У жылых пабудовах знайдзены ад адной да чатырох шпор[57].

Амаль усе шпоры Малага Замка былі прадметам вывучэньня А.М. Кірпічнікава, які распрацаваў іх тыпалогію[58]. Наступныя знаходкі на Малым Замку і Замкавай гары папоўнілі назіраньні гэтага аўтара. Вось характэрыстыка гэтых шпораў:

1 тып (3 экзэмпляры). Со стрыжнепадобным шыпом. Адна арнаментавана бронзавым дротам. Аналагічныя сустракаюцца ў Полацку, Мінску і Ваўкавыску[59].

III тып (14 экзэмпляраў). “Вуглаватыя”. Адна з іх для падлетка. Шыпы гэтых шпораў пірамідальныя, канічныя альбо з шарападобным наростам. Амаль усе шпоры гэтага тыпу анаментаваны бронзавым дротам, срэбнай плаціроўкай, срэбнай, залатой альбо алавянай кропкавай інкрустацыяй. Знайдзена шпора, якая ўпрыгожана срэбнымі кружкамі. Такі тып сустракаецца ў Полацку, Мінску, Гродне і Ваўкавыску[60].

IV тып (5 экзэмпляраў). З “манжэтамі” на шыпах. Адна з іх інкруставана бронзавым дротам. Паралелі гэтаму тыпу сустракаюцца ў Полацку, Гродне, Ваўкавыску і Бярэсьці[61].

V тып (6 экзэмпляраў). Дзьве з іх (з Малага Замку) былі парныя. Шпора Замкавай гары плаціравана волавам. Разам з ёй знайдзена спражка, праз каторую быў прасунуты раменьчык. Шпоры V тыпу сустракаюцца ў гарадах Полацкай зямлі, Ваўкавыску, Пінску і Бярэсьці[62].

Стрэмян у Наваградку амаль не было. Адзіны абломак стрэмя, абкручаны бронзавым дротам, знайдзены на Малым Замку[63].

На Замкавай гары знайдзены дзьве скрабніцы вышынёй 7 см. па тыпалогіі А.М. Кірпічнікава такія скрабніцы з пласцінкавым грэбнем належаць да першага тыпу[64].

Ледаходныя шыпы (5 экзэмпляраў). Сустракаюцца ў абедзьвух частках гораду і прызначаліся для чалавека і каня. Такія прыстасаваньні часта знаходзяць у Полацкай зямлі[65].

Па колькасьці і разнастайнасьці зброі Наваградская калекцыя адпавядае ўзбраеньню заходнерускіх гарадоў і блізкая да

калекцыі зброі Ваўкавыска, якая наібольш поўна адлюстроўвае ваенную справу Заходняй Русі. Да таго ж для абодвух гарадоў было характэрна шырокае карыстаньне ўтульчатымі наканечнікамі стрэлаў. У Ваўкавыску жалезныя наканечнікі этага тыпу нават пераважалі, складаючы 63% усіх знаходак[66]. Гэта акалічнасьць падмацоўвае выснову А.Ф. Мядзведзева, згодна якому ўтульчатыя наканечнікі стрэлаў былі распаўсюджаны ўздоўж заходніх граніц Русі. Для астатніх старажытнарускіх зямляў яны складаюць 1 % адносна чэрашковых[67].

Зброя Наваградка мае агульнарускі характар. Амаль уся яна зроблена мясцовымі рамеснікамі. Аб гэтым сведчаць нарыхтоўкі жалезных і касьцяных наканечнікаў стрэлаў. Прыналежнасьць зброі на Малым Замку ўладальнікам багатых дамоў вакольнага гораду, а на Замкавай гары феадалу і яго дружыне, сказалась на тым, што многія прадметы ўзбраеньня ўпрыгожаны інкрустацыяй, плаціроўкай і іншымі спосабамі. Акрамя шпораў, якія ў заходнерускіх гарадах нярэдка арнаментаваныя, наваградскія кавалі фігурна адкавалі цуглі, пакрыўшы іх бронзавай інкрустацыяй. Насечка і кропкавы арнамент упрыгожвалі іншыя знаходкі цугляў. Стрэмя было абкручана бронзавым дротам, бронзавымі цвічкамі аздоблены выраб, які мы лічым агалоўем каня. Нават звычайны наканечнік жалезнай стралы, які прызначаны ворагу, меў насечку ля перехвату.

Спецыфікай наваградскай калекцыі зброі была вялікая колькасьць срэзняў у форме вузкай рыдлёвачкі, у якіх А.Ф. Мядзведзеў бачыць зброю манголаў. У Ноўгарад і паселішчы Прыбалтыкі, якія не былі спустошаны манголамі, дадзеныя наканечнікі, на думку аўтара, трапілі пасля нашэсьця манголаў, у выніку палітычных і гандлёва-эканамічных сувязяў[68].

У Наваградку срэзняў знайдзена больш чым у Біляры — сталіцы Булгар, які манглолы ўзялі ў 1236 г. З 276 жалезных наканечнікаў стрэлаў, срэзні-рыдлёвачкі прадстаўлены 11 экзэмплярамі, а ў старажытнарускім Серэнску, які быў абложаны мангольскім войскам у 1238 г., знайдзена 12 такіх срэзняў[69].

Нагадаем, што з 16 наваградскіх срэзняў рыдлёвачак, 13 былі знайдзены на Замкавай гары — Наваградскім дзяцінцы і паспрабуем зразумець канцэнтрацыю дадзенага віду ўзбраеньня менавіта ў гэтай частцы гораду з дапамогай летапісных звестак. Як паведамляе летапісец пад 1274 г., у складзе раці Льва Данілавіча, які пайшоў паходам на Наваградак былі татарскія воі начале з Ягурчынам, згуртаваныя ў асобны полк. У выніку нападу валынскаму войску ўдалася ўзяць толькі вакольны горад, а дзяцінец яны ўзяць не змаглі (с.00). Відавочна, вялікая колькасьць мангольскіх стрэлаў на Замкавай гары — гэта сведчаньне

безпаспяховых спробаў воінаў князя Льва, у прыватнасьці, яго мангольскага палка, заваяваць Наваградскі дзяцінец.

Як ужо адзначалася, асобныя знаходкі срэзняў- рыдлёвачак вядомыя ў шэрагу заходнерускіх гарадоў, але цікава, што ў наібольш багатай ваўкавыскай калекцыі зброі, дзе налічваецца 234 жалезных наканечнікаў стрэлаў, такіх срэзняў не было[70].

Раней прыведзеныя пісьмовыя сведчаньні аб Наваградку паказваюць актыўную ваенную дзейнасьць яго жыхароў, праўда, толькі для другой паловы XIII ст. Наваградцы адбіваюць паходы на горад валынскіх князёў, аб гэтым паведамленьні пад 1252, 1253 і 1254 гадамі. У 1256 г. Раман Данілавіч, які атрымаў Наваградак ў сваё ўладаньне, збіраецца з гараджанамі на дапамогу свайму бацьку, які ваяваў з яцьвягамі. Пад тым жа годам маецца паведамленьне, што “Роман и новгородци” павінны былі ісьці да Возвяўля, а адтуль да Кіева. Войшалк, які валодаў Наваградкам у 60-я гады XIII ст. узяўшы з сабой наваградцаў “и пойди в Литву княжить”. Нарэшце пад 1274 г. паведамляецца, што пад напорам валынскага войска, паў Наваградскі вакольны горад, але дзяцінец утрымаўся.

Выдатная і разнастайная зброя Наваградка, характэрная для жыхароў гораду з пачатку XII ст., якая не саступала лепшым старажытнарускім ўзорам, давала ім магчымасць і ў XII ст. рабіць бліжнія і далёкія паходы, ў якіх прымалі ўдзел не толькі пешыя воі, але і коньнікі. Гэта зброя дазваляла трымаць у падпарадкаваньні просты люд гораду і жыхароў Наваградскай акругі.

Спасылкі:

[1] ДН. С. 39., Мал. 28,4.

[2] Paulsen P. Schwertortbander der Wikingerzeit. Stuttgart, 1953. S. 107, 125.

[3] ДН. С. 107., Мал. 88,2.

[4] ДН. Мал. 88,3; Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Минск, 1982. Табл. VI,4; Кирпичников А.Н. Древненаруское оружие. (? 2 ?)// САИ. 1966. Серия Е. 1-36

[5] ДН. Мал. 28,13; Побль Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. Мал. 83,2; Воронин Н.Н. Древнее Гродно. // МИА. 1954. Вып. 41. Мал. 22,1; Штыхов Г.В. Города полоцкой земли. Минск, 1978. Мал. 38,17.

[6] ДН. Мал. 54,12; Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск: 1975. Мал. 32,2.

[7] ДН. Мал. 28,14; Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 102.

[8] ДН. Мал. 88,5; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 216; Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Минск, 1975. С. 57; Лысенко П.Ф. Бярэсци.

Минск, 1985. Мал. 148,5.

[9] ДН. С. 45., Мал. 34,1.

[10] ДН. С. 107., Мал. 88,8.

[11] Павлова К.В. 1)Раскопки могильника близ Новогрудка. // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 100; 2) Раскопки курганов у д. Городиловка. // КСИА. 1973. вып. 135. С. 60; Поболь Л.Д. Op. cit. Мал. 83,1; 84,1,2.

[12] Медведев А.Ф. Ручное метательное оружие // САИ. 1966. Серия Е. 1-36. Лічбы ў дужках пасля найменавання знаходак абазначаюць тып наканечникаў па А.Ф. Мядзведзеву.

[13] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 22,7; Штыхов Г.В. Города ... Мал. 45,2; Лысенко П.Ф. 1) Города Туровской земли. Минск, 1975. С. 53; 2) Бярэсци. Мал. 150; Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966, Мал. 43,6; 72,12,13; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,1.

[14] ДН. Мал. 81; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 22,8; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,5.

[15] Медведев А.Ф. Op. cit. С. 57.

[16] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 105; Загорульский Э.М. Указ. счо. Табл. VIII,11-13; Лысенко П.Ф. Города ... Мал. 28,3-5; Медведев А.Ф. Op. cit. С. 59.

[17] Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. VIII,20.

[18] ДН. Мал. 47.1; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. IX,1-4; Штыхов Г.В. Города... Мал. 45,22.

[19] ДН. Мал. 28,8; 47,4; 60,5; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 22,5; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 45,21; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,21.

[20] ДН. Мал. 34,2; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 22,4;Медведев А.Ф. Op. cit. С. 65; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,12.

[21] ДН. Мал. 81,1; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,14; Штыхов Г.В. Города... Мал. 45,9.

[22] ДН. Мал. 47,5; 67,5; Лысенко П.Ф. Города ... С. 52; Зверуго Я.Г. 1) Op. cit. Мал. 33,25; Археологические работы в Слониме.// БС. Мал. 17,6.

[23] ДН. Мал. 55,4; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 107., Мал. 33,15.

[24] ДН. Мал. 55,8; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,16; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 45,28.

[25] ДН. Мал. 71,1; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,18; Загорульский Э.М. Op. cit. табл. IX,5.

[26] ДН. Мал. 55,5; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,17.

[27] ДН. Мал. 19,10; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,22-24; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 45,26.

[28] Медведев А.Ф. Op. cit. С. 73.

[29] Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. С. 105; 2) Города ... Мал. 45,5,6; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33, 26.

[30] Медведев А.Ф. Op. cit. С. 75.

[31] ДН. Мал. 78,4; Медведев А.Ф. Op. cit. С. 75; Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 88,100; Штыхов Г.В. 1) Города ... Мал. 45,35; 2) Древний Полоцк. Мал. 30,2; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. X,1; Лысенко П.Ф. 1) Города ... Мал. 38,2,3; 2) Берестье. Мал. 150,9.

[32] ДН. Мал. 69,1; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. IX,14,15.

[33] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,35.

[34] Медведев А.Ф. Op. cit. Табл. 25,7.

[35] ДН. Мал. 67,5; 73,4; Штыхов Г.В. Города ... Мал. 45,33; Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966. Мал. 431; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. IX,13.

[36] ДН. Мал. 42,1; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл.IX,13.

[37] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,43,45; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. X,11.

[38] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 33,42; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. X,10.

[39] ДН. Мал. 79,6,7; Медведев А.Ф. Op. cit. С. 43., табл. 9,2.

[40] ДН. С. 20., Мал. 8,9.

[41] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 88,8; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 150,22

[42] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 88,2,6; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 150,20; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 111.

[43] ДН. Мал. 81,4; Медведев А.Ф. Op. cit. С. 95; Зверуго Я.Г. Op. cit. С.111.

[44] ДН. Мал. 66,16; Штыхов Г.В. Древний Полоцк. С. 57; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 112; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 220; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 148,3,4.

[45] Кирпичников А.Н. Древнерусское оружие. // САИ. 1971. Серия Е 1-36. С. 17-18.

[46] ДН. Мал. 73,6.

[47] Колчин Б.А., Янин В.Л. Археологии Новгорода 50 лет.// Новгородский сборник. М., 1982. С. 78.

[48] Кухаренко Ю.В. Средневековык Полесья. // САИ. 1961. Серия Е 1-57. Табл. 8; Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 30,15; Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 16; Загорульский Э.М. Op. cit. Табл. XI,1,2; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 149.

[49] Гуревич Ф.Д. Древнености белорусского Понеманьня. 1962. Мал. 76,4.

[50] Кирпичников А.Н. Снаряжение конника и верхового коня на Руси IX-XIII вв. // САИ. 1973. Серия Е 1-36. С. 15-16.

[51] ДН. Мал. 55,16.

[52] Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 16.

[53] ДН. Мал. 88,4,6.

[54] Воронин Н.Н. Op. cit. Мал. 88,21; Зверуго Я.Г. Op. cit.

Мал. 35,1-4; Штыхов Г.В. Города ... С. 107; Лысекно П.Ф. Op. cit. ??? 153,1,2; Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 16.

[55] ДН. С. 93, 107., Мал. 73,2; 88,1.

[56] ДН. Мал. 40,8; 47,8; Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 83-84; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 35,1; Лысенко П.Ф. Op. cit. Мал. 153,12.

[57] ДН. Мал. 28,7,8; 34,5,9; 60,8,9,11; 67,24-27.

[58] Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 105.

[59] Кирипичников А.Н. Тамсама.

[60] Кирпичников А.Н. Тамсама.

[61] Кирпичников А.Н. Тамсама; Лысенко П.Ф. Op.cit. С. 229-230.

[62] Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 105.,табл. XX,2,2а; Штыхов Г.В. Op. cit. С. 107; Лысенко П.Ф. 1) Города ... Мал. 28,10; 2) Берестье. Мал. 152,4.

[63] ДН. Мал. 81,8.

[64] Кирпичников А.Н. Op. cit. С. 84.

[65] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 107.

[66] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 103

[67] Медведев А.Ф. Op. cit. С. 55.

[68] Медведев А.Ф. Op. cit. С. 76.

[69] Культура Биляра. М., 1985. С. 155. 171; Никольская Т.Н. Военное дело в городах земли Вятичей (по материалам древненаруского Серенска). // КСИА. 1974. Вып. 139. С. 35.

[70] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 103.

Глава 6. Сельская гаспадарка і промыслы

Важную ролю сельскай гаспадаркі, у прыватнасьці, зямляробства ў эканоміцы старажытнарускага гораду паказваюць шматлікія матэрыялы. Няма, здаецца, ні аднаго гораду дамангольскага часу, пры раскопках якога не былі б знайдзены тыя альбо іншыя сельскагаспадарчыя прылады, зярняты і іншыя рэаліі, што належаць зямляробству. Не выпадкова, гісторыя сельскай гаспадаркі Старажытнай Русі, шмат у чым будуецца на матэрыяле з раскопак старажытнарускіх гарадоў. Аб старажытнарускім горадзе апраўдана можна сказаць, як казалі аб сярэдневяковым горадзе Заходняй Еўропы: ён “напалову заселены і напалову засеяны”.

У культуры старажытнага Наваградка спецыфічна адлюстраваны заняткі вясковых жыхароў гаспадаркай. Жывучы ў зоне наібольш урадлівых зямляў Беларусі, наваградцы займаліся зямляробствам галоўным чынам, у раньнюю пару існаваньня паселішча. Да наібольш старажытнай пары ў гісторыі Наваградка належыць свіран на пасадзе і, магчыма, другое такое ж памяшканьне, што стаяла амаль побач. Сошнік з Малага Замка належыць да раньніх ворных прыладаў на Беларусі[1]. У абедзьвух частках гораду знайдзены абломкі яшчэ двух сашнікоў і двух наральнікаў. На тэрыторыі Замкавай гары знайдзена каса-гарбуша. Такая ж каса на вакольным горадзе ляжала пад печкай дома[2]. Сярпы (3 экзэмпляры) вядомыя толькі на Малым Замку. За выключэньнем аднаго з іх, які ўваходзіў у інвентар простага гаражаніна другой паловы XII ст., два другія, як і ворныя прылады і косы, звязаны з раньняй гісторыяй гораду.

Земляробчыя прылады, падобныя да нашых, з’яўляюцца ў X ст. На падставе знаходкі сашніка з Гродна, які нагадваў наваградскі, А.В. Кір’янаў рэканструяваў саху Панямоньня ў выглядзе трох, а магчыма і чатырохзубовай вупражнай прылады. Такая саха яшчэ не мела прыстасаваньня для адвалу пласта і магла толькі разрыхляць зямлю на нязначную глыбіню[3]. Наваградскія сярпы належаць да ноўгарадскага тыпу прыладаў, якія лічыліся наібольш эфектыўнымі[4]. Драўляная рыдлёўка для веяньня зерня адзначана ў главе 4. Яна знайдзена ў той зоне Наваградскага дзяцінца, дзе жылі княжацкія чаляднікі.

У Наваградку знайдзены восем камянёў-жорнаў, з якіх толькі адзін належаў да культурнага слою XII ст. Астатнія, ізноў такі звязаны з жыцьцём паселішча да канца XI ст. У гэтым плане

цікавая пабудова 23 вакольнага гораду. Да яе належалі пяць жорнавых камянёў. На Замкавай гары знайдзены толькі адзін такі камень. Ён ляжаў у мацерыковай яме. Для апрацоўкі агародаў служылі рыдлёўкі, ад якіх захаваліся жалезныя акоўкі (3 экзэмпляры). Падобныя акоўкі добра вядомыя ў старажытнарускіх помніках, у тым ліку ў заходнерускіх гарадах.

Занятак земляробствам, характэрны для перыяду з канца X да канца XI стст., у XII ст. спыняецца. Гэта праца робіцца заняткам простых гараджан, у той час як насельнікі багатага кварталу вакольнага гораду і заможныя слаі Замкавай гары прадстаюць толькі як спажыўцы ўраджаю. У апошніх гэта праявілася ў гумнах, якія запоўнены зернем і іншымі сельскагаспадарчымі культурамі.

У юрыдчных дакументах XVI ст. яшчэ добра прасочваецца сувязь Навагрудка з сельскай гаспадаркай[5]. Натуральна, што ў старажытнарускі час яна была нашмат цяснейшая. Можна сабе ўявіць, што вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі побач з шэраговымі навагрудцамі, якія займаліся земляробчымі работамі, былі таксама жыхары акругі.

Сельскагаспадарчыя культуры ў Навагрудку прадстаўлены наступным чынам: азімае жыта складала 56% злакаў, мягкая пшаніца — 42%[6]. Зусім па-іншаму прадстаўлены гэтыя дзьве культуры ў другіх гарадах Панямоньня. У Гродне азімага жыта было 98%, а ў Ваўкавыску 96% ураджаю[7]. У невялікай колькасьці ў Навагрудку прадстаўлены іншыя культуры — ячмень, авёс, гарох і канапля[8]. У адной з бочак кладавой на Замкавай гары ляжалі згарэўшыя косткі яблык і сліваў[9].

Разнастайныя матэрыялы сведчаць аб жывёлагадоўлі гараджан. Гэта рэшткі хлявоў з гноем, ножніцы, каб стрыгчы авечак, прасліцы з разнастайных матэрыялаў і остэалагічныя матэрыялы. Апошнія прадстаўляе табліца — вынік доследаў В.І. Цалкіна:

Табліца 5. Косьці хатняй жывёлы (Малы Замак)

Назва віду	Колькасьць	Працэнтныя суадносіны да ўсяго остэалагічнага матэрыялу
Буйная рагатая жывёла	105	21,4
Свіньні	94	19,1
Дробная рагатая жывёла	77	15,7
Коні	25	5,1
Сабакі	11	2,2
Усяго	312	63,5

Сярод хатняй жывёлы ў Навагрудку перавага была за буйнай рагатай жывёлай і свінямі, што, увогуле, адпавядае характару

остэалагічных астаткаў старажытнарускіх гарадоў. Авечкі і козы ў рацыёне насельнікаў складалі адносна невялікую долю, але людзі шырока выкарыстоўвалі скуры і воўну гэтай жывёлы, а косьці былі матэрыялам для розных вырабаў.

У археалагічнай літаратуры неаднаразова падымалася пытаньне аб тым, ці былі коні на Русі мясной жывёлай. Вялікая частка даследчыкаў лічыць, што гэта адбывалася ў галодныя гады[10]. Па назіраньнях В.І. Цалкіна жыхары Малага Замка елі каніну. Рэшткі конскіх касьцей сустракаліся ў такім стане, што гэта былі рэшткі мясной ежы[11], косьці каня былі матэрыялам для вырабу пралак. Але галоўнае выкарыстаньне коней было для транспартных і баявых патрэбаў. Пры адносна невялікай колькасьці конскіх касьцей — няшмат больш за 5% ад усіх касьцей жывёлы, у Наваградку знайдзена шмат рэчаў, якія належаць да рыштунаку коньніка і вупражжы верхавога каня, аб якіх гаварылася ў папярэдняй главе.

Апошнім у шэрагу хатняй жывёлы стаіць сабака. Па заключэньню Н.М. Ермолавай ён быў дробнай пароды.

Вялікае значэньне мела ў Наваградку паляваньне. Остэалагічныя матэрыялы, даследваныя В.І. Цалкіным паказваюць наступнае:

Табліца 6. Косьці дзікай жывёлы (Малы Замак).

Назва віду	Колькасьць	Працэнтныя суадносіны да ўсяго остэалагічнага матэрыялу
Зубр	30	6,2
Лось	37	7,6
Алень шляхетны	43	8,5
Касуля	21	4,3
Мядзведзь	4	0,9
Бабёр	5	1
Заяц	5	1
Усяго	179	36,4

Дзікія жывёлы прадстаўлены касьцямі зубра, шляхетнага аленя, дзіка і інш. Сярод остэалагічнага матэрыялу Замкавай гары Н.М. Ермолава вылучае косьці тура — вельмі рэдкай жывёлы. Такім чынам, палявалі на мясных жывёлаў. Заўважым, што да такіх В.І. Цалкін залічае мядзведзя і бабра[12].

Пушныя звяры, якіх у лясах Панямоньня вялося багата, астаткамі касьцей не прадстаўлены. Гэта, аднак, не значыць, што яны не былі аб'ектам паляваньня. Пушніна, несумненна, была хадавым таварам, якім наваградцы маглі расплачвацца за дарагія і нярэдка унікальныя вырабы, знайдзеныя ў гэтым горадзе. Яшчэ ў

1950 г. Е.І. Гарунова, а пазней В.І. Цалкін звярнулі ўвагу на тое, што остэалагічны матэрыял дае скажонае прадстаўленьне аб сапраўдных памерах паляваньня на пушнога звера. Адсутнасьць касьцей пушных зьвяроў на паселішчы аўтары тлумачаць тым, што пасля таго як скура звера была знята, тушу яго пакідалі у лесе[13]. Праўдзівасьць этага мяркаваньня падцвярджаецца драўлянай скульптурай са Штральзунда (ГДР), якая паказвае паляўнічага, які здымае ў лесе скуру забітай вавёркі[14]. Праўда, на асобных паселішчах знайдзена шмат касьцей пушных звяроў, так на гарадзішчы Асотэ ў Латвіі косьці куніцы складалі 45% остэалагічных астаткаў дзікай фауны[15].

Вялікае значэньне паляваньня характэрнае і для іншых гарадоў Панямоньня. У Ваўкавыску, на Замчышчы - вакольным горадзе, косьці дзікай жывёлы складалі 29,1% остэалагічных матэрыялаў, а на “Шведскай гары” - дзяцінцы - 55,4%. На гродзенскім дзяцінцы — Старым Замку прадстаўнікі лясной фаўны складалі 57% касьцей[16]. Остэалагічныя матэрыялы Замкавай гары Наваградка не былі так сістэматычна вывучаны як адпаведныя матэрыялы Малага Замка, але можна сабе ўявіць, што значэньне паляваньня там было, прыблізна, такое ж, як у Ваўкавыску і Гродне. Нагадаем, што менавіта на Наваградскім дзяцінцы была знайдзена серыя касьцяных стрэлаў, прызначаных для таго, каб не пашкодзіць скуру звера і косьці тура, незафіксаваныя ў другіх заходнерускіх гарадах.

Акрамя спецыяльнай паляўнічай зброі, амаль усе наканечнікі жалезных стрэлаў, за выключэньнем бранебойных і арбалетных, маглі прымяняцца і для паляваньня. Спецыфічнай зброяй паляўнічых былі жалезныя гарпуны, знайдзеныя толькі на Малым Замку (19 экзэмпляраў). Там яны з’явіліся з пачатку XII стагоддзя. Аднашыпныя гарпуны даўжынёй да 15 см. і двушыпныя, даўжынёй да 10 см. (мал.). У пабудове 6, блізка печы, ляжалі восем двушыпных гарпуноў, з якіх шэсьць, верагодна, знаходзіліся ў звязцы[17]. У гэтым доме жыў добры паляўнічы. Гарпуны выкарыстоўваліся пры паляваньні на буйнага звера. У заходнерускіх гарадах падобныя гарпуны знайдзены ў Ваўкавыску, Мінску і Бярэсьці, а таксама на гарадзішчы Масковічы (замак)[18].

У старажытнарускіх гарадах лясной паласы косьці дзікай жывёлы складаюць нязначную частку остэалагічных матэрыялаў. Так у Маскве, у “зарядье”, у слоі XII-XIII стст. яны прадстаўлены 0,6%, у Крамлі 5%, на дзяцінцы ў Серенску - 2,1%, у Слабодцы і Старай Разані - 5%, у Яраполчы Залескім 8,5-10%[19]. У гарадах Заходняй Русі значэньне паляваньня было большае. У Полацку косьці лясной фауны складалі 17,6%, Віцебску - 18,1%, Тураве -

21,8%, Пінску - 25,6%, Бярэсьці - 26,3%, Давідгарадку - 41%, Лукомлі - 42,3% і Клецку - 45,7%[20]. Наібольшае значэньне паляваньня, як адзначалася, для Ваўкавыска і Гродна і ў гэту ж групу трэба ўключыць Наваградскі дзяцінец.

Значэньне паляваньня ў старажытнарускім Наваградку асабліва праяўляецца ў XII і XIII стст., калі сацыяльныя вярхі гораду перастаюць займацца зямляробчымі работамі. Паляваньне для іх гэта не толькі эканамічная неабходнасьць, але і забава вярхушкі феадальнага гораду. Багатае насельніцтва вакольнага гораду і знаць дзяцінца бавіліся паляваньнем, “ловітвой”, “ловом” як называлі яго пісьмовыя крыніцы. “Ловітва пріспе” паведамляецца ў павучэньні Грыгорыя Назіянзіна па спісу XI ст. Аповесьць мінулых часоў (временных лет) пад 1036 г. адзначае “Мстислав изиде на ловы”, а ў павучэньні Ўладзіміра Манамаха князь гаворыць, што ён паляваў “на всяк зверь”[21]. Розніца ў паляваньні на пушных і мясных звяроў адлюстраваная ў наступных радках аб Ільлі Мурамцы: “В те поры Ильи Муромца дома не лучилося; полевал он далече во чистом поле. Зверя лютого на копье ловил, соболей, куниц на низок низал”[22].

Сацыяльная афарбоўка Наваградскага паляваньня наглядна супрацьпастаўлена значэньню этага промыслу ў прыгарадным паселішчы Гардзілоўка. Косьці дзікай жывёлы складаюць там 84% остэалагічных матэрыялаў. У жыхароў паселішча былі свіньні, козы і буйная рагатая жывёла. Лясная фаўна ў роўнай ступені прадстаўлена касьцямі дзіка і лася[23].

У Наваградку знайдзена некаторая колькасьць касьцей птушак. Скапленьне птушыньх касьцей адзначана ў адной з гаспадарчых пабудоў Наваградскага дзяцінца. Тут разводзілі кур, гусей і качак. Цікавай знаходкай з’яўляюцца косьці жураўля. Згодна “Рускай праўдзе” журавель лічыўся ўласнасьцю таго гаспадара, на страсе якога ён звіў сваё гняздо. Жураўлінае мяса “жеравіе” успамінаецца ў ліку блюд з дзічы на піру богатага чалавека ў “Слове аб багачы Лазары”[24].

Разам з мясным сталом у Наваградку быў распаўсюджаны рыбны. У жылых пабудовах і паблізу іх неаднаразова сустракаліся косьці і луска рыб. Па дадзеных Н.М. Ермолавай, гэтыя косьці буйных рыб з пароды асетровых, а таксама шчупака, акуня, язя і карпа. У Гродне, які стаіць на Нёмане і ў Ваўкавыску, які звязаны з гэтай ракой прытокамі, набор рыбы быў больш разнастайны[25].

У рыбалоўны рыштунак наваградцаў уваходзілі астрогі, знайдзеныя толькі на Малым Замку (3 экзэмпляры). Даўжыня іх дасягала 28 см. Аналогіі астрогам вядомыя ў шэрагу заходнерускіх гарадоў. Для закола рыбы выкарыстоўвалі таксама гарпуны і двушыпныя наканечнікі стрэлаў[26]. Жалезныя

рыбалоўныя кручкі з прамым і нахільным стрыжнем (мал.) (5 экзэмпляраў) вядомыя ў абедзьвух частках гораду. Вялікія кручкі прызначаліся для жэрліца, дробныя для вудаў і перамётаў. Рыбалоўныя кручкі сустракаюцца ва ўсіх гарадах Заходняй Русі.

У пабудове другой паловы XI ст. на Малым Замку знайдзены жалезная выраб, які прадстаўляе з сябе, можа быць, падвоены рыбалоўны кручок з дадатковымі выступамі (мал)[27]. Паралелі яму невядомыя.

Наваградцы лавілі рыбу сеткамі. Аб гэтым можна мяркаваць па вялікім каменным грузілу з прасвірлаванаў ступенчатай адтулінай і свінцовых грузілах. На Малым Замку вядомыя двайныя жалезныя кручкі з перавітым стрыжнем (3 экзэмпляры) [28]. Імі карысталіся каб вытасківаць сетку. Такія ж кручкі знайдзены ў Ваўкавыску[29].

Іхтыялагічныя астаткі і рыбалоўныя прылады дазваляюць заключыць, што значную частку ўлову складалі вялікія рыбіны. Магчыма, што спецыфіка Наваградскага паляваньня сказвалася на характары рыбалоўства. Абодва гэтыя промыслы былі блізкія адзін да другога і невыпадкова месцы паляваньня і рыбалкі мелі агульнае найменьне “ловище”. Аднак рыбалоўства ў гаспадарцы наваградцаў адыгрывала меньшую ролю чым паляваньне. Верагодна, гэта тлумачыцца тым, што галоўная крыніца рыбы — Нёман знаходзіцца ад гораду на адлегласьці каля 30 км.

Сярод археалагічных знаходак Навагрудка не захавалася матэрыялаў, якія б паказвалі заняткі гараджан бортніцтвам. Тым не меньш, гісторыю бортніцтва ў Навагрудку можна аднавіць рэтраспектыўна. У XVI ст. у гэтым горадзе існавала воскабойня, а ў прывілеях, дадзеных Наваградскім гараджанам па Мадзебургскаму праву, яны маглі сячы дрэвы “окром бортного дерева, которого рушить не смеють”[30]. Бортніцтва павінна было мець значэньне ў Навагрудку, як і па ўсёй Літве, дзе мёд і воск складалі галоўную частку сялянскіх грашовых плат у феадальны час[31]. Праўда, няясна, займаліся ім гаражане ці толькі сяляне.

На заканчэньне адзначым, што наваградцы ласаваліся ляснымі арэхамі — ляшчынай, шкарлупа якіх захавалася ў культурным слоі старажытнарускага часу.

Археалагічныя дадзеныя, якія характэрызуюць сельскую гаспадарку і промыслы Навагрудка, тыповыя для старажытнарускіх гарадоў. Спецыфіка нашага гораду заключаецца ў тым, што ў XII-XIII стст. там незвычайныя суадносіны паміж зямляробствам і паляваньнем. Значная роля паляваньня, тыповая для Гродна, Ваўкавыска і некаторых іншых заходнерускіх гарадоў, не адбілася на зямляробчых занятках гараджан. У Навагрудку, у тых частках гораду, дзе жылі прывеліраваныя слаі, паляўнічы

промысел як бы выцясняе зямляробства. Ім займаліся толькі простыя гаражане, а патрэбы ў сельскагаспадарчай прадукцыі, відавочна, задавальнялі таксама за кошт сельскага насельніцтва.

У сувязі з пытаньнем аб узаемаадносінах зямляробства і промыслаў у старажытнарускім Наваградку, хацелась б звярнуць увагу, што за пару кіламетраў ад гораду знаходзіцца вёска Брацянка, упершыню ўспамянутая ў пісьмовай крыніцы канца XIV пачатку XV стст. пад найменьнем двор Бретена, які ўваходзіў в склад уладаньняў Наваградка[32]. Найменьне Брацянка верагодна ўзыходзіць да старажытнарускага слова Бретьяніца альбо Бретьяніча, што значыць сьвіран альбо гумно, дзе захоўваўся запас правіянту — гатавізна[33]. Цікава, што Іпацеўскі летапіс гумны альбо сьвірны пад такой названіем паказвае ў сельскай мясцовасьці. Пад 1146 г. паведамляецца: “Идоста на Игарыве селче идеже бяше сустроил двор добре, бе же тоу готовизни много в бретьяничах/брнетьяницех и в погребе вина и медове”[34]. Цалкам магчыма, што ў старажытнарускім Наваградку на тэрыторыі сучаснай Брацянкі маглі быць склады, куды вакольнае насельніцтва звозіла сельскагаспадарчую прадукцыю і якія існавалі паралельна з гумнамі і свірнамі, адкрытымі на тэрыторыі дзяцінца.

Спасылкі:

[1] ДН. Мал. 80,3; Коробушкина Т.Н. Земляробства на тэрыторыі Беларусі. Мінск, 1979. С. 22-24.

[2] ДН. С. 26.

[3] Кирьянов А.В. Материалы по истории земледелия из раскопок в Гродно. // МИА. 1954. вып. 41. С. 209.

[4] Коробушкина Т.Н. Op. cit. С. 48, 49.

[5] Бурдзейка А. Нарыс соцыяльна эканамічнага жыцьця места Наваградку ў XVI сталецьці. // Гістарычна-археалагічны зборнік. Менск, 1927. Т. 1. С. 167-168.

[6] Кирьянов А.В. Op. cit. С. 20, 207; Зверуго Я.Г. Древний Волклвыск. Минск, 1975. С. 84.

[7] Вызначэнне Н.А. Кір’янавай.

[8] Вызначэнне М.М. Якубцінера.

[9] Вызначэнне В.А. Калеснікава.

[10] Третьяков П.Н. Сельское хозяйство и промыслы // ИКДР. 1951. Вып, 1 С. 59; Монгайт А.Л. Старая Рязань // МИА. 1955. Вып. 49. С. 166; Седов В.В. Сельские поселения центральных районов Смоленской земли // МИА. 1960. Вып. 92. С. 75

[11] Асабістае паведамленне В.І. Цалкіна. Канінай, магчыма, харчаваліся ў гарадах Панямоння — Гродне і Ваўкавыску. Зверуго Я.Г. Op.cit. С. 90

[12] Цалкин В.И. К истории животноводства и охоты в Восточной Европе // МИА. 1952. Вып. 107. С. 126.

[13] Горюнова Е.И. К вопросу об “остеологической” статистике // КСИИМК. 1950. Вып. XXXV. С. 60-65; Цалкин В.И. Op. cit. С. 65, 126.

[14] Штэтылло Я.Ф. Деревянная скульптура XIV-XV вв. из Штральзунда // СА. 1965. Вып. 1, С. 306-314.

[15] Шноре Э.Д. Асотское городишче // Материалы по археологии Латвийской ССР. Рига, 1961.

[16] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 86,91; Цалкин В.И. Фауна из раскопок Гродно // МИА. 1954, Вып. 41. С. 233.

[17] ДН. С. 35., Мал. 23,5; 54,9; 55,14.

[18] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 31, 17-19; Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Минск, 1982. Табл. XI, 3-6; Лысенко П.Ф. Берестье. Минск, 1985. С. 367; Дучыц Л.У., Шчаглова В.В. Жывёлагадоўля і палявянне ў жыцці насельніцтва Маскавіцкага гарадзішча (XI-XIII стст). // Весці АН БССР. 1987. Вып. 2 С. 78.

[19] Никольская Т.Н. Земля вятичей. М., 1981. С. 218; Данильченко В.Н. Характеристика остеологическогоматериала // Седов М.В. Ярополч Залесский. М. 1978. С. 154.

[20] Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 364-365.

[21] Срезневский И.И. Материалы для словаря древнеруского языка // ?? 1902. ? 11. С. 38; ПСРЛ. 1846. Вып. 1. С. 65.

[22] Кириевский П.В. Песни. 1860. Вып. 1. С. 57.

[23] Вызначэнне М.К. Верашчагіна.

[24] Левашева В.П. Сельское хозяйство // Труды ГИМ. 1956. Вып. 32. С. 83; Ржига В.Ф. Очерки по истории быта домонгольской Руси // Труды ГИМ. 1949. Вып. 5. С. 97.

[25] Воронин Н.Н. Древнее Гродно // МИА. 1954. Вып. 41. С. 58; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 95.

[26] ДН. Мал. 85,12; Куза А.В. Рыбный промысел в Древней Руси // Автореферат канд. дис. М., 1970. С. 11.

[27] ДН. Мал. 19,8.

[28] ДН. Мал. 45,3; 60,6; 77,15.

[29] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 31,6,12,13.

[30] Бурдзейка А. Op. cit. С. 160, 166.

[31] Паулекене Е. Хозяйственное значение бортничества в феодальной Литве // Is Lietuviu kulturos istorjos. 1964. IV. p. 278-279.

[32] Любавский М.К. Областное деление и местное управление литовско-русскогогосударства. М., 1902. С. 128.

[33] ПСРЛ. М.Ю 1962. Вып. 11. Стб. 333.

[34] Срезневский И.И. Op. cit. Спб., 1893. Т. 1. С. 571.

Глава 7. Гандаль. Знешнія сувязі

Прывазныя вырабы і матэрыялы Малага Замка і некаторыя пытаньні знешніх сувязяў яго жыхароў разглядаліся ў кнізе “Старажытны Навагрaдак”[1]. Задача гэтай главы — даць прадстаўленьне аб сувязях нашага гораду з бліжнімі і дальнімі землямі Старажытнай Русі і краінамі, што знаходзяцца за яе межамі, пазнаёміць пры гэтым чытача з прывазнымі вырабамі, знайдзенымі на Замкавай гары і ў ваколіцах гораду.

Аб бясспрэчнай гандлёвай дзейнасьці гараджан даюць прадстаўленьне матэрыялы XII-XIII стст. — бязмен і вагавыя гіркі. Жалезны бязмен і дзве гіркі знайдзены на Малым Замку. Да знаходак Замкавай гары належаць шэсьць гірак, пры гэтым пяць з іх сустракаюцца ў гаспадарчай пабудове XII ст.[2]

Навагрaдскі бязмен, кольцы якога інкруставаны белым металам, мае даўжыню стрыжня 41 см. Бязмены, якія рэдка сустракаюцца ў старажытнарускіх гарадах, вядомыя па знаходкам у Кіеве і Старой Рязані. На тэрыторыі Беларусі бязмены знайдзены ў Мінску і Слуцку, а гіркі ў Лагойску (2250 грамаў) і на гарадзішчы Масковічі Браслаўскага раёна Віцебскай вобласьці[3]. Па разліках Б.А. Колчына, на стараразанскім безмене, даўжынёй 36 см. можна ўзважыць груз вагой да 7-8 пудоў. Такі самы груз мог важыць бязмен з Мінска, які меў такую ж даўжыню[4]. Навагрaдскі бязмен даўжынёй 41 см. павінен быў вытрымліваць большы цяжар.

Гіркі Навагрaдка прадстаўляюць наступнае:

1. Свінцовая пляскатай формы. Дыяметр 3,4 см., вышыня 1,8 см. (мал.); вага 143 г.

2. Бронзавая з прасверленай адтулінай, залітай свінцом. Зоннай формы. Дыяметр 3 см., вышыня 1,5 см. (мал.). вага 100 г.

3. Бронзавая біканічная. Дыяметр 1,5 см., вышыня 1,6 см. Вага 90 г.[5]

4. Бронзавая зоннай формы. Дыяметр 1,8 см., вышыня такая ж (мал.). вага 57 г.

5. Металічная з гранёнымі бакамі. Дыяметр 1,8 см., вышыня такая ж. На сплошчаных баках выбіты крыжы. вага 34 г.[6]

6. Бронзавая. Зоннай формы. Дыяметр 1 см., вышыня 1,8 см. На сплошчаным баку выбіты крыж. вага 21 г.

7. Бронзавая дэфарміраваная (мал.). вага 29 г.

8. Бронзавая зонная. Дыяметр 1,8 см. Вышыня такая ж. На сплошчаных баках выбіты крыж. вага 34 г.

Амаль усе Навагрaдскія гіркі былі прадметам доследу Шаміля Бекцінеева. Четыром з іх — вагой 21, 29, 57 і 143 г. аўтар

знаходзіць весавыя аналогіі сярод літоўскіх зліткаў XII-XIV стст. Гірка вагой 90 г. блізкая да адпаведных знаходак з Друцка і Берасьця і адпавядае палове літоўскага рубля вагой 170-185 г. Што датычыць гіркі вагой 34 г., то падобныя, што маюць кратнасьць 4,25 (роўныя вазе скандынаўскага артуга — 8,5 г.) на думку Ш.І. Бекцінеева, хадзілі ў Наваградку, дзе асабліва моцны літоўскі ўплыў[7].

У заходнерускіх гарадах, акрамя безменаў і гірак, што ўспамянутыя вышэй, знайдзены часткі чашачных вагаў (Ваўкавыск, Друцк). Вагі і гіркі вядомыя і ў курганным інвентары[8].

Аб гандлёвай дзейнасьці аднаго з насельнікаў Наваградскага дзяцінца сведчыць скапленьне гірак у адной пабудове. Аб гэтым занятку жыхароў вакольнага гораду сведчыць маленькая свінцовая пломба з адціснутай на ёй латінскай літарай j. Дарэчы, у сувязі з гэтым, прыпомніць атрыбуцыю наваградскіх жалезных шчыпцоў Малага Замка, якую прапанаваў С.В. Белецкі — ён бачыў у іх буллотэрый — прыстасаваньне для вырабу свінцовых пломб.

Перш чым характэрызаваць сувязі Наваградка з другімі старажытнарускімі землямі і краінамі за межамі Русі, трэба зразумець яго эканамічныя адносіны з насельніцтвам навакольных вясковых паселішчаў. У нейкай меры гэта пытаньне разглядалася раней, але ў дадзенай главе яно патрабуе разгляду прымяняльна да ўсяго археалагічнага матэрыялу.

Ідэнтычнасьць жалезных вырабаў цэнтральнага паселішча і рэчаў, што знайдзены на селішчы Гардзілоўка і ў курганах, не пакідаюць сумненьня ў тым, што ў дагарадскі перыяд у гісторыі Наваградка, а таксама ў перыяд існаваньня раньняга і развітага старажытнарускага гораду, ён пастаўляў прадукцыю сваіх кавалёў у Наваградскую акругу. Вясковыя кавалі, відавочна, выпрацоўвалі толькі простыя жалезныя вырабы[9], а рэчы, якія патрабавалі кваліфікаванай працы маглі зрабіць толькі рамеснікі цэнтральнага паселішча.

Амаль усе бронзавыя вырабы акругі маюць аналогіі ў Наваградскім матэрыяле. Выключэньні адзінкавыя. Так у курганах знайдзены лірападобныя спражкі[10], якіх няма ў Наваградку. Аднак такая спражка знайдзена ў інвентары Наваградскага могільніка[11] і, натуральна, належала жыхару Наваградка. Толькі дзве знаходкі не маюць паралеляў у Наваградку. Гэта скроневыя кольцы з завязанымі канцамі з могільніка Гардзілоўка 1, якія нагадваюць племянныя ўпрыгожаньні крывічоў (гл. с. 00).

Напачатку гісторыі Наваградка ў вясковыя паселішчы прывозілі вырабы Наваградскіх ганчароў. Некаторыя гаршкі з курганаў немагчыма адрозніць ад Наваградскіх. Уплыў

Наваградска ганчарства сягаў так далёка, што нават гаршок з селішча каля в. Чарэшля, амаль за 30 км. ад Наваградка[12], нагадвае кераміку этага гораду. У XII ст. у вясковых паселішчах працавалі свае ганчары. Посуд этага часу адрозніваецца ад гарадскога[13]. Магчыма, што ў Наваградку была выраблена тканіна, абрывок якой (скдадаўся з чорных, чырвоных, жоўтых і белых нітак), быў знайдзены ў Каменке і, верагодна, паходзіць з кургана[14].

Прывазныя вырабы, знайдзеныя ў Наваградскай акрузе, якія трапілі туды праз Наваградак, істотна дапаўняюць наша прадстаўленьне аб знешніх сувязях цэнтральнага паселішча. Імпарт, знайдзены ў курганах гэта, галоўным чынам, пацеркі са шкла і камяню іншаземнага паходжаньня. У той час калі ў Наваградку яны прадстаўлены адзінкавымі знаходкамі, у курганах, асабліва ў Наваградскім магільніку знайдзены ніткі са шкляных пацерак.

Археалагічныя матэрыялы неаспрэчна паказваюць, што дагарадское паселішча, а потым і старажытнарускі Наваградак з канца X да XIII стст. сістэматычна пастаўляла вакольнаму насельніцтву прадукцыю сваіх рамеснікаў і прывазныя вырабы. На абмен, як мы спрабавалі паказаць у папярэдняй главе, гаражане куплялі сельскагаспадарчую прадукцыю.

Абмежаваўшыся гэтымі звесткамі аб сувязі Наваградка са сваёй акругай разгледзім як адбіліся ў культуры гораду кантакты з другімі старажытнарускімі землямі.

Прывазныя вырабы старажытнарускага паходжаньня

Галоўнымі пастаўшчыкамі прывазных вырабаў у Наваградак былі Кіеў, Кіеўская зямля і некаторыя іншыя паўднёварускія землі. Для паўднёварускага імпарту характэрна не толькі разнастайнасьць, але і паступленьне знаходак значнымі партыямі. Пераходзім да іх разгляду.

Шыферныя прасліцы (112 экзэмпляраў). Гэтыя вырабы прыбывалі ў Наваградак напрацяг усяго разгледжанага перыяду. Прасліцы з шыферу размяркаваліся наступным чынам: Малы Замак - 101 знаходка, Замкавая гара - 8, ваколіцы - 3 прасліцы. Наібольш раньняя знаходка паходзіць з кургана з трупаспаленьнем у Гардзілоўцы 1. На Замкавай гары шыфернае прасліца ўпершыню з'яўляецца ў пабудове другой паловы XI ст. [15] Гэта прасліца было знайдзена на вогніску гэтага ж часу. У пабудовах XII-XIII стст. на Малым Замку лік такіх прасліц

даходзіў да 11 экзэмпляраў.

Форма прасліц, пераважна, біканічная і зонная. Радзей сустракаліся бочкападобныя і дыскападобныя. Памеры: дыяметр 1,5-2,5 см., вышыня 0,7-2 см. Рэдкімі знаходкамі былі мініяцюрныя экземпляры (дыяметр да 1,5 см). Шыферныя прасліцы, знайдзеныя ў адной пабудове былі рознай формы і памераў (мал.). Храналагічнаму падзелу яны, такім чынам, не паддаюцца, чым і падцвярджаюць выснову В.А. Мальм[16].

Наваградскіе знаходкі, як і ўсе шыферныя прасліцы былі паўднёварускага паходжаньня. Даўняе мяркаваньне аб тым, што гэтыя вырабы вывезены толькі з Оўруча, дзе здабывалі і апрацоўвалі ружовы шыфер, пахілена пераканаўчымі матэрыяламі аб тым, што падобны шыфер апрацоўвалі ў шэрагу старажытнарускіх пунктаў (Кіеў, Суздаль, гарадзішча на Менцы, Гарадішча Вербычка ў Галіцкай зямлі)[17]. Пры тым значэньні, якое мелі сувязі Наваградка з Кіевам, наібольш верагодным прадстаўляецца, што Наваградскія шыферныя прасліцы былі прадукцыяй кіеўскіх майстэрняў.

Наваградскія прасліцы з ружовага шыферу выкарыстоўвалі ў хатняй працы. На некаторых знаходках захаваліся сляды нітак. Колькасьць іх значная, але нашмат меньшая, чым у другіх гарадах Заходняй Русі, дзе імпартных рэчаў было не так многа як у Наваградку. Так у Тураве знайдзены 232 шыферныя прасліцы, у Бярэсьці больш за 200, у Ваўкавыску 224, на Лукомльскім гарадзішчы 222, на Мінскім Замчышчы толькі за сезон 1959 г. сабрана 234 прасліцы, а з Верхняга Замка ў Полацку паходзіць 451 экземпляр прасліц з ружовага шыфера[18].

Вялікая колькасьць шыферных прасліц у заходнерускіх гарадах нагадвае аб палажэньні В.Л. Яніна аб тым, што ў безманетны перыяд XII-XIV стст. ролю дробных сродкаў абароту выконвалі тавара-грошы, у ліку якіх былі шыферныя прасліцы[19]. Тая акалічнасьць, што ў Наваградку з яго актыўнымі знешнімі сувязямі, колькасьць шыферных прасліц заўважна саступала колькасьці гэтых рэчаў у другіх заходнерускіх гарадах і разам з тым, у нашым горадзе знайдзена больш гірак, у параўнаньні з астатнімі гарадамі Заходняй Русі, можа азначаць, што наваградцы ў большай ступені карысталіся эквівалентам у выглядзе металу.

З ружовага шыфера зроблены дзьве біканічныя пацеркі, а таксама тачыльны камень[20]. Шыферныя культавыя знаходкі будуць разгледжаны ў адпаведнай главе.

Побач з паліванай керамікай з каляровай гліны, каторую ў Наваградку выраблялі мясцовыя рамеснікі, і, як мы спрабавалі паказаць, у некаторай ступені прыезжыя кіеўскія майстры, у

горадзе пабытаваў бела-гліняны паліваны посуд (мал.). У ваколіцах Наваградка няма выхадаў белай гліны і таму няма падстаў лічыць бела-гліняныя пасудзіны этага гораду мясцовай прадукцыяй.

Вытворчасьць керамікі з белай гліны ў Кіеве і гарадах паблізу яго распачалося ў XI ст., а магчыма і ў канцы X ст.[21] Гэта дае магчымасьць бачыць у наваградскім бела-гліняным посудзе паўднёварускі імпарт, уключыўшы туды нешматлікую непаліваную кераміку з белай гліны. Падобная атрыбуцыя дадзена ваўкавыскаму бела-глінянаму паліванаму посуду. Адзначым падобную кераміку з Віцебска і Слоніма[22]. Істотна, што нават у Любечы, які экспартаваў паліваны посуд з каляровай гліны, бела-гліняная паліваная кераміка была прывазная[23].

Важным артыкулам наваградскага імпарту з'яўляецца шкляны посуд, што зроблены ў кіеўскіх майстэрнях. Ён даволі добра вядомы ў літаратуры. Значную частку пасудзін, знайдзеных на Малым Замку, характэрызавала Ю.Л. Шчапава (надрукавана ў кнізе "Старажытны Наваградак")[24]. Аднак тэму аб шкляных пасудзінах старажытнарускага паходжаньня нельга лічыць вычарпанай.

За час раскопак у Наваградку знайдзены фрагменты, якія належалі 70 пасудзінам, звараным па старажытнарускім каліева-свінцова-крэмнязёмным рэцэпце. Амаль усе знаходкі належаць да Малога Замка. На Замкавай гары сустракаюцца абломкі пяці пасудзін, з іх толькі адно донца і венчык даюць прадстаўленьне аб форме пасудзін.

Наібольш распаўсюджанай формай пасудзін з'яўляюцца келіхі, ад якіх захоўваецца часьцей за ўсё паддон (мал.). Такіх келіхаў было 36. У асобных пабудовах яны сустракаліся ў некалькіх экзэмплярах[25]. У заходнерускіх гарадах келіхі на паддоне вядомыя ў Полацку, Тураве, Пінску і Бярэсьці[26].

Варонкападобныя гладкія і рыфлёныя келіхі з вострым донцам (6 экзэмпляраў). Шкло іх безколернае, у адным выпадку блакітнае. Гэты тып пасудзін у Наваградку з'явіўся раней за іншыя. Донца такаго келіха знайдзена ў пабудове другой паловы XI ст. Наібольш позні варонкападобны келіх адносіўся да другой паловы XII ст.[27] У гарадах заходняга рэгіёну падобныя келіхі вядомыя ў Тураве і Полацку[28].

Шклянкападобныя пасудзіны з пятлястым венчыкам (6 экзэмпляраў). Часам такія пасудзіны мелі вертыкальныя рэбры (мал.). Паралелі ім знайдзены ў тых самых гарадах Заходняй Русі, дзе вядомыя востродонныя келіхі[29].

У пабудове Малага Замка другой паловы XII ст. знайдзена 25 абломкаў шклянога посуда з безколернага шкла, упрыгожаныя

ніцямі з блакітнага і сіняга шкла[30]. Абломкі такіх жа пасудзін сустракаліся ў культурным слоі. Форму такіх пасудзін не ўдалася аднавіць. Фрагменты шкляных пасудзін з накладнымі ніцямі знайдзены ў Тураве[31]. Ножку пасудзіны, анаментаваную паласой фіялетавага шкла і верхнюю частку чаркі з выступаючым рэльефам, можна супаставіць са знаходкамі з Полацка[32].

Астатнія наваградскія пасудзіны, выраблены па старажытнарускім рэцэпце, пакуль не маюць аналогій. Гэта гаршкападобныя (5 экзэмпляраў) (мал.), колбы (5 экзэмпляраў), рыфлёны флакон, упрыгожаны фіялетавай шкляной спіральлю, абломак бірузовай пасудзіны з акруглымі сьценкамі, талерка, унутраная частка якой упрыгожана карычнева-фіялетавай эмальлю, абломак тоўстасьценнай пасудзіны з валікам (мал.) і інш.[33]

У літаратуры агульнапрызнана кіеўскае паходжаньне Наваградскіх пасудзін, зробленых з каліева-свінцова-кремнязёмнага шкла, як і такіх жа пасудзін з іншых заходнерускіх гарадоў. Жаданьне беларускага мастацтвазнаўцы М.М. Яніцкай у Наваградскім шкляным посудзе бычыць мясцовую прадукцыю, не мае падстаў[34]. У Кіеве адкрыты майстэрні, вырабы якіх блізкія да наваградскіх. Так на тэрыторыі “гораду Яраслава”, былі: востродонны келіх, бакалы на паддоне, пасудзіны, упрыгожаныя шкляной ніткай і інш. На тэрыторыі Падолу выраблялі чаркі і іншыя шкляныя пасудзіны. Такі ж малюнак назіраецца і ў майстэрнях Кіева-Пячорскай лаўры[35].

Аб ваконным шкле багатых дамоў вакольнага гораду мы гаварылі ў главе 3 (с. 00). У дадатак трэба адзначыць, што безколерныя з жаўтаватым адлівам ваконныя шліскі па колеру і фактуры шкла надзвычай падобныя да кіеўскага шкляного посуду. Падобны і рэцэпт вырабу абодвух відаў шкляных вырабаў. Асобныя фрагменты наваградскага ваконнага шкла, звараны з дамесам кальцыя. Гэта, на думку Ю.Л. Шчапавай, сведчыць аб тым, што такое шкло вышла з майстэрняў грэчаскіх майстроў, якія перасяліліся ў Кіеў[36]. Акрамя Кіева, ваконнае шкло выраблялі і ў Пераяслаўлі[37].

Ваконнае шкло з’яўляецца ў Наваградку амаль адначасова са шклянымі кіеўскімі пасудзінамі. Калі самы раньні востродонны келіх належыць да наваградскага жылога дому другой паловы XII ст., то ваконныя дыскі зафіксаваны ў першай палове XII ст. адразу ў трох дамах. Яны прыбывалі ў Наваградак напрацягу ўсяго XII і першай паловы XIII вв.[38]

Вялікая колькасьць ваконнага шкла на Малым Замку Наваградка выводзіць гэты горад на першае месца па колькасьці знаходак такога кшталту, што тлумачыцца канцэнтрацыяй на

дадзенай тэрыторыі багатых жылых дамоў. На Замкавай гары жылыя пабудовы знаці не трапілі ў наш раскоп і таму там не знайдзена ні аднаго фрагмента ваконнага шкла, хаця няма сумненьня, што і на дзяцінцы дамы яго сацыяльных вярхоў былі зашклёныя. Знаходкі ваконнага шкла ў заходнерускіх гарадах Ваўкавыску і Тураве паходзяць менавіта з тэрыторыі іх дзяцінцаў[39].

Значны аб'ём шклоробчых работ майстэрні Кіева-Пячорскай лаўры, дзе, побач са шкляным посудам было знайдзена шмат ваконнага шкла[40], ідэнтычнага наваградскаму, не пакідае сумненьня ў тым, што шкляныя пасудзіны і ваконныя дыскі Наваградка былі дастаўлены з Кіева.

Шкляныя ўстаўкі (10 экзэмпляраў). Зробленыя, пераважна, з сіняга альбо зялёнага шкла, маюць авальную, акруглую, подтрохвугольную альбо квадратную форму. З сямі ўставак, якія былі прааналізаваны, пяць былі зроблены ў старажытнарускіх майстэрнях. Такія знаходкі, па матэрыялах Малага Замка, пабытавалі ў Наваградку з другой паловы XII ст.[41] Да асобна знайдзеных уставак трэба далучыць чатыры сэрцападобныя з зялёнага шкла, устаўленыя ў срэбныя з пазалотай бляшкі[42]. Яны таксама былі зроблены з каліева-свінцова-крэмнезёмнага шкла. Шкляныя ўстаўкі разнастайных формаў знайдзены ў Полацку, Ваўкавыску, Тураве і Гродне. У апошнім, вялікія па сваіх памерах (дыяметр да 3 см.) устаўкі, верагодна, упрыгожвалі кнігі[43].

У Наваградку і яго навакольлі знайдзена шмат шкляных пацерак. З пабудоў і культурнага слоя паходзяць 253 знаходкі. Пры гэтым на Замкавай гары знайдзена толькі восем пацерак. Нітка з бісера ў колькасьці 90 штук была знайдзена пры пахаваньні на хрысьціянскіх могілках Малага Замка[44]. Больш за 500 бісерных пацерак знайдзена ў наваградскім курганным магільніку. Асобныя ніткі мелі да 150 пацерак. У іншых курганах шкляные пацеркі сустракаюцца ў невялікай колькасьці[45]. У масе шкляных пацерак пераважаюць вырабы старажытнарускага, больш дакладна кіеўскага паходжаньня, зробленыя са свінцовага альбо каліева-свінцовага шкла. Пры вывучэньні старажытнарускіх шкляных пацерак Наваградка і яго ваколіц, выкарыстаны дадзеныя аналагічных знаходак, хімічны аналіз рабілі М.Ф. Фехнер, Ю.Л. Шчапава і З.А. Львова. Старажытнарускія пацеркі Наваградка і яго ваколіц маюць паралелі ва ўсіх заходнерускіх гарадах і іншых помніках, даследаваных на тэрыторыі Беларусі. Гэта пазбаўляе ад неабходнасьці паказваць паралелі для кожгага тыпу нашых пацерак.

Старажытнарускія пацеркі прадстаўлены наступнымі тыпамі:

Бітрапецэпадобныя (8 экзэмпляраў). Зроблены з сіняга і зялёнага шкла. Наібольш раньняя пацерка дадзенага тыпу знайдзена ў пабудове другой паловы XI ст.[46] Хімічны аналіз паказаў, што шкло адной з такіх пацерак было свінцова-крэмнезёмнае.

Шарападобныя (12 экзэмпляраў). Сярод знаходак пераважалі вялікія пацеркі (дыяметр да 1,5 см) (мал.). Зробленыя з жоўтага, сіняга, зялёнага, фіялетавага шкла. Шкло безколерных пацерак часам нагадвае ваконнае і шкло пасудзін. Наібольш раньняя шарападобная пацерка знайдзена ў Наваградскім магільніку[47]. Як разавыя знаходкі такія пацеркі сустракаліся на працягу ўсёй гісторыі старажытнарускага гораду. Жоўтыя шарападобныя пацеркі, як паказалі аналізы, зроблены з каліева-свінцова-крэмнезёмнага шкла.

Зонныя (39 экзэмпляраў) (мал.). Пераважаюць пацеркі з сіняга і зялёнага шкла, едзінкава сустракаюцца жоўтыя і безколерныя. Адна пацерка зроблена з чырвонага шкла. Зонныя пацеркі сустракаюцца ва ўсіх слаях старажытнарускага гораду. Знаходка з перадмацерыковага слоя была буйнейшай за астатнія (дыяметр 1 см.). У пабудове першай паловы XII ст. сустракаюцца жоўтыя зонныя пацеркі, а для жылых дамоў другой паловы XII і для XIII стст. характэрныя сінія і зялёныя. Хімічны аналіз зоннай пацеркі вядомы для знаходкі з фіялетавага шкла, якое было каліева-свінцова-крэмнезёмнае[48]. Фіялетавых зонных пацерак у Наваградку не было, але, верагодна, склад нашых пацерак быў такі самы. Зонныя пацеркі Наваградка, што належалі да часу да сярэдзіны XII ст. былі, бясспрэчна, кіеўскага паходжаньня. Што датычыць знаходак больш позняга часу, то яны маглі быць зроблены і ў другіх гарадах, паколькі ў гэты час выраб пацерак распаўсюджваецца ў шэрагу помнікаў Старажытнай Русі[49].

Пранізкі — двайныя і трайныя (9 экзэмпляраў) з сіняга, зялёнага і жоўтага шкла (мал.).

Пацеркі з абадком і пласцінкавым арнаментам (6 экзэмпляраў). Яны распісаны хвалістымі лініямі зялёнага, жоўтага і карычневага колераў. З'яўляюцца ў Наваградку ў пабудовах другой паловы XII ст.[50] Пацеркі з пласцінкавым арнаментам падрабязна апісала Ю.Л. Шчапава, уключыўшы і наваградскія знаходкі. Аўтар схіляецца да думкі, што такія пацеркі выраблялі ў Кіеве, дзе ў іх вытворчасьці маглі, побач са старажытнарускімі рамеснікамі, прымаць удзел майстры грэкі. Частка ж такіх пацерак магла быць зроблена ў Ноўгарадзе[51].

Плоскія падоўжаныя — "рыбападобныя" (7 экзэмпляраў). Зроблены з бледна-блакітнага шкла, яны з'яўляюцца адначасова з пацеркамі з пласцінчатым арнаментам. У адной з пабудоў другой

паловы XII ст. знайдзена чатыры падобныя пацеркі[52]. Па складу шкла адна з “рыбопадобных” пацерак была каліева-свінцова-крэмнезёмнай[53].

Цыліндрычныя (2 экзэмпляры). Абедзве пацеркі зроблены з зялёнага шкла (мал.). Адна са знаходак уваходзіла ў інвентар пабудовы другой паловы XII ст.[54]

З агульнага ліку пацерак, да старажытнарускіх вырабаў належаць не больш за 80. Недахоп аналізаў робіць гэту карціну не поўнай. Магчыма, што некаторыя тыпы шкляных пацерак, для якіх не ўзяты аналіз, маглі быць таксама вырабамі майстроў Старажытнай Русі. Усе наваградскія пацеркі, для якіх быў зроблены аналіз, альбо якія былі супастаўлены з аналізамі такіх самых пацерак з іншых помнікаў, былі кіеўскага паходжаньня. Толькі для пацерак з пласцінчатым узорам месцам вырабу, акрамя Кіева, мог быць і Ноўгарад. Даціроўка наваградскіх пацерак старажытнарускага паходжаньня шмат чым адпавядае храналогіі пацерак Ноўгараду[55].

Шкляныя пярсьцёнкі (97 экзэмпляраў). Амаль усе, за выключэньнем адной знаходкі, сустрэліся на Малым Замку, дзе такія вырабы старажытнарускага паходжаньня з’яўляюцца не раней першай паловы XII ст.[56] У багатых пабудовах вакольнага гораду было ад 10 да 28 пярсьцёнкаў[57]. Форма іх выпуклая і плоскавыпуклая. На некаторых знаходках маюцца плоскія альбо выпуклыя шчыткі (мал.). Аднойчы знайдзены рубчаты пярсьцёнак. Колер шкла сіні, зялёны, жоўты, карычневы і фіялетавы. Адзіны цэлы пярсьцёнак быў з фіялетавага шкла. Адзначым таксама сіні пярсьцёнак, распісаны жоўтай эмаллю[58]. Шкло наваградскіх пярсьцёнкаў, мяркуючы па аналізах, што зроблены для дзевяці знаходак, свінцова-крэмнезёмнае і каліева-свінцова-крэмнезёмнае.

У шкларобчых майстэрнях Кіева пярсьцёнкі выраблялі разам з другімі шклянымі вырабамі. У адной з іх знайдзены распісаны шкляны пярсьцёнак[59]. Наваградскія шкляныя пярсьцёнкі, зробленыя па старажытнарускім рэцепце можна напэўна прылічыць да кіеўскага імпарту.

Шкляныя пярсьцёнкі даволі рэдкія знаходкі ў старажытнарускіх гарадах. Нават шматгадовыя раскопкі ў Ноўгарадзе выявілі 300 фрагментаў пярсьцёнкаў[60]. Таму каля 100 шкляных пярсьцёнкаў, што пабытавалі ў Наваградку адлюстроўваюць значную колькасьць гэтых упрыгожаньняў. Амаль ва ўсіх заходнерускіх гарадах пярсьцёнкі са шкла былі адзінкавымі знаходкамі. Толькі ў Ваўкавыску, дзе іх было больш чым у другіх гарадах Заходняй Русі, фрагменты шкляных пярсьцёнаў знайдзены ў колькасьці 12[61].

Масавымі ўпрыгожаньнямі са шкла, як і ў другіх старажытнарускіх гарадах, для наваградскіх жанчын былі шкляныя бранзалеты. На тэрыторыі Малага Замка знайдзена каля 3000 фрагментаў шкляных бранзалетаў[62]. Лік іх на Замкавай гары не паддаецца дакладнаму рахунку. За час раскопак там знайдзена 110 абломкаў (мал.). Акрамя таго, пад самым старажытным драўляным насьцілам паўночнага раскопа знайдзена скапленьне так моцна разбураных вырабаў, што шкло амаль разпалася. Цяжка было вызначыць колькі бранзалетаў тут знаходзілася.

Як адзначана ў кнізе “Старажытны Наваградак”, шкляныя бранзалеты ў нашым горадзе з’явіліся ў першай палове XII ст., і, напачатку, прыбывалі невялікімі партыямі. Вельмі шмат знаходак прыбывае ў другой палове XII ст. і аж да разгрому паўднёварускіх шкларобчых майстэрняў манголамі, гэтыя ўпрыгожаньні прывозілі ў Наваградак у вялікай колькасьці[63]. У дзьвух з трох пабудоў XIII ст. знайдзена адпаведна 44 і 320 фрагментаў шкляных бранзалетаў[64]. Для гаспадарчых будынкаў дзяцінца бранзалеты са шкла былі выпадковымі знаходкамі. Тым не меньш, там сустрэліся больш за 100 такіх абломкаў, не лічачы скапленьня такіх бранзалетаў пад драўляным насьцілам. У паўднёвым раскопе гэтай часткі гораду, дзе знаходзіліся жылыя дамы, сустрэліся больш за 90 абломкаў. 75% іх адносіліся да пабудоваў XII ст.[65]

Форма і колер бранзалетаў абедзьвух частак гораду некалькі адрозніваюцца. На тэрыторыі Малага Замка першае месца ў гаме колераў належала карычневаму шклу. Далей ішлі зялёнае, сіняе, бірузовае, фіялетавае і жоўтае. Пераважалі кручаныя. Другое месца належала гладкім, трэцяе — плоскавыпуклым. Астатнія формы (трохвугольная, вітая, рыфлёная) сустракаюцца даволі рэдка. У жылых пабудовах Замкавай гары адразу за карычневымі і зялёнымі, ішлі фіялетавыя, а на тэрыторыі гаспадарчых будынкаў другое месца пасля карычневых займалі бранзалеты з безколернага шкла. Па форме шкляные бранзалеты Замкавай гары прадстаўлены, галоўным чынам, гладкімі. Вельмі рэдка сустракаюцца бранзалеты з каляровай аплёткай — даволі частыя знаходкі вакольнага гораду.

111 шкляных бранзалетаў Наваградка былі падвергнуты хімічнаму аналізу. З 63 бранзалетаў вакольнага гораду 80% зроблены з каліева-свінцова-крэмнезёмнага шкла, 5% з каліева-крэмнезёмнага і 5% звараны па “антычным” рацэпце з натрыева-кальцыева-крэмнезёмнага шкла. Усе 4% шкляных бранзалетаў дзяцінца мелі шкло каліева-свінцова-крэмнезёмнага складу.

Асаблівасьцю наваградскай калекцыі шкляных бранзалетаў

з’яўляецца тое, што такія ж знайдзены на вясковым паселішчы Гардзілоўка. Сустракаюцца абломкі 11 вітых і гладкіх бранзалетаў фіялетавага, блакітнага і зялёна-карычневага колераў. Адзін фрагмент з безколернага шкла[66]. Знаходкі ў Гардзілоўцы пахіснулі замацаваную ў літаратуры думку А.У. Арцыхоўскага аб тым, што шкляные бранзалеты насілі толькі гаражанкі[67]. Тое, што жанчыны з вясковых паселішчаў карысталіся шклянымі бранзалетамі падцвярджаюць матэрыялы селішчаў Чарнігаўшчыны[68].

Па колькасьці шкляных бранзалетаў, як і па іншых вырабах са шкла, Наваградку належыць першае месца сярод заходнерускіх гарадоў. Наібольшая колькасьць такіх упрыгожаньняў, што знайдзены ў Мінску і Тураве (1100 і 1600 экзэмпляраў)[69] складае меньш за палову шкляных бранзалетаў, што паходзяць з Наваградка.

Хімічны аналіз шкла наваградскіх шкляных бранзалетаў пераканаўча сведчыць аб кіеўскім паходжаньні пераважнай колькасьці гэтых вырабаў. Магчыма, што сярод 5% шкляных бранзалетаў Малага Замка, што зроблены са свінцова-крэмнезёмнага шкла, былі вырабы з іншых, у прыватнасьці заходнерускіх гарадоў. Гэта, перш за ўсё, Полацк, дзе існавала ўласная вытворчасьць бранзалетаў[70]. Ёсьць мяркаваньні, што акрамя Полацка, вытворчасьць шкляных бранзалетаў была і ў іншых заходнерускіх гарадах: Гродне, Віцебску, Гомелі і гарадзішчы Свіслач[71]. Аднак аналіз наваградскіх бранзалетаў, які зрабіла Ю.Л. Шчапава, дазваляе аўтару зазначыць іх падабенства са знаходкамі з Мінска і Ваўкавыска па каларыту і паходжаньню, мяркуючы, што ў гэтыя гарады бранзалеты дастаўлялі карабейнікі кіеўскага паходжаньня[72].

Наваградскія шкляныя вырабы старажытнарускага паходжаньня дазваляюць прыйсьці да наступнага заключэньня: посуд, ваконнае шкло, устаўкі-“вочкі”, пацеркі, пярсьцёнкі і бранзалеты, якія мяркуючы па рэштках вытворчасьці выраблялі ў адных і тых самых кіеўскіх майстэрнях, прывозілі ў Наваградак бесперапынна з канца XI ст. і да таго часу, калі Кіеў спусташыла мангольскае нашэсьце. Першапачаткова колькасьць кіеўскіх шкляных вырабаў была невялікая. Масавы імпарт рэчаў са шкла пачынаецца, прыкладна, з другой чвэрці XII ст., калі ў яго склад уваходзіць ваконнае шкло, устаўкі, пярсьцёнкі, разнастайны шкляны посуд і бранзалеты. Усё гэта багата прадстаўлена ў заможных дамах на Малым Замку і, натуральна, у меньшай ступені ў простых дамах і гаспадарчых пабудовах на Замкавай гары.

Майстэрні Кіева, адкрытыя ў межах “гораду Яраслава”, на

тэрыторыі Пячорскага і Міхайлаўскага манастыроў і на Падоле, як лічаць кіеўскія археолагі, “сведчаць аб значнай і высокаарганізаванай вытворчасьці шкла, якая задавальняла патрэбы не толькі Кіева, але і другіх гарадоў Русі XII-XIII стст.”[73] Апошняе палажэньне ў поўнай меры датычыць Навагрaдка.

Апраўдана было б мяркаваць, што сярод навагрaдскіх шкляных вырабаў, перш за ўсё, бранзалетаў, павінны былі быць рэчы з тэрытарыяльна блізкіх заходнерускіх гарадоў, дзе іх выраблялі. Калі б гэта было так, то ў Навагрaдку шкляные бранзалеты, якія выраблялі яшчэ ў XIV ст. (Полацк, Свіслач), былі б знайдзены ў слаях, датаваных паслямангольскім перыядам. Але там іх няма, і, такім чынам, шкляныя бранзалеты Навагрaдка, як і іншыя вырабы са шкла, былі прывезены з Паўднёвай Русі.

Прадукцыя Кіева, Кіеўскай і іншых паўднёварускіх земляў прадстаўлена ў Навагрaдку рознымі індывідуальнымі знаходкамі. Гэта срэбная завушніца з трыма напускнымі зярнёнымі пацеркамі (мал.), што знайдзена на Замкавай гары. Падобныя ўпрыгожаньні — частыя знаходкі ў скарбах Кіева і Княжай гары[74]. Аб падабенстве Навагрaдскіх упрыгожаньняў з паўднёварускімі ішла гаворка ў нашай кнізе. Гэта — бронзавы медальён з устаўкай, плецены бранзалет з тонкага дроту, абломак бронзавага бранзалета з заканчэньнем у выглядзе полай трубкі і інш.[75] Да вырабаў кіеўскіх майстроў быў аднесены таксама срэбны пярсьцёнак з чэрньню. У сувязі з выхадам у свет працы Т.І. Макаравай, што прысвечана чарненьню ў Старажытнай Русі[76], спынімся ізноў на дадзенай знаходцы. Пярсьцёнак вузкі з прамавугольным шчытком, у сярэдзіне якога ў раме паказаны завіток[77], у каталогу Т.І. Макаровой паралеляў не мае. Па тыпалогіі Т.І. Макаравай навагрaдская знаходка належыць да другога тыпу, а па характару арнаменту да падтыпу з рапартам бардзюра з лазы[78]. Пасля супастаўленьня з іншымі рэчамі, пярсьцёнак з черню ўпэўнена можна разглядаць як выраб кіеўскага майстра. Арыгінальная бронзавая праразная накладка, са стылізаванымі галовамі жывёлаў, разеткамі і крынападобнымі фігурамі[79], якую, на нашу думку, трэба звязываць з вырабамі кіеўскага майстра.

Ёсьць падставы лічыць, што бронзавыя часткі люстраў-хорасаў таксама былі зроблены ў Кіеве. Зробленыя з алавяністай бронзы, яны маюць той жа хімічны склад металу, з якога зроблены навагрaдскія матрыцы, а кіеўскае паходжаньне апошніх не выклікае сумненьня.

Дзьве Навагрaдскія знаходкі паходзяць з Княжай гары. Гэта бронзавая прамавугольная спражка з акруглымі бакамі,

упрыгожаная касымі крыжамі[80] і абломак бронзавага люстэрка (мал.). У свой час на Княжай гары была адкрыта майстэрня па вытвочасьці металічных люстэрак, дзе побач з гатовымі вырабамі знайдзены ліцейны брак[81]. Верагодна, што імпартам з поўдня была бронзавая абоймачка, адлітая ў адной форме з вырабам з гарадзішча Ленкавечкі ў Галіцкай зямлі[82]. Да пералічаных вырабаў далучым перакрыжаваньне шаблі паўднёварускага паходжаньня, аб якім гаварылася ў главе аб ваеннай справе.

Сярод матэрыялаў Замкавай гары, з якімі працавалі жыхары Наваградка, ёсьць горны крышталь. Радовішча яго вядома на Украіне, а ў Кіеве мела месца яго апрацоўка[83]. Не выключана, што горны крышталь Наваградка трапіў туды таксама з Кіева.

З ружовага шыфера паўднёварускага паходжаньня зроблены асобныя культавыя прадметы. Нямала такіх вырабаў, выплаўленых з бронзы, выйшлі з кіеўскіх майстэрняў. Яны будуць разгледжаны ў наступнай главе.

Прыведзеныя матэрыялы паказваюць, што ў сваіх знешніх сувязях Наваградак быў цесна і актыўна звязаны з Кіевам і другімі паўднёварускімі землямі. Разам з тым, Кіеў быў не толькі пастаўшчык тавараў, якія выраблялiся ў яго майстэрнях і суседніх землях, але і буйным цэнтрам транзітнага гандлю. Гэты бок наваградска-кіеўскіх адносін мы паспрабуем характэрызаваць на матэрыяле іншаземных тавараў.

Сувязі Наваградка з іншымі заходнерускімі землямі і з тэрыторыяй Паўночнага Захаду і Паўночнага Усходу праяўляюцца, галоўным чынам, у асобных знаходках. Пэўныя кантакты існавалі з роднасным па культуры Ваўкавыскам. Гэта асабліва адчуваецца па матэрыялах канца X - пачатку XI стст., калі, як адзначалася ў главе 2, частка першапачатковага насельніцтва Наваградка перасялілася з Ваўкавыска, які быў заселены трошку раней. Магчыма, што з Ваўкавыска, дзе кастарэзнае рамяство было больш развітае чым у нашым горадзе[84], прывозілі аднабаковыя грэбні (мал.), накладкі для лука і некаторыя іншыя вырабы, выраб якіх патрабаваў працы кваліфікаваных кастарэзаў.

Цікавая знаходка з Гродна — абломак даламітавай формы XII ст. для адліўкі шкляных пацерак[85], дазваляе мяркаваць, што частка пацерак зоннай формы маглі быць дастаўлены з гэтага гораду. Зярнёныя металічныя пацеркі, якія лічацца характэрнымі ўпрыгожаньнямі дрыгавічоў, знайдзены ў абедзьвух частках гораду і ваколічных магільніках[86]. Такія ўпрыгожаньні, як лічыць Б.А. Рыбакоў, магчыма, выраблялі ў Тураве[87].

Бронзавыя трохпяцельчатыя прывескі і зорчатая спражка з белага металу, паходзяць з тэрыторыі, занятай радзімічамі. У

Наваградку яны з'яўляюцца ў раньнюю пару гісторыі гораду[88]. Цэнтрам вытворчасьці прывесак у форме лыжачкі быў Смаленск і яго ваколіцы[89].

У вялікай яме, што выкапана ў мацерыку на гары знайдзены віты срэбны бранзалет з абламанымі канцамі (мал.). Бронзавы бранзалет такой жа формы, з петлямі на канцах, знайдзены ў ваколіцах Наваградка, каля вёскі Гарадзечна, і паходзіць, верагодна, з кургана[90]. Падобныя бранзалеты характэрныя для Ноўгарада, а таксама для Наўгародскіх славенаў, крывічоў і вяцічаў[91]. Не выключана, што наваградскія знаходкі былі дастаўлены з Ноўгараду, хаця актыўных сувязяў з гэтым горадам у матэрыяльнай культуры Наваградка не назіраецца. Магчыма, што з этага ж гораду паходзіць абломак паліванай керамікі з падглазурным роспісам, які М.У. Малеўская лічыць характэрнай для Ноўгараду[92]. З Ноўгараду альбо Старой Рязані паходзіць абломак пісанкі з чорнай палівай, якая арнаментавана фігурнымі скобкамі[93]. З паўночна-заходнімі землямі Старажытнай Русі звязаны дзьве знаходкі, якія належаць да раньняга паселішча — абломак навершыя касьцянога грэбня ў форме жывёлы і жалезны паясны кручок, які заканчваецца выявай конскай галавы[94].

Цяжка паказаць месца вырабу бронзавай вухавёрткі, якая захавалася ў выглядзе вітага стрыжня і навершыя з фігурай сабакі. Аналагічная вухавёртка знайдзена ў гарадзішчы на Менцы. Несумненна, што абодва вырабы зроблены ў адным месцы.

Іншаземныя прывазныя вырабы.

Наваградскій імпарт з краін, што ляжалі за межамі Старажытнай Русі, разгледзім пачынаючы з суседняй Прыбалтыкі. Аб прадметах узбраеньня, прывезеных з вобласьці куршаў адзначалася ў главе аб вайсковай справе. Па даўняй традыцыі, пастаўшчыком бурштына лічацца прыморскія тэрыторыі Прыбалтыкі. У савецкай літаратуры выказана мяркаваньне, што ў старажытнарускіх гарадах побач з прыбалтыйскім мог выкарыстоўвацца бурштын, радовішча якога меліся на Дняпры і Прыпяці[95]. У гэтым выпадку дарэчы прывесьці выснову З.М. Сяргеевай аб тым, што павелічэньне знаходак бурштыну ў заходнерускіх землях з канца XI да XIII стст. супадае з актывізацыяй руска-прыбалтыйскіх адносін[96]. Таму няма падстаў сумнявацца, што бурштын у заходнерускія землі і, адпаведна, у Навагрудак, прыбываў з Прыбалтыкі.

У канцы 1 і пачатку II тысячагоддзя з Прымор'я і

заходнеславянскіх зямляў у Літву, праз пасрэдніцтва прусаў пывозілі срэбра, якое апошняя пастаўляла Латвіі[97]. Ці магла Літва пастаўляць гэты шляхетны метал у блізка адстаячы ад яе Наваградак? Гэта тым больш верагодна, што лентападобны срэбрны злітак аб якім успаміналася ў главе 3, аналагічны прыбалтыйскім знаходкам.

З розных абласьцей Прыбалтыкі прывезены ў Наваградак металічныя ўпрыгожаньні. Часьцей за ўсё гэта бронзавыя падковападобныя спражкі. У перадмацерыковым слоі Малага Замка знайдзена буйная спражка з варонкападобнымі галоўкамі. Блізкая да яе па форме паходзіць са скарбу ў Цэльміню (Латвія) [98]. На Малым Замку і Замкавай гары сустрэлася па бронзавой фібуле з заканчэньнямі ў форме галовак маку (мал.). Больш за 500 такіх фібул налічваецца ў Летуве[99]. Бронзавыя фібулы з патоўшчанымі канцамі, што праніклі ў Наваградак і Суляцічы пад горадам і, знайдзеныя ў шэрагу заходнерускіх гарадоў (Стары Барысаў, Лукомль, Браслаў, Гродна, Слонім), таксама характэрныя для Літвы[100]. Да старажытнасьцяў гэтых земляў таксама трэба аднесьці бронзавыя масіўныя пярсьцёнкі (мал.) [101] і акруглыя гладкія і тардзіраваныя фібулы[102].

У Наваградак трапляюць рэчы з тэрыторыі, занятай латгаламі. Гэта бронзавае чатырохчасткавае ўпрыгожаньне[103], падковападобная бронзавая вітая фібула (мал.)[104] і прывескі ў форме калпачкоў[105]. Сувязі з гэтай групай прыбалтыйскага насельніцтва праяўляюцца ў перанясеньні іх арнаменту на Наваградскія бытавыя нажы.

Да раньняга перыяду гісторыі Наваградка належыць бронзавая крыжападобная булаўка, пакрытая срэбрам і чэрню. Гэта ўпрыгожаньне тыповае для мацерыковай Эстоніі[106]. Без удакладненьня месца паходжаньня да імпарту з Прыбалтыкі трэба аднесьці асобныя бронзавыя спіралькі[107].

Пры разглядзе пытаньняў сувязі Наваградка з Прыбалтыкай ёсьць магчымасць мяркаваць, што наш горад не толькі атрымліваў упрыгожаньні з Літвы, але і ў сваю чаргу мог адпраўляць туды сваю прадукцыю. У склад літоўскіх скарбаў, што знайдзены ў Стоклішках і Гелегодзе ўваходзілі прывескі ў форме лілеі (крыну) і полыя металічныя пацеркі. Гэтыя скарбы О. Навіцкайтэ-Кунцэне, Е. Антаневіч і Р. Валкайтэ-Кулікаўскене абаснавана звязваюць з Кіеўскай зямлёй. У сувязі са знаходкамі ў Наваградку матрыц кіеўскага тыпу, сярод якіх былі матрыцы, прызначаныя для цісненьня прывесак у форме крыну і полых пацерак, не выключана, што знаходкі ў Летуве мелі не толькі кіеўскае, але і наваградскае паходжаньне[108]. Пры суседстве і жывых сувязях Наваградка з літоўскімі землямі такое мяркаваньне цалкам

рэальнае.

Паспрабуем разгледзець тыя прывазныя вырабы Наваградка, якія былі прывезены з краін Паўночнай, Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Пастаўшчыком медзі для Ноўгараду і Латвіі лічыцца Швецыя[109]. Магчыма, што старажытнарускі Наваградак таксама атрымоўваў медзь з гэтай краіны. Паўночнае аблічча мае касьцяны футаляр для грэбня са “сьцяжкамі”, які належыць да раньняй гісторыі Наваградка[110]. Такі арнамент ёсьць на футалярах і грэбнях Біркі, Латвіі і Старай Ладагі. Э.Д. Шнорэ лічыць, што вырабы з такім арнаментам былі прывезены з паўднёвага берагу Балтыйскага мора[111]. Магчыма, што скандынаўскімі з’яўляюцца некаторыя наваградскія аднабаковыя грэбні з накладнымі пласцінкамі, якія прымацаваныя цвічкамі. Падобныя распаўсюджаны ў Старажытнай Русі, а таксама Швецыі, Германіі і Польшчы[112].

Асобныя знаходкі з Наваградка можна разглядаць як падражаньне скандынаўскім вырабам. Напрыклад жалезная спражка з увагнутымі бакамі, што знайдзена ў пабудове канца X ст. Аналагічная паходзіць з Ваўкавыска, дзе скандынаўскія знаходкі больш выразныя чым у Наваградку. Спражкі такой формы вядомыя ў Бірке. Там яны інкруставаны срэбрам[113]. Бронзавая крыжападобная прывеска з прымацаваным вушкам таксама магла быць падражаньнем паўночным упрыгожаньням. Прывескі такой формы знайдзены ў Бірке, а ў нашай краіне, яны вядомыя ў Кіеўскім некропалі, у пахаваньні, дзе побач з другімі рэчамі, былі шкарлупападобныя фібулы[114].

Цяжка сказать аб знаходках наканечнікаў жалезных ланцэтападобных стрэлаў — ці праўляюць яны скандынаўскі ўплыў. У блізкім па культуры Ваўкавыску ланцэтападобныя наканечнікі спалучаліся з другімі скандынаўскімі знаходкамі адной з частак паселішча — Муравельніка (антрапаморфныя прывескі, ключ, шпоры)[115].

Бронзавая булаўка з культурнага слоя Наваградка з навершыем у выглядзе фігуркі птушачкі, нагадвае булаўкі Фінляндыі[116].

У кнізе “Старажытны Наваградак” выказана мяркаваньне аб тым, што каляровыя металы ў наш горад прывозілі не толькі з Паўночнай, але і з Цэнтральнай Еўропы. Калі лічыць, што Паўночна-заходняя і Заходняя Русь карысталіся каляровымі металамі з адных і тых самых зямляў, то гэта мяркаваньне падмацаванае знаходкамі бясспрэчна польскага свінца ў Ноўгарадзе[117]. Дакладнае вызначэньне крыніц каляровых металаў ускладняецца тым, што яны былі розныя. Да таго ж

мясцовыя рамеснікі свабодна іх змешвалі[118].

Невялікая группа керамікі першапачатковага Наваградка, упрыгожаная рамбічным і авальным штампам, адлюстроўвае кантакты наваградцаў з заходне-славянскімі зямлямі[119]. Хаця гэта маглі быць не столькі кантакты, колькі перасяленьне ў Наваградак асобных груп мазаўшан, якія выраблялі падобны посуд.

З польскай тэрыторыяй звязана акругла-прамавугольная жалезная спражка са срэбнай насечкай (мал.). Блізкая ёй па форме і арнаментацыі спражка знайдзена ў каменным магільніку Чарна Велька на тэрыторыі Польскага Падляшша[120]. Да старажытнасьцяў Польшчы мы адносім таксама прыгожа арнаментаваны касьцяны ігольнік[121]. Тыповымі знаходкамі ў польскіх скарбах з'яўляюцца бронзавыя пацеркі — шарападобныя з дробнай зерню і авальная са сканай ніткай паблізу адтулін[122].

Праз Польшчу альбо Паўднёва-Усходнюю Прыбалтыку трапіла ў Наваградак бронзавая чара са слядамі шматлікіх рамонтаў. Наваградская знаходка ідэнтычная чары з магільніка Стэфанова Вейгероўскага павету[123].

У Наваградку маецца невялікая колькасьць фрагментаў шкляных пасудзін заходнееўрапейскага паходжаньня, шкло якіх з'яўляецца каліева-кальцыева-магніева-крэмнезёмным. З Замкавай гары (дзяцінца) паходзіць абломак тоўстасьценнай гранёнай пасудзіны з безколернага шкла, з вертыкальнымі палосамі, што нанесены белай эмаллю (мал.). У вакольным горадзе заходнееўрапейскія пасудзіны мелі петлепадобныя венчыкі. Да гэтай групы посуду належаць таксама фрагменты з бязколернага тоўстага шкла з палосамі, нанесенымі чырвонай, жоўтай і белай эмаллю[124].

Важкай знаходкай з'яўляецца тонкі залаты пярсьцёнак з чырвоным каменьчыкам. На яго абадку з перахватамі выгравіраваны лацінскія літары, з ліку якіх чытаюцца: i, v, s, d, u, n, m, a.[125] Д.А. Дрбоглав прачытаў надпіс на пярсьцёнку наступным чынам: "Jesus dominus vindicarit me" - "Ісус Гасподзь выратаваў мяне". Гэты ахоўны пярсьцёнак, трэба думаць, трапіў у Наваградак разам са сваёй уладальніцай. Да прадукцыі заходнееўрапейскай майстэрні трэба аднесьці і маленькую залатую бляшку з чырвоным камянем[126], які падобны на камень апісанага вышэй пярсьцёнка.

Заходняе паходжаньне маюць крыштальныя ўстаўкі, якія знайдзены ў пабудове першай паловы XII ст. Адна з іх плоская, а другая пірамідальная[127]. Надзвычай рэдкай знаходкай для Старажытнай Русі з'яўляецца заходнееўрапейская шкляная гемма,

знайдзеная пры раскопках Наваградскага храма. Аднак, паколькі яна звязана з духоўным жыццём гараджан, то будзе разглядацца ў наступнай главе.

Значная частка Наваградскага імпарту паходзіць з хрісьціянскага і мусульманскага Ўсходу і паўднёвага памежжа Русі. З апошнім звязаны завушніцы ў выглядзе пытальніка (6 экзэмпляраў), на двух з іх былі надзеты сінія шкляные пацеркі, а на астатнія - бронзавыя спіралькі[128]. У Ноўгарадзе і некаторых другіх старажытнарускіх помніках падобныя завушніцы належаць да XIV-XV стст.[129] У Наваградку яны з'явіліся не пазней XIII ст., бо былі знайдзены ў слоі пад пяском, што насыпаны на тэрыторыі Малага Замка, пасля разбурэньня вакольнага гораду, зафіксаванага пад 1274 г. Па ўсёй верагоднасьці, завушніцы такой формы трапілі ў Наваградак з тэрыторыі полаўцаў, дзе такія ўпрыгожаньні маглі з'явіцца ў пачатку XIII ст.[130] Аднак, завушніцы ў выглядзе пытальніка, палавецкія па сваім паходжаньні, магчыма, трапілі ў Наваградак вельмі своеасаблівым спосабам. У летапісным паведамленьні аб першым паходзе князя Данііла на гарады Панямоньня, у тым ліку і на Наваградак, сярод удзельнікаў паходу ўспамінаецца сват валынскага князя Цягак "с половци"[131]. У Заходняй Русі група паселішчаў палавецкага паходжаньня вядомая ў былой Палавецкай воласьці Брэсцкага павету Гродзенскай губерні. Цюрка-палавецкія тапонімы і імёны з цюрскімі карнямі сустракаюцца ў Каменецкім і Пружанскім районах Брэсцкай вобласьці[132]. Такім чынам, палавецкія ўпрыгожаньні Наваградка маглі трапіць з тымі полаўцамі, якія засялялі пэўныя землі Заходняй Русі і ўваходзілі ў склад валынскага войска.

З палавецкім светам звязаны жалезны выраб Замкавай гары даўжынёй 21 см., адзін канец якога заканчваецца крукам, а другі пятлёй. (мал.). Зусім ненечаканыя блізкія аналогіі знаходкі маюцца ў паўднёва-сібірскіх старажытнасьцях, дзе іх разглядаюць як крукі каб прадзёргіваць рамяні збруі. Д.Г. Савінаў лічыць, што менавіта такія крукі стылізавана паказаны на палавецкіх бабах і што рэчы гэтага тыпу былі шырока распаўсюджаны ў асяроддзі качэўнікаў у пачатку II тысячагоддзя н.э.[133]

На Малым Замку знайдзены два абломкі белагліняной керамікі, пакрытыя блакітна-зялёнай палівай з чорным роспісам. Падобная кераміка ў Старай Разані разглядаецца як прывазная з Залатой Арды[134].

Землі, падуладныя Візантыі прадстаўлены шматлікімі фрагментамі амфар. У Наваградку знайдзена каля 2750 абломкаў гэтых пасудзін., якія належалі, прыблізна, 80 амфарам. Пераважная частка, каля 2500 фрагментаў, паходзіць з вакольнага

гораду. Першыя амфары з'явіліся ў Наваградку ў самым пачатку XII ст. У пабудовах першай паловы XII ст. сустрэліся ад трох да васьмі пасудзін, а ў дамах другой паловы гэтага стагоддзя ад двух да дзесяці амфар. У пабудовах XIII ст. знайдзена ад двух да пяці амфар. Пазней, пасля таго як паўднёвыя шляхі, па якіх прыбылі амфары былі захоплены манголамі, дадзеныя пасудзіны выкарыстоўваліся ў якасьці тары.

Амфары Малага Замка М.У. Малеўская размяркавала на пяць тыпаў.

Пераважаюць амфары другога тыпу (82%) з уздутым барозчатым тулавам і дугападобнымі ручкамі (мал.). Амфары першага тыпу - грушападобныя з вузкім дном, высокім горлам і паднятымі ручкамі - складалі 8,3%. Астатнія тыпы амфар складалі ад 0,9 до 5,5%.[135] На амфарах першага, але пераважна, другога тыпаў захаваліся графіці. У адном выпадку выдрапана імя ўладальніка "Олькъсн"[136]. Імёны гаспадароў пасудзін "Гаврiло", "Доброгост", "Прокоп", часам з тумачэньнем "Ярополче віно", "Мстіславля корчага" і інш. выдрапаны на амфарах Пінска, Кіева і некаторых іншых старажытнарускіх гарадоў[137]. На Наваградскіх амфарах меліся таксама графіці у выглядзе асобных старажытнарускіх букв і геаметрычных фігур — кругоў, пяціканцовых зорак, крыжа, які ўпісаны ў круг (мал.) і іншыя выявы і простыя лініі.

Абломкі амфар знайдзены амаль ва ўсіх заходнерускіх гарадах дзе праводзілі раскопкі. Другое месца пасля Наваградка па колькасьці сустрэтых фрагментаў амфар належыць Ваўкавыску (знайдзена 1600 абломкаў)[138].

Нам ужо даводзілася адзначаць, што наваградскія амфары былі часткай інтэр'еру багатых дамоў. Таму, на Замкавай гары, дзе дамы знаці не ўдалася даследаваць, знайдзена няшмат амфар. Цікава, што ў насыпе старажытняга вала Наваградскага дзяцінца знайдзена амаль цэлая амфара. Яна належыць да самага распаўсюджанага другога тыпу.

У Наваградку пераважалі амфары большых памераў. Ёмкасьць такіх пасудзін была 19-20 літраў[139]. Запаўненьнем амфар, як можна мяркаваць па граффіці, было віно. Разам з тым імпартаваліся і іншыя тавары. Надпіс на амфары з Белаозера чытаецца як "Масло"[140]. Слова "Горуша", выдрапанае на самай старажытнай амфары з Гнёздава, Г.Ф. Карзухіна інтэрпрэтавала як паліва[141]. Амфары з нафтай вядомыя на Таманскім паўвостраве і Паўночным Каўказе[142]. Цяжка сказаць у якой меры імпарт гэтага паліва мог закрануць старажытнарускія гарады і, у прыватнасьці, Наваградак. Вялікія і моцныя амфары, пасля таго, як было выкарыстана тое, што ў іх было, працягвалі служыць як

тара. У гэтым плане цікавы надпіс (графіці) на амфары са Звенігараду на Белке, які А.А. Раціч чытаў як слова “Рожь”[143].

Амфары Навагрaдка прыбылі ў гэты горад з розных месцаў. Так амфары пятага тыпу адрозніваюцца ад іншых пасудзін дадзенага віду формай, абпалам і апрацоўкай вонкавай паверхні. Як паказаў петрографічны аналіз, цеста іх адрознівалася ад цеста астатніх амфар. Месцам вырабу гэтых амфар, па ўсёй верагоднасьці, была Тмутаракань[144]. Радзіму іншых амфар трэба бачыць на паўночным і заходнім узбярэжжах Чорнага мора. Трэба пры гэтым заўважыць, што ў Прычарнамор’і знайдзены паралелі не да ўсіх навагрaдскіх амфар. Так не маюць аналогій у Візантыі і яе правінцыях пасудзіны з маленькімі ручкамі-скобкамі. Дно некаторых з іх было амаль плоскае[145]. Тым не меньш, цеста іх падобна да цеста бясспрэчна прывазных амфар з правінцый Візантыі[146].

Асобную групу прывазной керамікі складаюць чырвонагліняныя збаны (мал.). Цеста іх падобна да цеста амфар, што паходзілі з Тмутаракані.

Шматлікія знаходкі прычарнаморскіх амфар у Навагрaдку і Ваўкавыску вылучаюць гэтыя заходнерускія гарады сярод астатніх гарадоў Старажытнай Русі. Па гэтай прывазной прадукцыі Навагрaдак і Ваўкавыск нашмат пераўзышлі Ноўгарад, дзе за ўсе гады раскопак знайдзена больш за 760 фрагментаў амфар[147] і наблізіліся да Кіева, дзе знайдзена шмат амфар, асабліва, за апошнія гады[148].

Візантыйскі шкляны пасуд Навагрaдка неаднаразова фігураваў у рускай і замежнай літаратуры[149]. Амаль усе знаходкі пасудзін са шкла апублікаваныя ў кнізе “Старажытны Навагрaдак”. Аднак, гэта такая незвычайная калекцыя ў далёкім ад Візантыі старажытнарускім горадзе працягвае прыцягваць увагу.

Падчас раскопак Навагрaдка знайдзена каля 350 фрагментаў шкляных пасудзін, зробленых з натрыева-кальцыева-крэмнезёмнага шкла. З гэтай колькасьці ў канстантынопальскіх і правінцыйна-візантыйскіх майстэрнях былі зроблены 55 пасудзін. Астатнія фрагменты належалі вырабам мусульманскага Усходу. На Малым Замку знайдзены абломкі шкла, што належалі да 50 пасудзін, на Замкавай гары было толькі пяць пасудзін, зробленых в майстэрнях Візантыі.

Навагрaдская калекцыя шклянога посуду складаецца з келіхаў, флаконаў, чар, ваз і тэхнічага посуду. Форма астатніх пасудзін засталася невызначаная.

Пераважная частка візантійскіх пасудзін была з тонкага безколернага, малочна-белага, чырвонага, сіняга, блакітнага і

зялёнага шкла, распісанага золатам, нярэдка ў спалучэньні з каляровай эмаллю. Пасудзіны ўпрыгожвалі фігуры геральдычных птушак, медальёны, запоўненыя крыжыкамі, “візантыйскія крыжыкі”, зорачкі, галінкі і іншыя выявы. Рэдкай знаходкай з’яўляецца тоўстасьценная пасудзіна — “келіх Ядвігі”, з тоўстага дымчатага шкла, дэкараваная разьбой і шліфоўкай.

Першыя візантыйскія пасудзіны з’яўляюцца ў пабудовах вакольнага гораду адначасова са шклянымі бранзалетамі, у другой чвэрці XII ст. Асартымент іх быў вельмі разнастайны. Да пабудовы 3 належаў марганцава-чырвоны келіх, распісаны золатам. Тамсама былі асклепкі шкла ад блакітнай пасудзіны. У пабудове 12 знайдзены рэшткі вазы з малочна-белага шкла, распісанай золатам, крышка ад пасудзіны ў форме сабачкі з цёмнага шкла з белымі налепамі, а таксама фрагменты пасудзін з чырвонага, сіняга і безколернага шкла. У пабудовах 18 і 19 гэтага ж часу быў іншы набор шклянога посуду. Там знайдзены фрагменты сіне-белага шкла, распісанага золатам, сіняга, упрыгожагана жоўтай эмаллю, бела-зялёнага і малочна-белага, распісанага золатам і чырвонай эмаллю[150].

Новыя формы візантыйскага шклянога посуду з’яўляюцца ў дамах другой паловы XII ст. Так у пабудове 5 знайдзены флакон з сіняга шкла, распісаны золатам і белай эмаллю, шарападобная бязколерная пасудзіна з выступам на ўнутраным баку сьценкі. Такія пасудзіны выкарыстоўваліся для сцэжваньня вадкасьцяў. У гэтай жа пабудове былі фрагменты безколернай пасудзіны на паддоне, чырвонай пасудзіны з залатым роспісам, сіняга з роспісам белай эмаллю і асклепак блакітнага празрыстага шкла. Наібольш багаты набор шкляных пасудзін паходзіць з пабудовы 10. Там пабытавалі: флакон і чара з малочна-белага шкла, распісаныя золатам і чырвонай эмаллю, флакон і чара з безколернага шкла, распісаныя золатам і “келіх Ядвігі”, а таксама абломкі пасудзін з блакітнага і малочна-белага шкла[151].

У пабудовах XIII ст. візантыйскія шкляныя пасудзіны не сустракліся за выключэньнем асобных абломкаў чырвонага шкла з залатым роспісам, верагодна, захаваныя ад больш раньняга часу. Вялікая бутыль з прамавугольным тулавам і ўвагнутым дном, зробленая з сіняга шкла[152], магла быць не толькі візантыйскага, але і блізкаўсходняга паходжаньня.

Вышэй гутарка ішла аб шкляных пасудзінах Навагрудка, вядомых па публікацыях. Спынімся на раней невядомых пасудзінах з візантыйскага шкла. На тэрыторыі Малага Замка былі знайдзены абломкі сіне-белага шкла ў спалучэньні з безколерным, гэта дазволіла аднавіць пасудзіну вышынёй 9,5 см. з кальцавой ножкай і ручкамі з безколернага шкла (мал.). У

майстэрнях Карынфу вядомыя знаходкі донцаў, ручак і сьценак[153], якія дазваляюць аднавіць форму нашай пасудзіны. Праўда, шкло карынфскіх пасудзін, у адрозеньне ад наваградскага, аднатоннае. Наваградскі бакал з ручкамі з безколернага шкла дазваляе ўспомніць сведчаньне Тэафіда (X ст.), які пісаў у сваім трактаце, што грэкі ў сваіх шкляных пасудзін "з белага жа шкла робяць і ручкі"[154]. Пасудзіна з сіне-белага шкла была ў Наваградку не адзіная. Вышэй успамінаўся абломак сіне-белага шкла распісаны золатам.

На Замкавай гары, дзе абломкі візантыйскіх шкляных пасудзін прадстаўлены донцам і сьценкамі безколернай празрыстай пасудзіны (мал.) і абломкам малочна-белай пасудзіны, распісанай золатам[155], у 1985 г. былі знайдзены венчык і сьценка ад яшчэ адной такой жа пасудзіны.

З часу першай публікацыі Р.М. Джанпаладзян аб наваградскіх шкляных пасудзінах — чырвонага келіха і сіняга флакона, большасьць савецкіх і замежных даследчыкаў уключаюць іх у лік візантыйскіх вырабаў. Англійскі даследчык А. Мігоу адзначае, што такі роспіс, як на наваградскіх шкляных пасудзінах, распаўсюджаны ў выяўленчым і прыкладным мастацтве Візантыі. Арэал сініх флаконаў, як піша вучоны, распрасьціраўся ад тэрыторыі Беларусі да Кіпру і, магчыма, Егіпту і ад Карынфа да Ірану. На думку Мігоу, сінія флаконы выраблялі ў адным цэнтры — Канстантынопалі[156]. Амерыканская даследчыца Г. Дэвідсон, якая шмат гадоў праводзіла раскопкі ў Карынфе, лічыць, што такія флаконы выраблялі ў карынфскіх майстэрнях[157].

Візантыйскі шкляны пасуд прыбываў у Наваградак напрацягу ўсяго XII ст., а потым прывоз яго спыніўся. Магчыма, гэта трэба звязваць з падзеньнем Канстантынопаля ў 1204 г. і думка А. Мігоу аб канстантынопальскім паходжаньні сініх флаконаў правільная. У святле гэтага тлумачэньня, канстантынопальскімі трэба лічыць і астатнія цудоўныя шкляные пасудзіны нашага гораду. "Кубак Ядвігі", на думку Ю.Л. Шчапавай, з'яўляецца прадукцыяй, перш за ўсё Канстанцінопальскай майстэрні[158].

Наваградская калекцыя візантыйскіх шкляных пасудзін прыкметная не толькі сваімі дасканалымі ўзорамі, але і тым, што яны прыбывалі ў горад партыямі. У горадзе налічваецца тры сінія флаконы, што распісаны золатам і белай альбо жоўтай эмальлю, столькі ж пасудзін з чырвонага шкла з залатым роспісам, не меньш чым дзве пасудзіны з сіня-белага шкла. Флаконы, чашы і вазы з малочна-белага шкла, распісаныя золатам, часам у спалучэньні з чырвонай эмальлю таксама прадстаўлены не адзінкавымі экзэмплярамі, а флакон і чару, што знайдзены ў адной пабудове, увогуле можна лічыць прадукцыяй аднаго

майстра. Абломкі зпаянага дымчатага шкла з Малага Замка, дазваляюць мяркаваць, што на вакольным горадзе Наваградка мог быць яшчэ адзін “келіх Ядвігі”. Гэта выснова асабліва важная таму, што на думку Ю.Л. Шчапавай, наваградскі келіх з’яўляецца адзінай сапраўднай сярэдневяковай знаходкай, у той час як астатнія “келіхі Ядвігі”, што захоўваюцца ў Польшчы і Заходняй Еўропе, з’яўляюцца падражаньнямі такім пасудзінам і зроблены ў XVII-XVIII стст.[159]

Перавага канстантынопальскіх вырабаў у Наваградку не значыць таго, што сярод шкляных пасудзін не было прадукцыі правінцыйных візантыйскіх майстэрняў. Звесткі аб апошніх нешматлікія і вядомыя пакуль толькі па матэрыялах Карынфу.

Знаходкі візантыйскіх шкляных пасудзін у гарадах Старажытнай Русі не шматлікія. Сярод заходнерускіх гарадоў абломкі іх сустракаюцца толькі ў Тураве[160]. Няшмат такіх пасудзін было ў Кіеве, Ноўгарадзе, Старой Разані, Ўшчыжы, Старой Ладаге, Смаленску і Гарадзішчы пад Ноўгарадам[161]. У гарадах за межамі Старажытнай Русі, якія вядомыя сваімі трывалымі сувязямі з Візантыяй, асартымент візантыйскага посуду са шкла быў невялікі. Так у Херсоне — наібуйнейшай візантыйскай калоніі ў Паўночным Прычарнамор’і, пры немалой колькасьці фрагментаў візантыйскага шкла няма тае разнастайнасьці формаў шклянога посуду, што ёсьць у Наваградку[162]. У сярэдневяковых гарадах Арменіі (Двін, Ані), якія цесна звязаныя Візантыяй, колькасьць шкляных візантыйскіх пасудзін вельмі невялікая[163].

Сярод упрыгожаньняў з натрыева-кальцыева-крэмнезёмнага шкла, да візантыйскіх вырабаў належаць сінія і блакітныя бранзалеты (15% знаходак). Вядома, што шкляные бранзалеты выраблялі ў Карынфе[164]. Візантыйскія шкляные бранзалеты сустракаюцца ў шэрагу заходнерускіх гарадоў — Віцебску, Оршы, Мінску і Ваўкавыску. Па колькасьці гэтых прывазных упрыгожаньняў бліжэй за ўсё Ваўкавыск, дзе такія бранзалеты складалі 13%[165]. Асобная група шкляных бранзалетаў прадстаўлена вырабамі, інкруставанымі шкляной крошкай, з зашчыпамі на паверхні. Аналогіі да іх сустракаюцца на поўдні нашай краіны (Саркел, Тмутаракань, Херсанэс)[166]. Іх, верагодна, таксама трэба лічыць візантыйскімі вырабамі.

Вялікую колькасьць упрыгожаньняў з натрыева-кальцыева-крэмнязёмнага шкла складаюць пацеркі. Не маючы пераканаўчых візантыйскіх аналогій, мы адносім іх да міжземнаморскага імпарту, маючы на ўвазе большы абшар, чым Візантыя і яе правінцыі.

Сярод пацерак колькасна пераважае бісер. Праўда, у

культурным слоі Малага Замка і Замкавай гары ёсьць адзінкавыя знаходкі зялёнага і жоўтага бісеру. Аднак, пры пахаваньні ачэльлі з жоўтага бісеру былі распаўсюджаным упрыгожаньнем у навагрaдцаў. У чатырох жаночых пахаваньнях гарадскога курганнага магільніка знайдзены 425 бісерныя пацеркі. Пры адным з пахаваньняў навагрaдскага магільніка на Малым Замку было ачэльле, што сабранае з 90 такіх пацерак[167]. Такім чынам, лік бісерных пацерак Навагрaдка і яго магільніка перавышае 500 экзэмпляраў бісеру. У іншых заходнерускіх гарадах бісер сустрaется адзінкава альбо ў невялікай колькасьці[168], а ў блізкім па культуры Ваўкавыску яго няма зусім.

З.А. Львова разглядае старажытнарускі бісер як імпарт з Міжземнамор'я. Верагодна, такое ж паходжаньне і нашых знаходак. Спецыфікай Навагрaдка з'яўляецца позняе пабытаваньне бісеру. У той час як у Ноўгарадзе бісер у канцы XI - пачатку XII стст. - вялікая рэдкасць[169], то на нашым помніку, як вынікае са знаходкі ачэльлья ў пахаваньні першай паловы XII ст., ён быў дастаткова распаўсюджаны.

Лімонныя пацеркі — адзінарные, двайныя і трайныя (6 экзэмпляраў). Колер іх жоўты. Мяркуючы па комплексах, такія пацеркі з'яўляюцца ў першай палове XI ст. і не выходзяць за межы гэтага стагоддзя. Аб гэтым сведчыць знаходка з кургана каля в. Мольнічы[170]. Лімонныя пацеркі знайдзены амаль ва ўсіх заходнерускіх гарадах.

Мазаічныя цыліндрычныя пранізкі (6 экзэмпляраў) (мал.). У Навагрaдку падобныя пранізкі звязаны з пачаткам існаваньня паселішча на Малым Замку. У кургане каля в. Сялец мазаічная пранізка знайдзена пры пахаваньні з абрадам трупапакладаньня[171], які ў гэтых месцах усталёўваецца не раней XI ст. Мазаічныя пранізкі — архаічны від пацерак. У Ладаге ён характэрны для культурнага слою VIII-IX стст. і радзей X ст. [172] У Навагрaдку, як можна пераканацца, такія пацеркі былі распаўсюджаны пазней. Часам да сярэдзіны XI ст. як датуецца мазаічная пацерка з Лукомля[173].

Глазчатыя (5 экзэмпляраў). На Малым Замку знайдзены чорная пацерка з рэльефным арнаментам з белага і чырвонага шкла і дзьве жоўтыя з белымі і чырвонымі кветкамі. Дзьве апошнія знайдзены ў пабудовах канца X і першай паловы XI ст. Па адной глазчатай пацерке знайдзена ў курганных магільніках[174]. Аналагічныя знаходкі вядомыя в Віцебску, Мінску, гарадзішчы на Менцы[175] і некаторых іншых заходнерускіх помніках.

Бочкападобныя з залатой пракладкай (9 экзэмпляраў). На паселішчы знайдзены толькі дзьве такія пацеркі, адна з іх у

пабудове другой паловы XI ст. Астатнія паходзяць з курганаў[176]. Аналагічныя пацеркі характэрныя для многіх гарадоў Заходняй Русі (Ваўкавыск, Віцебск, Лукомль і інш.)[177].

Адзіная срэбнашкляная цыліндрычная паходзіць з магільніка каля в. Мольнічы. У старажытнарускіх помніках падобныя пацеркі датуюцца канцом X - пачатакм XII ст.[178]

Рабрыстыя з жоўтага і сіняга шкла (4 экзэмпляры). Адна з пацерак знайдзена ў пабудове першай паловы XI ст. разам з лімоннымі і глазчатай. Больш дробныя належалі да пабудовы першай паловы XII ст.[179] Рабрыстыя пацеркі знайдзены таксама ў Віцебску, Оршы і Ваўкавыску[180].

Ягадападобныя (2 экзэмпляры). Зроблены з жоўтага і зялёнага шкла. Абедзьве пацеркі знайдзены ў пабудовах другой паловы XII ст. на Малым Замку, хаця ў літаратуры датуюцца X - пачаткам XII ст.[181]

Плоскавыпуклыя (2 экзэмпляры). Шкло іх сіняе і зялёнае. Знайдзены на Малым Замку. Адна з іх належала да пабудовы другой паловы XII ст. Разам з тым, падобныя пацеркі вядомыя ў магільніку Бірка[182].

Прызматычныя пацеркі, падражаньне сердалікавым (3 экзэмпляры), з'яўляюцца рэдкімі знаходкамі[183].

Прызматычная пацерка з сіняга шкла з беларамбічнымі ўстаўкамі (мал.). Знайдзена на Замкавай гары. Датуецца X-XI стст.[184]

Шарападобныя чорныя з хвалістай інкрустацыяй з белага, жоўтага і блакітнага шкла (3 экзэмпляры) (мал.). Падобныя пацеркі вядомыя ў Мінску і Бярэсьці[185]. У Ноўгарадзе такія пацеркі з'яўляюцца ў XII ст. і пабытуюць да XIV ст.[186]

Шарападобныя паліхромныя (3 экзэмпляры). Дзьве з іх знайдзены ў пабудове другой паловы XII ст. Паралелі такім пацеркам вядомыя ў паўднёварускіх помніках (Белая Вежа, Данецкае гарадзішча)[187].

Адзінкавымі знаходкамі з'яўляюцца зялёныя пацеркі: цыліндрычная і квадратная ў сячэньні з уключэньнем белага шкла, а таксама буйная бітрапецэпадобная з празрыстага бледна-зялёнага шкла з жалабкамі на паверхні[188].

Такім чынам, колькасьць пацерак са шкла, што зварана па "антычным" рацэпце перавышае 560 штук, з іх больш за 500 прыходзіцца на бісер, які пабытаваў в Наваградку даўжэй чым у іншых старажытнарускіх помніках.

Устаўкі (2 экзэмпляры) з зялёнага шкла (мал.). Знайдзены па адным экземпляры ў абедзьвух частках гораду.

Пярсьцёнкі (2 экзэмпляры). Абодва паходзяць з Малага Замка. Абломак пярсьцёнка з карычневага шкла з інкрустацыяй

належыць да інвентара пабудовы першай паловы XI ст. Па заключэньню М.У. Малеўскай, ён блізкі да шкляных вырабаў Закаўказзя X-XI стст.[189] Сіні пярсьцёнак, распісаны сіняй і блакітнай эмальлю, знайдзены ў пабудове другой паловы XII ст., па характару роспісу блізкі да шкляных вырабаў Карынфу і Херсанэсу[190].

Сярод знаходак Малага Замка ёсьць шаўковы пояс і абрыўкі залатых нітак, якімі магла быць разшытая якая-небудзь тканіна. Пачынаючы з XI ст. вытворчасьцю шоўка займаліся гарады Эллады і Пелапанесу, а гандль ім праходзіў праз Канстантынопаль[191].

Візантыйскія культавыя вырабы будуць разгледжаны ў наступнай главе.

Аб некаторых наваградскіх знаходках, што звязаныя з імпартам, сведчыць падражаньне рэчам візантыйскай работы. Прыкладам можа быць касьцяная пласцінка з разнымі медальёнамі, якія запоўнены васьмікутнымі зоркамі. У свой час гэта пласцінка зацікавіла А.У. Банк, якая бачыла ў ёй падражаньне пласцінкам са слановай косьці з такім самым арнаментам, імі абкладвалі выраблены ў Канстантынопалі скрынкі-ларцы.

Такая ж касьцяная пласцінка знайдзена ў Смаленску[192].

Калі наваградская, як і смаленская пласцінкі, былі вырабамі мясцовых кастарэзаў, то майстры павінны былі мець перад сабой канстанцінопальскія ўзоры. Разам з тым, такія пласцінкі маглі быць не мясцовымі, а херсанескімі падражаньнямі. У 1964 г. пры раскопках Херсанэсу былі знайдзены астаткі скрынкі, абкладзенай пласцінкамі з косьці хатняй жывёлы. Скрынка была вылажана пласцінкамі з арнаментам, аналагічным арнаменту наваградскай і смаленскай пласцінак. Васьмівугольныя зоркі ў крузе былі выразаны на пласцінцы з косьці ў сярэдневяковым пахаваньні Херсанесу[193]. Такім чынам, падобныя рэплікі візантыйскіх пласцінак слановай косьці маглі вырабляць у Херсанэсе і з гэтага гораду трапляць у Старажытную Русь.

Бясспрэчна мясцовымі падражаньнямі візантійскага паліванага посуду былі блюда і чара на паддоне (гл. мал.) з Малага Замка. Апошняя, з некалькі зменены прапорцыямі паўтарыла херсанескія ўзоры[194].

У Наваградак праніклі таксама вырабы з краін мусульманскага Ўсходу. Наібольш выразныя знаходкі — гэта шкляны і фаянсавы посуд. Спынімся на характарыстыцы шклянога посуду.

За час раскопак знайдзены абломкі ад 12 шкляных пасудзін, пяць з якіх належаць да Малага Замку і сем да Замкавай гары.

Наібольш раньняя пасудзіна знайдзена ў пабудове першай паловы XII ст., гэта сіне-зялёная рыфлёная шклянка з накладнымі ніцямі каля венчыка. Такія пасудзіны выраблялі ў Сірыі[195].

У пабудовах другой паловы XII ст. знайдзены абломкі чатырох пасудзін, з якіх дзве пасудзіны належалі да аднаго дома. Яны прадстаўлялі з сябе келіхі з безколернага шкла; роспіс золатам, а таксама белай, чырвонай і зялёной эмаллю. На адной з пасудзін ёсць рэшткі роспісу, які складаўся з геральдычных птушак у перабіўку з шасьціпялёсткавымі разеткамі, запоўненымі кропкамі (мал.). На асобных пасудзінах захаваліся арабскія надпісы[196]. Адзін з іх чытаецца як “Алі”. Магчыма, што ад падобнай пасудзіны паходзіць абломак з Замкавай гары з астаткамі пазалоты і кропкамі, нанесенымі сіняй эмаллю. Стыль роспісу і тэхніка выкананьня дазваляюць аднесьці гэтыя келіхі да вырабаў сярэдневяковай Раккі[197]. У групу больш позніх ракскіх пасудзін могуць быць далучаны фрагменты з пабудовы другой паловы XII ст. безколернай пасудзіны з астаткамі фрызу і роспісу белай, чырвонай і сіняй эмаллю і маленькі абломак сіняй пасудзіны са стылізаванымі арабскімі літарамі, нанесенымі белай эмаллю і аточаных золатам[198].

У пабудове XIII ст. Малага Замка знайдзены абломак келіха з безколернага шкла, распісанага золатам. Арнамент складаецца з пікападобных фігур і чатырохлістнікаў, аточаных чырвонай эмаллю — гэта характэрна для шкляных пасудзін, якія выраблялі ў Алеппо[199].

На тэрыторыі Замкавай гары знайдзены абломкі трох шкляных пасудзін з безколернага шкла, распісаных чырвонай і сіняй эмаллю і аточаных золатам. Роспіс двух пасудзін прадстаўлены, галоўным чынам, арабескамі (мал.). Поверхню трэцяга пакрывалі фігурныя палосы з чырвонай і сіняй эмалі, аточаныя золатам. Месца паміж палосамі запоўнена залатым роспісам з гравіроўкай (мал.). Роспіс нашых пасудзін нагадвае арнаментацыю шкляных пасудзін, што выраблялі ў Алеппо[200].

Яшчэ адзін фрагмент пасудзіны з безколернага шкла, што знайдзены на Замкавай гары быў звонку спрэс пакрыты сіняй эмаллю, па якой золатам нанесены ломаныя лініі і трохвугольнікі, а таксама гравіроўка. Мяркуючы па ўнутраным баку абломка, перад тым як нанесьці звонку эмаль, яго паверхня была пакрыта палосамі чырвонай эмалі. Аналогію пасудзіне, анаментаванай такім чынам знайсьці не ўдалася, але па характару роспісу яе трэба лічыць прадукцыяй блізкаўсходняй майстэрні.

У заходнерускіх гарадах блізкаўсходняе мастацкае шкло прадстаўлена большай колькасьцю знаходак чым візантыйскае. У

Слоніме знайдзены абломак тонкасьценнай пасудзіны, афарбаванай з сярэдзіны палоскамі ружовага і блакітнага колераў. Паверхня яго распісана золатам. На ёй нанесены арабскі надпіс: “С-алім вучоны”[201]. Цікавы келіх з арабскім надпісам з Мсьціслаўля. Абломкі пасудзін з шклоробчых майстэрняў Блізкага Ўсходу прысутнічаюць у Тураве, Гродне, дзе знайдзены абломак шкляной пасудзіны, распісанай цёмна-чырвонай, жоўтай і зялёнай эмаллю і ў Віцебску. У апошнім, у слаях XII-XIII стст. сустракаюцца абломкі пасудзін з безколернага і сіняга шкла, з характэрным роспісам золатам і эмаллю[202].

Блізкаўсходняе мастацкае шкло знайдзена і ў другіх старажытнарускіх гарадах — Кіеве, Ноўгарадзе, Гарадку, Старой Разані і Тмутаракані. Шмат рэштак шкляных пасудзін сірыйскай вытворчасьці атрымана пры раскопках на Гарадзішчы пад Ноўгарадам. У другіх цэнтрах Усходняй Еўропы фрагменты такіх пасудзін вядомыя ў Херсанэсе, Волжскай Балгарыі, у курганах прадгор’я Каўказа і ў гарадах Закаўказья (Дзвін, Ані)[203].

Пры рэдкасьці вышэй пералічаных знаходак, цікава адзначыць абломак шкляной чары з імітацыяй арабскага надпісу, знайдзены пры раскопках горада Аполе ў Польшчы[204]. Адначасова з візантыйскімі і сірыйскімі шклянымі пасудзінамі ў Наваградак былі прывезены фаянсавыя пасудзіны з іранскіх майстэрняў. Знайдзена 43 фрагменты такіх пасудзін, якія належаць да 15 экзэмпляраў, з якіх толькі дзве пасудзіны паходзяць з Замкавай гары. Вялікая частка фаянсавага посуду пакрыта люстравым роспісам, які робіць эфект металічнага бляску. Гэты роспіс наносіўся на абпаленую глазураваную (паліваную) рэч, пасля чаго прадмет абпальваўся другі раз[205].

Іранскі фаянсавы посуд з’яўляецца ў пабудовах Малага Замка першай паловы XII ст., пры гэтым у пабудове з фрэскамі былі знайдзены фрагменты, якія належалі да трох пасудзін. Абломкі трох фаянсавых пасудзін адносіліся таксама да адной з пабудоў другой паловы XII ст.[206]

Рэдкай знаходкай для старажытнарускага гораду стала цалкам адноўленая чара, знайдзеная ў паўночным раскопе Замкавай гары. Яна прадстаўляе з сябе дванадцацілопасную пасудзіну на паддоне. Вышыня чары 11 см., дыяметр (уверсе) - 12 см. Чару пакрывае чырвона-карычневы роспіс. Звонку гэта геаметрычны арнамент, а з сярэдзіны лініі, палосы і стылізаваныя арабскія літары (мал.). У музеях і прыватных зборах вядомыя лопастныя чары з двубаковым роспісам, якія маюць пяць, восем, дзесяць і 16 лопасьцяў. У апошнім выпадку пасудзіна датавалася першай чвэрцю XIV ст.[207]

Фрагмент лопастнай пасудзіны з аднабаковым роспісам

належыць да знаходак Малага Замка. Вішнёвы роспіс у выглядзе арабескі нанесены звонку. Верагодна наваградская знаходка належала да лопастной чары, падобнай да чары з гарадзішча Орен-Кала ў Азербайджане[208].

Абломкі трох пасудзін належалі адкрытым чарам на паддоне. Двубаковы роспіс іх жоўты і карычневы. Форма чараў, колер роспісу і яго арнамент набліжае наваградскія знаходкі да чары з кліўлендскага музея[209]. У пабудове другой паловы XII ст. знайдзены абломкі чары з двубаковым сінім і карычневым роспісам. Захавалася выява твару чалавека на верхняй унутранай частцы аднаго з венчыкаў. Выявы галоў людзей на дне і ля венчыкаў чараў даволі характэрна для іранскіх пасудзін XII-XIII стст.[210] Відавочна, да чары належаў яшчэ адзін абломак з двубаковым чырвоным і сінім роспісам па белым фоне[211].

Сярод фрагментаў фаянсавай керамікі з люстравым роспісам шэраг знаходак належыць закрытым пасудзінам. Такі абломак сьценкі з цёмна-карычневым роспісам і арабскім надпісам, які нанесены белай фарбай. Верагодна, ён належаў да куўшына, прыкладам таго, што апублікаваны А. Поўпам[212]. Абломкі сьценак ад закрытых пасудзін з вакольнага гораду пакрывала арабеска вішнёвага колеру, а з Замкавай гары сінія і карычневыя скругленыя лініі і кропкі, нанесеные золатам (мал.).

На тэрыторыі Малага Замка пабытавалі і іншыя фаянсавыя пасудзіны з Ірана. Знайдзена частка донца на паддоне. На белым фоне яго рэльефна паказаны птушыныя лапы, выкананыя кобальтам і марганцам. Гэту знаходку можна супаставіць з чарай XII ст. з калекцыі Э. Хічкока, на дне якой маецца выява драпежнай птушкі. Фігура яе рэльефная і афарбавана ў чырвоны, сіні і зялёны колеры[213].

Асобную групу складалі фаянсавыя пасудзіны з кракелюрамі. Абломкі іх адносіліся да чатырох экзэмпляраў. Гэта былі венчык мініацюрнай пасудзіны (дыяметр 4 см.), пасудзіна з атагнутым венчыкам, які распісаны золатам, пасудзіна з гравіроўкай па сырым цесьце, пакрытая ярка сіняй палівай і пасудзіна, на паверхні якой, акрамя кракелюраў, нанесены люстравы роспіс. Паралелі пасудзінам з кракелюрамі вядомыя ў прыватных зборах[214].

На тэрыторыі Заходняй Русі абломкі іранскай керамікі з люстравым роспісам знайдзены ў Полацку і Лукомлі. У апошнім гэта абломак блюда, якое ўпрыгожана арабескай[215].

У кнізе “Старажытны Наваградак” адзначалася, што іранскі фаянсавы посуд рэдка сустракаецца ў старажытнарускіх гарадах. У апошнія гады становішча нескалькі змянілася. Акрамя ўспамянутых знаходак у Полацку і Лукомлі, такія пасудзіны

пабытавалі ў Ноўгарадзе, Смаленску, Тмутаракані, Гарадзішчы пад Ноўгарадам. Асабліва цікавыя знаходкі іранскіх фаянсовых пасудзін у Паўночна-Усходняй Русі. У Старай Рязані на сядзібах баяр і рамеснікаў сабраны фрагменты, якія належалі, прыкладна 30 такім пасудзінам. Выразнай знаходкай з'яўляецца паліваны збанок з Суздаля з эпіграфічным арнаментам[216]. Цікава, што добра вывучаны іранскі фаянсавы посуд Старой Разані, істотна адрозніваецца ад адпаведных пасудзін Навагрудка. Так у Старой Разані няма вырабаў з горада Кашана, якія прадстаўлены ў нашым горадзе. У Кашане, на думку А. Поўпа, выраблялі самы дарагі фаянсавы посуд[217]. У Старой Разані вылучаецца прадукцыя Рэя, а таксама кераміка, блізкая да іранскага фаянсавага посуду, што знайдзены ў Азербайджане, Паўночным Хорасане і Харэзме[218]. Такія адрозненьні ў іранскім імперце паказваюць, што асартымент гэтай прадукцыі ў Старажытнай Русі быў вялікі і прыбываў з розных цэнтраў Ірану.

У межах нашай краіны іранскі поліваны посуд, у тым ліку з люстравым роспісам быў шырока распаўсюджаны. Ён сустракаецца на тэрыторыі Сярэдняй Азіі, дзе побач з прывазнымі пасудзінамі зафіксавана работа майстра, які прыехаў з Рэя[219]. Фаянсавы посуд з Ірана знайдзены ў гарадах Азербайджана, Арменіі і Грузіі, а таксама ў Паўночным Прычарнамор'і[220]. Такім чынам, іранская фаянсавая кераміка і, у прыватнасьці, распісаная люстрам, якая па словах Э.К. Кверфельдта, з'яўляецца вяршыняй росквіту керамікі феадальнага гораду[221], пранікла ў побыт сацыяльных вярхоў Усходняй Еўропы і дзяржаў Азіі.

Імпартам мусульманскага Усходу ў Навагрудку былі сердалікавыя пацеркі (10 экзэмпляраў). Толькі дзьве з іх знайдзены ў самым горадзе, астатнія паходзяць з курганаў. Форма пацерак — прызматычная і 14-гранная. Пабытаваньне пацерак з сердаліку ў Навагрудку і яго магільных помніках не выходзіць за межы XI ст., што адпавядае распаўсюджаньню дадзенага тыпу пацерак на тэрыторыі Старажытнай Русі[222]. Аналагічныя сердалікавыя пацеркі ў Заходняй Русі сустракаюцца ў Полацку, Вітебску, Гарадзішчы на Менцы і Ваўкавыску[223]. Па заключэньню М.В. Фехнэр, галоўная маса сердалікавых пацерак была прывезена з Сярэдняй Азіі, адкуль ішоў гандль камянямі, у першую чаргу сердалікам[224].

Крыштальныя шматгранныя пацеркі (3 экзэмпляры), знайдзены толькі ў магільніках. Яны таксама належаць да сярэднеазіяцкага імпарту. Вышэй (с. 00) зафіксавана апрацоўка крышталя на Замкавай гары. Аднак, гэта адбывалася не раней XII ст. Крыштальныя пацеркі з Навагрудскіх курганоў датуюцца не пазней XI ст. Яны разам з сердалікавымі былі прывезены з

Сярэдняй Азіі[225]. Заходнерускія паралелі крыштальным пацеркам з Навагрaдскіх курганаў вядомыя ў Полацку, Віцебску і Ваўкавыску. У апошнім яны знайдзены на гарадзішчы Муравельнік, якое існавала з канца X да пачатку XI ст.[226] Разам з сердалікавымі і крыштальнымі пацеркамі знайдзена адзіная амеціставая пацерка. Яна сустрэта пры раскопках курганаў каля в. Сялец[227].

Пры раскопках Замкавай гары ў 1977 г. знайдзены акруглы бронзавы выраб, на якім нанесены арабскія літары (мал.). Нажаль, на дадзеным раскопе слой старажытнарускага часу быў разбураны больш позняй забудовай і аб яго існаванні можна было мякаваць толькі па рэчам — кераміцы, шкляным бранзалетам і некаторым іншым знаходкам, якія пабытавалі да XIII ст. Таму няма пэўнасьці, што дадзеная знаходка належыць да цікавага для нас часу.

На заканчэньні адзначым находку з Замкавай гары, якая прадстаўляе з сябе прамавугольны адшліфаваны цёмна-чырвоны камень з белымі ўкрапленьнямі (мал.). Петрографічны аналіз знаходкі (зрабіла Н.Б. Селіванава) паказаў, што гэта порфірыт, які распаўсюджаны ў розных горных абласьцях.

Археалагічныя матэрыялы паказваюць старажытнарускі Навагрaдак як месца на рэдкасьць абшырных сувязяў. У раньнюю пару свайго існаваньня, яго кантакты з іншымі старажытнарускімі землямі і краінамі за межамі Русі, не вылучаюць наш горад сярод другіх заходнерускіх гарадоў. Увесь навагрaдскі імпарт канца X-XI стст., пачынаючы з каляровых металаў, заканчваючы ўпрыгожаньнямі, адпавядае характару прывазных тавараў Полацка, Мінска, Ваўкавыска і некаторых другіх гарадоў Заходняй Русі. Навагрaдак гэтага часу вылучаецца толькі большай колькасьцю бісеру, характэрнага для гарадскога магільніка, што, відавочна, тлумачыцца асаблівасьцю ўбору навагрaдскіх жанчын. Пачынаючы з XII ст., калі на тэрыторыі Малага Замка фарміруецца вакольны горад з яго багатым кварталам, а на Замкавай гары ўзнікае феадальны двор, асартымент і колькасьць імпарту вылучае Навагрaдак сярод многіх другіх, у тым ліку стольных, гарадоў Старажытнай Русі.

Якім шляхам трапілі ў Навагрaдак шматлікія старажытнарускія і іншаземныя тавары? Наібольш значнай воднай артэрыяй зямлі, да якой належыць наш горад, з'яўляецца Нёман. У свой час археолаг Е. Антаневіч звярнуў увагу, што ў літаратуры недастаткова ацэнена роля Нёмана, як воднага шляху ў знешніх сувязях[228]. За апошні час роля Нёманскага гандлёвага шляху падкрэслена ў работах З.М. Сяргеевай і В.Н. Зоценко[229].

Значэньне Нёмана в сувязях са знешнім светам наібольш пераканаўчае для Гродна і Турэйска, якія заснаваныя на гэтай рацэ, а таксама Ваўкавыска і Слоніма, якія звязаныя з Нёманам яго прытокамі. Што датычыць Навагрaдка, то мы ўжо адзначалі, што ён быў аддалены ад суднаходных рэкаў і значную частку шляху (каля 30 км.) тавары прыходзілась дастаўляць сухапутнымі шляхамі[230]. Магчыма, што сухапутныя дарогі былі карацейшыя. У чатырох км. ад Навагрaдка працякае безымянная рэчка, на якой знаходзяцца паселішча і магільнікі (разгледжаны ў главе 2). Гэта помнікі ля вёсак Сялец, Гардзілоўка і Гарадзечна. У апошняй рэчка, аб якой гутарка, упадае ў раку Валоўку, прыток Сервечы — левага прытоку Нёмана. Такім чынам, не выключана, што тавары прыбывалі па Нёману і па гэтай сістеме рэкаў.

Знаходкі бязмена і гірак рознай вагі сведчаць аб пэўных гандлёвых аперацыях, у Навагрaдку. Мірныя і ваенныя ўзаемаадносіны з Валыньню і Літвой, а таксама планаваны паход князя Рамана з навагрaдцамі да Возвягля, а потым да Кіева, бясспрэчна ўплывалі на знешнія сувязі Навагрaдка. Нават у святле гэтых пісьмовых сведчаньняў відавочна, што жыхары Навагрaдка мелі непасрэдныя кантакты з асобнымі старажытнарускімі землямі і Прыбалтыкай, у выніку якіх у горад маглі трапіць прывазныя вырабы. Недарагія іншаземныя тавары прывозілі паломнікі. Паломніцтва пакінула свой след у гісторыі культуры Навагрaдка і больш падрабязна будзе разгледжана ў наступнай главе.

Вышэй адзначалася роля Кіева як галоўнага пастаўшчыка прывазных тавараў у Навагрaдак. Кіеў пастаўляў не толькі вырабы сваіх рамеснікаў, але і быў буйнейшым транзітным цэнтрам, праз які перапраўляліся па Дняпру ў Старажытную Русь тавары, што ішлі з Візантыі і яе правінцый і многія вырабы з краінаў мусульманскага Усходу[231].

Пэўныя кантакты назіраюцца паміж Навагрaдкам і Херсанэсам, які знаходзіўся на перыферыі візантыйскага свету. Тыпы навагрaдскіх амфар ідэнтычныя херсанэскім. Падобныя амфары, на думку А.Л. Якабсона, выраблялі ў самым Херсанэсе[232]. З партыі сініх візантыйскіх флаконаў, што распісаны золатам і эмальлю, частка асела ў Херсанэсе, а іншыя трапілі ў Навагрaдак і Тураў. Гэта ж датычыць шкляных пасудзінаў з выступамі на ўнутранай частцы сьценак і келіхаў, што зроблены ў сірыйскіх майстэрнях[233]. У Херсанэсе знайдзены абломак іранскай фаянсавай чары з люстравым роспісам з выявай твару чалавека[234], што нагадвае знаходкі з Навагрaдка. Вышэй адзначалася, што ў абодвух гарадах былі ў карыстаньні скрынкі, выкладзеныя разнымі пласьцінамі з касьцей

мясцовай жывёлы. Такія скрынкі падражалі канстанцінопальскім. Далучым да гэтага наваградскую паліваную чару, на якой паўторана херсанэская аздоба. Можна сабе ўявіць, што на шляху паўднёвага імпарту ў Старажытную Русь, у тым ліку і Заходнюю, ён трапляў у Херсанэс, які далучаў да яго сваю прадукцыю, а затым каштоўныя тавары ішлі да Кіева. Здзіўляе пры гэтым, што паміж Кіевам і Наваградкам няма такога падабенства ў асартыменце візантыйска-усходніх тавараў, якое назіраецца паміж Херсанэсам і Наваградкам.

Не ўсе вырабы траплялі ў Наваградак з тых аддаленых земляў, дзе яны былі зроблены. Так адзіная ракавіна каурі з вакольнага гораду, радзімай якой з'яўляецца Індыйскі альбо Ціхі акіян, належыць да катэгорыі любімых упрыгожаньняў прыбалтыйскага насельніцва[235], і, скарэй за ўсё, трапіла ў Наваградак з Прыбалтыкі. Наваградскія сердалікавыя пацеркі дасягалі нашай тэрыторыі не з Сярэдняй Азіі, адкуль гандлявалі такімі вырабамі, а верагодна, з Полацкой зямлі, дзе сердалікавыя пацеркі спалучаюцца са знаходкамі вялікай колькасьці куфічных манет. Граніцы распаўсюджаньня абедзьвух катэгорый знаходак супадаюць[236]. У Наваградку ж зусім не было арабскіх манет.

Іншым шляхам трапляе ў Наваградак "келіх Ядвігі". Шматлікія падражаньні яму ў XVII-XVIII стст., на думку Ю.Л. Шчапавай, могуць сведчыць на карысьць таго, што ў Сярэднявечча з Канстантынопалю была вывезена вялікая партыя такіх пасудзін. На тое, што такія існавалі паказваюць металічныя аправы "келіхаў Ядвігі" мяжы XIII і XIV, а таксама XIV стст.[237] Мы трымаемся раней ужо выказанага ў літаратуры мяркаваньня, што гэтыя келіхі сталі здабычай крыжакоў. Калі сапраўдны Наваградскі "келіх Ядвігі" аказаўся там у пабудове другой паловы XII ст., наібольш верагодным прадстаўляецца, што ўся партыя была вывезена з Канстантынопаля падчас крыжовага походу 1147-1149 гг., калі крыжакі двойчы рабавалі візантыйскую сталіцу. Адзін з келіхаў праз Заходнюю Еўропу і Польшчу трапіў ў Наваградак[238]. Астатнія, якія нарадзілі серыю падражаньняў, не ацалелі. Апублікаваны нядаўнім часам кавалак "келіха Ядвігі" з Венгрыі, другой сапраўднай пасудзіны этага віду, аб якім успомнена вышэй, падцвярджае шлях келіхаў з Канстантынопаля праз Цэнтральную і Заходнюю Еўропу. Трапіўшы з Канстантынопалю на Захад наш келіх, каб трапіць у Наваградак, павінен быў прайсьці той шлях, якім достаўлялі ў Панямоньне іншыя заходнееўрапейскія рэчы. З Германіі, на Прагу, Кракаў (там знайдзены падражаньні "келіху Ядвігі")[239], па Вісле, Заходнім Бугу праз Драгічын. З Заходняга Буга на Прыпяць тавары перапраўлялі волакам[240]. Ад прытоку Прыпяці Ясельды тавары

дастаўлялі волакам у басейн Нёмана.

Калі сярод прывазных тавараў Навагрудка старажытнарускага паходжаньня вядучая роля належала Кіеву і другім паўднёварускім зямлям, то сярод іншаземнага імпарту пераважалі вырабы візантыйскіх майстэрняў Сірыі і Ірана, адкуль дарагія і больш сьціплыя вырабы прыбывалі партыямі. Шматлікія вырабы з суседняй Прыбалтыкі і слабей прадстаўлены тавары з краін Паўночнай, Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Паступленьне ў Навагрудак імпарту партыямі дае падставы мяркаваць, што вялікая частка яго прыбывала ў выніку гандлёвых аперацый, а вырабы, што трапілі неэканамічным шляхам (ваенная здабыча, дарункі і інш.) былі нешматлікія. Для навагрудцаў — жыхароў лясной зоны, асноўным эквівалентам у гандлёвых сувязях была пушніна[241]. Магчыма, што гаражане гандлявалі зернем, якое атрымалі на мясцовых пладародных зямлях. У гэтым выпадку дарэчы ўспомніць пра бязмен, прыстасаваны каб важыць значныя грузы. Не выключана, што з Навагрудка былі прывезены ціснёныя срэбныя ўпрыгожаньні. Добра ўзброеныя навагрудцы, не толькі спадарожнічалі князям у паходах, як сведчыць летапіс, але маглі выконваць ролю купцоў, тым больш, калі гутарка аб багатых златакавалях вакольнага гораду XII-XIII стст.[242]

Археалагічныя матэрыялы Навагрудка даюць прадстаўленьне аб надзвычай актыўных знешніх сувязях гораду. У культуры раньняга Навагрудка захавалася шмат вырабаў з другіх старажытнарускіх зямляў і краін за межамі Старажытнай Русі. У XII-XIII стст. імпарт павялічваецца ў шмат разоў, ператварыўшы Навагрудак у горад, для якога характэрна канцэнтрацыя як масавых, так і раскошных, даступных толькі для сацыяльных вярхоў прывазных тавараў.

Спасылкі:

[1] ДН. С. 148-156.

[2] Павлова К.В. Хозяйственные постройки XII-XIII вв. на детинце древнего Новогрудка // КИСА. 1972. Вып. 129. С. 80

[3] ДН. С. 107; Загорульский. Возникновение Минска. Минск, 1982. Мал. 183,184; Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли. Минск, 1978. С. 115; Бекцінееў Ш. Старажытныя вагі // ПКГБ. 1984. Вып. 3. С. 43. Звесткі аб слуцкім бязмене, як і другіх знаходках з гэтага гораду, ласкава паведаміў Л.В. Калядзінскі.

[4] Колчин Б.А. Черная металлургия и металлообработка в Древней Руси // МИА. 1956. Вып. 32. С. 164; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 283-284.

[5] ДН. С. 107.

[6] ДН. С. 93., Мал. 72,5.

[7] Бектинеев Ш.И. Весы и гирьки - разновесы з Беларуси // СА. 1987. Вып. 2. С. 233-237.

[8] Бектинеев Ш.И. Op. cit. С. 44.

[9] Колчин Б.А. Op. cit. С. 193-194.

[10] Гуревич Ф.Д. Древности Белорусского Понеманьня. Л., 1962. Мал. 90,3; Павлова К.В. Раскопки курганов у деревень Селец и Ботаревка // КСИА. 1977, Вып. 148, Мал. 1,2.

[11] Павлова К.В. Раскопки могильника близ Новогрудка // КСИА. 1965. Вып. 104. Мал. 37,11.

[12] Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 73,1.

[13] Тамсама Мал. 74,125; 89,1.

[14] Поболь Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979. С. 131.

[15] Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 90,1; ДН. Мал. !7,5; 19,5.

[16] Мальм В.А. Шиферные пряслица и их использование // История и культура Восточной Европы по археологическим данным. М., 1971. С. 205-206.

[17] Новое в археологии Киева. Киев, 1981. С. 330-333; Седова М. В. Ярополч Залесский. М., 1978. С. 95; Штыхов В.Г. Op. cit. С. 113; Rauhut L. Wczesnosreniowieczne materialy z terenow Ukrainy w Panstwowym muzem archeologicznym w Warszawie // MW. 1960. V. s. 253., Tab. XVI, 17-20; XVII, 6,7.

[18] Лысенко П.Ф. 1) Города Туровской земли. Минск, 1975. С. 40, 52. 2) Берестье. Минск, 1985. С.383; Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 74; Штыхов Г. В. Op. cit. С. 114.

[19] Янин В.Л. 1) Денежно-весовые системы русского средневековья. М., 1956. С. 188-189; Русские денежные системы IX-XV вв. // Древняя Русь. Горд, село, Замок. М., 1985. С. 365.

[20] ДН. Мал. 49,13; 58,2.

[21] Макарова Т.И. Поливная керамика древнего Любеча. М., 1972. С. 10.

[22] Зверуго Я.Г. Op. cit. С.79; Штыхов Г. В. Op. cit. С. 34; Пех Г.И. Раскопки древнего Слонима // Древности Беларуси. Минск, 1966. С. 279.

[23] Макарова Т.И. Поливная керамика древнего Любеча // СА. 1965. Вып. 1. С. 235.

[24] Щапова Ю.Л. Стекло Киевской Руси. М., 1972. С. 45-51; ДН. Мал. 24,1; 31,1,3,6; 48,10,12,13; 62,3; 71,10; 74,4-6.

[25] ДН. С. 41., Мал. 31,1,3,6.

[26] Полубояринова М.Д. Стекляная посуда древнего Турова // СА. 1963. Вып. 4. Мал. 1,2; Яніцкая М.М. Вытокі шкларобства ў Беларусі. Мінск, 1980. Мал. 19; Лысенко П.Ф. Города ... С. 111; Бярэсце. С. 383.

[27] ДН. Мал. 19,9; 55,15.

[28] Полубояринова М.Д. Op. cit. С. 234; Яніцкая М.М. Op. cit. Мал. 19,и.

[29] Полубояринова М.Д. Op. cit. Мал. 1,1; Яніцкая М.М. Op. cit. Мал. 19,б.

[30] ДН. Мал. 79.

[31] Полубояринова М.Д. Op. cit. Мал. 1,3; 2,10.

[32] Щапова Ю.Л. Op. cit. Мал. 8,14,15.

[33] ДН. Мал. 62,3; 71,10; 74,1.

[34] Погляд М.М. Яніцкай прааналізаваны аўтарам у артыкуле “О Новогрудском стеклоделии” (по поводу выхода книги М.М. Яницкой “Истоки стеклоделия в Белоруссии”) // СА. 1985. Вып. 4. С. 260-264.

[35] Богусевич В.А. Мастерские по изготовлению смальты и стекла в Киеве // КСИА УССР. 1951. вып. 3. С. 20; Новое в археологии Киева. С. 314, 316.

[36] Щапова Ю.Л. Древнерусские стеклянные изделия как источник истории русско-византийских отношений // ВВ. 1962. Вып. 21. С. 66.

[37] Сикорский М.И. Склоробна майстерня XII ст. у Переяславли-Хмельницкому // Дослиджения словяно-руськой археологии. Київ, 1976. С. 448.

[38] ДН. С. 32, 37, 45, 67, 73, 93.

[39] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 79; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 40, 60.

[40] Богусевич В.А. Op. cit. С. 19; Вытворчасць шкляных пасудзін і ваконнага шкла ў адных і тых жа майстэрнях адбывалася і ў майстэрнях феадальнай Грузіі: Чхарашвили М.Н. Стекло средневековой Грузии // Автореферат канд. дис. Тбилиси, 1977. С. 19.

[41] ДН. С. 39, 71,91, 93.

[42] ДН. Мал. 49,14.

[43] Яніцкая М.М. Op. cit. Мал. 49, в-л.

[44] ДН. С. 118.

[45] Павлова К.В. 1) Раскопки могильника близ Новогрудка // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 100, 103; 2) Могильники у деревень Мольничи и Сулятичи // КСИА. 1974. вып. 139. С. 63; Гуревич Ф.Д. Древности ... Мал. 97,5; Поболь Л.Д. Op. cit. Мал. 81,3,4; Архіў ЛАІА. ф. 35,8 90, л. 24.

[46] ДН. С. 28.

[47] Павлова К.В. Раскопки могильника... С. 100.

[48] Фехнер М.В. К вопросу об экономических связях древнеруской деревни // Труды ГИМ. 1959. Т.33. Прил. VI,6,8.

[49] Щапова Ю.Л. Стекло Киевской Руси. С. 78.

[50] ДН. Мал. 49,5; 77,3.

[51] Щапова Ю.Л. Op. cit. С. 88-84.

[52] ДН. С. 79., Мал. 59,20,21.

[53] Фехнер. Op. cit. Прил. VI,14.

[54] ДН. С. 61.

[55] Щапова Ю.Л. Стеклянные бусы древнего Новгорода // МИА. 1956. Вып. 55, С. 165-170; Колчин Б.А. Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник. М., 1982. С. 168-169.

[56] ДН. С. 32.

[57] ДН. С. 51, 65, 97.

[58] ДН. Мал. 41,7; 49,18,19.

[59] Новое в археологии Киева. С. 312-313.

[60] Колчин Б.А., Янин В.Л. Археологии Новгорода 50 лет // Новгородский сборник. С. 85.

[61] Зверуго Я.Г. Op. cit. С.78.

[62] Да ліку гэтых знаходак, што прыведзены раней (2500) - ДН. С. 154, далучым раней неўлічаныя знаходкі раскопаў 1965-1967 гг.

[63] ДН. С. 153.

[64] ДН. С. 98, 101.

[65] Зильманович И.Д. Раскопки детинца в Новогрудке в 1962 г. // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 98.

[66] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 185.

[67] Арциховский А.В. Курганы вятичей. М., 1930. С. 25-26.

[68] Шекун А.В. Раскопки и разведки на Черниговшчине // АО 1979 г. М., 1980. С. 352.

[69] Загорульский Я.Г. Op. cit. С. 229; Лысенко П.Ф. Города.. С. 60.

[70] Щапова Ю.Л. Op. cit. С. 11-118

[71] Яніцкая М.М. Op. cit. С. 99-100; Калядзінскі Л., Скрыпчанка Т. Ткачоў М. Віцебскія бранзалеты // ПКГБ. 1984. Вып. 4. С. 41-42; Скрыпчанка Т.С. Свіслацкія шкляныя бранзалеты // Весці АН БССР. 1980. Вып. 3. С. 71; Белорусская археология. Минск, 1987. С. 100.

[72] Щапова Ю.Л. Стеклянные браслеты Волковыска // ТДКБ. С. 170.

[73] Новое в археологии Киева. С. 351.

[74] Корзухина Г.Ф. Русские клады IX-XIII вв. Л., 1954. Табл. XXIV,7-10; XXXI,10; Килиевич С.Р. Детинец Киева IX - первой половины XIII вв. Киев, 1982. С. 101.

[75] ДН. С. 115., Мал. 76,9; 90,1,4.

[76] Макарова Т.И. Черневое дело Древней Руси. М., 1986.

[77] ДН. Мал. 90,2.

[78] Макарова Т.И. Op. cit. С. 39.

[79] ДН. Мал. 49,27.

[80] ДН. С. 101., Мал. 77,12.

[81] Беляшевский Н.Ф. Княжая гора. Киев, 1891. С. 8.

[82] ДН. С. 112., Мал. 90,7.

[83] Фехнер М.В. Op. cit. С. 49.

[84] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 49.

[85] Яніцкая М.М. Op. cit. С. 44.

[86] ДН. Мал. 66,6; Павлова К.В. 1) Раскопки курганов у дер. Городиловка… Мал. 16,1,2; 2) Могильники у деревень Мольничи и Сулятичи // КСИА. 1974. С. 63; Поболь Л.Д. Op. cit. Мал. 81,5,6.

[87] Рыбаков Б.А. Ремесло Древней Руси. М., 1948. С. 342.

[88] ДН. С. 26., Мал. 19,6; 20, 2.

[89] ДН. С. 103-104., Мал. 84,1.

[90] Поболь Л.Д. Op. cit. Мал. 81,2.

[91] Седова М.В. Ювелирные изделия древнего Новгорода (X-XV вв.). М., 1981. С. 96.

[92] Малевская М.В. Поливная керамика древнего Новогрудка // СА. 1969. Вып. 3. С. 199-200.

[93] ДН. С. 110., Мал. 89,4.

[94] ДН. Мал. 84,3; Штыхов Г.В. Города... Мал. 28,10.

[95] Розенфельдт Р.Л. Янтарь на Руси // Проблемы советской археологии. М., 1978. С. 197; Рыбина Е. Археологические очерки новгородской торговли. М., 1978. С. 60-61.

[96] Сергеева З.М. Культурно-экономические связи западнорусских земель с Прибалтикой // Автореферат канд. дис. М., 1980. С. 12.

[97] Накайте Л. Серебро в археологических памятниках Литвы // Автореферат канд. дис. Вильнюс, 1967. С. 15-16.

[98] ДН. Мал. 5,6; Urtans V. Senakie depoziti Latvja. Riga, Zinatne, 1977. att. 101,10.

[99] ДН. Мал. 35,14; Lietuvos TSR archeologijos atlasas. Vilnius, 1978. T. IV. zem. 35.

[100] ДН. Мал. 59,25; Гуревич Ф.Д. Op. cit. Мал. 78,1; Сергеева З.М. О подковообразных фибулах с утолщенными концами на территорыи Древней Руси // КСИА. 1977, Вып. 150. С. 36.

[101] ДН. С. 47., Мал. 35,12.

[102] ДН. С. 112., Мал. 85,8,9.

[103] ДН. С. 82., Мал. 66,19.

[104] Сергеева З.М. Культурно-эканамические связи ...С. 8.

[105] ДН. Мал. 83,6; Snore E. Kivtu kapulauks. Riga, Zinatne, 1987. Tab. VII,9.

[106] ДН. С. 11-12., Мал. 5,7.

[107] ДН. Мал. 11,2,3.

[108] Гуревич Ф.Д. Культурные связь древнерусских городов

на территории Белоруссии с Прибалтикой // Проблемы энтоногенеза и этнической истории балтов. Вильнюс, 1985. С. 95.

[109] Рыбина Е.А. Из истории торговли цветными металлами в Новгороде X-XV вв. // Вестник МГУ. 1973. Вып. 1. С. 94; Коновалов А.А. Цветной металл, медь и её сплавы // Автореферат канд. дис. М., 1974. С. 10.

[110] ДН. Мал. 5,8.

[111] Ardman H. Birka, Tafeln, Stockholm, 1940. Taf. 159,4; Давидан О.И. Гребни Старой Ладоги // АСГЭ. 1962. Вып. 4. Мал. 3,2; Шноре Э.Д. Асотское городишче. Рига, 1961. С. 124., табл. IX,15,19.

[112] ДН. Мал. 5,4; Давидан О.И. Op. cit. С. 101.

[113] ДН. Мал. 8,10; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 11,26; Arbman H. Op. cit., Taf. 26,2,5.

[114] ДН. Мал. 83,3; Arbman H. Op. cit., Taf. 102,5-10; Каргер М.К. Древний Киев. Л., 1958. Т. 1. С. 209-210.

[115] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 13,6; 10,1,2; 34,4,6.

[116] Kivikoski E. Die Eisenzeit im Auraflussgebiet. Helsinki, 1939. Taf. V,2,3.

[117] ДН. С. 150; Янин В.Л. находка польского свинца в Новгороде // СА. 1966. Вып. 2. С. 324.

[118] Коновалов А.А. Op. cit. С. 5.

[119] Малевская М.В. Некоторые исторические связи Новогрудка в X в. (по материалам керамики) // КСИА. 1972. Вып. 129. С. 19.

[120] Зильманович И.Д. Op. cit. С. 97.

[121] ДН. С. 105., Мал. 86,6.

[122] ДН. С. 101., Мал. 77,7,8.

[123] ДН. С. 102.

[124] ДН. С. 110.

[125] ДН. С. 44., Мал. 30,11.

[126] ДН. Мал. 76,4.

[127] ДН. Мал. 35,5; У ДН. устаўкі памылкова вызначаны як шкляныя.

[128] ДН. Мал. 4

[129] Седова М.В. Op. cit. С. 16.

[130] Плетнева С.А. Печенеги, токи и половечки // МИА. 1958. вып. 62. С. 176., Мал. 16,2,3.

[131] ПСРЛ. 1962. Т. 11. Стб. 816.

[132] Алексеюк М.И. Половецкие поселения на Брестчине // ЭБ. С. 63-68.

[133] Кызласов И.Л. Аскизская культура Южной Сибири // САИ. 1983. Серия Е-318. С. 61., Мал. 34,1-4; Савинов Д.Г. Сибирские реалии половецких каменных изваяний // Археология

Сибири и Дальнего Востока. Новосибирск, 1984. С. 117.

[134] ДН. Мал. 89,2; Даркевич В.П., Стародуб Т.Ч. Иранская керамика из Старой Рязани // СА. 1983. Вып. 2. С. 191.

[135] Малевская М.В. Амфоры Новогрудка XII-XIII вв. // ТДКБ. С. 185, 187, 188., Мал. 2; Гуревич Ф.Д. Византийский импорт в городах Западной Руси в XII-XIII вв. // ВВ. 1986. Вып. 47. С. 67-68.

[136] ДН. Мал. 22.6.

[137] Равдина Т.В. Надпись на корчаге из Пинска // КСИИМК. 1957. Вып. 70. С. 151; Новое в археологии Киева. С. 374; Медынцева А.А. Надпись на корчаге с Полтавщины // КСИА. 1986. Вып. 187. С. 55-57.

[138] Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 66; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 80.

[139] Баранова О.О., Платонов С.Б. К методике изучения объемов средневековых амфор // Античная древность и Средние века. Свердловск, 1982. Вып. 19. С.133.

[140] Голубева Л.А. Надпись на корчаге из Белоозера // СА. 1960. Вып. 3. С. 321-323.

[141] Корзухина Г.Ф. О гнездовской амфоре и её надписи // Исследования по археологии СССР. Л., 1961. С. 226-230.

[142] Анфимов Н.В. Средневековые амфоры с нефтью с Таманского полуострова (IX-X вв.) // КСИИМК. 1953. Вып. 49. С. 151; Кострин К.В. Исследования нефти из средневековых амфор, найдзеныных близ станицы Пролетарской // СА. 1965. Вып. 1. С. 291-293.

[143] Ратич А.А. Надпись на амфоре из Звенигорода на Белке // АО 1970 г. М., 1980. С. 295.

[144] Малевская М.В. Op. cit. С. 188.

[145] ДН. Мал. 36.

[146] Малевская М.В. Op. cit. С. 190.

[147] Колчин Б.А. Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник. С. 175.

[148] Новое в археологии Киева. з 373.

[149] Джанполадян Р.М. 1) Два стекляных сосуда из Новогрудка // ВВ. 1961. Вып. XIX. С. 161-171; 2) Новые материалы по истории византийскогостеклоделания // ВВ. 1967. вып. 27. С. 251-256; Гуревич Ф.Д., Джанполадян Р.М., Малевская М.В. Восточное стекло в Древненай Руси. Л., 1968. С. 7-12; Щапова Ю.Л. О резном бокале з Новогрудка // Средневековая Русь. М., 1976. С. 209-215; Гуревич Ф.Д. Op. cit. С. 70-76; Philippe J. Le Mond Bizantin dans l'histoire de la verrerie (V-XVI siecle). Bologna, 1970. P. 168., fig. 57, 58, 67, 72, 88-90; Megaw A.H.S. More gilt and enameled Glass from Cyprus // JGS. 1968. X. P. 90., fig. 2,3.

[150] ДН. С. 32, 41, 45, 47., Мал. 22,7; 25,2; 31,5; 37,3.

[151] ДН. С. 79., Мал. 61, 62,1,4.

[152] ДН. С. 96., Мал. 74,3.

[153] Davidson G.K.A. A medieval mystery: Bizantine glass production // JGS. 1975. XVIII. P. 140., fig. 29.

[154] Манускрипт Теофила "Записки о разных искусствах" // Всесоюзная центральная научно-исследовательская лаборатория по консервации и реставрации. М., 1963. Сообщение 7. С. 107.

[155] Зильманович И.Д. Op. cit. Мал. 35,6; Гуревич Ф.Д., Джанполадян Р.М. Op. cit. Табл. XII.

[156] Megaw A.H.K. Op. cit. P. 102-103.

[157] Davidson G.K. Op. cit. P. 133.

[158] Щапова Ю.Л. Op. cit. С. 214.

[159] Щапова Ю.Л. Op. cit. С. 213-214. Фрагмент яшчэ аднаго"келіха Ядвігі" XII ст. знайдзены пры раскопках палаца ў Вудзе (Венгрыя) - Hell-Gyurky K. The use of glass in medieval Hungary // JGS. 1986. 28. P. 71., fig. 2.

[160] Полубояринова М.Д. Op. cit. С. 235., Мал. 2,3-6.

[161] Новое в археологии Киева. С. 371; Щапова Ю.Л. 1) Стеклянные изделия древнего Новгорода // МИА. 1963. Вып. 117. С. 133-134; 2) Стеклянные изделия Старой Рязани. М., 1984. С. 81-87; Джанполадян Р.М. Стеклянная чара из Старой Ладоги // АСГЭ. 1967. Вып. 28. С. 49-50; Асташева Н.И. К вопросу о южных связях древнего Смоленска // Труды ГИМ. 1980. Вып. 51. С. 122; Матэрыялы Гарадзішча ласкава паведаміў Е.Н. Носаў.

[162] Колесникова Л.Г. Восточное стекло из собрания Херсонесского музея // ВВ. 1973. Вып. 34. С. 240-251.

[163] Джанполадян Р.М. Византийское стекло из раскопок Ани // КИСА. 1977. Вып. 150. С. 85-89; Кафадарян К. горад Двин и его раскопки. Ереван, 1982. Т. 2. С. 147.

[164] Davidson G. The minor objects. Corihth. 1952. XII. P. 262-265.

[165] Калядзінскі Л.У. і інш. Op. cit. С. 42; Штыхов Г.В. Города...С. 97; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 233; Щапова Ю.Л. Стеклянные бранзалеты Волковыска. С. 169.

[166] ДН. С. 153., Мал. 49,25.

[167] Павлова К.В. Раскопки могильника ...С. 100, 103., Мал. 38,1. Архіў ЛАІА ф. 35. № 90. л. 24; ДН. С. 118., Мал. 79,3.

[168] Воронин Н.Н. Op. cit. С. 67; Штыхов Г.В. Пацеркі з Віцебска // ТДАБ. С. 12.

[169] Львова З.А. Стеклянные бусы Старой Ладоги // АСГЭ. 1968. Вып. 10. С. 89; Щапова Ю.Л. Стеклянные бусы... С. 173.

[170] ДН. Мал. 12,2; 13,1,2; Павлова К.В. Могильники у деревень ... Мал. 19,8.

[171] ДН. Мал. 5,3; Павлова К.В. Раскопки курганов ...С.8.,

Мал. 1,1.

[172] Львова З.А. Op. cit. С. 65-67.

[173] Штыхов Г.В. Op. cit. С. 50.

[174] ДН. С. 18., Мал. 5,2; 15,4; Павлова К.В. 1) Могильники у деревень...Мал. 19,9 ; 2) Раскопки могильника ... С. 100.

[175] Штыхов Г.В. 1) Города ... Мал. 50,8; 2) Пацеркі з Віцебска.. Мал. 1,2; Загорульский Э.М. Op. cit. С. 235.

[176] ДН. Мал. 17,2; Гуревич Ф.Д. Древнености ... Мал. 97,5; Павлова К.В. Могильники у деревень.. Мал. 19,4.

[177] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 75; Штыхов Г.В. 1) Пацеркі з Віцебска. Мал. 1,26; 2) Города ... Мал. 17,2.

[178] Павлова К.В. Могильники з деревень. Мал. 19,6; Фехнер М.В. Op. cit. Прил. VI,4,6.

[179] ДН. Мал. 15,3; 30,3.

[180] Штыхов Г.В. 1) Пацеркі з Віцебска. Мал. 1,21; 2) Города ... С. 98; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 77.

[181] ДН. С. 85., Мал. 49,6; Фехнер М.В. Op. cit. Прил. V., Мал. 5,11.

[182] ДН. С. 65.

[183] Фехнер М.В. Op. cit. С. 170. Прил. V., Мал. 5,16.

[184] Фехнер М.В. Op. cit. С. 170-171.

[185] Загорульский Э.М. Op. cit. С. 235; Лысенко П.Ф. Бярэсци. С. 276.

[186] Щапова Ю.Л. Стеклянные бусы ... С. 177; Колчин Б.А. Op. cit. С. 169.

[187] ДН. С. 65., Мал. 49,1,12.

[188] ДН. С. 61, 65., Мал. 49,15.

[189] ДН. С. 22., Мал. 12,1; Малевская М.В. О датировке нижнего горизонта Новогрудка // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 89.

[190] ДН. С. 65., Мал. 49,19; Davidson G. Op. cit. P. 262, 263; Якобсон А.Л. Средневековый Херсонес (XII-XIV вв.) // МИА. 1950. Вып. 17. С. 17.

[191] Гуревич Ф.Д. Византийский импорт ... С. 76; Сюзюмов М.Я. Экономика пригородов византийских крупных городов // ВВ. 1966. Вып. XI. С. 70; Фехнер М.В. Шелковые ткани как источник для изучения экономических связей Древней Руси // История и культура Восточной Европы по археологическим данным. М., 1971. С. 208.

[192] ДН. Мал. 86,5; Банк А.В. Константинопольские узоры и местные копии (по материалам прикладного искусства) // ВВ. 1973. вып. 34. С. 192; Даркевич В.П. Светское искусство Византии. М., 1975. С. 276., ил. 392.

[193] Даниленко В.Н. Некоторые итоги раскопак Херсонеса Таврического(1958-1964) // Ученые записки Пермского

ГосударственногоУниверситета. 1966. Вып. 143. С. 80., Мал. 4; Белов Г.Д. К изучению экономики и быта позднесредневекового Херсонеса // СА. 1941. Вып. 7. С. 242. Мал. 10.

[194] Малевская М.В. Поливная керамика древнего Новогрудка // СА. 1969. вып. 3. С. 196.

[195] ДН. С. 39., Мал. 31,4.

[196] ДН. Мал. 55,13; 62, 2; Гуревич Ф.Д., Джанполадян Р.М., Малевская М.В. Op. cit. С. 12., Табл. VIII-IX.

[197] Тамсама

[198] ДН. Мал. 53,12.

[199] ДН. С. 96., Мал. 72,2; Гуревич Ф.Д., Джанполадян Р.М., Малевская М.В. Op. cit. Табл. XI,2.

[200] Lamm C.J. Mittelalterliche Glaser und Steinschnittarbeiten aus dem nahen Osten. Berlin, 1930. Taf. 127,2; 132,22.

[201] Пех Г.И. Раскопки древнего Слонима // Древности Беларуси. Минск, 1966. С. 279.

[202] Алексеев Л.В. Смоленская земля. М., 1980. Мал. 12; Полубояринова М.Д. Op. cit. Мал. 2,8-8; Яніцкая М.М. Op. cit. С. 103; Звесткі аб знаходках у Віцебску паведаміў Л.В. Калядзінскі.

[203] Бусятская Н.Н. Художественное стекло стран Ближнего Востока на территории Восточной Европы // Вестник МГУ. 1972. Вып. 2. С. 84-89; Дадзеныя аб знаходках на гарадзішчы атрыманы ад Е.Н. Носава.

[204] Holubowicz W. Opole w wiekach X-XII. Katowice, 1956. S. 251., rys. 101.

[205] Художественная керамика средневековогоИрана. Л., 1971. С. 3.

[206] ДН. Мал. 29,1,2,4,5; 53,2,5,10,13,16,17.

[207] SPA [11] 650, 663, 668; Lane A. Islamic pottery from the ninth to fourteen centuries A.D. London, 1956. P. 33. [1] 74; Hein W. Fruhe islamische Keramik im Osterreichischen Museum fur angewandte Kunst ип Wien. Wien, 1963. Taf. III; Rosen-Ayalon M. La potene islamique. Paris, 1974. Pl. LXIX, p.

[208] ДН. Мал. 29,1,4; 53,10; SPA V,N 616.

[209] ДН. Мал. 84,4., С. 110.

[210] ДН. Мал. 48,1,2; SPA V, N 730.

[211] ДН. Мал. 53,2.

[212] ДН. Мал. 59,24; SPA, V, N 649.

[213] ДН. С. 41., Мал. 29,2; Lane A. Op. cit. P. 126, pl. 40.

[214] ДН. С. 47, 67, 82., Мал. 37,4; 53,2,5,10,13,17; 66,25,26; Lane A. Op. cit. pl. 52: SPA V, N 598.

[215] Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. Минск, 1975. Мал. 33,8; 2) Раскопки в Лукомле // Древности Беларуси. Минск, 1969. С. 321., Мал. 15,6.

[216] Даркевич В.П., Стародуб Т.Х. Op. cit. С. 192; Куглюковский П.И. Исследование древнего жилища в г. Суздале // АО 1973 г. М., 1974. С. 61; Звесткі аб знаходках у Гарадзішчы паведаміў Е.Н. Носаў.

[217] Pope A.U. Suggestion towards the indicution of medieval iranian faience // Иранское искусствоа и археология. М.-Л., 1939. С. 176.

[218] Даркевич В.П., Стародуб Т.Х. Op. cit. С. 192.

[219] Вактурская Н.Н Классификация средневековой керамики Хорезма (IX-XVII вв.) // Керамика Хорезма. М., 1959. С. 328; Пуганенкова Г.А. К открытию люстровой керамики Мерва XII ст. // Известия Академии наук Туркменской ССР. 1960. Вып. 4. С. 84-95.

[220] Ибрагимов Ф.А. Иранская фаянсовая керамика из раскопок средневековых городов Азербайджана // Тезисы докладов II всесоюзной конференции по искусству и археологии Ирана и его взаимосувязь з искусствоам других народов в Средние века. М., 1973. С. 24; Макадзе М.А. Несколько люстровых образцов з городишча Дманиси (XII-XIII вв.). // Тамсама С. 25; Шелковников Б.А. 1) Поливная керамика из раскопок г. Ани. Ереван, 1957. С. 69; 2) Фаянсы, расписанные люстром по белай непрозрачной глазури з Орен-Кала // МИА. 1959. вып. 67. С. 302-323; Мамаиашвили Н.Ф. К истории производства и потребления фаянса в средневековой Грузии // Археологические памятники Феодальной Грузии. Тбилиси, 1969. С. 124-125.

[221] Кверфельдт Э.К. Керамика Ближнего Востока. Л., 1947. С. 56-57.

[222] ДН. С. 56; Павлова К.В. 1) Раскопки могильника ... С. 100, 103., Мал. 38,1; 2) Могильники у деревень ... С. 63., Мал. 19,8; Фехнер М.В. Op. cit. С. 152.

[223] Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. С. 014; 2) Города ... Мал. 50,4,15; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 78.

[224] Фехнер М.В. Op. cit. С. 154-155.

[225] Павлова К.В. 1) Раскопки могильника ... С. 100; 2) Могильники у деревень... С. 63; Фехнер М.В. Op. cit. С. 155-156.

[226] Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. С. 104; 2) Города ... Мал. 50, 2; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 78.

[227] Павлова К.В. Раскопки курганов у деревень ... Мал. 1,1., С. 86.

[228] Antoniewicz J. Niektore spedniowieczne skarby pruskie i litewskie i ich związki z Rusią. // Liber Josepho Lostrzewski octogenanrio a veneratoribus dicatus. Wrocław-Warszawa-Kraków, 1968. S. 550.

[229] Сергеева З.М. О подковообразных фибулах ... С. 37;

Зоценко В.Н. Импорт изделий Юго-Восточной Прибалтики в Киев (X - первая половина XIII вв.) // ДГ. С. 36.

[230] ДН. С. 155; Гуревич Ф.Д. Внешие связи древнерусских городов Понеманья // КСИА. 1982. вып. 171. С. 47.

[231] Даркевич В.П. 1) светское искусствоа ... С. 296; 2) Международные связи. // Древняя Русь, город, Замак, село. М., 1985. С. 391, 395; Бусская Н.Н. Op. cit. С. 88; Рыбина Е. А. Археологические очерки новгородской торговли. М., 1978. С. 19-21; Асташева Н.И. Op. cit. С. 123.

[232] Якобсон А.Л. Рецензия на работу: Антонова И.А., Даниленко В.Н., Романчук А.И. Средневековые амфоры Херсонеса // СА. 1973. Вып. 3. С. 287.

[233] Колесникова Л.Г. Op. cit. Мал. 2,4.

[234] Косцюшко-Валюжинич К.К. Отчет о раскопках в Херсонесе Таврическом // ИАК. 1906. Вып. 20. С. 55., Мал. 27.

[235] ДН. С. 98, 100.

[236] Штыхов Г.В. Города ... С. 116; Фехнер М.В. Op. cit. С. 154.

[237] Schmidt R. Die Hedwigsglaser und die verwandten faimidischen Glas und Kristallschnittarbeiten. // Jahrbuch des Schlesischen Museums fur Kunstgewere und Altertumer. B. IV. Breslau, 1912. S. 56, 58, 59.

[238] Гуревич Ф.Д. Византийский импорт ... С. 79.

[239] Schmidt R. Op. cit. S. 57.

[240] Musianowicz K. Drohiczin we wczesnem sredniowieczu // MW. 1959. IV. S. 220.

[241] ДН. С. 156.

[242] Тамсама

Глава 8. Духоўная культура

Наваградак быў горадам позняга язычніцтва. Яго гісторыя з канца X да канца XI і нават мяжы XI-XII стст. знаходзіцца ў дахрысьціянскім часе. Рэаліі язычніцкіх вераваняў на паселішчах рэдкія. Не выключана, што амулетам гэтага часу быў авальны выраб з лазурыту (ляпіс-лазур) з двума адтулінамі, які знайдзены ў мацерыковай яме Малага Замка (мал.). Радовішча лазурыту знаходзяцца ў Сярэдняй Азіі, аднак наваградскую знаходку трэба звязваць скарэй з палавецкімі старажытнасьцямі, сярод якіх сустракаюцца вырабы з гэтага мінерала[1]. Як адзначана ў папярэдняй главе, асобныя рэчы паўднёвых качэўнікаў у Наваградку вядомыя (с. 00). Магчыма, што ахоўныя функцыі прыпісваліся бурштыну, які ў гэты час сустракаецца выключна ў выглядзе неапрацаваных кавалкаў. Можна мяркаваць, што з язычніцкімі вераваньнямі звязана мініяцюрная сякерка з жалеза, з выбітым на ёй знакам[2]. Знайдзеная ў культурным слоі XI ст. бронзавая чара (с. 00) — рэч хрысьціянскага культу. Аднак, у язычніцкім Наваградку яе маглі выкарыстоўваць не па прамым прызначэньні. Далучым да названых знаходак прасвірлаваныя іклы мядзведзя і дзіка.

Язычніцтва наваградцаў у раньні перыяд існаваньня паселішча, а пазней гораду, адлюстравалася, галоўным чынам у яго курганным магільніку. Звычай трупаспаленьня, якога жыхары трымаліся ад часу заснаваньня паселішча ў Наваградку, паступова замяняўся звычаем трупапакладаньня. Па абраду пахаваньня і інвентару наваградскі курганны магільнік амаль не адрозніваецца ад навакольных вясковых помнікаў. Толькі ў інвентары жаночых пахаваньняў сустракаюцца скроневыя кольцы, адзін канец якіх сагнуты ў форме спіралі і шмат бісеру. (с. 00). Істотна, што ў Наваградскім магільніку не было пахаваньняў, якія сінхронныя самаму раньняму пасяленьню на Малым Замку. Так у курганах не знайдзена старажытнейшая кераміка часткова абточаная на ганчарным коле. Магчыма, што такія пахаваньні не былі намі раскопаны, але не выключана, што першыя жыхары будучага Наваградка хавалі сваіх нябожчыкаў ў якімсьці іншым месцы[3].

Пранікненьне хрысьціянства ў Наваградак азнаменавалася пабудовай храма на узвышшы, што знаходзіцца на захад ад Малага Замка і заселена ад XI стагоддзя. Яшчэ ў 70-я гады мінулага стагоддзя была выказана думка, што пад сёньняшнім храмам Барыса і Глеба, пабудаваным у XVI ст. павінны быць рэшткі старажытнай царквы[4]. Яны былі адкрыты і даследаваны М.К. Каргерам у 1961, 1962 і 1965 гг. Раскапаны помнік аўтар

рэканструяваў у выглядзе чатырохсталповага трохапсіднага храма, які абкружаны галерэяй. У сярэднім нефе царквы адткрыта частка майолікавай падлогі. Ва ўсходняй частцы паўднёвага прытвора сабрана шмат фрагментаў тынкоўкі, пакрытай фрэскавым роспісам і кавалкі з граффіці. Кладка галоўнага аб'ёму храма з добра абчасаных квадратаў порыстага камяню з праслойкамі плінфы, паўтаряе кладкі царквы Дабравешчаньня ў Віцебску. М.К. Каргер мяркаваў, што гэта тэхніка была занесена з правінцыйна-візантыйскай архітэктуры, магчыма з Крыму, спачатку у Віцебск, а потым у Наваградак. Сьцены галерэі царквы, складзеныя з плінфы на растворы з дамесам цэмянкі (так званы утоплены рад), былі ўзведзены полацкімі будаўнікамі. М.К. Каргер датаваў наваградскі храм XII ст.[5]

На думку П.А. Рапапорта, падабенства наваградскай і віцебскай цэркваў можна тлумачаць тым, што ў 20-я — 40-я гады XII стаг. у склад віцебскай будаўнічай арцелі ўваходзілі візантыйскія будаўнікі. Пасля пабудовы храма ў Віцебску яны выбудавалі галоўны гмах царквы ў Наваградку. Галерэя ж наваградскага храма была зроблена полацкімі майстрамі[6].

Час пабудовы Барысаглебскай царквы ў Наваградку можна ўдакладніць матэрыяламі жылой пабудовы Малага Замка з фрэскавым роспісам. Фрэскі храма і жылой пабудовы сходныя па гаме колераў і арнаментах. Відавочна, што сьцены адзінага жылога дому з фрэскавым роспісам і сьцены царквы былі распісаны аднымі і тымі ж мастакамі і, прыблізна, у адзін і той жа час. Жыльлё, аб якім гаворка, па стратыграфічных дадзеных і інвентару належыць да другой чвэрці XII стагоддзя. Заканчэньне будаўніцтва Барысаглебскай царквы Наваградка мжна датаваць гэтым самым часам.

Храм Барыса і Глеба быў збудаваны ў Наваградку за межамі гарадскіх умацаваньняў прыкладна ў той час, калі там фармаваліся дзяцінец і вакольны горад. Было б дзіўна, калі б у самым горадзе не было сваёй царквы. Нажаль, непасрэдных дадзеных аб існаваньні храмаў на тэрыторыі Замкавай гары і Малага Замка няма, але ўскосныя матэрыялы дазваляюць мяркаваць, што яны існавалі.

Для Малага Замка асновай для такога мяркаваньня з'яўляюцца хрысьціянскія могілкі XII-XIII стст., што займалі паўднёвую частку пляцоўкі. Хрысьціянскія могілкі ўзнікалі, звычайна, паблізу храмаў. За час раскопак было аткрыта 150 пахаваньняў у трунах і без іх. 83 пахаваньні датаваліся першай паловай XII ст., перакрываючы, а часам і праразаючы рэшткі забудовы X-XI стст. Могілкі, размешчаныя паблізу багатых дамоў вакольнага гораду былі месцам пахаваньня багатых жыхароў

Наваградка. Там хавалі не толькі насельнікаў квартала залатароў, але і багацейшых насельнікаў дзяцінца. Аб гэтым можна мяркаваць па жаночаму пахаваньню, пры якім знайдзены срэбныя позалочаныя бляшкі, адціснутыя з матрыцы Замкавай гары (с. 00). У перыяд максімальнага росквіту вакольнага гораду тэрыторыя могілак была забудавана. Гэта адбывалася ў другой палове XII ст. Гарадская забудова на месцы хрысьціянскіх могілак мела месца і ў другіх старажытнарускіх гарадах. У Старой Разані грунтовы могільнік жыхароў гораду XI - першай паловы XII ст. быў перакрыты жылой забудовай. На дзяцінцы Чарнігава могілкі каля царквы ў другой палове XII ст. былі замошчаны жоўтай плінфай[7]. У Наваградку, у пачатку XIII ст., у сувязі з рэзкім заняпадам вакольнага гораду, тэрыторыя, аб якой гутарка, ізноў становіцца могілкамі. Але цяпер там хавалі, галоўным чынам, дзяцей. Мяркуючы па наібольшай канцэнтрацыі пахаваньняў , храм на тэрыторыі Малага Замка павінен быў стаяць паблізу паўднёва-усходняй часткі пляцоўкі, дзе зараз знаходзіцца мемарыяльны капец Адама Міцкевіча (дыям. 25 м.)[8].

Аб існаваньні храма на Замкавай гары можна мяркаваць па звестках летапісца пад 1262 г., які паведаміў аб хрышчэньні князя Войшэлка: “Воишелк же нача княжити в Новегородце в поганьстве буде... а посемь вниде страх Божий во сердце его, помыслив собе хотя прияти святое крещение и крестися ту в Новегородце и нача быти во хрестьянстве”[9]. Трэба думаць, што Войшалк хрысьціўся ў царкве, якая была пры яго двары на дзяцінцы.

Аб археалагічных матэрыялах Замкавай гары, што сведчаць аб існаваньні там старажытнарускага храма, гаварылася ў главе 3 (с. ...). Гутарка аб драўляных насьцілах, што ляжалі пад насьціламі, пры царкве XIV ст. і, верагодна, суадносіліся з больш раньняй драўлянай царквой. Магчыма, што да старажытнарускага храма дзяцінца належалі часткі бронзавай люстры-хораса (мал.).

Хрысьціянства, якое з’явілася ў Наваградку не раней за XII ст., пачало ў горадзе інтэнсіўна распаўсюджвацца. Праўда, аб гэтым можна мяркаваць па дадзеных, якія звязаны з прывеліраванай часткай гарадскога насельніцтва. Цяжка сказать як прынялі новую рэлігію простыя гаражане. Аб познім пабытаваньні язычніцтва сведчыць курган XII ст. гарадскога магільніка[10]. Больш трывалым было язычніцтва ў ваколіцах Наваградка, где курганныя магільнікі існавалі да XIII ст. Уплыў хрысьціянскай абрадавасьці праявіўся ў іх у тым, што нябожчыкі былі пахаваны, пераважна, у ямах[11]. Эвалюцыя пахавальнаго абраду ў сельскіх жыхароў ваколіц Наваградка адбывалася таксама як і ў другіх старажытнарускіх абласьцях, у прыватнасьці ў Смаленскай зямлі[12].

У хрысціянскім Наваградку з'яўляюцца разнастайныя культавыя вырабы (крыжы-нацельнікі, энкалпіёны, абразкі і інш.), як мясцовай работы так і прывазныя. У пошуках аналогій наваградскім знаходкам мы, у першую чаргу, звяртаемся да матэрыялаў старажытнарускіх гарадоў, але нярэдка яны сустракаюцца за межамі Заходняй Русі.

У Наваградку знайдзены наступныя культавыя вырабы:

Каменныя крыжы-цельнікі (10 экзэмпляраў). Усе знаходкі, за выключэньнем адной, паходзяць з Малага Замка. Пяць цельнікаў зроблены з гліністага сланца. Сярод іх два гладкія роўнабаковыя. Пры гэтым маленькі да канца не апрацваны (мал.). Другі цельнік, захаваны часткова, запаліраваны (мал.). Роўнабаковыя крыжыкі з гліністага сланца, вапняка і другіх мясцовых парод знайдзены ў Ваўкавыску і Тураве[13]. Два цельнікі гранёныя. Цалкам захаваны экзэмпляр з пабудовы XIII ст. 3х2,2 см., падобны да знаходкі з Пскова[14].

Рэдкай знаходкай быў цельнік з троху звужанымі канцамі (3,7х2х8 см.). На ім выбіта пляцёнка[15], што нагадвае арнамент наваградскіх драўляных вырабаў і, праз гэта, можа быць вырабам мясцовага камянярэза. Разам з тым, як ласкава паведаміў В.Г. Пуцко, каменны крыж з такім самым арнаментам знайдзены ў старажытным Галічы.

Два цельніка з ружовага шыферу, відавочна, былі прывазныя. Не цалкам захаваны далікатны крыжык з пабудовы з фрэскамі (шырынёй 2,5 см.) мае квадратнае скрыжаваньне і зкругленыя стораны, упрыгожаныя валікамі. Другі крыж з культурнага слоя 3,7х3,2 см. таксама з квадратным скрыжаваньнем і закругленымі канцамі. Канцы ўпрыгожаны ўрэзанымі лініямі[16]. Крыжы з ружовага шыфера былі разнастайныя па форме. Аб гэтым сведчаць знаходкі з Каладзяжына, Сярэдняга Паволжжа[17] і іншых месцаў.

Тры цельніка з шэра-белага гладкага камяню, што нагадвае мармур — "карсунчыкі", аднатыпныя. Яны роўнабаковыя 2,5х1,8 - 2 см. і паходзяць з жылых пабудоў XII ст.[18] Аналагічныя крыжы добра вядомыя ў многіх помніках. У Заходняй Русі яны знайдзены ў Мінску і Бярэсьці[19]. Сустракаюцца ў Падняпроўі, у Паўднёва-Заходняй Русі, на тэрыторыі вяцічаў[20] і другіх тэрыторыях. У самым найменьні такіх крыжоў прыгадваецца места іх вырабу — Херсанэс.

Металічныя крыжы - цельнікі (7 экзэмпляраў) знайдзены выключна на Малым Замку. Аб вырабе металічных цельніков на Малым Замку сведчыць ліцейная форма, на абедзьвух баках якой маюцца паглыбленьні для адліўкі тонкіх металічных крыжоў[21]. Вырабаў, якія адлітыя ў дадзенай форме знайсьці не ўдалася.

Відавочна, да мясцовых рэчаў належыць бронзавы роўнабаковы крыжык 2х2 см.

У культурным слоі адначасова знайдзены два бронзавыя крыжы з выемчатай эмаллю. Адзін з іх 3х2,6 см., з трохлопаснымі канцамі[22], а другі 2,2х1,8 з прамавугольнымі (мал.). Крыжы з выемчатай эмалью ў XI-XIII ст. выраблялі ў Кіеўскай зямлі. Яшчэ адзін цэнтр па вырабу такіх самых крыжоў, з'явіўся ў XII ст. на тэрыторыі Латвіі[23].

У пабудове другой паловы XII ст. знайдзены абламаны бронзавы цельнік са зкругленымі канцамі. Скрыжаваньне яго запоўнена зялёнай эмаллю. Аналагічны крыж знайдзены ў курганным магільніку каля в. Засьвір Мінскай вобласьці[24].

Бронзавы крыж 2,8х1,8 см. з квадратным скрыжаваньнем і прамавугольнымі канцамі (васьмікутны) мае паралелі ў Прыдняпроўі[25]. Тамсама вядома аналогія цельніку 4х2,5 см., на адным баку якога выява Хрыста, а на другім выразаны літары ХС[26]. Яшчэ адзін бронзавы крыж (4х2,5 см.) са стылізаванай выявай Багародзіцы і пашыранымі канцамі, да некаторай ступені, нагадвае цельнік, што захоўваўся ў музеі Кіеўскай духоўнай акадэміі[27].

Энкалпіёны (9 экзэмпляраў), з якіх чатыры прыходзяцца на Малы Замак і пяць на Замкавую гару. Цалкам захаваліся толькі два энкалпіёны. Знаходка з Малага Замка 2,8х1,8 см., выраблена з залатой бронзы, на адным з бакоў мела выяву чатырохканцовага крыжа[28]. Складні гэтага тыпу вядомыя сярод старажытнарускіх помнікаў (Ноўгарад, Прыдняпроўе, Яраполч), а таксама на тэрыторыі Польшчы (Драгічін, Обровец каля Грубешова)[29]. Ва Усходняй Латвіі знайдзена ачэльле, у якім было некалькі такіх энкалпіёнаў і трохлопастныя крыжыкі з выемчатай эмаллю[30].

Другі энкалпіён, захаваны цалкам (6х4 см.), знайдзены на Замкавай гары. На яго вонкавым баку выява ўкрыжаваньня, над якім нанесены "мальтыйскі" крыж. На канцах захаваліся медальёны са сьцёртымі выявамі. На адваротным баку выгравіраваны васьміканечны крыж, а па баках акруглыя медальёны, запаўненьне якіх сьцёрта (мал.). Падобныя складні добра вядомыя. Л.В. Аляксееў адзначае іх у Друцку, Кіеве, Ноўгарадзе, Княжай гары, Каневе, Грыгараўцы, Камянцы-Падольскім, Вырбычцы і на Паўночным Каўказе[31].

На рэштках створак двух складняў, знайдзеных у абедзьвух частках гораду, выявы былі толькі рэльефныя. Энкалпіён з Малага Замка меў у скрыжаваньні фігуру Хрыста і пагрудныя фігуры ў медальонах па баках[32]. На Замкавай гары ацалеў абломак з выявай святога ў медальёне (мал.). На тэрыторыі Беларусі падобныя складні знайдзены ў Гродне і Мінску. Сустракаюцца

яны таксама ў Падняпроўі, Яраполчы Залескім, на рускім паселішчы ў Сярэднім Паволжжы[33] і на іншых помніках.

На тэрыторыі Малага Замка знайдзены абломак энкалпіёна са слядамі пазалоты[34]. Паралелі яму невядомыя. Сярод знаходак Замкавай гары - абломкі трох складняў - створка і дзьве пятлі, адна з якіх дыяметрам 2,4 см. належала вялікаму энкалпіёну.

Наваградскія складні, форму якіх можна было вызначыць, тыповыя для помнікаў Старажытнай Русі. Г.Ф. Карзухіна разглядала гэтыя вырабы як прадукцыю кіеўскіх рамеснікаў і лічыла, што адбывалася эвалюцыя ад больш раньніх (XI - пачатак XII стст.) складняў з суцэльнай рэльефнай арнаментацыяй да энкалпіёнаў са сплошчанымі фігурамі, што з'явіліся, прыкладна, у другой чвэрці XII ст.[35] Некаторыя папраўкі ў даціроўку Г.Ф. Карзухінай унеслі А.А. Медынцава і М.В. Седова[36]. На думку В.Г. Пуцко, эвалюцыя вырабленых у Кіеве энкалпіёнаў храналагічна супадае са зменай формаў іншых відаў пластыкі, уключаючы каменныя рельефы, корапластыку і тарэўтыку[37].

Знаходка ў Наваградку абломка складня, які адрозніваецца ад кіеўскіх вырабаў, можа значыць, што падобныя рэчы выраблялі ў іншых месцах. Так ад характэрных кіеўскіх энкалпіёнаў адрозніваецца складзень гарадзішча Майшагола ва Ўсходняй Летуве[38].

У абедзьвух частках гораду знайдзена шэсьць абразкоў: два з іх бронзавыя, тры каменныя і адзін са шкляной масы. На абломку абразка з Малага Замка на адным баку прадстаўлены Хрыстос, на другім расьцвіўшы крыж. Падобны абразок вядомы ў Падняпроўі (Вяцічы).[39]

Другі бронзавы абразок паходзіць з Замкавай гары. Гэта прамаввугальны складзень з алавяністай бронзы 5x4,5 см. з вушкам. Абразок вельмі пацярпеў ад агню. Тым не меньш на яго створках можна было заўважыць рельефныя выявы чалавечых фігур. Іх атрыбуцыя належыць І.І. Плешанавай. Гэта - фігуркі Барыса і Глеба. На правай створцы паказаны Барыс, у плашчы, з сагнутай правай рукой. У выцягнутай левай руцэ ён держіт мадэль аднаглавага храма са шлёмападобным купалам. Частка створкі, дзе павінна была быць паказана галава, пашкоджана. Левую створку займае фігура Глеба. Як і Барыс, ён апрануты ў плашч. На яго галаве княжацкая шапка з круглай тульяй. У выцягнутай правай руцэ Глеб трымае мадэль такога ж храма, як і Барыс, левая рука Глеба апушчана (мал.).

Культ Барыса і Глеба - першых рускіх святых - шырока адбіўся ў творах старажытнарускай літаратуры і мастацтва. Па высновах В.І. Лесючэўскага і М.Х. Алешкоўскага, якія займаліся даследваньнем гэтага культу, шанананьне святых братоў не было

аднолькавае. На першым этапе, пераважна ў XI ст., Барыса і Глеба шанавалі як лекараў і цаліцеляў і паказвалі з мучаніцкімі крыжамі і мадэлямі храмаў. Пры гэтым, браты фігуравалі без бародаў. З пачатку XII ст. Барысу і Глебу пакланяліся як воінам-заступнікам Рускай зямлі, з крыжамі ў руках і з мячамі на поясе. Часам мячы знаходзяцца ў руках князёў. У больш позніх помніках браты ўзброены коп'ямі. Барыса, як правіла, паказваюць з барадой, а Глеба без барады[40].

Прыняўшы такую храналогію іканаграфіі Барыса і Глеба, наваградскі абразок, на якім браты трымаюць у руках мадэлі цэркваў, трэба аднесьці да часу, калі іх лічылі цаліцелямі, г.зн. да канца XI ст. У гэты час ён быў адліты. Аднак, у Наваградак абразок трапіў не раней першай паловы XII ст., паколькі, як паказана вышэй, у нашым горадзе няма хрысьціянскіх рэалій раней гэтага часу.

Алавяністая бронза абразка аналагічная складу метала энкалпіёнаў кіеўскага паходжаньня. Наш абразок таксама трэба разглядаць як імпарт з Кіева. Прамыя аналогіі ёй невядомыя. В.І. Лесючэўскі, не спасылаючыся на крыніцу, пісаў, што сярод знаходак, якія зроблены ў розны час у Дзесяціннай царкве, ёсьць створка маленькага абразка, з выявай Барыса, які трымае ў руцэ храм. На другой створцы, па мяркаваньню аўтара, павінна была знаходзіцца выява Глеба[41]. Не выключана, што абразок з Дзесяціннай царквы быў адліты ў адной форме з наваградскай знаходкай. Пакуль жа, апошняя, верагодна з'яўляецца адзіным абразком - складнем з выявай першых рускіх пакутнікаў.

Крыніцазнаўчае даследваньне наваградскага абразка можа мець свой працяг. На думку Лесючэўскага і Алешкоўскага, выявы Барыса і Глеба на энкалпіёнах прадстаўляюць з сябе частку агульнай кампазіцыі капіруемага іканапіснага арыгіналу і браты былі прадстаячымі каля якогасьці цэнтру. Трохчастковая кампазіцыя вядома ў Барысаглебскай іканаграфіі на фрэсках храма Нярэдзіцы ў Ноўгарадзе, дзе паміж Барысам і Глебам стаіць альбо Хрыстос, альбо айтец братоў — князь Уладзімір. У цэнтры мог быць проста крыж, як гэта ёсьць на Барысаглебскім амулеце-змеевіку XII ст. з дзяржаўнага Гістарычнага Музея ў Маскве[42].

З паўсюдным пашырэньнем культа Барыса і Глеба на Русі, ён прыходзіць і ў заходнерускія землі. Сыны Усяслава Полацкага і Усеваладкі Гродзенскага насілі імёны Барыса і Глеба[43]. У пачатку XII ст. у княжацкай рэзідэнцыі Бельчыцы паблізу Полоцка ўзводзіцца Барысаглебскі манастыр[44]. Барысу і Глебу быў прысвечаны храм на Каложы, пабудаваны за межамі гарадскіх умацаваньняў — ён з'яўляецца цэнтральным помнікам манументальнага дойлідства гродзенскай архітэктурнай

школы[45]. Вядома аб Барысаглебскіх могілках паблізу старажытнага Турава. У 1909 г. Мінскай гісторыка-археалагічнай камісіяй там быў адкрыты саркафаг з ружовага шыферу, у якім знайдзены чалавечыя косьці і парчовыя ніткі[46]. Назва могілак і саркафаг дамангольскай пары даюць падставу мяркаваць, што на тэрыторыі могілак мог знаходзіцца Барысаглебскі храм. Выявы Барыса і Глеба захаваліся на фрэсках Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастыра[47].

На тэрыторыі Заходняй Русі вядомыя прадметы металічнай і каменнай пластыкі з выявамі святых братоў — энкалпіёны з Друцка і Гродна, абразка з Мсьціслаўля і Копысі, створка абразка з Полацка. У Полацку знайдзены каменны абразок з выявай Барыса. Барыс альбо Глеб паказаны на свінцовай пломбе з Мінска. Істотна прылучыць да гэтым знаходак “Барысавы камяні” Полацкой зямлі — манументальныя помнікі эпіграфікі XII ст.[48]

У XII ст. культ Барыса і Глеба трапляе ў Наваградак, што праяўляецца ў пабудове Барысаглебскага храма. У кнізе “Старажытны Наваградак” адзначаны фрагмент фрэскавага роспісу з багатага жылішча вакольнага горада, на якім паказана галава маладога князя, магчыма, Глеба[49]. Бронзавы абразок з выявай Барыса і Глеба з’яўляецца яшчэ адным сведчаньнем шанаваньня святых братоў у хрысьціянскім Наваградку.

Пауднёварускі культ Барыса і Глеба пападае ў Наваградак двума шляхамі. Непасрэдна з Кіева, адкуль быў прывезены абразок-складзень і праз полацкіх і візантыйскіх будаўнікоў, а таксама праз фрэскістаў, якія пабудавалі наваградскую царкву і распісалі яе сьцены і сьцены багатай жылой пабудовы.

У культурным слоі горада знайдзены тры каменныя абразкі. З Замкавай гары паходзіць прамаввугальны (5,2х4,2 см.) абразок з шэрага каменя, на якім выразана паясная фігура Міколы з евангельлем у левай руцэ. Лік святога пашкоджаны. Захаваліся валасы і частка барады (мал.). Т.В. Нікалаева датуе гэты абразок XIII ст. і лічыць вырабам скарэй адукаванага рамесніка чым майстра прафесіянала[50].

Абраз Міколы, які займаў выключнае месца ў рэлігійнай свядомасьці жыхароў Старажытнай Русі і адлюстраваўся ў каменнай пластыцы[51], атрымаў сваё ўвасабленьне і ў заходнерускіх каменных абразках. Такі паўкруглы абразок з ружовага сланца, дзе Мікола паказаны з евангельлем у руцэ (выпадковая знаходка). У Мінску знайдзены прамавугольны абразок з светла-шэрага сланца. На ім выразаны двох святых — Мікола з евангельлем і Стэфан. Вышэй іх знаходзіцца бласлаўіцель — Спас-Эмануіл[52].

На думку Т.В. Нікалаевай, значная колькасьць абразкоў у

заходнерускіх землях і разам з тым іх адарванасьць ад вялікіх культурных старажытнарускіх цэнтраў сведчыць пра іх мясцовы выраб[53]. Гэта выснова распаўсюджваецца і на наваградскага Міколу.

На тэрыторыі Малага Замка знайдзены абломак акруглага абразка з ружовага шыфера. На ім выразана галава чалавека, шасьціканцовы крыж і літары: ХС. Над німбам маецца літара “О”[54]. Абразок з такога ж камяню, знайдзены каля Дзесяціннай царквы ў Кіеве з падобнымі выявай і надпісам, Т.В. Нікалаева, разглядае як прысвечаны Хрысту Эммануілу[55]. Аб паходжаньні наваградскага абразка сведчыць, у першую чаргу, матэрыял, з якога ён зроблены. Для каменных кіеўскіх абразкоў тыповы твар з міндалепадобнымі вачамі, акантаванымі здвоенымі лініямі, выразна адчэрчаны нос, а таксама шасціканцовы крыж[56]. Гэтыя асаблівасьці ўласьцівыя і нашай знаходцы.

У дадатак да абразкоў, якія апублікавала Т.В. Нікалаева далучым абразок з ружовага шыферу, знайдзены ў Звенігарадзе: на ім выявы двух апосталаў, якія плачуць[57].

У культурным слоі Замкавай гары знайдзены абламаны круглы абразок (дыям. 4,5 см.) з чорнага сланца альбо стэатыту. Па краі яго маецца выступаючая рамка, а выява прадстаўляе Багародзіцу з Дзіцяткам тыпу “Замілаваньне” (мал.). Абразок належыць да візантыйскіх вырабаў. З такога ж матэрыялу і такой жа формы і памераў у Херсанэсе знайдзены абразок з выявай Хрыста Пантакратара. З гэтага ж гораду паходзяць іншыя абразка са стэатыту[58]. Не выключана, што наваградская знаходка была вырабам херсанэскага камнярэза.

У 1974 г. пры разпрацоўцы культурнага слоя XV-XVI стст., сярод пад’ёмнага матэрыялу быў знайдзены шкляны абразок-ліцік. Гэта найменьне даецца літым шкляным вырабам, якія апрацаваныя як камеі. На наваградскім авальным ліціке (4,7х3 см.) выява сцэны Раства. Зправа відаць Марыю — яна трымаецца за яслі, якія абапіраюцца на дзьве аркі. Злева сядзіць Іосіф з кіем у руцэ. Галовы Марыі і Іосіфа абкружаны німбамі. У яслях ляжыць немаўля Хрыстос. Над яслямі відаць галовы асла і быка, якія схіліліся над младзенцам. У верхняй частцы абразка маецца гречаскі надпіс “НГЕІ ІНС ІС” (мал.).

Наваградскі ліцік адліты ў адной форме яшчэ з двума абразкамі. Адзін з іх захоўваецца ў музеі хрысьціянскіх старажытнасьцяў Ватыкану, а другі, які паходзіць з Александрыі, у Ашмолен музеі Оксфорда. Аб тым, што ўсе тры абразкі адлітыя ў адной форме сведчыць не толькі іх матэрыял, форма, сюжэт і кампазіцыя, але і брак адліўкі ў выглядзе палоскі ў ніжняй частцы[59].

Авальныя ліцікі меньшага памеру з аналагічным сюжэтам і кампазіцыяй, але ў люстэркавым адбітку захоўваюцца ў музеі Думбартан-Окса[60]. На тэрыторыі нашай краіны маецца больш за 20 абразкоў ліцікаў невядомага паходжаньня з біблейскімі сюжэтамі (Дзярж. Эрмітаж, Дзярж. Гістарычны музей, Аружэйная палата і інш.)[61].

Абразкі ліцікі ў вялікай колькасьці вядомыя ў музеях Заходняй Еўропы і ЗША. У літаратуры яны трактуюцца як знакі паломнікаў. М. Рос, які датуе гэтыя абразкі XI-XIII стст., бачыць у іх вырабы візантыйскага паходжаньня, якія выраблялі ў Канстантынопалі і пасля яго падзеньня ў 1204 г.[62] Заходнегерманскі вучоны Г. Венцэль, якому належыць каталог абразкоў-ліцікаў, за візантыйскія лічыць толькі невялікую іх колькасьць, і мяркуе, што галоўная маса абразкоў была зроблена ў Венецыі ў XIII ст. На думку даследчыка, шкляныя ліцікі былі знакамі паломнікаў і займалі прамежкавае становішча паміж масавымі свінцовымі знакамі і дарагімі памятнымі знакамі са слановай косьці[63]. Погляды Г. Венцэля падзяляла А.У. Банк. Разглядаючы навагрaдскі абразок яна адзначае, што іканаграфічны варыянт яго кампазіцыі незвыклы для Візантыі, негледзячы на грэчаскі надпіс. Яслі ў выглядзе вежападобнага збудаваньня ў два паверхі з аркамі ўнізе, блізкія заходнееўрапейскай іканаграфіі. Трактоўка фігур таксама адрозніваецца ад візантыйскай[64].

Шкло навагрaдскага ліціка, згодна аналізу, аказалася тыпова візантыйскім: натрыева-кальцыева-крэмнязёмным з дамескам марганцу. Па дадзеных трасалагічнай лабараторыі ЛАІА (заключэньне Г.Ф. Карабковай), абразок, пасля таго як ён быў адліты, дадаткова не апрацоўвалі. Гэта, прынамсі, азначае, што такія ліцікі былі вырабамі масавай вытворчасьці.

З'яўленьне ліціка ў Навагрaдку можна звязаць з рэальным паломніцтвам. Вышэй адзначалася, што пад 1262 г. летапісец успамінае аб хрышчэньні язычніка, князя Войшалка ў Навагрaдку (с. 00). Пасля хрышчэньня, стаўшы рэўнасным хрысьціянінам, Войшэлк вырашыў зрабіць вандроўку да святых месцаў. Летапіс двойчы паведамляе аб паломніцтве Войшэлка. Першае паведамленьне належыць да 1255 г., калі князь прыходзіць да Данііла ў Узвышша і просіцца ісьці ў Візантыю, на Афон (Святую Гару). Данііл паказвае яму шлях праз Венгрыю, але Войшалк не змог трапіць у Візантыю і дайшоўшы да Балгарыі вярнуўся[65]. Другое сведчаньне аб імкненьні Войшалка трапіць у Святую Зямлю маецца пад 1262 г. Прыняўшы хрышчэньне ў Навагрaдку, Войшалк з'яўляецца ў Данііла ў Галічы, хрэсьціць унука Данііла Юрыя Львовіча, пастрыгаецца ў манастыры на Карпатах

(Полонына), а потым рушыць на Афон. “Войшелк же не може дойти до Святой горе, зане мятеж бы велик в тых зямлях и приде опять в Новгородок ... и оучини себе монастырь на реце на Немне межи Литвою и Новым городком и тоу живяше несмотря на укоры своего отца Миндовга”[66].

Ёсьць усе падставы лічыць, што летапісец піша двойчы аб адным і тым самым паломніцтве Войшалка. Відавочна, што ў 1255 г. князь не мог пайсьці на Афон. Ён яшчэ быў язычнік. Можна сабе дапусьціць, што двойчы апісаныя падзеі адбываліся наступным чынам. Пасля хрышчэньня Войшалка ў Наваградку ў 1262 г., ён накіроўваецца да Данііла, а адтуль, праз Венгрыю, імкнецца трапіць на Афон. Аднак, з-за хваляваньняў, якія ў гэты час былі ў Візантыі, князь змог дайсьці толькі да Балгарыі і быў вымушаны вярнуцца ў Наваградак, якім кіраваў, заснаваў манастыр на Нёмане і пасяліўся ў ім. Трэба думаць, што ліцік з’явіўся ў Наваградку ў выніку гэтага паходу. Абразок мог набыць наваградзец са світы Войшалка на Балканах. Аб тым, што падобныя ліцікі былі распаўсюджаны ў Балгарыі сведчыць знаходка шкляного літага абразка з выявай святой Сафіі ў горадзе Каліакра[67].

Культавыя вырабы Наваградка трэба дапоўніць знаходкай, якую зрабілі пры даследваньні Барысаглебскай царквы. Гэта акруглая (дыям. 2 см.) гемма з сіняга шкла са скошанымі краямі. На яе вонкавым баку выразаны фігуры трох барадатых людзей, якія трымаюцца за рукі, над іх галавамі нанесены дзьве галінкі. Твары людзей па краях павернуты да цэнтральнай фігуры (мал.). На тэрыторыі Старажытнай Русі вядомыя дзьве аналагічныя геммы. Адна з іх адкрыта Смаленскай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам Д.А. Аўдусіна і паходзіць з культурнага слоя XII-XIV стст. На смаленскай гемме з блакітнага шкла выдрапаны такія ж фігуры і ў такіх самых позах, што і на наваградскай, але без галінак[68]. Яшчэ адну гемму здабыў В.В. Хвойка пры раскопках старажытнага Белгарада і апублікавана Т. Арнэ. Яна авальная з светла-сіняга шкла з выдрапанымі фігурамі мужчын, якія трымаюцца за рукі[69].

Геммы, падобныя знайдзеным у Наваградку, Смаленску і Белгарадзе добра вядомыя сярод старажытнасьцяў Паўночнай і Заходняй Еўропы. Па гемме, што знайдзена ў 1871 г. у горадзе Зондэнбург на востраве Альзен у Данії, гэтыя вырабы атрымалі найменьне “Alsengemmen”. Атрыбуцыяй і храналогіяй “Alsengemmen” займаліся некалькі пакаленьняў вучоных. Каталог іх, які ўключыў 84 экзэмпляры і даследваньне, прысвечанае “Alsengemmen” здзейсніў заходнегерманскі вучоны О.Ф. Гандэрт. Са знаходак у Старажытнай Русі аўтару была вядома толькі

белгарадская гемма[70].

Больш паловы цікавых для нас гемм — 46 экзэмпляраў, што сістэматызаваў Гандэрт, упрыгожвалі царкоўныя рэчы. Нярэдка ў аправе з пазалочанага срэбра ці золата, яны прымацоўваліся да пераплётаў богаслужбовых кніг, крыжоў, рэлікварыяў і іншых вырабаў культавага абіходу. У гэтай функцыі “Alsengemmen” часцей за ўсё выкарыстоўвалі ў Германіі XI-XV стст.[71] Астатнія еўрапейскія геммы гэтага тыпу з’яўляюцца выпадковымі знаходкамі.

Наваградская гемма мае шмат паралеляў сярод заходніх знаходак. Выява трох барадатых мужчын з галінкамі ёсць на гемме Зондэнбурга на Альзене, якая дала назву ўсёй серыі падобных гемм, а таксама ў Нідэрландах (Франекер, Ідаард), ФРГ (Оснабрюк, Эдэвехт), на востраве Готланд і ў іншых месцах[72].

У Барысаглебскі храм Наваградка заходнееўрапейская гемма, відавочна, трапіла як культавы выраб. Не выключана, што яна звязана з залатым кальцом, на якім былі выгравіраваны словы малітвы на лаціне, што знайдзена ў доме, сцены якога былі распісаны фрэскамі (с. 00). Абедзьве знаходкі з Заходняй Еўропы маглі належаць жанчыне, якая прыехала ў Наваградак[73].

Абломкі люстраў-хорасаў з багатых дамоў мы аднеслі да інтэр’еру жыльля (с. 00). Адпаведная знаходка з Замкавай гары (мал.), магла быць звязана з храмам, які там знаходзіўся.

Хрысьціянізацыя насельніцтва, звычайна, звязваецца з распаўсюджаньнем пісьменнасьці. Аднак, у Наваградку прылады пісьма — стылі вядомыя яшчэ ў дахрысьціянскі час. Наібольш раньняя знаходка стылю належыць да пабудовы 13[74], г.зн. другой паловы XI альбо мяжы XI-XII стст. Яшчэ адно пісала знайдзена ў пабудове 6 Малага Замка[75], якая існавала ў самым пачатку XII ст., у той час як Барысаглебская царква і першыя культавыя знаходкі Наваградка з’яўляюцца не раней другой чвэрці XII ст. Такім чынам, пісьменнасьць у багатых насельнікаў вакольнага гораду распаўсюдзілася на некалькі дзесяцігоддзяў раней, чым яны прынялі хрысьціянства.

У Наваградку знайдзены 14 пісалаў з жалеза, бронзы і косьці. Усе яны, за выключэньнем аднаго стылю з Замкавай гары, былі прыналежнасьцю багатых жылішчаў Малага Замка альбо адносіліся да культурнага слоя гэтай часткі гораду. Магчыма, што касьцяных пісалаў на самой справе было больш. У пабудове першай паловы XII ст. знайдзены жалезны стыль з лапатачкай, як бы паўторам формы лапатачкі касьцяных пісалаў, вядомых у Ноўгарадзе другой паловы X альбо першай паловы XI стст.[76]

Сярод наваградскіх пісалаў, даўжыня якіх 10-13 см., вылучаюцца 4 тыпы:

тып 1 (2 экзэмпляры). Лапатачка іх мае паўкруглую форму. У заходнерускіх гарадах падобныя сустракаюцца ў Друцку і Мінску. [77]

тып 2 (1 экзэмпляр) з лапатачкай трапецэпадобнай формы. Аб ім гаварылася вышэй.

тып 3 (4 экзэмпляры). Лапатачкі іх маюць форму вузкага бакальчыка з адцянутымі краямі. Тры пісалы паходзяць з пабудоў XII ст. На лапатачцы бронзавага стыля нанесены раслінны арнамент. У Заходняй Русі падобныя пісалы знайдзены ў Ваўкавыску, Браслаўлі і Друцку. Дадзены тып стыляў больш за іншыя распаўсюджаны ў гарадах Старажытнай Русі[78].

тып 4 (3 экзэмпляры). Трохвугольныя лапатачкі з выступамі альбо зубчыкамі па краях. Адзін з жалезных стыляў інкруставаны белым металам (мал.). Заходнерускія стылі дадзенага тыпу знайдзены ў Ваўкавыску і Мінску[79].

Асобныя лапатачкі стыляў не захаваліся. Ад адзінай знаходкі на Замкавай гары ацалеў жалезны стрыжань. На Малым Замку без лапатачак знайдзены жалезны (мал.), бронзавы і касьцяны стылі. На стрыжні апошняга выразаны знак[80].

Наваградскія прылады пісьма, падобныя да пісалаў іншых заходнерускіх гарадоў, належаць да агульнарускіх тыпаў. Трэба лічыць іх вырабамі мясцовых рамеснікаў. Магчыма, што асобныя бронзавыя пісалы былі прывазныя. Аб імпарце бронзавых стыляў у Заходнюю Русь сведчаць пісалы з Ваўкавыска і Бярэсьця з крыжападобнай прарэззю на лапатачцы. Яны ідэнтычныя знаходкам з Віцічава і Звенігарада[81].

Стылі Наваградка, як і ўсе прылады такога кшталту, выкарыстоўваліся для пісьма на навошчаных дошчачках, падобнымі на тыя, што знайдзены ў Ноўгарадзе і Бярэсьці[82].

Прылады пісьма Наваградка належаць да агульнарускіх тыпаў. Пераважаньне жалезных стыляў над бронзавымі, што адзначыў А.Ф. Мядзьведзеў, характэрна і для наваградскіх знаходак.

Пісалы з лапатачкамі служылі для скорых часовых запісаў, якія можна было лёгка правіць. Магчымасьць карыстацца лапатачкай для выпраўленьня напісанага нарадзіла ў Еўропе параду таму, хто піша: “Часьцей паварачвай стыль”[83].

Пісьмо на навошчаных дошчачках у Старажытнай Русі было распаўсюджана не толькі ў стольных, але і ў малых гарадах. Так жалезных, бронзавых і касьцяных пісалаў у Ноўгарадзе знайдзена больш за 45[84]. У Наваградку ж іх было 14, у Ваўкавыску - 12[85], а ў Яраполчы Залескім - 11 экзэмпляраў[86].

Наваградцы мецілі ўласныя рэчы, у прыватнасьці амфары. На адной з іх, што адносілася да пабудовы першай паловы XII ст.

выдрапана імя “Олъкъсн” (Аляксей) (мал.), верагодна, уладальніка амфары. На веданьне жыхарамі гэтага дома граматы паказвае знайдзены там стыль[87]. Літара Н, выдрапаная на абломку другой амфары была напісана няправільна. Палеаграфічна яна нагадвае форму знака №. У старажытнарускім напісаньні сярэдні нахільны стрыжань гэтай літары цягнуўся ад верхняга канца левага стрыжня да канца правага[88]. У Наваградскім варыянце стрыжань нанесены ў адваротным накірунку. Магчыма, што асоба, якая нанесла гэту літару была не асабліва спрактыкаваная.

На адным з наваградскіх прасліцаў з шыферу высячана літара Ж, а на каменным абразку Міколы, як адзначана вышэй, выразаны словы “Ніколае агиос”. Палеаграфічна надпіс датуецца XIII ст.[89]

Пры даследваньні Барысаглебскай царквы Наваградка сабрана даволі многа абломкаў тынкоўкі са сграфіці. Іх атрыбуцыя належыць Т.У. Раждественскай[90]. Аўтару ўдалася прачытаць наступныя надпісы і словы: “Господі помозі рабу своему”; “Господи, помози рабу Макъ(симоу)”; “Господи помози рабу своему Григо(риеви)”; “Господи помози рабу (гр)ъешному”; “Господи оуслы(ши)”; “(Барыс) і Глъ(б)” (мал.).

Т.У. Раждественская лічыць, што палеаграфічна надпісы датуюцца канцом XII - першай паловай XIII стст. Толькі надпіс з імем Максіма сведчыць скарэй аб XIII - пачатку XIV стст. Цікавая выснова аўтара, што дэталёвае вывучэньне наваградскіх надпісаў паказвае на іх палеаграфічнае падабенства да літараў у кіеўскай Сафіі і можна мяркаваць, што аўтары графіці знаходзіліся ў рэчышчы кіеўскай рукапіснай традыцыі.

Побач з тэкстамі малітваў на тынкоўцы Барысаглебскага храма ёсьць выявы птушак (мал.).

Графіці захаваліся таксама на асобных кавалках тынкоўкі з жылой пабудовы. На адным з іх можна прачытаць літару А. Сярод фрэсак гэтага дому знайдзены кавалкі, на якіх па белым фоне чорнай фарбай нанесены кірылічныя літары. Сярод вялікіх літар (вышынёй 5 см.) выразна чытаюцца Е, С, аб (мал.). З пэўнай верагоднасьцю можна вызначыць літары К, Л, Ъ. Больш дробныя літары — вышынёй да 3 см. прадстаўлены літарай Е. Калі мець на ўвазе, што на сьцяне жылой пабудовы была выява маладога князя Глеба (с. 00), то рэшткі надпісу былі звязаны з гэтай выявай. Текст надпісу жылой пабудовы першай паловы XII ст. такім чынам храналагічна ранейшы чым графіці храма з малітвенымі словамі, што датаваныя канцом XII - пачаткам XIII стст.

Жыхары Наваградка карысталіся кнігамі, ад якіх ацалелі толькі металічныя зашпількі. У той час, як прылады пісьма — стылі былі знайдзены па большасьці на Малым Замку, амаль усе

зашпількі ад кніг належаць да знаходак Замкавай гары. З васьмі зашпілек толькі дзьве — бронзавая і срэбрная — паходзяць з Малага Замка. Астатнія бронзавыя знайдзены на тэрыторыі дзяцінца. Усе зашпількі вышынёй 2-3 см. аднатыпныя, трохпяцельныя (мал.). Падобныя знайдзены ў Бярэсьці, Тураве, Друцку і Ваукавыску. Цікава, што в Ваўкавыску ўсе кніжныя зашпількі (4 экзэмпляры) паходзяць, выключна, з дзяцінца[91]. Мяркуючы па захаваных старажытнарускіх кнігах, у ніжнюю пятлю зашпількі прасоўвалі раменчык, другі канец якога мацаваўся на адной з дошак пераплету. Сярэдняя пятля надзявалася на цьвічок у верхняй частцы пераплету[92]. З кніжнасьцю мы звязваем таксама шэсьць бронзавых вырабаў з Замкавай гары, якія маюць форму маленькіх мячэй з дзірачкай на лязе. Даўжыня іх 2-3 см. (мал.). У літаратуры яны, часам, разглядаюцца як амулеты[93]. Аднак, знаходкі дэталяў кніг у Старай Разані з такім “мячом” дазваляюць бачыць у іх кніжныя рэаліі. Таксама трактуюцца такія знаходкі ў Кіеве[94]. Значная колькасьць падобных знаходак зроблена ў Херсанэсе[95].

Хімічны аналіз аднаго з “мячоў” паказаў, што ён был зроблены з алавяністай бронзы, тыповай для кіеўскіх вырабаў. Разам з тым, на адным з вырабаў не было адтуліны, г.зн. апрацоўка яго не была закончана (мал.). Гэта азначае, што, па крайняй меры, падобныя рэчы выраблялі ў Наваградку.

Значная колькасьць кніжных зашпілек, што знайдзены на Замкавай гары Наваградка дазваляе звярнуцца да гіпотэзы, якую высунуў у свой час Уладзімір Пашута. Аналізуючы пісьмовыя звесткі аб княстве Міндоўга і яго пераемніках, аўтар мяркаваў, што мог існаваць летапіс, створаны на тэрыторыі Чорнай Русі. Магчыма, ён узнік у Наваградку, дзе хрысьціўся Войшалк альбо ў адным з праваслаўных манастыроў яго акругі[96]. Мяркаваньне У.Ц. Пашуты было катэгарычна адхілена гісторыкамі. У святле матэрыялаў, якія паказваюць пісьменнасць гараджан і існаваньне манастыра, заснаванага Войшалкам, думка У.Ц. Пашуты не прадстаўляецца неверагоднай і, як гіпотэза, мае права на існаваньне. Тым больш, што з пранікненьнем пісьменства і феадальнай раздзеленасьцю ў кожным значным цэнтры ўзнікае сваё летапісаньне[97].

Наваградцы ведалі гульню ў шахматы. У пабудове Малага Замка знайдзена фігура каня з косьці выш. 2,9 см., якая выглядае як цыліндр з выступам наверсе. Наваградская фігура належыць да катэгорыі абстрактных шахматных фігур, што зроблены на арабскі ўзор. На думку савецкага гісторыка шахмат І.М. Ліндэра, наваградскі конь з’яўляецца ўзорам арабскай сімволікі[98]. На тэрыторыі Русі такія ж фігуры шахматных коней сустракаюцца на

гарадзішчы на Менцы і ў Тураве[99]. Другая абстрактная шахматная фігура паходзіць з пабудовы Малага Замка. Гэта пешка з косьці ў форме цыліндра са скругленым верхам, вышынёй 2 см., дыям. 1.5 см. (мал.). Навагрудская пешка больш за ўсё мае падабенства з пешкамі з камплекту касьцяных шахмат зробленых па арабскіх узорах і знайдзенага ў Польшчы, у зямлянцы Сандаміра[100].

Шахматныя фігуры з косьці, якія выкананы па ўзору арабскіх фігур, вядомыя ў шэрагу заходнерускіх гарадоў. Гэта ладьдзі з Копысі і Ваўкавыска, сланы з Турава і Друцка і пешкі, таксама знайдзеныя ў Друцку. Побач з сімвалічнымі фігурамі, у гарадах Заходняй Русі знайдзены арыгінальныя рэалістычныя (кароль, ферзь, ладьдзі, пешка). Прыцягвае ўвагу той факт, што з 20 старажытнарускіх пунктаў карты, складзенай І.М. Ліндэрам, у якіх сустракаюцца шахматныя фігуры, датуемыя часам да XIII ст., 13 гарадоў належаць да Беларусі[101].

Распаўсюджанае ў савецкай літаратуры прадстаўленьне аб тым, што гульня ў шахматы распаўсюдзілася ў Заходняй Русі ў XI ст., у апошні час крытычна перагледжана Е.А. Рыбінай. Сярод шахматных фігур Ноўгараду, колькасьць якіх перавышае 150 экзэмпляраў, дакладна датаваныя належаць да часу не раней другой паловы XIII ст. Менавіта да гэтага часу аўтар адносіць з'яўленьне шахмат у Ноўгарадзе. Е.А. Рыбіна адхіляе думку аб шырокім пабытаваньні шахмат на Русі ў XI-XII, а тым больш IX-X стст., адзначыўшы, што вядомыя шахматныя фігуры не звязаны з дакладна датаванымі комплексамі[102]. Што ж у сувязі з такой высновай можна сказаць аб шахматах Заходняй Русі? Сапраўды, вялікая частка шахматных фігур з заходнерускіх гарадоў знайдзена па-за комплексамі. Аднак, ёсьць выключэньні. Так конь з гарадзішча на Менцы ляжаў у мацярыковай яме. Археалагічны матэрыял дадзенай частцы паселішча сведчыць, што жыцьцё там спынілася пры канцы XI ст. Гэта падцвярджаецца знаходкамі адпаведнай керамікі, глазчатымі пацеркамі, пацеркамі "лімонкамі" і іншым тыповым інвентаром гэтага часу[103]. Даціроўка шахматнага каня паселішча на Менцы дакладна абгрунтавана. Гэта не толькі самая раньняя знаходка ў заходнерускіх гарадах, але і на ўсёй Старажытнай Русі. Цікава, што камплект шахмат з Сандаміра, які аўтар яго публікацыі Э. Гансоўская, звязвае са Старажытнай Русьсю, таксама датуецца XI ст.[104]

Навагрудская шахматная фігура знайдзена ў пабудове другой паловы XII ст. Разам з ёй знаходзіліся абломкі амфар, наканечнікі стрэлаў XII ст., цуглі, а таксама абломкі двух шкляных пасудзін, што прывезены з Сірыі[105]. Фігуры каня і слана ў Тураве

паходзяць з 4-га слоя, які па знаходках датуецца XII-XIII стст. Ладьдзя з Ваўкавыска знайдзена на гарадзкім дзяцінцы ў слоі са знаходкамі XII ст.[106]

Цяжка растлумачыць пранікненьне шахмат арабскага тыпу на тэрыторыю Заходняй Русі ў XI ст. Што тычыць іх распаўсюджаньня ў XII і XIII стст., то гэта можа быць звязана са з'яўленьнем у гэтых зямлях шклянога і фаянсавага посуду мусульманскага Усходу, аб чым гаварылася ў папярэдняй главе.

Яшчэ адна шахматная фігура — пешка з косьці (мал.) належыць да больш позняга часу, да XIV ст. і блізкая па форме фігурам каралей гэтага часу, якія знайдзены ў Полацку і Друцку[107].

Ад другіх гульняў гараджан захавалася ігральная костка — астрагел з прабітымі на ім шасьцю адтулінамі (мал.). Такая ж костка знайдзена ў Браслаўлі[108].

Аб музычных густах гараджан ускосна дае прадстаўленьне касьцяная вухачыстка (даўжынёй 10 см), якая ляжала на падлозе дома з фрэскавым роспісам. Яе навершые выканана ў выглядзе фігуры музыканта, які сядзіць на лаўцы кубічнай формы і грае на трохструнным трапецэпадобным інструменце, які стаіць на падстаўцы. Струны інструмента вертыкальна нацягнуты на дошцы. Музыкант безвусы і безбароды. Валасы яго каротка падстрыжаны, а галову пакрывае плоская шапка, насунутая на лоб. Шырокая сарочка, перахопленая поясам, спускаецца да кален[109].

На фрэсцы лествіцы Кіева-Сафійскага сабору паказаны музыкант, апрануты ва ўсходні касьцюм. Ён грае на трапецэпадобным інструменце з сям'ю вертыкальнымі нацягнутымі струнамі. Сярод розных упрыгожаньняў сьценаў царквы Пакрава на Нерлі тройчы прадстаўлены цар Давід. У яго левай руцэ знаходзіцца трапецэпадобны інструмент з чатырма вертыкальна нацягнутымі струнамі. Наваградскіму інструменту бліжэй другіх па форме трохструнны інструмент, на якім грае цар Давід, пасучы авечак. Гэта выява маецца ў славянскім рукапісу 1397 г.[110]

У заходнерускіх пісьмовых крыніцах падобныя інструменты называліся псалтырам (psalterim). У рукапісу IX ст. з Анжэра (Францыя) ёсьць малюнак прамавугольнага, вертыкальна пастўленага інструмента і кісьцяў рук. Пад малюнкам напісана па латыні "Hic est David filius Jesses, tenens psalterium in mani (bus) suis. Hoc est forma psalterii" — "Гэта Давід сын Іессея, які трымае псалтыр у сваіх руках. Такі выгляд псалтыра"[111].

Слова "псалтыр", якое абазначае струнны музычны інструмент у Старажытнай Русі было вядома з XII ст. і, звычайна,

успаміналася разам з гуслямі ў тых выпадках, калі гутарка ішла аб урачыстых песняспевах. “Встани слава моя, въстани в псалтири и гуслех” — гаворыць Данііл Заточнік[112]. На мініяцюры славянскага зборніка XII-XIV стст. з выявай цара Давіда, кінаварам напісана “Хваліце яго ў псалтыры і гуслех”. “Псалтірь красен гусльмі” гаворыць подпіс да другой мініяцюры гэтага зборніка[113].

Аб шырокім распаўсюджаньні гусляў у Ноўгарадзе сведчаць археалагічныя матэрыялы. Пры раскопках знайдзена 26 экзэмпляраў гэтага інструмента. Ноўгарадскія гуслі былі пяці, шасьці і дзевяціструнныя. Наібольш раньнія пяціструнныя гуслі датуюцца сярэдзінай XI ст.[114] Дошка ад пяціструнных гусляў паходзіць з Польшчы, з Гданьска, дзе яна датуецца XII ст.[115]

У адрозненьне ад гусляў, псалтыр прызначаны для выкананьня псалмоў і быў, верагодна, запазычаным інструментам. У азбукоўніку XVI ст. аб ім гаворыцца насупнае: “Псалтирь во Евреях бо сотворе, сосуд древян, в нем бяху десять струн и нарицаша той сосуд по гречески псалтирь, по славянски песневец”[116].

Такім чынам, наваградскі музыкант з выявы на вухачыстцы граў на псалтыры[117]. Рэальнасьць нашага музыканта і яго інструмента падцьвярджаецца касьцяной шахматнай пешкай з Ваўкавыска. Гэта фігура чалавека, які ў левай руцэ трымае барабан, а ў правай стрыжань для ўдару — вашчагу[118]. Дзіўнае падабенства наваградскага і ваўкавыскага музыкантаў. У абодвух адзін тып твару, прычосак, шапак і сарочак. Такое падабенства аблічча музыкантаў дае падставы мяркаваць, што кастарэзы, якія іх рабілі, паказалі старажытнарускіх музыкантаў прафесіяналаў[119]. Наваградскі музыкант дае прадстаўленьне аб песьняры, што іграў на псалтыры ў доме багатага гаражаніна.

Духоўнае жыцьцё наваградцаў, у святле археалагічнага матэрыялу, прадстае вельмі разнастайным. Язычніцтва, якое існавала ў Наваградку пазней чым у другіх старажытнарускіх гарадах не зрабіла яго адсталым. Пісьменныя жыхары з’явіліся ў ім яшчэ да прыняцьця хрысьціянства. Распаўсюджаньне пісьменства ў язычаскай Русі засведчана рознымі дадзенымі. Гэта дагаворы з грэкамі 911 і 945 гг., знаходкі касьцяных пісалаў у Ноўгарадзе другой паловы X ст., кірылічны надпіс “горушча” на гнёздаўскай амфары другой чвэрці X ст.[120] і некаторыя іншыя матэрыялы. Стылі язычаскага Наваградка з’яўляюцца яшчэ адным доказам з’яўленьня ўжытковага пісьма ў дахрысьціянскай Старажытнай Русі. Толькі ў асяроддзі, якое ведае пісьмо, маглі з’явіцца надпіс “Олексій” і кірылічныя літары у дамах, што пабудаваны адначасова з заканчэньнем будаўніцтва

Барысаглебскай царквы. З хрысьціянізацыяй гораду, граматнасьць гараджан развіваецца больш актыўна, аб чым можна мяркаваць па вялікай колькасьці графіці і развіццю кніжнай справы.

Хрысьціянскія могілкі багатага квартала вакольнага гораду першай паловы XII ст. з вялікай колькасьцю пахаваньняў, могуць сведчыць на карысьць таго, што існаваўшая на Малым Замку царква, паблізу якой узніклі могілкі, магла быць старэйшай за Барысаглебскі храм, які пабудаваны не раней другой чвэрці XII ст.

Сацыяльныя вярхі Наваградка, даспеўшыя для хрысьціянізацыі, ўспрымаюць новую веру досыць хутка. Гэта праяўляецца ў распаўсюджаньні розных мясцовых і прывазных культавых вырабаў, якія пабытавалі ў багатых пабудовах першай паловы XII ст. У 60-я гады XIII ст. Наваградак з'яўляецца горадам, у якім прымае хрышчэньне Войшалк і адтуль адпраўляецца паломнікам у Святую зямлю. Пасля заканчэньня няўдалага паломніцтва, правіцель Наваградка закладае манастыр на граніцы наваградскай зямлі і пасяляецца там.

Манастыр, які заснаваў Войшалк (в. Лаўрышава на Нёмане) быў цэнтрам праваслаўя краю і існаваў да 1836 г.[121] Яму належала Евангельле з мініяцюрамі XIV ст., якое зараз захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх, у Кракаве[122]. Цалкам верагодна, што з часу свайго заснаваньня манастыр распаўсюджваў хрысьціянства сярод язычнікаў літоўцаў, землі якіх знаходзіліся на другім беразе Нёмна. Археалагічныя матэрыялы і дадзеныя лінгвістыкі паказваюць, што з тэрыторыі Беларусі хрысьціянства трапляе ў Летуву[123]. У далучэньні літоўцаў да хрысьціянскай рэлігіі мог адыграць сваю ролю Наваградскі манастыр, што знаходзіўся на граніцы з Літвой.

Спасылкі:

[1] Макарова Т.И. Украшения и амулеты из лазурита у кочевников X-XI вв.// АСГЭ. 1964. Вып. 4. С. 133.

[2] ДН. Мал. 90,8.

[3] Гуревич Ф.Д. Погребальные памятники жителей Новогрудка (конец X - 70-е годы XIII вв.) // КСИА. 1983. Вып. 175. С. 48-49.

[4] Описание церквей и приходов Минской епархии. Минск, 1879. Кн. 9. С. 11-12.

[5] Каргер М.К. Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке // КСИА. 1977. Вып. 150. С. 79-85.

[6] Раппопорт П.А. 1) Зодчество Древненай Руси. Л., 1986. С. 87-88; 2) Церковь Благовещения в Витебске // ПКНО 1985 г. С. 526-527.

[7] Даркевич В.П. Старая Рязань (Итоги археологических

исследований 1970-1979 гг.) //ТДСД. С. 125; Коваленко В.П. Новые исследвания черниговского детинца // ЗСА. С. 117.

[8] Гуревич Ф.Д. 1) Детинец и окольный горад древнерусского Новогрудка в свете археологических работ 1956-1977 гг. // СА. 1980. С. 88-99; 2) Погребальные памятники ... С. 49-53.

[9] ПСРЛ. М., 1962. Т. 11. Стб. 858-859.

[10] Павлова К.В. Раскопки могильника близ Новогрудка // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 103.

[11] Павлова К.В. 1) Могильники у деревень Молничи и Сулятичи // КСИА. 1974. Вып. 139. С. 63, 68; 2) Раскопки у деревень Селец и Ботаревка в Понеманьни // КСИА. 1977. Вып. 148. С. 87, 90.

[12] Шмидт Е.А. К вопросу об изменении погребального обряда в Смоленской земли после середины XII ст. // ЗСА. С. 289.

[13] Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 60; Лысенко П.Ф. города Туровской земли. Минск, 1975. Мал. 9,29.

[14] ДН. Мал. 76,7; Гроздилов Г.П. Раскопки древненого Пскова // АСГЭ. 1962. Вып. 4. Мал. 53,10.

[15] ДН. Мал. 91,7.

[16] ДН. Мал. 30,14; 91,1.

[17] Юра. Древний Колодяжин // АП УРСР. 1962. Вып. XII. С. 118; Алихова А.Е. Русский поселок XIII-XIV вв. у с. Березовка // МИА. 1962. С. 80., мал. 2,16.

[18] ДН. С. 44., мал. 49,20; 66,14.

[19] Загорульскийй Э.М. Возникновение Минска. Минск. 1982. Таб. XX,5; Лысенко П.Ф. Берестье. Минск. 1985. С. 325., мал. 229.

[20] Ханенко Б.И. и В.И. Древнени Русские. Киев, 1899. С. 8., табл. 1,2-6; Rauhut L. Wczesnosredniowieczne materialy z terenow Ukrainy w Panstwowym muzeum archeologicznym w Warszawie // MW. 1960. Tab. XX,1; Никольская Т.Н. Земля вятичей. М., 1981. Мал. 103,4.

[21] ДН. Мал. 85,11.

[22] ДН. Мал. 85,11.

[23] Малым В.А. Крестики з эмалью // Славяне и Русь. М., 1968. С. 117; Мугуревич Э.С. Крестовидные подвески XI-XV вв. (на латышском языке) - Archelogija un etnografija. 1974. XI. lpp. 220-239.

[24] ДН. С. 82., мал. 66,12.

[25] ДН. С. 56., мал. 49,23.

[26] ДН. С.47., мал. 35,2.

[27] ДН. С. 93., мал. 69,3.

[28] ДН. Мал. 91,5.

[29] Ханенко Б.И. и В.И. Op. cit. Таб. 1,28,29; Садова М.В. Ювелирные изделия Древненого Новгорода (X-XV вв.). М., 1981. С. 57., мал. 18,5; Antoniewcz J. Brązowy krzyzyk skladany znalezona w Drohiczynie nad Bugiem, pow. Semiatycze // WA. 1957. 24. S. 368-369; Gaewski L. Brązowy krzyzy skladany znalezona w Obrowcu, pow. Grubieszow. // WA 1959-1960. 26. S. 345.

[30] Мугуревич Э.С. Восточная Латвия и соседние земли в X-XIII вв. Рига., 1965. Таб. X,5.

[31] Алексеев Л.В. Мелкое художественное литье из некоторых западнорусских земель (кресты и иконы Белоруссии) // СА. 1974. Вып. 3. С. 206-207., мал. 1,2.

[32] ДН. Мал. 91,8.

[33] Алексеев Л.В. Op. cit. С. 217-218. Мал. 1,10,11; Загорульский Э.М. Op. cit. Таб. XVII,16; Алихова А.К. Op. cit. Мал. 3,1.

[34] ДН. Мал. 66,9.

[35] Корзухина Г.Ф. О помниках “корсунского дела” на Руси (по материалам медного литья) // ВВ. 1958. Вып. 14. С. 133.

[36] Медынцева А.А. О датировке некоторых типов энколпионов // Археологический сборник МГУ. М., 1961. С. 65-68; Седова М.В. Op. cit. С. 61.

[37] Пуцко В.Г. Древнейшие типы киевских энколпионов // ТДСД. С. 162.

[38] Волкайте-Куликаускене Р.К. Крест-энколпион из городища Майшагола // Тези пленарных и секцийных доповидей (выник польових археологичных дослиджень 1970-1971 рокив на територири Украини). Одесса, 1972. С. 366-367.

[39] ДН. Мал. 94,4; Ханенко Б.И. и В.И. Op. cit. Таб. VI,78.

[40] Лесючевский В.И. Выжгородской культ Бориса и Глеба в памятниках искусства // СА. 1946. Вып. VIII. С. 240-241; Алешковский М.Х. Русские глебоборисовские энколпионы 1072-1150 годов // Древнерусское искусство. Художественная культура домонгольской Руси. М., 1972. С. 104-123.

[41] Лесючевский В.И. Op. cit. С. 241-242.

[42] Лесючевский В.И. Op. cit. С. 241; Алешковский М.Х. Op. cit. С. 107-108.

[43] ПСРЛ. 1962. Вып. 11. Стб. 315; Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966. С. 252.

[44] Воронин Н.Н. Бельчицкие руины // Архитектурное наследство. 1956. Т. 2. С. 6.

[45] Воронин Н.Н. Древнее Гродно // МИА. 1954. Вып. 41. С. 78-104, 140.

[46] Каргер М.К. Новый помник зодчества XII ст. // КСИА. 1965. Вып. 100. С. 131.

[47] Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Минск, 1975. С. 122.

[48] Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 1,1,9,10,11; Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. С. 116; 2) Города Полоцкай земли - Автореферат докторской диссертации. Киев, 1983. С. 45; Загорульскийй Э.М. Op. cit. С. 286; Николаева Т.В. Древнерусская мелкая пластика из камня XI-XV вв. // САИ. Серия Е 1-60, С. 142., таб. 62,2.

[49] ДН. С. 121.

[50] Николаева Т.В. Op. cit. С. 145.

[51] Порфиридов Н.Г. Древнерусская каменная пластика и яе сюжеты // СА. 1972. Вып. 3. С. 202-203; Успенский Б.А. Культ Николы на Руси в историко-культурным освещении // Ученые записки Татрусского Гос. Университета. 1978. Вып. 463. С. 86.

[52] Штыхаў Г.В., Захаренка П.Н. Старажытныя скарбы Беларусі. Мінск, 1971. С. 44; Загорульскийй Э.М. Op. cit. С. 228., таб. XXI,3.

[53] Николаева Т.В. Op. cit. С. 43, 146.

[54] ДН. Мал. 91,6.

[55] Николаева Т.В. Op. cit. С. 51.

[56] Николаева Т.В. Op. cit. С. 19.

[57] Свешников И.К. Новые находки произведений древнерусского искусства из Звенигорода // ЗСА. С. 227.

[58] Искусство Византии в собраниях СССР. Каталог выставки, 2. М., 1977. № 616, 617, 619, 620, 624, 625.

[59] Munos A.L. L'Art Bizantine a l'exposition de Grottaferrata. Roma, 1906, fig. 86; Vickers M.A. A note on glass medailons in Oxford // JGS, 1974, XVI, P. 18-19.

[60] Ross M.C. Catalog of tne Bizantine and early medieval antiquities in the Dumbarton Oaks collection. I. Washington, 1962, P. 90-91, pl. LVII, 108.

[61] Гуревич Ф.Д. Новые данные о секляных иконках-литиках на территории СССР // ВВ. 1982. Вып. 43. С. 180; Gurevich F.D. New Find of glass medalions in the USSR // JGS. 1982, 24. P. 44-48.

[62] Ross M. Op. cit. P. 88-91.

[63] Wentzel H. Das Medaillon mit dem Hl. Theodor und die venezianishen Glaspasten in byzantinishen Stil. In: Festschrift fur Erich Meyer zum 60 Geburstta d. Hamburg, 1959. S. 64.

[64] Банк А.В. Два литика из недавних раскопок // Зборник IX-X Народного музеиа. Београд, 1981. С. 222.

[65] ПСРЛ. Т. 11. Стб. 830-831.

[66] ПСРЛ. Т. 11. Стб. 858-859.

[67] Кузманов Г. Византийска иконка-медалион з рядък образ на св. София // Археология. София, 1975. Т. 3. С. 51-54.

[68] Даркевич В.П. Гемма из Смоленска // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 38-41.

[69] Arne T.J. Alsengemmen aus Russland // Wiener Prahistorische Zeitschrift, 1916 III, H. 3-4, S. 92-94.

[70] Gandert O.F. Die Alsegemmen. 36 Bericht der Romisch-Germanische Komission. Berlin, 1956. S. 156-222.

[71] Gandert O.F. Op. cit. S. 189-191.

[72] Gandert O.F. Op. cit. S. 207, 210, 214.

[73] Гуревич Ф.Д. Об одной группе стеклянных гемм из древнерусских городов // ПКНО. 1985. С. 515-521; Gurevich F.D. Alsengemmen from Ancient Russian Towns // JGS. 1986. V. 28. P. 24-29.

[74] ДН. Мал. 17,4.

[75] ДН. Мал. 23,1.

[76] ДН. Мал. 22,1; Медзьведев А.Ф. древнерусские писала X-XV вв. // СА. 1960. Вып. 2. Мал. 1,2.

[77] Медзьведев А.Ф Op. cit. С. 73; Загорульскийй Э.М. Op. cit. Мал. 152,5.

[78] ДН. мал. 23.1; 28,1; 51,2; Зверуго Я.Г. Op. cit. мал. 38,1-4; Загорульский Э.М. Op. cit. Мал. 152,2-4; Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966. Мал. 68,1,2,4; Медзьведев А.Ф. Op. cit. С. 76.

[79] ДН. Мал. 76,10; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 38,11; Загорульский Э.М. Op. cit. Мал. 152,1.

[80] ДН. Мал. 71,2; 76,1.

[81] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 123; Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 390., мал. 260.

[82] Колчин Б.А., Янин В.Л. Археологии Новгорода 50 лет // Новгородский сборник. М., 1982. С. 88.

[83] Добиаш-Рождественская О.А. История письма в Средние века. М-Л., 1936. С. 24.

[84] Колчин Б.А., Янин В.Л. Тамсама

[85] Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 122.

[86] Седова М.В. Ярополч Залесский. М., 1978. С. 115.

[87] Малевская М.В. Амфора с надписью из Новогрудка // СА. 1962. Вып. 2. С. 153-154; ДН. С. 32.

[88] Черепнин Л.В. Русская палеография. М., 1956. С. 157, 167.

[89] Николаева Т.В. Op. cit. С. 145.

[90] Выказваю падзяку Т.У. Раждственскай, якая ласкава паведаміла вынікі сваіх доследаў.

[91] Лысенко П.Ф. 1) города ... мал. 9,8; 2) Берестье. мал. 260; Штыхов Г.В. Op. cit. С. 137; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 127.

[92] Симони П. Опыт сборника сведений по истории и технике книгопереплетного искусства на Руси. СПб., 1903. Таб. IX, XI.

[93] Юра Р.О. Op. cit. С. 104; Никольская Т.Н. Op. cit. С. 235;

Загорульский Э.М. Op. cit. С. 224.

[94] Монгайт А.Л. Старая Рязань // МИА. 1949. Вып. 49. С. 179; Боровский Я.В., Сагайдак М.А. Археологические исследвання Верхнего Киева в 1978-1982 гг. // Археологические исследвання Киева в 1978-1982 гг. Киев, 1985. С. 39-40., мал. 4,1.

[95] Экспозиция Херсонесского музея-заповедника.

[96] Пашуто В.Т. 1) Очерки истории Галицко-Волынской Руси. М., 1950. С. 113-121; 2) Образование литовского государства. М., 1959. С. 38.

[97] Воронин Н,Н,, Кузьмин А.Г. Духовная культура Древней Руси // ВИ. С. 124.

[98] ДН. Мал. 55,10; Линдер И.М. Шахматы на Руси. М., 1975. С. 79.

[99] Штыхов Г.В. Op. cit. Мал. 43,3; Лысенко П.Ф. города... Мал. 11,3.

[100] Gassowska E. Wczesnosredniowieczne szachy z Sandomierza // Archeologja Polski. 1964. IX,1. S. 150-151., ryc. 2.

[101] Штыхов Г.В. Исследвання в Северной Белоруссии // АО 1969 г. М., 1970. С. 309, 310; Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 19,3; Лысенко П.Ф. Op. cit. мал. 11,2; Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 68,10-12; Линдер И.М. Op. cit. С. 70, 91-93, 95-96.

[102] Рыбина Е.А. Шахматы на Руси (о типологии шахматных фигур) // ЗСА. С. 217.

[103] Штыхов Г.В. Поселения и курганы в Северной Белоруссии // АО 1975. М., 1976. С. 430-431.

[104] Gassowska E. 1) Op. cit. S. 167; 2) W sprawie datowania wczesnosredniowiecznych szachow znalezionych w Sandomierzu // Archeologja Polski. XV,2. S. 548-554.

[105] ДН. С. 71., мал. 55,13.

[106] Лысенко П.Ф. Op. cit. С. 41-44; Зверуго Я.Г. Op. cit. С. 124.

[107] Линдер Op. cit. С. 124.

[108] Алексеев Л.В. Op. cit. Мал. 44,11.

[109] ДН. Мал. 30,20.

[110] Кондаков Н.П. О фресках лестниц Киево-Софийского собора // ЗРАО. 1888. Вып. 3. С. 292-293., таб. XIII; Воронин Н.Н. Зодчество Поуначо-Усходняй Руси. М., 1962. Т. 1. Таб. IV, 3; VI,1; Фаминцын А.С. Гусли - русский народны инструмент. СПб., 1890. С. 80.

[111] Фаминцын А.С. Op. cit. С. 79.

[112] Слово Даниила Заточника по редакциям XII и XIII вв. и их переделкам / пад ред. Н.Н. Зарубина. Л., 1932. С. 4.

[113] Описание миниатюр из славянской псалтири XIII-XIV вв. библиотеки А.И. Хлудова. Древности. // Труды Московского

археологического общества. М., 1873. Серия. III. Вып. 5, 6. С. 25.

[114] Колчин Б.А. Коллекция музыкальных инструментов древненого Новгорода // ПКНО 1978. М., 1979. С. 176-179; Янин В.Л. Op. cit. С. 87.

[115] Jazdzewski K. Najstarsze zachowane gesle slowianske // Z otchlani wiekow. 1950. 1-2. S. 13-18.

[116] Фаминцын А.С. Op. cit. С. 94-95.

[117] Існуе іншае мяркаванне наконт прызначэння тае рэчы, якую Ф.Д.Гурэвіч лічыць за “вухачыстку” — М.Нікалаеў і П.Канакоў атрыбутуюць яе як плектр, якім гралі на струнных музычных інструментах кшталтам гусляў (Нікалаеў М. Канакоў П. Паспрабуем прачытаць “ілюмінацыю”//Мастацтва Беларусі. 1988. С.39-41.) — заўвага перакладчыка.

[118] Зверуго Я.Г. Op. cit. Мал. 19,1.

[119] Гуревич Ф.Д. Изображение музыкантов в Древненай Руси // СА. 1965. Вып. 2. С. 280.

[120] Воронин Н.Н., Кузьмин А.Г. Op. cit. С. 116-117; Медзьведев А.Ф. Op. cit. С. 65; Авдусин Д.А. Гнездовская корчага // МИА. 1970. Вып. 176, С. 11-13.

[121] Описание церквей ... С. 66.

[122] Свенцицкий И.С. Лаврышевское евангелие начала XIV ст. // Известия отделения русского языка и словесности. 1913. XVIII. 1. С. 206-207; Терещатова О.В. Зарождение монументальной живописи в период формирования белорусской народности // ЭБ. С. 221.

[123] Гуревич Ф.Д. Культурные связи древнерусских городов на территории Белоруссии с Прибалтикой // Проблемы Этногенеза и этнической истории балтов. Вильнюс, 1985. С. 97-100

Глава 9. Аб культуры і сацыяльным абліччы старажытнарускага Наваградка

Прадстаўленьне аб матэрыяльнай і духоўнай культуры Наваградка, а таксама аб яго сацыяльным абліччы было б няпоўнае, без выяўленьня таго месца, якое ён заўмаў сярод іншых старажытнарускіх гарадоў і, у першую чаргу, сярод гарадоў Заходняй Русі, матэрыялы якіх мы сістэматычна супастаўлялі з наваградскімі.

У главе 2 узнікненьне і першапачатковая гісторыя Наваградка параўноўвалася з адпаведнымі працэсамі, што адбываліся ў другіх паселішчах Панямоньня. Як можна мяркаваць па дадзеных археалогіі, дагарадскі і гарадскі перыяды ў гісторыі Наваградка супалі з часам складаньня другіх старажытнарускіх паслішчаў гэтай зямлі.

Не заўсёды паселішча дагарадскога характару ў Панямоньні перарасталі ў гарады. Так сталася з гарадзішчам Індура недалёка ад Гродна, якое раскапала К.Т. Кавальская. Гэта гарадзішча размешчана на мысавам узвышшы недалёка ад ракі. Наібольш высокая яго частка занята пляцоўкай, агароджанай валам вышынёй 1 м. і рвом. Вал абкружаў таксама другую пляцоўку, у заходняй частцы якой захаваліся рэшткі трэцяга вала. Культурны слой магутнасьцю да 1 м., адзначаны на другой пляцоўцы паблізу вала, у той час як у цэнтры таўшчыня слоя дасягае толькі 20-40 см. Знаходкі гарадзішча Індура прадстаўлены раньнекружальным посудам X-XI стст., сярод якога сустракаецца заходнеславянскі. Цікавая знаходка тут касьцяной пласцінкі для арнаментаваньня глінянага посуду. Варта адзначыць знаходкі жалезных наканечнікаў стрэлаў, інкруставаную шпору і спражку ад аброці каня.

Па распалажэньню культурнага слоя на краю пляцоўкі і па складу інвентара, гарадзішча Індура падобна да гарадзішча Муравельнік у Ваўкавыску. Для абодвух сінхронных помнікаў характэрная канцэнтрацыя культурнага слоя каля валоў і прысутнасьць воінаў. У Муравельніку, сярод апошніх, побач са славянскім насельніцтвам былі нарманы. Аднак, жыцьцё, спыніўшыся на Муравельніку ў сярэдзіне XI ст., працягвалася на бліжэйшых узвышшах у той час як пасёлак у Індуры спыніў сваё існаваньне[1].

У канцы I і пачатку II тысячагоддзя н.э. працэс утварэньня

гарадоў ішоў у Полацкай зямлі. У адрозненьне ад Панямоньня, дзе будучыя гарады засноўвалі на раней незаселеных месцах, полацкія гарады ўзніклі на месцы больш раньніх пасёлкаў. Лукомль заснаваны на тэрыторыі, дзе быў пасёлак пачатку I тысячагоддзя н.э., Друцк — на месцы паселішча IV-V стст. н.э. Браславу папярэднічаў латгальскі пасёлак апошніх стагоддзяў I тысячагоддзя н.э. Феадальны Полацк вырас пасля пераносу Полацкага гарадзішча і селішча на новае месца[2]. Шмат гадоў ідзе дыскусія паміж Э.М. Загарульскім і Г.В. Штыхавым аб тым дзе і як быў заснаваны Мінск.

Археалагічныя матэрыялы прывялі аўтара да высновы, што людзі, якія заснавалі Наваградак, былі дрыгавічы (с. 00). На думку П.Ф. Лысенкі Тураў і Берасьце таксама былі заснаваны дрыгавічамі[3].

Першапачатковы наваградскі пасёлак, які ўзнік у канцы X ст., у сярэдзіне XI ст. ператвараецца ў старажытнарускі горад і ў гэтым статусе жыве больш 250 гадоў. Па поваду нашага гораду ў адной са сваіх работ Л.В. Аляксееў піша так: “Трэба памятаць, што Наваградак быў асобы, нетыповы для астатняй Русі цэнтр”[4]. Каб згадзіцца з гэтай высновай альбо адхіліць яе неабходна ўсебакова ацаніць культуру гэтага гораду. Пры гэтым трэба вылучыць у ёй агульнарускія рысы, галоўным чынам, у іх заходнерускім увасабленьні — адзначыць асаблівасьці, якія збліжаюць Наваградак з другімі гарадамі Панямоньня — Чорнай Русі і вылучыць спецыфіку, уласьцівую толькі культуры Наваградка.

Агульнарускае аблічча першапачатковага паселішча ў Наваградку, у значнай меры, ахарактэрызавана папарадзе. У главе 2 сабраны матэрыялы, дзякуючы якім можна сабе ўявіць узнікненьне пасёлку, насельніцтвам якога былі пераважна нашчадкі дрыгавічоў, якія засвоілі ў канцы I тысячагоддзя ўрадлівыя землі Наваградчыны. Іх матэрыяльная культура — домабудаўніцтва, мясцовыя і прывазныя вырабы, а таксама пахавальны абрад тыповы для ўсходнеславянскага насельніцтва свайго часу.

Ператвараўшыся ў горад у сярэдзіне XI ст. і ўступіўшы ў пару максімальнага росквіту ў XII ст., Наваградак захоўвае старажытнарускі характар сваёй культуры. У горадзе працягваюць будаваць наземныя зрубныя жылыя дамы з глінабітнымі печкамі, характэрнымі для паселішчаў лясной зоны. Масавая кераміка прадстаўлена старажытнарускімі формамі посуду, пераважна, гаршкамі. Тыповая карціна вымалёўваецца ў жалезаапрацоўчым рамястве. Амаль усе катэгорыі знаходак з жалеза, што зроблены ў Наваградку, немагчыма адрозніць ад іншых вырабаў Старажытнай Русі, у першую чаргу заходнерускіх гарадоў. У гэтым плане

асаблівую цікавасьць прадстаўляе ідэнтычнасьць навагрaдскага “арсеналу” з распаўсюджанымі на Русі прадметамі ўзбраеньня. Пры ўсіх асаблівастях арганізацыі бронзаліцейства і залатарства ў Навагрaдку, у ім знайдзена вельмі многа прадметаў убору і ўпрыгожаньняў, паўсюдна пашыраных на Русі.

Вялікая частка старажытнарускіх гарадоў была звязана з Кіевам. У поўнай меры такая сувязь праяўляецца ў культуры Навагрaдка. Асаблівасьці кіева-навагрaдскіх кантактаў будуць разгледжаны ніжэй. Падобна да другіх заходнерускіх гарадоў, Навагрaдак меў шматбаковыя кантакты з Прыбалтыкай.

Зусім відавочны старажытнарускі характар духоўнай культуры жыхароў Навагрaдка. Ён праявіўся ў культавым дойлідстве, хрысьціянскіх рэаліях, кірылічным пісьме, распаўсюджаньні хрысьціянскіх імёнаў і другіх асаблівасьцях ідэалогіі.

Такія асноўныя асаблівасьці культуры Навагрaдка, і гэта родніць яго з культурай іншых гарадоў Старажытнай Русі, у прыватнасьці, заходнерускіх.

У культуры нашага гораду ёсьць рысы, уласьцівыя, выключна, для гарадоў Панямоньня. Даследаваўшы масавую кераміку Навагрaдка і іншых гарадоў Чорнай Русі, М.У. Малеўскай удалася выявіць своеасаблівасьць іх керамічнага комплексу. Сярод асноўнага віду глінянага посуду — гаршкоў, вылучаюцца формы характэрныя для керамікі дрыгавічоў. Побач з гэтым распаўсюдзіліся, а ў раньнім Ваўкавыску сталі дамінуючым тыпам, гаршкі, якія вядомыя на Паўднёва-Заходняй Валыні. Асобную групу керамікі складае заходнеславянскі мазавецкі посуд, арнаментаваны штампам і налепленым валікам, а таксама гаршкі з прамым горлам. У другой палове XI ст. уваходзяць ва ўжытак гаршкі так званага драгічынскага тыпу, вертыкальныя шыйкі якіх, таксама як і тулава, пакрыты лінейным арнаментам. Гэты посуд па сваім паходжаньні ўзыходзіць да паселішчаў Падляшша[5].

Кераміка паселішчаў Чорнай Русі ў іх дагарадскі і раньнегарадскі перыяды, уключаючы посуд дрыгавічоў, валынян, жыхароў Мазовіі і Падляшша адлюстроўвае, такім чынам, керамічны комплекс перыяду засяленьня Панямоньня, фарміраваньня і першапачатковай гісторіі гарадоў гэтай зямлі.

Падабенства керамікі гарадоў Панямоньня захоўваецца і ў XII-XIII стст. з той розніцай, што заходнеславянская кераміка, якая знікла ў Навагрaдку, прцягвае пабытаваць у гарадах Заходняй часткі Панямоньня — Ваўкавыску і Гродне[6].

Спецыфіка гаспадарчага жыцьця гарадоў Чорнай Русі праявілася ў вялікім значэньні паляваньня. У той час калі ў

Полацкай і Тураўскай зямлях важная роля гэтага промыслу характэрна для асобных гарадоў (Лукомль, Клецк, Давідгарадок), у гарадах Панямоньня яна ўласьціва ўсім помнікам і нават пераважала над жывёлагадоўляй. Толькі ў гарадах Чорнай Русі палявалі на тура. (с. 00).

Асабліва шмат агульнага ў культуры Наваградка і Ваўкавыска. Першапачатковае засяленьне абодвух гарадоў адбываецца амаль адначасова і аднатыпна. Як адзначана ў главе 2, у Ваўкавыску акрамя двух першапачаткова неўмацаваных паселішчаў — Шведскай гары і Замчышча, існавала маленькая крэпасьць Муравельнік і гэтым Ваўкавыск адрозніваўся ад Наваградка. Пасля спыненьня жыцьця на Муравельніку, тапаграфія абодвух гарадоў становіцца ідэнтычнай. На Замкавай гары ў Наваградку і Шведскай гары ў Ваўкавыску адначасова ўзводзяцца валы, якія ператварылі неўмацаваныя ўзвышшы ў гарадскія дзяцінцы, а суседнія ўзвышшы — Малы Замак у адным горадзе і Замчышча ў другім — у пасады. Яшчэ адна змена ў характары абарончых збудаваньняў абодвух гарадоў адбываецца ў пачатку XII ст., калі гарадскія пасады абносяцца валамі і ператвараюцца ў вакольныя гарады[7].

Матэрыяльная і духоўная культура Наваградка, як можна мяркаваць по археалагічным матэрыялам, мае шмат агульнага з культурай Ваўкавыска. Важной асаблівастью, якая зьбліжае абодва гарады, з'яўляецца шматлікая зброя, якой валодалі жыхары. Сярод зброі дальняга бою наваградцаў і ваўкавысцаў вялікае значэньне мелі ўтульчатыя наканечнікі жалезных стрэлаў, якія вельмі рэдка сустракаюцца ў другіх старажытнарускіх гарадах.

Для духоўнага жыцьця абодвух гарадоў Панямоньня характэрна актыўнае пранікненьне пісьменства, што падцьвярджае вялікая колькасьць знайдзеных стыляў — пісалаў. Па колькасьці гэтых знаходак Наваградак і Ваўкавыск займаюць адно з першых месцаў не толькі ў маштабе Панямоньня, але ўвогуле сярод гарадоў Старажытнай Русі.

Падабенства і нават роднасьць культуры Наваградка і Ваўкавыска фіксуецца дзякуючы таму, што абодва гарады археалагічна вывучаны больш за другія чорнарускія гарады. Цалкам магчыма, што даследваньне шырокай плошчай іншых гарадоў Панямоньня дазволіць паказаць ідэнтычнасьць іх культуры з культурай другіх помнікаў Чорнай Русі.

Асноўныя матэрыялы Наваградка дазваляюць акрэсліць месца гэтага гораду сярод заходнерускіх гарадоў і іх лакальнай групы — гарадоў Панямоньня. Наваградак, які ўзнік і існаваў на ўсходзе Чорнай Русі меў усе рысы старажытнарускага гораду.

Напрацяг стагоддзя ад часу свайго ўзнікненьня ў канцы X ст. і

да канца XI ст., паселішчы ў Наваградку не вылучалася якімі б ні было асаблівасьцямі. Больш за паўстагоддзя жыхары, што занялі наваградскія ўзвышшы, не ведалі і, відавочна, не мелі патрэбы ў абарончых збудаваньнях. З узвядзеньнем вала на Замкавай гары і з ператварэньнем яе ў крэпасьць, яе тэрыторыя служыла як сховішча.

У першапачатковым паселішчы і раньнім горадзе былі развітыя галоўныя рамёствы — ганчарства, апрацоўка жалеза і каляровых металаў. Падтрымліваліся сувязі са знешнім светам. Наваградцы пастаўлялі навакольнаму сельскаму насельніцтву свае і прывазныя вырабы.

У мацярыковай культуры Наваградка аж да канца XI ст. рэзка не выяўлялася маёмасная няроўнасьць. Зброя сустракалася рэдка. Мяркуючы па абраду пахаваньня і інвентару, наваградскі магільнік мала чым адрозніваўся ад магільных помнікаў сваёй сельскай акругі. Да канца XI ст. насельніцтва было язычнікамі.

Карэнныя змены ў культуры гораду прыходзяцца на пачатак XII ст. Яго дзяцінец з крэпасьці-сховішча стаў месцам перабываньня феадала — феадальным дваром. Гарадскі пасад ператвараецца ў вакольны горад. Тая яго частка, якоя была археалагічна даследавана, прадстала ў выглядзе багатага гарадскога квартала. Такім чынам, культура Наваградка XII-XIII стст. аднаўляецца па дадзеных аб, пераважна, сацыяльных вярхах гарадскога насельніцтва, сярод якога хутка распаўсюджваецца хрысьціянства. Менавіта гэтыя асаблівасьці ствараюць прадстаўленьне аб нетыповасьці старажытнарускага Наваградка.

Змены ў культуры Наваградка XII-XIII стст. у параўнаньні з культурай раньняга гораду, не звязаны ні з якімі знешнімі ўплывамі. Яны з'яўляюцца ў выніку пераўтварэньняў, што адбываліся на месцы. Самыя выразныя матэрыялы, што характарызуюць домабудаўніцтва, рамяство, кантакты з другімі зямлямі і іншыя бакі жыцьця гораду перыяду яго росквіту, сягаюць сваімі каранямі ў яго папярэднюю гісторыю. Змены ў культуры Наваградка, з пачатку XII ст. абумоўлены сацыяльнымі зменамі, якія адбываліся ў яго жыцьці. Натуральна, што пры гэтым з'явіліся новыя, раней невядомыя бакі культуры.

Археалагічныя матэрыялы, што належаць да жыцьця прывілераванага насельніцтва гораду XII-XIII стст. даюць канцэнтраванае прадстаўленьне аб старажытнарускай гарадской культуры гэтага часу. Нешматлікія пісьмовыя сведчаньні, датычныя палітычнай і культурнай гісторыі прыпадаюць, выключна, на XIII ст.

У XII ст. наваградскі дзяцінец належыць феадалу, які валодаў Замкавай гарой. Мяркуючы па тым, што пад 1235 г. летапісцу

вядомы Ізяслаў Наваградскі (с. 00), магчыма, што княжацкая ўлада існавала тут і ў больш раньні час. Феадалы і іх атачэньне мелі шмат зброі і такіх каштоўных рэчаў як іранскі фаянсавы посуд, шкляны посуд і іншы імпарт. Сацыяльным вярхам дзяцінца належала спецыяльная гаспадарчая зона ў паўночнай частцы пляцоўкі Замкавай гары. У амбарах і засеках гэтай зоны захоўваліся харчы і іншыя запасы. Багатыя насельнікі дзяцінца займаліся гандлем, аб чым можна мяркаваць па скапленьню гірак для вясоў, знайдзеных у адной з гаспадарчых пабудоў. З духоўным жыцьцём прывеліраванай частцы жыхароў Замкавай гары звязаны мясцовыя і прывазныя хрысьціянскія рэаліі і ўвайшоўшыя ў побыт кнігі.

Рамесніцкая дзейнасьць на тэрыторыі наваградскага дзяцінца XII-XIII ст. прадстаўлена, галоўным чынам, залатарамі, якія сумяшчалі сваю асноўную работу з апрацоўкай горнага крышталя. Рабілі, галоўным чынам, цісненьне і коўку каляровых металаў і срэбра, радзей ліцейныя работы. Распаўсюджаньне матрыц кіеўскага ўзору дазваляе мяркаваць з'яўленьне ў Наваградку залатароў з Паўднёвай Русі. Магчыма, што сярод ганчароў, якія працавалі за межамі дзяцінца і выраблялі паліваны посуд таксама былі кіеўскія рамеснікі, якія паўтаралі ўзоры паўднёварускай паліванай керамікі.

Вярнуўшыся да пытаньня аб сацыяльных групах насельніцтва дзяцінца, адзначым людзей простых — чэлядзь. Абслуга феадала і яго атачэньня, плебс Замкавай гары сяліўся ў паўднёвай і часткова паўднёва-усходняй частцы пляцоўкі., займаючы звычайныя зрубныя дамы, да якіх, часам, прымыкалі невялікія гаспадарчыя пабудовы. Асобныя знаходкі — абломкі амфар, прывазны шкляны посуд і інш., знайдзеныя пры раскопках гэтых пабудоў, наўрад ці звязаны з побытам нізшай праслойкі насельніцтва дзяцінца і, па ўсёй верагоднасьці, трапілі туды з багатых комплексаў дзяцінца.

Канцэнтрацыя несвабодных рамеснікаў дзяцінца і асоб, якія заняты абслугай феадала ў пэўнай частцы пляцоўкі гарадской крэпасьці, адзначана ў Друцку і Мсьціслаўлі, раскапаных Л.В. Алексеевым[8].

Такім чынам, мяркуючы па дадзеных археалогіі, невялікую пляцоўку наваградскага дзяцінца ў XII-XIII стст. займалі тры катэгорыі гараджан, дзьве з якіх — рамеснікі і чэлядзь — абслугоўвалі ўладальніка Замкавай гары і яго атачэньне. Рамеснікі дзяцінца, натуральна, належалі да катэгорыі вотчынных.

Сацыяльнае аблічча насельніцтва вакольнага горада Наваградка, разглядалася ў кнізе "Старажытны Наваградак"[9].

Матэрыялы, якія адносяцца да гэтай праблемы незвычайныя і шматгранныя. Іх трактоўку нельга лічыць вычарпанай.

Матэрыяльная культура раскапанай намі гэтай часткі гораду і датаваная XII-XIII стст. на дзіва аднародная. За выключэньнем двух жылых пабудоў, якія наляжалі простым грамадзянам, астатняя тэрыторыя была забудавана вялікімі і багатымі дамамі, частку якіх на працягу стагоддзя належала адным і тым жа сем'ям.

Шматлікі і багаты інвентар жылых пабудоў спалучаўся са знаходкамі, якія неабвержна сведчылі, што ўладальнікі дамоў займаліся апрацоўкай каляровых і шляхетных металаў і што асабліва важна, золата. Гэтыя асаблівасьці прывялі аутара да высновы, што ў багатым квартале залатароў вакольнага гораду можна бачыць своеасаблівае аб'яднаньне рамеснікаў[10].

У савецкай літаратуры неаднаразова падымалася пытаньне аб магчымасті існаваньня рамесных аб'яднаньняў у Старажытнай Русі. Аб гэтым пісалі: С.В. Юшкоў, М.М. Ціхаміраў, В.В. Стокліцкая-Церашковіч, Б.А. Рыбакоў, М.М. Варонін і Б.А. Колчын. Існаваньне арганізацыі рамеснікаў-будаўнікоў у старажытнай Гродне бачыў археолаг В. Галубовіч[11]. Іначай ставілася да гэтай праблемы Н.Л. Подвігіна, прымяняльна да Ноўгорада. Прызнаваючы ўслед за Б.А. Колчыным інстытут вучнёўства ў кавалёў, аўтар спрабуе на ноўгарадскіх матэрыялах праверыць прыкметы існаваньня цэхаў, якія на думку Б.А. Рыбакова ім уласьцівыя. Гэта — існаваньне патранальнай царквы, сумесныя піры, наяўнасьць цэхавай адміністрацыі і некаторыя іншыя асаблівасьці. Н.Л. Подвігіна прыходзіць да высновы, што довады Б.А. Рыбакова не падцвярджаюцца матэрыяламі, у прыватнасьці археалагічнымі і што ў Ноўгарадзе XII-XIII стст. не было эканамічных і палітычных прадпасылак для ўтварэньня карпарацый рамеснікаў. Не абмяжоўваючыся Ноўгарадам, даследчыца распаўсюджвае сваю выснову на всю Старажытную Русь і піша: "На наш погляд, у дамангольскі час на Русі яшчэ не склалася сукупнасьць тых эканамічных і сацыяльных умоў, якія прывялі да ўзнікненьня цэхаў на Захадзе"[12].

У апошнія гады праблема існаваньня аб'яднаньняў рамеснікаў ізноў падымаецца ў савецкай літаратуры. Археалагічныя матэрыялы Кіеўскага Падолу прыводзяць М.А. Сагайдака да думкі, што высокая ступень знаходак таварнай прадукцыі ў гэтай частцы гораду, дазваляе думаць аб узнікненьні там аб'яднаньняў рамеснікаў[13].

Прыхільнікам існаваньня ў Старажытнай Русі аб'яднаньняў рамеснікаў з'яўляецца П.С. Пеняк, на думку якога шматпрофільнае рамяство старажытнарускіх гарадоў дазваляе

мяркаваць існаваньне ў іх рамесных аб'яднаньняў. Мабілізуючы дадзеныя пісьмовых крыніц і археалогіі, П.С. Пеняк прыходзіць да высновы, што такія маглі ўтварыцца ў вялікіх гарадах[14].

Наваградак не належыць да ліку вялікіх гарадоў Старажытнай Русі. Тым не меньш яго вакольны горад мае многія рысы, якія дазваляюць убачыць на яго тэрыторыі своеасаблівае аб'яднаньне рамеснікаў. Гэта знайшло праяву ў строгай адасобленасьці квартала багатых і добра ўзброеных залатароў, спадчынасьці іх рамяства, існаваньні прывеліраваных могілак, якія ўзніклі, верагодна, каля патранальнай царквы, рэаліях, што сведчаць аб пірах жыхароў квартала і другіх прыкметах, што вылучаюць іх сярод іншых гаражан.

На кожным з трох этапаў існаваньня багатага квартала вакольнага гораду Наваградка з пачатку XII ст. да яго гібелі ў 70-я гады XIII ст., сярод багатых дамоў вылучаюцца асобныя жылішчы. Для першай паловы XII ст. такім быў дом, сьцены якога пакрываў фрэскавы роспіс. Мяркуючы па тым, што сьцены гэтага дому і Барысаглебскай царквы пакрывалі адны і тыя ж фрэскісты, гаспадары яго маглі мець сувязі з наваградскім храмам[15].

У другой палове XII ст. шматлікім і разнастайным інвентаром вылучаліся два дамы. Пабудова 10, якая змяніла дом з фрэскавым роспісам і пабудова 5 у цэнтры пляцоўкі, якая ўзведзена над заглыбленым домам. У гэтых абодвух дамах побач з апрацоўкай каляровых металаў і срэбра, займаліся гарачай і халоднай апрацоўкай золата[16].

Выснова аўтара гэтай работы аб тым, што ў вакольным горадзе Наваградка XII-XIII стст. магло фарміравацца аб'яднаньне рамеснікаў, аб чым упершыню было сказана ў друку ў пачатку 70-х гадоў[17], застаецца ў сіле. Пры гэтым варта зазначыць, што ў познім Сярэднявеччы на тэрыторыі Беларусі адзначаны даўнія традыцыі карпаратыўнага рамяства. Узнікненьне цэхаў там адзначана задоўга да атрыманьня гарадамі Магдэбургскага права (XVI ст.)[18].

Забудова багатага квартала рэзка скарачаецца з пачатку XIII ст. Аднак і ў гэты час сваім маёмасным становішчам вылучаюцца ўладальнікі пабудовы 4, якая пабудавана на месцы загінуўшай у пажары пабудовы 5[19].

Тэрыторыя Малага Замка, што даследавана археалагічнымі раскопкамі, дае яркую, але няпоўную карціну засяленьня вакольнага гораду. Багаты квартал займаў мыс узвышша. Яго граніцы ўдалася акрэсліць з поўначы, усходу і поўдня. Працягласьць гэтага кварталу на Захад з-за сучаснай забудовы тэрыторыі высвятліць не ўдалася. У закладзеных шурфах сустракаецца культурны слой старажытнарускага часу, але

няясна, ці звязаны ён з дамамі багатага кварталу. Магчыма, што на тэрыторыі вакольнага гораду жылі рамеснікі тых прафесій, якія не прадстаўлены ў багатым квартале. Разам з тым, частка рамеснікаў магла сяліцца за межамі гарадскіх умацаваньняў. У недаўнім мінулым, вуліцы на поўдзень ад Замкавай гары называліся Кавальскай, Бандарскай, Рымарскай і інш.

У сувязі з вызначэньнем сацыяльнага аблічча пасаду-вакольнага гораду старажытнарускага Наваградка, звернемся да высновы Б.А. Цімошчука аб археалагічных прыкметах пасадаў гарадоў Старажытнай Русі. Аўтар разглядае іх як самакіруемыя абшчыны, якія ўзніклі ля сьцен дзяцінцаў і заселеныя дробнымі рамеснкамі-вытворцамі[20].

Пакуль няма тлумачэньня прычыны заняпаду жыцьця на тэрыторыі багатага кварталу. Магчыма, што маючы больш слабыя ўмацаваньні чым дзяцінец, Малы Замак быў аб'ектам нападу раней таго часу, які зафіксавалі летапісы. Безперапынная ваенная небяспека магла адбіцца на яго забудове.

Археалагічныя матэрыялы Наваградка даюць прадстаўленьне аб розных катэгорыях гаражан, але спецыфікай гэтага гораду з'яўляецца то, што ў ім незвычайна яскрава і шматвобразна адлюстравана жыцьцё гарадскіх вярхоў. Па сутнасьці, у гэтым заключаецца прычына прадстаўленьня аб нетыповасьці гэтага гораду. Якія ж былі ўзаемаадносіны абедзьвух груп прывіліраванага насельніцтвя дзяцінца з яго феадалам і адпаведным атачэньнем і багатых залатароў вакольнага гораду? Абодва паселішчы абкружаны валам. Паміж імі быў глыбокі роў. Па колькасьці зброі жыхары дзяцінца (Замка) і багатага кварталу вакольнага гораду (Малага Замка) не саступалі адны другім. Гэта былі роўныя па сваім маёмасным становішчы насельнікі сярэдневяковага гораду.

Сумесныя дзеяньні гарадскіх вярхоў можна бачыць у тым, што ніжні вал, пабудаваны першапачаткова ля падножжа Замкавай гары, пазней быў працягнуты да падножжа Малага Замка і стаў прадстаўляць дадатковае абарончае збудаваньне ўсяго гораду. На дзяцінцы выкарыстоўвалі ювелірныя вырабы, зробленыя рамеснікамі вакольнага гораду. Пахаваньне жанчыны на могілках Малага Замка з бляшкамі, ціснёнымі з матрыц дзяцінца, значыць альбо тое, што на прывіліраваных могілках хавалі знатных насельнікаў дзяцінца, альбо распаўсюджаньне падобных упрыгожаньняў сярод гараджанак багатага кварталу. Абедзьве групы сацыяльных вярхоў дзейнічалі сумесна ў сувязях са знешнім светам: як з іншымі старажытнарускімі землямі, так і з тэрыторыямі, што знаходзіліся за межамі Старажытнай Русі.

У летапісных звестках аб Наваградку неаднаразова

ўспамінаецца тэрмін “Новгородци”. Сын Данііла Раман, які валодаў Навоградкам, ідзе на дапамогу бацьку, які змагаецца з яцьвягамі “со всими новгородци”. Князь Міндоўг, звяртаючыся да Данііла кажа: “пришлю тобе Романе и Новгородце”. Войшалк “поя з собой новгородце и поиде в Литвоу княжить”[21]. “Новгородци” летапісу — гэта воіны, княжаская раць. Мяркуючы па знайдзенай зброі, яна магла камплектавацца не толькі з княжаскага атачэньня на дзяцінцы, але і вельмі добра ўзброеных жыхароў вакольнага гораду.

Палітычнае значэньне Наваградка ў XIII ст. дапамагаюць зразумець словы летапісца пад 1253 г., у канцы паведамленьня аб другім паходзе Данііла ў Панямоньні “Наоутрея плениша всю землю Новгородскую”[22]. Тэрмін “зямля” А.Н. Насонаў атаесамляў з найменьнем “воласьць” і “вобласьць”, і лічыў, што так называліся феадальныя паўдзяржавы[23]. “Зямля Наваградская” азначала існаваньне ў Чорнай Русі княства, цэнтрам якога быў летапісны Новгородок. Мяркуючы па археалагічных матэрыялах, гэта княства афармляецца з пачатку XII ст.

Мяжа наваградскага княства выразна прасочваецца толькі на поўначы, у 30 км. ад гораду на Нёмане. Менавіта там Войшалк заснаваў манастыр “на реце на Немне межи Литвою и Новым городком”[24]. Магчыма, што ўсходняя мяжа таксама абазначалася гэтай ракой. Заходнія землі наваградскага княства сутыкаліся з уладаньнямі Слоніма, адлеглага на 80 км. які, відавочна, таксама з’яўляўся княжацкім цэнтрам. Зусім няяснай застаецца працягласьць наваградскай зямлі на поўдзень.

Наваградскае княства XII-XIII стст., як і горад папярэдняга часу цесна звязана з акругай, менавіта ў гэты час назіраецца актыўнае жыцьцё на селішчы Гарадзілаўка (суч. Гардзілоўка - пер.). Узаемаадносіны гораду і мясцовых паселішчаў відаць па мясцовых і прывазных вырабах, якія траплялі з Наваградка жыхарам акругі, за хлеб і іншыя прадукты сельскай гаспадаркі, што тыя пастаўлялі ў горад.

Наваградак як цэнтр княства вылучаўся сваімі актыўнымі знешнімі сувязямі. Рэдкі старажытнарускі горад не меў кантактаў з Кіевам. У Наваградку яны шматгранныя. Кіеўскі імпарт, што прыбываў з канца X ст., у XII ст. робіцца абільным і разнастайным. З пашырэньнем хрысьціянства заўважным патокам прывазных вырабаў становяцца прадметы культу, а ў помніках пісьменства засвайваецца кіеўская традыцыя. Праз горад на Дняпры транзітам прыбываюць дарагія, нярэдка унікальныя візантыйскія і блізкаўсходнія тавары. Археалагічныя матэрыялы дазваляюць гаварыць аб з’яўленьні ў Наваградку кіеўскіх і іншых

паўднёварускіх рамеснікаў (залатары, ганчары).

Пабудова Барысаглебскай царквы паказвае на кантакты нашага гораду з Полацкай зямлей. Храм пабудавала грэчаская арцель, якая перад гэтым паставіла царкву ў Віцебску, удзельнічалі таксама полацкія будаўнікі. Навагрудак быў звязаны і з іншымі старажытнарускімі землямі, а таксама з дзяржавамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Сваім абільным і разнастайным імпартам Навагрудак XII-XIII стст. вылучаецца сярод іншых гарадоў Старажытнай Русі.

Гісторыкі, якія пісалі аб Чорнай Русі на падставе пісьмовых крыніц, пры ўсёй абмежаванасьці, не маглі не вылучыць Навагрудак, за які ў 50-70-я гг. XIII ст. упарта змагаліся князі Валыні і Літвы. Толькі ў святле дадзеных археалогіі стала відавочна, што барацьба вялася за квітнеючы горад. Летапісныя звесткі як бы завяршаюць гісторыю старажытнарускага Навагрудка, адноўленага археолагамі.

Гісторыя старажытнарускага Навагрудка, якая заканчваецца да канца XIII ст. не звязана з заваёвамі альбо якімі знешнімі падзеямі. Разбурэньне вакольнага гораду, зафіксаванае летапісцам пад 1247 г., прывяло да загасаньня жыцьця на яго тэрыторыі, што адбывалася ад пачатку XIII ст.

Пасля заваяваньня вакольнага гораду жыцьцё на ім на нейкі час замірае. Паміж культурным слоем гораду ў перыяд Старажытнай Русі і познесярэдневяковым ляжыць магутная падсыпка пяску. У матэрыялах XIV ст. і пазнейшага часу нішто не нагадвае аб багатым квартале старажытнарускага гораду.

У канцы XIII ст. заканчваецца старажытнарускі перыяд і ў гісторыі Замкавай гары, але гістарычны яе лёс іншы. На навагрудскам дзяцінцы, што выстаяў перад войскам валынскага князя, а ў далейшым перад Ордэнам, пачынаецца інтэнсіўнае будаўніцтва. У XIV ст. на паўночнай частцы Замкавай гары ўзводзіцца з пачатку царква, а потым палац феадала, у якім адзначаецца спалучэньне старажытнарускіх традыцый з архітэктурна-будаўнічымі прыёмамі еўрапейскай готыкі, што ўласьціва часу фарміраваньня дойлідства Вялікага Княства Літоўскага[25]. У паўднёва-усходняй частцы пляцоўкі былі адкрыты рэшткі двухкамерных печаў, складзеных з брусковай цэглы і каменю. Мяркуючы па фармату цэглы (28-29x13-14, 5x8-9 см.)[26], абедзьве печы сінхронныя грамадзянскай пабудове.

У далейшым, в выніку інтэнсіўнага будаўніцтва, тэрыторыя Замкавай гары ператвараецца ў сямівежавы замак — адзін з магутных замкаў свайго часу[27].

Сістэматычныя даследваньні навагрудскіх старажытнасьцяў XIV-XVII стст. дапаможа выявіць іх сувязь з культурай летапіснага

Новгородка. Гэту сувязь прызнаваў М.К. Любаўскі, калі пісаў аб Наваградку — стольным горадзе Вялікага Княства Літоўскага. “Самастойнасьць наваградскага намесніка ўзыходзіла да удзельнай эпохі і тлумачыцца тым, што ён быў пераемнікам удзельнага князя”[28].

У томе “Археалогіі СССР”, што прысвечаны старажытнарускаму гораду, сярод іншых помнікаў, пэўнае месца адведзена Наваградку. А.В. Куза, які зрабіў велізарную працу па сыстэматызацыі паселішчаў Старажытнай Русі, змяшчае яго ў групу помнікаў, чыя ўмацаваная тэрыторія не перавышае 2,5 га. Для часу да XII ст., наш горад аднесены аўтарам да другой групы, якую склалі 32 умацаваныя паселішчы. Для іх, на думку аўтара, цяжка вылучыць вядучы накірунак у гаспадарчай дзейнасьці, вузкую спецыялізацыю рамяства, дыферэнцыяцыю жылых пабудоў і інш. З сярэдзіны XII ст. Наваградак у ліку 25 помнікаў, сярод якіх Плісненск, Тарапец, Гродна, Ушчыж, Друцк і інш. пераходзіць у першую групу, г.зн. гэтыя помнікі ператвараюцца ў сапраўдныя гарады, большай часткай у сталіцы удзельных княстваў[29].

Згаджаючыся з А.В. Кузой, які акрэсліў працэсы, што нароўні з іншымі паселішчамі адбываліся ў Наваградку, трэба ўдакладніць, што ў нашым горадзе яны закончыліся на паўстагоддзя раней. Археалагічныя матэрыялы — узвядзеньне вала на Малым Замку, будаўніцтва вялікіх дамоў са шматлікай зброяй і прадметамі раскошы, адбудова Барысаглебскай царквы, узнікненьне хрысьціянскіх могілак паблізу багатай забудовы, фарміраваньне гаспадарчай зоны для знаці дзяцінца і распаўсюджаньне на ім разнастайнай зброі — з’яўляюцца з пачатку XII стагоддзя. Няма сумневу, што сапраўдным гарадскім цэнтрам, якому ўласьцівыя ўсе альбо амаль усе прыкметы вызначаныя А.В. Кузой для гораду, Наваградак робіцца з надыходам XII ст.

Сьціплыя паселішчы дагарадскога характару канца X і першай паловы XI стст., якія не мелі абарончых збудаваньняў, дзяцінец і неўмацаваны пасад другой паловы XI ст., выдатны па сваёй культуры старажытнарускі горад XII-XIII стст. і першакласны замак позняга сярэднявечча — такія асноўныя этапы гісторыі і культуры Наваградка. Істотна, што ўсе змяненьні ў абліччы старажытнарускага паселішча, асабліва значныя перамены, што адбываліся ў Наваградку з пачатку XII ст., з’явіліся ў выніку працэсаў, якія праходзілі ў эканоміцы і культуры нашага помніка, без уплыву заўважных знешніх падзей, у той час як яго культурная гісторыя больш позняга часу цесна звязана з Вялікім Княствам Літоўскім.

Археалагічныя досьледы выявілі культуру летапіснага

Новгородка як аднаго з гарадскіх цэнтраў Чорнай Русі і гэтым, несумненна, папоўнілі веданьне ўсёй старажытнарускай культуры. Разам з тым, у матэрыялах Навагрaдка ёсьць асаблівасьці, якія прымушаюць па новаму ацаніць некаторыя рысы культуры Старажытнай Русі.

У адной са сваіх работ А.В. Куза характэрызаваў культуру малых старажытнарускіх гарадоў. Выкарыстаўшы матэрыялы такіх паселішчаў XII-XIII стст., што раскапаныя шырокай плошчай, аўтар адзначаў, што ім уласьцівыя тыя ж “гарадскія” паказальнікі, што і стольным гарадам: разнастайная дзейнасьць рамеснікаў, знаходкі зброі, прывазных вырабаў, наяўнасьць каменных храмаў (сустракаюцца ў 27 малых гарадах), пісьменнасьці, маёмаснай дыферэнцыяцыі і іншыя прыкметы культуры, уласьцівыя вядучым старажытнарускім гарадам. “Археалагічныя характарыстыкі разгледжаных паслішчаў - піша аўтар - большай часткай паказальнікаў сходныя з характарыстыкамі 10 буйнейшых цэнтраў Русі, адрозніваючыся толькі з боку колькасьці, але не якасьці”[30].

Выснова А.В. Кузы вельмі важная. З яе вынікае, што не існавала старажытнарускай правінцыйнай культуры. Трэба пры гэтым адзначыць, што колькасныя паказальнікі, якімі дыспануе археалогія вельмі ўмоўныя. Як правіла, стольныя гарады раскапаны шмат большай плошчай чым малыя. Пры гэтым, звяртае на сябе ўвагу, як мы адзначылі ў адпаведных главах гэтай працы, колькасьць зброі ў Ваўкавыску, колькасьць прыладаў для пісьма, знайдзеных у тым самым Ваўкавыску і Яраполчы Залескім. Падобныя прыклады можна павялічваць. Навагрaдак, у гэтым плане займае асобнае становішча. Адзіная для старажытнарускага арэалу канцэнтрацыя заможнага насельніцтва ў вакольным горадзе, спрыяла таму, што асобныя бакі старажытнарускай культуры праявіліся ў ім ярчэй чым у шэрагу стольных гарадоў. Багаты квартал з вялікімі асьцекленымі дамамі (якому няма аналагаў), а таксама размах знешніх, асабліва іншаземных сувязей вылучаюць Навагрaдак сярод астатніх старажытнарускіх гарадоў.

У працэсе вывучэньня сацыяльнай арганізацыі старажытнарускага рамяства, у літаратуры даўно пастаўлена праблема аб магчымасьці існаваньня аб’яднаньняў рамеснікаў у старажытнарускіх гарадах. Яна яшчэ не вырашана, да гэтай праблемы даследчыкі звяртаюцца і, несумненна, яшчэ будуць звяртацца і ў гэтых умовах, квартал залатароў — гаспадароў багатых дамоў вакольнага горада Навагрaдка з’яўляецца каштоўнай крыніцай.

У выніку Навагрaдак — гэты малы старажытнарускі горад у

XII і XIII стст. па пэўных баках культуры не толькі стаіць у шэрагу буйнейшых гарадскіх цэнтраў, але і мае свае, толькі яму ўласьцівыя культурныя асаблівасьці.

Наваградак у гэтым плане не адзіны. На тэрыторыі Чорнай Русі, у Гродне, таксама малым старажытнарускім горадзе, верагодна ў 70-я гг. XII ст. узнікае самастойная архітэктурная школа, для якой характэрна незвычайная структура плана і своеасаблівая аздоба фасадаў. Акрамя культавых будынкаў, там адкрыты рэшткі грамадзянскіх пабудоў, аздобленых часам багацей, чым падобныя збудаваньні Полацка і Смаленска[31]. Як вядома, усе іншыя старажытнарускія архітэктурныя школы ўзніклі ў стольных гарадах. На думку П.А. Рапапорта, складаньне будаўнічай арганізацыі ў Гродне адбывалася шляхам пераходу сюды майстроў з некалькіх старажытнарускіх цэнтраў[32]. Тым не меньш складаньне арыгінальнай архітэктурнай школы ў Гродне, на наш погляд, належыць да тае ж з'явы, якая адзначана для старажытнарускага Наваградка. Не выключана, што падобныя асаблівасьці будуць выяўлены пры даследваньні другіх гарадоў і праблема ўкладу малых гарадоў у культуру Старажытнай Русі атрымае новы імпульс.

Археалагічныя работы ў Наваградку адкрылі старажытнарускі горад, які больш чым на два з паловай стагоддзя старэйшы, чымсьці першы ўспамін аб ім у летапісу. У святле археалогіі ўдалася вызначыць этапы яго развіцьця з канца X і да канца XIII стст. і прачытаць асобныя старонкі ў гісторыі культуры гэтага помніка. Шмат праблем, якія датычаць культуры летапіснага Наваградка і сфармуляваны ў адпаведных главах нашай работы, чакаюць свайго вырашэньня. Яго змогуць даць далейшыя археалагічныя работы як на тэрыторыі гораду так і ў "Наваградскай Зямлі".

Спасылкі:

[1] Гуревич Ф.Д. 1) О формировании городов Черной Руси по данным археологии // СА. 1983. Вып. 3. С. 63-64; 2) Скандинавские знаходки X-XI вв. на тэрыторыи Белоруссии // Скандинавский сборник XXXIII (в печати).

[2] Штыхов Г.В. 1) Древний Полоцк. Минск, 1975. С. 21-33; 2) Города Полоцкай земли. Минск, 1978. С. 42; Алексеев Л.В. Полоцкая земля. С. 151, 173.

[3] Лысенко П.Ф. 1) Города Туровской земли. Минск, 1975. С. 69; 2) Берестье // ТДСД. С. 134.

[4] Алексеев Л.В. Три альбома - каталога по искусству Белоруссии XII-XVIII вв. Рецензия // СА. 1986. Вып. 3. С. 278.

[5] Малевская М.В. Некоторые исторические связи городов

Черной Руси в X-XI вв. // ЭБ. С. 37-39.

[6] Воронин Н.Н. Древнее Гродно // МИА. 1954. вып. 41. С. 60; Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 61-70; Малевская М.В. К вопросу аб локальных вариантах керамики западнорусских земель XII-XIII вв. // КСИА. 1971. вып. 125. С. 27-31.

[7] Гуревич Ф.Д. О формировании ... С. 64.

[8] Алексеев Л.В. 1) Op. cit. С. 153-157; 2) Смоленский город Мстиславль. Стратиграфия, хронология, топография // ТДСД. С. 120.

[9] ДН. С. 130-137.

[10] ДН. С. 132.

[11] ДН. С. 132.

[12] Подвигина Н.Л. Очерки социально-экономической и политической истории Новгорода Великого в XII-XIII вв. М., 1976. С. 87-93.

[13] Сагайдак М.А. Новое в археологии Киевского Подола // ЗСА. С. 222.

[14] Пеняк П.С. 1) К вопросу о социальной организации древнерусского ремесла // ДГ. С. 94-96; 2) К вопросу аб ремесленных объединениях Древней Руси XII-XIII вв. // Земли Южной Руси в IX-XIV вв. Киев, 1985. С. 126-130.

[15] ДН. С. 36-44.

[16] ДН. С. 54-65, 71-81.

[17] Гуревич Ф.Д. Ремесленная корпорация древнерусского города по археологическим данным // КСИА. 1972. Вып. 129. С. 31-36.

[18] Копысский З.Ю. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии. Минск, 1968. С. 143.

[19] ДН. С. 93-98.

[20] Тимощук Б.А. Археологические признаки посада древнерусского города // ТДСД. С. 70-71.

[21] ПСРЛ. М., 1962. Т. 11. Стб. 838, 861.

[22] ПСРЛ. Т. 11. Стб. 829.

[23] Насонов А.Н. “Русская земля” и образование территорыи раннерусского государства. М., 1951. С. 26.

[24] ПСРЛ. Т. 11. Стб. ???

[25] Малевская М.В. Архитектурный комплекс новогрудского детинца XIII-XIV вв. // ДГС. С. 122-125.

[26] Гуревич Ф.Д., Ковальская К.Т., Николаев Н.В., Пономарева Т.С. Новогрудская экспедиция // АО 1974. М., 1975. С. 384-385; Гуревич Ф.Д. Работы в Новогрудке // АО 1984. М., 1986. С. 340.

[27] Ткачоў М.А. Замкі Беларусі. Мінск, 1977. С. 15-21.

[28] Любавский М.К. Очерк истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1915. С. 127.

[29] Древняя Русь. город, Замак, село. М., 1985. С. 47-48, 49.

[30] Куза А.В. Малые города в Древненай Руси // ДГ. С. 64.

[31] Раппопорт П.А. Зодчество Древней Руси. Л., 1986. С. 124-130.

[32] Раппопорт П.А. Op. cit. С. 132.

Дадаткі
Археалагічныя работы на тэрыторыі Замкавай гары

Стацыянарныя даследваньні на тэрыторыі Замкавай гары адбываліся напрацягу 12 сезонаў (1959, 1962, 1968-1971, 1973, 1974, 1977, 1983-1985 гг.). Да гэтых работ трэба прылічыць зачыстку сьценак ямы на пляцоўцы ў 1956 гг., у выніку якой былі адкрыты рэшткі культурнага слоя старажытнарускай пары. За час палявых доследаў былі разбіты тры раскопы агульнай плошчай 664 кв. м. у паўночнай, паўднёвай і паўднёва-усходняй частках пляцоўкі (раскопы 1-3) (мал.).

З-за інтэнсіўнай забудовы пляцоўкі Замкавай гары пачынаючы з XIV ст., раскопы прыйшлося разбіваць бліжэй да краёў пляцоўкі. Культурны слой старажытнарускага гораду ляжаў пад магутным слоем (месцамі дасягаў трох метраў) познесярэдневяковага гораду. Астаткі будаўніцтва гэтага часу амаль паўсюды былі разбураны. У тых выпадках, калі комплексы XIV ст. і больш позняга часу захаваліся, яны ўключаны ў тэкст.

Стратыграфія Замкавай гары ўпершыню была выяўлена пры зачыстцы сьценкі ямы ў 1956 г. Амаль пад дзёрнам паказаўся развал каменю і цэглы (28х15 см.), які сягаў на глыбіню да 1 м. Другі развал цэглы знаходзіўся на глыбіні 1,60 м., а трэці і чацьвёрты на глыбіні 1,80 і 2, 20 м. На глыбіні 3 м. паказаліся астаткі негарэлага дрэва і сустракаліся знаходкі XII-XIII стст. Глыбей немагчыма было працягваць зачыстку сьценкі.

Магутнасьць культурнага слоя ў раскопе 1, мяркуючы па разрэзах яго паўночнай і ўсходняй сьценак складала 3,40-3,60 м. У паўночнай сьценцы напластаваньні з камянем і цэглай і знаходкамі XIV-XVII стст. складалі ад 1 да 1,80 м. пад імі знаходзілася напластаваньне таўшчынёй 1,40-1,50 м., насычанае будаўнічымі рэшткамі і матэрыяламі XII-XIII стст., пад якімі на падсыпцы з пяску адзначаецца культурны слой таўшчынёй 20-30 см. з матэрыяламі не пазней XI ст. У разрэз паўночнай сьценкі трапіла частка пясчанага насыпу, які засыпаны пазней за вал (мал.).

У разрэзе ўсходняй сьценкі гэтага ж раскопа верхняе напластаваньне таўшчынёй 2.40 м. было інтэнсіўна насычана абломкамі цэглы і другімі будаўнічымі рэшткамі. Сярэдняе напластаваньне з матэрыяламі XII-XIII стст. мела таўшчыню каля 1 м. Ніжняе, з матэрыяламі не пазней XI ст. адзначалася не па

ўсім разрэзе. На працягу шасьці метраў (кв. ІКЛ) непасрэдна на мацярыку ляжала другое напластаваньне (мал.).

Максімальная магутнасьць культурнага слоя зафіксавана ў паўднёвым раскопе (2). Ён дасягаў амаль пяці метраў. З іх да познесярэдневяковага гораду належыла напластаваньне да 1,20 м. Сярэдняе напластаваньне таўшчынёй да 2,40 м. з запушчанымі ў яго драўлянымі слупамі, было падсыпана слоем пяску таўшчынёй 80 см., пад якім знаходзілася трэцяе напластаваньне. Апошняе ляжала на мацярыку. У разрэз трапіла яма глыбінёй 40 см., запоўненая зямлёй з рэшткамі драўніны і камянямі (мал.).

У заходняй частцы раскопа 3, плошча якога склала 240 кв. м., старажытнарускага культурнага слою не было. Аб яго існаваньні сведчыла кераміка, амфара, шкляныя бранзалеты і іншыя знаходкі XII-XIII стст. Слаі, што належалі да старажытнарускага гораду захаваліся ва ўсходняй частцы. Яны ляжалі пад слаямі познесярэдневяковага гораду, што мелі таўшчыню да 3 м. Культурны слой, які адносіўся да XII ст. (таўшчынёй да 40 см.), быў падасланы слоем пяску таўшчынёй да 60 см. Ніжэй знаходзіўся слой XI ст., насычаны шчэпкамі, якія ляжалі на мацярыку (мал.). Напластаваньні з матэрыяламі больш раньняга часу ў гэтых разрэзах не адлюстраваліся.

Стратыграфія Замкавай гары паказвае на перапад магутнасьці культурнага слоя з поўначы на поўдзень. Розніца паміж яго таўшчынёй складае больш за 1,5 м. Напластаваньні Замкавай гары адпавядаюць той самай карціне, якая назіралася на Малым Замку, дзе таксама адзначана пры чляненьні культурнага слою. Розніца ў тым, што на Замкавай гары культурны слой позняга гораду быў больш магутны і адлюстроўвае актыўную забудову гораду ў перыяд развітага і позняга Сярэдневечча. Сярод будаўнічых астаткаў Замкавай гары XII-XIII стст. не было цэглы так характэрнай для слою гэтага часу на Малым Замку. Гэта тлумачыцца тым, што ў раскопе на апошнім стаялі багатыя дамы, у будаўнічым матэрыяле якіх была цэгла. На Замкавай гары такія комплексы ў нашы раскопы не трапілі.

Пераходзім да выкладу атрыманых матэрыялаў, пачынаючы апісаньне з наібольш раньніх, як гэта мела месца пры характарыстыцы дадзеных Малага Замка.

Раскоп 1.

Астаткі першапачатковага паселішча. Дзяцінец XI ст.

Да бясспрэчных будаўнічых астаткаў, якія звязаны з першапачатковым засяленьнем Замкавай гары мы залічаем участак, што ляжаў вузкай паласой пад насыпам старажытнага вала і прасочаны ў кв. кв. БД 17-22. На пясчанай падсыпцы

мацярыка ляжаў вуглісты слой таўшчынёй 25 см. У кв.кв. Б. на глыбіні 147-169 см., шчыльна да паўночнай сьценкі адкрыты два рады абпаленых камянёў і скапленьнне залы. Пад камянямі знаходзіліся абломкі двух згарэўшых бярвеньняў, якія былі, відавочна, вуглом пабудовы. У кв. В 20 сустракаюцца скапленьні неабпаленай гліны. Вялікае скапленьне неабпаленай гліны адкрыта на граніцы кв.кв. ВГ 20-21, яно займала плошчу 130-50 см. Сярод другіх будаўнічых астаткаў была абгарэлая дошка даўжынёй 120 см. Шчыльна да яе прытыкала пляма гліны 40х30 см.

У вуглістым слоі знайдзена кераміка I, II, III і V тыпаў[1], даволі вялікі тачыльны камень са слядамі запрацаванасьці, вялікі наканечнік утульчатай двушыповай стралы і железны выраб невызначанага характару.

Культурны слой з будаўнічымі рэшткамі і знаходкамі, што ляжаў пад валам, з'яўляецца наібольш пераканаўчым матэрыялам, які сведчыць аб першапачатковым засяленьні Замкавай гары. Супастаўляючы знайдзеную ў гэтым слоі кераміку з керамікай Малага Замка, трэба адзначыць, што на апошнім гаршкі I тыпу характэрныя для пабудоў з мацярыка і некаторых ямаў, г.зн. для канца X ст. Гаршкі II тыпу з'яўляюцца ў пабудовах першай паловы XI ст., у Навагрaдскім магільніку і іншых магільных помніках ваколіц Навагрaдка, а гаршкі V тыпу ўпершыню вядомыя ў пабудове 23 (першая палова XI ст.)[2]. Паколькі гаршкі V складаюць каля 40 % керамікі першапачатковага паселішча Замкавай гары, ёсьць падставы лічыць, што апошняя была заселена не раней за XI ст.

Мяркуючы па разрэзах сьценак раскопа I, паселішча аж да канца XI ст. сягала ад края пляцоўкі, прыкладна, на 20 м.

Як неўмацаванае першапачатковае паселішча Замкавай гары існавала вельмі кароткі тэрмін і хуткім часам было агароджана валам, які насыпаны ў 10 м. ад паўночнага краю пляцоўкі. Канструкцыя яго апісана ў главе 3. Памежная дата існаваньня гэтага валу сярэдзіна - першыя дзесяцігоддзі другой паловы XII ст., калі вал быў перанесены на край пляцоўкі.

Пабудова вала і пераўтварэньне Замкавай гары ў крэпасьць не зрабілі заўважнага ўплыву на культуру паселішча да пачатку XII ст. Комплексы другой паловы XI ст. невыразныя.

На слоі шэрага гумуса ў кв.кв. Ж 21-22 адкрытыя астаткі вогнішча (110х89 см.) у выглядзе прапаленага пяску, камянёў і абпаленай залы. З вогнішчам звязаны вугальны слой таўшчынёй да 4 см. і абпаленыя камяні. На вогнішчы і паабапал яго было шмат лускі рыбы. 50 % знайдзенай керамікі належыць да гаршкоў V тыпу, 30 % да IV, 15 % да II. Астатнія 5 % не ўдалася

вызначыць. Сустрэліся таксама два гліняныя і шыфернае прасліца, бронзавае колца і невыразныя железныя вырабы.

Сатлелыя пабудовы. Насыціл.

На глыбіні ад 105 см. з нахілам на поўдзень і ўсход да тыльнага боку вала прытыкаліся рэшткі трох сатлелых пабудоў.

Пабудова 18 (кв.кв. БВ 16-17).

Значная частка пабудовы, што ляжала на глыбіні 105-130 см. ішла пад каменна-цагляную кладку (“палаты феадала”). У захаванай яе частцы, на шэрым гумусе ляжала неабпаленая гліна таўшчынёй 6-10 см., якая мела ўхіл на паўднёвы ўсход. Гліну пакрывалі рэшткі насьцілу з дошак, які арыентаваны з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Насьціл быў пакрыты другім слоям неабпаленай гліны, такой самай таўшчыні як і першы, у сваю чаргу пакрыты насьцілам на лагах. Апошнія — бярвеньні дыяметрам 10 і 20 см., знаходзіліся на адлегласьці 35 см. адно ад другога. Дошкі гэтага насьцілу нешчыльна прылягалі адна да другой. Шырыня іх 20-22 см. У паўночна-усходняй частцы пабудовы слаба намечана перакрыжаваньне з абломкаў двух бярвеньняў. Магчыма, гэта быў вугал пабудовы (мал.).

Пры расчыстцы насьцілаў знайдзена нешмат керамікі — гаршкі V тыпу, абломак амфары з дробным рыфленьнем, жалезная булаўка з кальцавой галоўкай і некалькі цьвікоў.

Пабудова 19 (кв.кв. ВД 17-19).

Размешчана на шэрым гумусе на адлегласьці каля 2 м. на ўсход ад пабудовы 18. Арыентавана таксама як вышэйапісаная пабудова. Маючы ўхіл на ўсход і полудзень, пабудова ляжала на глыбіні 1,24-1,78 м.

На гумусе знаходзілася падушка з неабпаленай гліны плошчай 4,6х4 м. таўшчынёй да 8 см. У паўднёвай частцы яе захавалася няшмат дравеснага вугалю. Краі падушкі роўныя, у паўднёвай частцы мелі тры акруглыя выступы. На гліне ляжалі валокны з насьцілу падлогі. Захавалася частка зруба ад паўночнай, усходняй і заходняй сьценак пабудовы. Зруб рабіўся ў абло. Бярвеньні заходняй і ўсходняй сьценак ўсечаны ў чашку да бярвеньняў паўночнай сьценкі (мал.).

У паўночнай частцы пабудова тройчы перабудоўвалася, аб чым можна мяркаваць па двух радах дошак, якія прамазаныя глінай, ляжалі на галоўным слоі глінянай падушкі.

У больш позні час пабудова 19 была прарэзана канавай шырынёй 25 см., глыбінёй да 80 см. і чатырма акруглымі ямамі дыяметрам 20-25 см. Тры ямы прабілі бервяно паўночнай сьценкі, а чацвёртая была выкапана ў слоі гліны.

Пры разборцы пабудовы на драўляным тлене і гліне знайдзена шмат птушыных касьцей. Сярод керамікі пераважалі

гаршкі VI тыпу. Сустрэліся таксама абломак белагліняной пасудзіны з лінейным арнаментам, донца бочачкі, адзінкавыя абломкі шкляных бранзалетаў, палова дробнай пацеркі, абломак бронзавага званочка з крыжовай прарэзьзю і некалькі невызначаных жалезных вырабаў.

Пабудова 24 (кв.кв. ДЖ 19-22).

Плошча, якую займала пабудова не вызначана, бо яе паўднёвая частка прарэзана позняй траншэяй, а паўночная ссунута. Астаткі пабудовы ляжалі на шэрым гумусе. Як пабудовы 18 і 19, гэтая мела значны ўхіл на поўдзень і ўсход. Яе паўночная частка ляжала на глыбіні 207-217 см.

У паўночнай частцы на гумусе ляжала неабпаленая гліна, якая захавалася асобнымі скапленямі таўшчынёй 10 см. З прычыны таго, што астаткі пабудовы былі змешчаны, у паўночнай частцы гліна выходзіла за зруб. Да заходняй сьценкі зруба належала бервяно дыяметрам 22 см., якое ішло пад бервяно паўночнай сьценкі, што цянулася на 4,2 м. На месцы ўсходняй сьценкі ляжалі бярвеньні і дошкі. За межамі зруба гліну атачалі чатыры дошкі шырынёй 20 см. (мал.).

Пры разборцы пабудовы знайдзена шмат касьцей жывёлы. Сустракаецца таксама кераміка ад гаршкоў V і VI тыпаў. Амаль 10% масавага посуду прадстаўлена гаршкамі з прамым горлам. 70 абломкаў амфар належалі да двух пасудзін. Знайдзены маленькі тачыльны камень, адтуліна якога была прасвірлавана не да канца, наканечнік абламанай касьцяной стралы (мал.), бронзавая прывеска з вушкам і абломкі цьвікоў.

Пабудова 25 (кв.кв. ГД 15-16).

Пабудова 25, якая стаяла шчыльна з пабудовай 19, належала да іншага шэрагу сатлеўшых пабудоў. Захавалася яна кепска. На шэрым гумусе ляжаў слой абпаленай гліны таўшчынёй 3 см., частка якой знаходзілася на глыбіні 1,45, а другая рэзко падала на поўдзень на глыбіню 185 см. На гліне ляжалі дзьве дошкі даўжынёй 118 і 60 см., шырынёй 24 см. з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. На дошках знаходзіўся другі слой гліны таўшчынёй 3 см. Пры разборцы верхняга і ніжняга слаёў гліны і дошак знайдзены косьці птушак і няшмат керамікі ад гаршкоў IV тыпу.

Пабудова 26 (кв. ВГ 16-17).

Паўночная частка яе часткова налягала на рэшткі пабудоў 18 і 19, ад якіх іх аддзяляў шэры гумусіраваны слой таўшчынёй 10-12 см. Захаваліся асобныя бярвеньні дыяметрам 20 см. Дзе-нідзе прасочвалася сатлелае дрэва. Да рэштак пабудовы належалі косьці жывёлы, наканечнік жалезнай чарашковай стралы, два фрагменты амфар і абломак жалеза.

Амаль усю паўднёва-заходнюю частку раскопа (кв.кв. Ж-І 13-18) займалі сатлеўшыя насыпы, якія ўваходзілі ў заходнюю сьценку. Пераходзім да іх апісаньня.

Насыпь V.

Ад насыпу ацалелі каля 20 дошак шырынёй 20 см., арыентаваных з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Дошкі ляжалі на мацярыку. Астатняя частка насыпу прадстаўляла з сябе тлен дрэва. Як і іншыя будаўнічыя астаткі, насыпь рэзко нахілены на паўднёвы ўсход. Глыбіня яго была 240-184 см. З поўначы да насыпу прытыкалі скапленьні неабпаленай і абпаленай гліны і камяні (мал.). Асобныя кавалкі насыпу рамантаваліся. Так пад дошкамі ў кв. З 16 ляжалі астаткі зусім сатлелых дошак. Сярод знаходак разтрушаныя шкляные бранзалеты, а пры разчыстцы гліны і камянёў сустракаюцца фрагменты амфары.

Ад пазнейшага часу ў раскопе 1 захаваліся астаткі згарэўшых пабудоў і яшчэ адзін насыпь. Пабудовы, якія загінулі ў пажары, звычайна разбіралі. Ад будынкаў ацалелі толькі асобныя бярвеньні і дошкі. Пабудовы раскопу 1 выгаралі напрацягу пяці разоў.

Будынкі, якія загінулі ў першым пажары.

Пабудова 20/23 (кв.кв. ДЖ 17-18).

Будаўнічыя астаткі, магчыма, ад двух пабудоў. З поўдня іх мяжа прасчвалася па шчыльнаму зляжаламу вугальнаму слою, насычанаму гарэлым зернем, змяшаным з саломай. Захаваліся астаткі зруба 3х2 м., які знаходзіўся на глыбіні 185-213 см. У згарэлым слоі знайдзена шмат рэчаў (зброя, прадметы культу і інш.). Аднак, гэтыя знаходкі не звязаны з пабудовамі і трапілі туды, відавочна, пад час пажару.

Пабудова 21 (кв.кв. ДЖ 20-22).

Астаткі гэтай пабудовы, каторую ад пабудовы 20/23 адлучала паласа гумуса шырынёй да 80 см., ляжалі на глыбіні 187-217 см. Тут адкрыты вугальны слой таўшчынёй да 3 см. Месцамі ён складаўся з двух праслоек, раздзеленых гумусам таўшчынёй 3-4 см. Сустрэлася згарэлае бервяно дыяметрам 10 см.

Пры зачыстцы слою вугаля паўсюдна сустракаліся абгарэлае зерне і гарох, больш за ўсё яны сустракаліся ў паўднёвай частцы. Там жа знайдзены адзінкавыя абломкі керамікі і шкляных бранзалетаў, два наканечнікі касцяных стрэлаў (мал.) і жалезныя пласцінкі.

Пабудова 22 (кв.кв. Д 19-20).

На глыбіні 173-204 см. ляжала шырокая дошка даужынёй 2,80 м., арыентаваная з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Верагодна, да гэтай жа пабудовы адносілася яшчэ адна абгарэлая

дошка даўжынёй 80 см., шырынёй 20 см.

Пры расчыстцы знайдзена гарэлае зерне.

Пад час пажару, які знішчыў пабудовы 20-23, згарэлі гарадні валу. Пасля пажару вал быў засыпаны. Засыпка таўшчынёй да 1 м. складалася з гумусу, пяску, неабпаленай гліны і дробных вугельчыкаў. У засыпе знаходкі прадстаўлены гаршкамі V і VI тыпаў, амаль цэлай амфарай II тыпу, фрагментам бронзавага энкалпіёна (мал.), паловай пацеркі з горнага крышталя, фрагментамі шкляных бранзалетаў і вырабамі з жалеза. На засыпе валу былі ўзведены новыя пабудовы.

Будынкі, якія загінулі ў другім пажары.

Пабудова 9/14 (кв.кв. ДЖ[3] 20-23).

На шчыльнай гумусіраванай глебе, якая знаходзілася на глыбіні ад 100 да 150 см., ляжалі астаткі бярвенчатага зруба. Ад зруба захаваліся ніжнія вянцы паўночнай, усходняй і заходняй сьценак. Паўднёвая частка пабудовы прарэзана позняй траншэяй. Дыяметр бярвеньняў 20 см. У сярэдзіне зруба на слоі попела ляжала згарэлае зерне (мал.). Гэта былі: жыта, пшаніца, авёс, ячмень і каноплі, а таксама гарох. Сярод зерня знайдзена даволі шмат рэчаў. У паўночна-ўсходняй частцы пабудовы стаяла лубяная скрыня, ад якой ацалела ніжняя частка. Другая скрыня стаяла ў паўднёва-заходняй частцы. Кераміка прадстаўлена гаршкамі V і VIII тыпаў. Знайдзены таксама: фрагмент амфары, паліваны гляк (мал.), донца драўлянай пасудзіны (мал.), тачыльны камень, дзьве бронзавыя матрыцы для цісненьня бляшак (мал.), бронзавы пярсьцёнак, наканечнік жалезнай чарашковай стралы (мал.), свінцовая і чатыры бронзавых гіркі (мал.), абломкі двух верацёнаў з наматанымі ніткамі і два клубкі нітак (мал.). У межах зруба над зернем і рэчамі, знаходзіўся другі ярус пабудовы. Да яго належаў насьціл з сасновых дошак шырынёй 15-18 см., орыентаваных з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход і часткова пакрытых берастой. Насьціл падтрымлівалі лагі — бярвеньні дыяметрам 15 см., якія ляжалі на адлегласьці 60 см. адно ад другога. Месцамі на насьціле адзначаны абпаленая гліна і попел (мал.). На ім амаль не было знаходак. Сустракаюцца адзінкавыя абломкі керамікі і шкляных бранзалетаў.

Пабудова 15 (кв.кв. БГ 17-19).

На плошчы каля 16 кв. м. на вуглістым слоі з рэшткамі саломы ляжалі згарэўшае зерне і гарох. Над імі знаходзіўся насьціл із дошак, шырынёй да 40 см., які падтрымлівалі лагі — бярвеньні 15-18 см. Насьціл месцамі пакрывала бяроста. Сярод развалу пабудовы былі астаткі дзьверы вышынёй 1 м., шырынёй 1,5 м., з дошак, змацаваных драўлянай шпонкай. Сярод рэшткаў

пабудовы было чатыры згарэўшыя слупы вышынёй 20 см. і такога ж дыяметру. У заходняй частцы адкрыта скапленьне гліны (мал.).

Пры разборцы пабудовы знайдзены фрагменты гаршкоў V, VII і IX тыпаў, берасьцянае донца, драўляныя абручы ад бочак, драўляная лыжка (мал.), абломак аплаўленай бронзы і фрагмент шклянога бранзалету.

Будынкі, якія загінулі ў трэцім пажары.

Пабудова 9а (кв.кв. ДЖ 21-23).

Знаходзілася над пабудовай 9/14. Яе развал на глыбіні 0,8-1,2 м. чатырыхвугольнай формы, займаў плошчу 5х5 м. і быў прарэзаны той самай траншэяй, якая прарэзала ніжэйляжачую пабудову. На лагах дыяметрам 10 см. ляжаў насьціл. Яго дошкі шырынёй 15 см., былі арыентаваны перпендыкулярна дошкам папярэдняй пабудовы. На насьціле ляжалі асобныя бярвеньні, абпаленая гліна і попел (мал.). Знайдзены абломкі гаршкоў VII і VIII тыпаў, жалезны ключ (тыпы мал. 40,1), два тычыльныя камяні (тыпу мал. 57,4,9), жалезныя вырабы і асобныя абломкі шкляных бранзалетаў.

Пабудова 10 (кв.кв. ВД 18-20).

Ляжала на глыбіні 72-100 см., часткова перакрываючы пабудову 15. Развал пабудовы 10 займаў 6х5,5 м. яе ніжнюю частку займаў вугальны слой з рэшткамі саломы, на якіх ляжалі гарэлае зерне і гарох. Над гэтым слоям быў дашчаты насьціл на лагах дыяметрам 10 см. Шырыня дошак 20 см. У паўночна-ўсходняй частцы развалу знайдзены астаткі дзьверы і дошак шырынёй 20-30 см., змацаваныя двума драўлянымі шпонкамі. Пасля гібелі пабудовы ў пажары, на яе плошчы былі вырыты дзьве ямы і пакладзены камяні (мал.).

Пры даследваньні астаткаў пабудовы пад дзьвярыма быў знайдзены раздаўлены гаршок (тыпы мал. 51,2). Сярод іншых знаходак: абломкі лубяных скрыняў, верацяно з наматанымі ніткамі, жалезны наканечнік чарашковай стралы (мал.), невызначаныя вырабы з жалеза і фрагменты шкляных бранзалетаў.

Будынкі, якія загінулі ў чацьвёртым пажары.

Пабудова 7/16 (кв. кв. БД 19-22.[4]

Ляжала на глыбіні да 1 м. і прадстаўляла з сябе двухузроўневую пабудову, якая абмежавана з поўначы бервяном ад ніжняга вянца. Дыяметр бярвеньняў 22 см. Паўднёва-ўсходняя частка пабудовы прарэзана позняй траншэяй шырынёй 70 см. У ніжнім ярусе на гумусе знайдзены днішчы, клёпкі і абручы ад сямі драўляных бочак і астаткі трох лубяных скрыняў (мал.). Каля адной з бочак ляжалі плады і абгарэлыя костачкі ад сліў, каля другой — косьці жывёлы. Утулка адной з клёпак паказвае на тое,

што гэта бочка прызначалася для вадкасьці. Мяркуючы па астатках бочек, яны былі вышынёй ад 64 да 80 см. дыяметрам 35-65 см. Знаходак рэчаў, за выключэньнем абломкаў керамікі, не было.

Над рэшткамі бочак і скрыняў знаходзіўся насьціл з дошак шырынёй 22-35 см., арыентаваных з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Насьціл, які падтрымлівалі лагі дыяметрам 18-20 см., месцамі быў пакрыты берастой (мал.). Вялікая колькасьць берасты, што знайдзена ў засыпе пад насьцілам, дазваляе лічыць, што ён быў цалкам пакрыты бяростай. Прастора паміж дошкамі запаўняла абпаленая да чырвонага гліна. Плошча, якую займаў насьціл, складала каля 20 кв. м. (мал.).

На насьціле сустрэліся няшмат керамікі ад гаршкоў V, VII і IX тыпаў, а таксама ад гаршкоў з прамым горлам. Акрамя таго знайдзены абломак місы, збанка і фрагмент белаглінянай пасудзіны. Сустракаюцца наканечнікі жалезнай і касьцяной стрэлаў (мал.) і некалькі абломкаў шкляных бранзалетаў.

Пабудова 6 (кв. Е 20-21).

Рэшткі пабудовы ляжалі на глыбіні 80-107 см. і захаваліся ў выглядзе развалу абпаленай гліны, попелу і вуглю. З паўночнага ўсходу і паўночнага захаду развал аточаны абгарэлымі бярвенькамі дыяметрам 20 см. Яны ўтваралі вугал, але знакаў урубкі прасочыць не ўдалася. Завал пабудовы займаў плошчу няшмат большую за адзін кв. м. і ляжаў з ухілам на паўднёвы захад (мал.). Абпаленая гліна ляжала двума слаямі, паміж якімі былі попел і сажа таўшчынёй да 1,5 см. Пабудова была зрезана позняй траншэяй.

У развале пабудовы знайдзена некалькі невыразных абломкаў керамікі, масіўны жалезны крук, два вялікія тачыльныя камяні, язычок жалезнай спражкі, ключ ад замка (мал.), жалезны вялікі цьвік (мал.) і тры абломкі шкляных бранзалетаў.

Пабудова 8 (кв. кв. ДЕ 18-20).

На глыбіні 130 см. ляжалі кавалкі гарэлага дрэва і тры дошкі шырынёй 22 і 24 см., даўжынёй каля 180 см., а трошку вышэй дзве цагліны — плінфы 27х23х5х4,5 см., якія ляжалі in situ на слоі тонкай абпаленай гліны. Там жа адзначаны развал бітай цэглы і абпаленая гліна на плошчы 2х1,20 м., а таксама попел, кавалкі бярвеньняў і абломкі дошак (мал.).

Над гэтым будаўнічым развалам была вымастка з шчыльнай неабпаленай гліны чатырыхвугольнага абрысу, выцянутая з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Таўшчыня гліны ад 10 да 30 см. У гліне захаваліся абломкі цэглы і невялікія камяні. Дзенідзе прасочвалася праслойка попелу і кавалкі гарэлага дрэва.

Пры расчыстцы гэтага развалу знайдзены косьці жывёлы,

абломкі сьценак гліняных пасудзін, два нажы і некалькі абломкаў шкляных бранзалетаў.

Пабудова 11 (кв. ДЖ 15-16).

На глыбіні 105-161 см. адкрыты рэшткі гарэлых дошак шырынёй 20-25 см., даўжынёй ад 20 да 170 см., арыентаваныя з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, якія мелі нахіл да паўднёвага захаду. З паўночнага ўсходу дошкі абрэзаны позняй траншэяй. Сустракаюцца асобныя дошкі, якія ляжалі перпендыкулярна. Частка дошак ляжала на рабры. Месцамі адзначаны тлен дрэва (мал.).

Сярод дошак знайдзены: сьценкі гліняных пасудзін, абломак амфары, донца і клёпкі ад бочак, два наканечніка жалезных стрэлаў (тыпы мал. 66) і абломак шкляной усходняй пасудзіны.

Пабудова 17 (кв. кв. БВ 16-18).

На глыбіні 26-40 см. ляжалі кавалкі абгарэлых бярвеньняў кепскай захаванасьці, якія, відавочна, належалі да заходняга вянца пабудовы. Адно з бярвеньняў ляжала ў накірунку з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Дыяметр яго 22 см. Канец бервяна ўваходзіў у сьценку раскопа. На адлегласьці 15 см. ад канца гэтага бервяна ляжала пад прамым вуглом яшчэ адно бервяно каля 70 см. даўжыні і дыяметрам 12 см. Акрамя бярвеньняў у развале пабудовы захавалася нескалькі невялікіх кавалкаў абгарэлых дошак, адна з якіх ляжала паралельна бервяну, а астатнія без парадку. Над рэшткамі бярвеньняў і дошак ляжала вугальная пляма больш 4 м. даўжыні і 3,6 м. шырыні са звычайным ухілам на паўднёвы захад. Таўшчыня вугальнага слою 1-2,5 см. У ім сустракаюцца гнёзды з абпаленага пяску. У некаторых месцах сустракаецца абпаленая салома.

Да будаўчага развалу належылі некалькі сьценак керамікі і абломкаў шкляных бранзалетаў.

Насьціл IV. (кв. кв. ЕІ 13-18).

Паміж насьціламі IV, які займаў трошкі большую плошчу чым ніжэйшы насьціл V, і пятым, послядоўна ляжалі слой згарэлага зерня і слой шчэпак. Слой з гарэлым зернем быў нераўнамерны. Больш за ўсё зерня адзначана ў кв.кв. З 15-18 і І 18 на глыбіні 2,60-2,82 м. Там жа сустракаюцца невялікае авальнае на плане скапленьне пяску і асобныя вуглі. Яшчэ адно скапленьне зерня адкрыта ў кв.кв. Д 13-14 на глыбіні 2,19-2,26 м. разам з вугалем.

Будаўнічых астаткаў у слоі зерня не было. Разам са згарэлым зернем сустракаюцца абгарэлыя гарох і проса. У кв.кв. З 17-18 была авальная ў плане яма, запоўненая зернем і гарохам.

У слоі з зернем сустрэліся шмат знаходак. Масавы гліняны посуд, абломак паліванай керамікі, абломкі амфар, больш за 80 жалезных пласцінак ад аднаго панцыра і асобныя пласціны ад

другога панцыра (мал.), скіпелыя матрыцы для цісьненьня пацерак, бляшак і калодачак (мал.), абломкі тыгляў (мал.), тачыльныя камяні са знакамі работы (мал.), утульчатыя і чарашковыя наканечнікі жалезных стрэлаў (мал.), жалезны замок (мал.), ключы ад навяснога і ўразнога замкоў (мал.), жалезная булаўка з кальцавой галоўкай (мал.), рыбалоўны кручок (мал.), жалезныя іглы і невызначаныя жалезныя вырабы, шмат моцна абпаленых шкляных бранзалетаў, бронзавая кніжная зашпілька (мал.) і іншыя знаходкі.

Над слоем з гарэлым зернем знаходзіўся слой шчэпак таўшчынёй каля 20 см. У ім сустрэліся шмат зусім разложаных шкляных бранзалетаў.

Насьціл IV, які ляжаў на слоі шчэпак з поўначы на полудзень сягаў на глыбіню 230-257 см., а з захаду на ўсход на глыбіню 243-266 см. Ад яго захавалася больш дошак чым ад больш раньняга насьцілу. Дошкі шырынёй 22-25 см., таўшчынёй да 1 м. лепш захаваліся ў заходняй частцы насьцілу, дзе побач з імі сустракаюцца абломкі тоўстых плашак са слядамі апрацоўкі, якія пакладзены там, дзе насьціл патрабаваў рамонту ў той час, калі ім яшчэ карысталіся. Плахі ляжалі перпендыкулярна дошкам. Дошкі месцамі шчыльна прылягалі адна да другой, часам паміж імі заставаўся невялікі зазор (мал.). На некаторых дошках захавалася сасновая кара, але вялікая частка іх была з дуба.

Знаходак на насьціле не было. Зрэдку сустракалася арэхавая шкарлупа.

Ямы ў мацярыку (мал.).

Мацярык прадстауляе з сябе характэрны для Наваградка светлы пясок з плямамі іржы. Залягае нераўнамерна. У паўночнай частцы раскопа ён паказаўся на глыбіні 130-140 см., а ў паўднёвай падае на глыбіню больш за 315 см.

У мацярыку выкапана шмат ям. Іх не было толькі пад насьцілам V, які ляжаў на роўным мацярыку.

Да наібольш раньніх ямаў належаць тыя з іх, якія былі выкапаныя на ўчастку, што заняты культурным слоем першапачатковага паселішча, якое пазней перакрыта старажытным валам (кв.кв. Б 16-18 В 18). У заходняй частцы раскопа адкрыта каля 10 такіх ям. Акруглыя ў плане, дыяметрам 10-25 см., глыбінёй да 30 см., яны былі запоўненыя шэрым і цёмным гумусам, у якім часам ляжалі кавалкі абгарэлага дрэва, асобныя камяні і неабпаленая гліна. Адна з ямаупа краі была абкладзена камянямі. Сярод знаходак нешматлікія косьці жывёлы і адзінкавыя фрагменты кружальнага глінянага посуду.

На астатняй тэрыторыі раскопа адкрыты яшчэ больш за 70 ямаў такой жа формы і запаўненьня, якія характэрныя для ямаў

пачатковага паселішча. Мяркуючы па асобных знаходках (абломак жорна, кавалак бурштына, наканечнік утульчатай бранябойнай стралы) падобныя ямы пабытавалі і на паселішчы XII ст.

У главе 2 успамянутая вялікая яма. Спынімся на ёй больш падрабязна. Авальная ў плане яма, выкапаная ў мацярыку і арыентаваная з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, гэта яма 4,8х2,5 (у наібольш шырокай частцы) часткова ішла ў сьцяну раскопа. У ніжняй частцы ямы быў вялікі камень. У прыдоннай частцы на шэрым гумусе і праслойцы пяску, знаходзілася паласа дрэўнага тлену, які пакрыты вугальным слоем. Апошні пакрывала яшчэ адна паласа тлену таўшчынёй да 4 см. Верхняя палова запаўненьня ямы складалася з карычневага гумуса (мал.). У ніжняй частцы запаўненьня ямы было даволі шмат керамікі, сярод каторой гаршкі V тыпу складалі 50%, IV - 25%, II - 20% і I- 5%. У вугальным слоі знайдзены срэбны бранзалет і злітак срэбра (мал.). Каля гэтай вялікай ямы было некалькі звычайных акруглых.

У паўднёвай і паўднёва-усходняй частках раскопа, якія былі вольныя ад будынкаў, побач са звычайнымі невялікімі акруглымі ямамі, сустракаюцца ямы такой жа формы, але большага памеру, а таксама авальныя і ямы, якія не мелі геаметрычных абрысаў. Такіх ямаў не шмат. Ніжэй прыводзіцца іх апісаньне.

Паўднёва-усходняя частка раскопа.

Яма 54 (кв.кв. Ж 16-17). Неправільнай авальнай формы 80х60 см., глыбінёй 20 см. Запоўнена цёмным гумусам.

Яма 55 (кв. Ж 18). Акруглая дыяметрам 50 см. Запоўнена гумусам, які змяшаны з пяском. Знайдзены железны выраб.

Яма 57 (кв. кв. ЗІ 18). Выцянутая 48х30 см., глыбінёй 20 см. Запоўнена цёмным гумусам.

Паўднёвая частка раскопа.

Яма 1 (кв.кв. ІК 20). Няправільнай авальнай формы з выцянутым на поўнач канцом 60х30 см., глыбінёй 10 см. У запаўненьні ямы каменьне і гумус. Знайдзены косткі жывёлы і абломкі керамікі з лінейным арнаментам.

Яма 3 (кв. І 21). Авальная. Выцягнутая з поўначы на поўдзень 90х70 см., глыбінёй 50 см. Сьценкі ступенчатыя. У верхняй частцы некалькі камянёў. Яма была запоўнена гумусам, у якім былі косьці жывёлы, два абломкі керамікі і абломак амфары, а таксама жалезны стрыжань.

Яма 6 (кв.кв. КЛ 21). Акруглая. Дыяметрам 106 см., глыбінёй 60 см. Частка сьценкі прыступкай. Запоўнена цёмна-шэрым гумусам. У верхняй частцы запаўненьня вялікія і дробныя камяні. У запаўненьні фрагменты керамікі, тры абломкі амфар, жалезны стрыжань і частка бронзавай пласцінкі.

Да пытаньняў даціроўкі матэрыялаў раскопа, акрамя тых, якія

разглядаліся вышэй, нам прыйдзецца звярнуцца пасля таго, як будзе характэрызаваны ўвесь культурны слой Замкавай гары старажытнарускага часу.

На заканчэньні каротка спынімся на комплексах, якія змянілі будаўнічыя астаткі старажытнарускага часу.

Пабудова 12 (кв.кв. БВ 17-18 Г18).

Рэшткі пабудовы амаль прытыкалі да валу, які насыпаны на краі пляцоўкі пасля знішчэньня старажытнага вала. У яе аснаваньні, на 10 см. вышэй рэпера, ляжаў цёмны гумус з абломкамі цэглы, кавалкамі вапнавага раствору, вуглямі і абпаленым пяском. Ад пабудовы захавалася некалькі абгарэлых бярвеньняў дыяметрам 22 см. Адно з іх мела ў даўжыню 2.80 м. Бярвеньні ляжалі перпендыкулярна адно да другога. Сустракаюцца асобныя гарэлыя дошкі шырынёй 20 см. Над развалам пабудовы ляжаў гумус, запоўнены бітай цэглай.

Да пабудовы адносіліся адзінкавыя фрагменты керамікі.

Пабудова 12а (кв. кв. БВ 17-19).

На ўзроўні пабудовы 12, у слоі цэглы і вапнавага раствору ляжалі асобныя абгарэлыя бярвеньні дыяметрам 23 см. і адзначаны вугальны слой. Пабудова прарэзана позняй ямай. Знайдзены асобныя выразныя абломкі керамікі.

Пабудова 13 (кв. кв. БВ 19-20).

На ўзроўні пабудоў 12 і 12а, шчыльна да валу ляжала вымастка з абпаленай гліны, змяшанай з пяском таўшчынёй да 15 см. На ёй знаходзіліся астаткі згарэлай пабудовы, ад якой захавалася некалькі бярвеньняў дыяметрам 20 см., даўжынёй да 3 м., якія ляжалі ў наірунку з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Сустрэта дошка даўжынёй каля 2 м. шырынёй 30 см. ад насьцілу і больш тонкія бярвеньні (18-20 см.), верагодна ад лаг. У слоі пабудовы было шмат бітай цэглы, знайдзены абломкі чарапіцы.

Пры расчыстцы развала пабудовы знайдзена некалькі абломкаў керамікі, бронзавае кальцо і фрагмент бронзавай пластінкі.

Насьціл III.

Над насьцілам IV сустрэліся: у кв. З 15 на глыбіні 223 см. ляжала чыстая неабпаленая гліна, да якой прытыкаў слой вугалю. У кв. З 16 на глыбіні 222 см. - вугальны слой таўшчынёй да 20 см. і скапленьне неабпаленай гліны. У кв.кв. Е 15-16 дзьве абгарэлыя плашкі даўжынёй 28 см. В кв.кв. З 14 і 13-14 на глыбіні да 216 см. ляжалі разбрасаныя шчэпкі добрай захаванасьці. Там жа былі часткі драўляных рэчаў, клёпкі і абады ад бочак. Сярод гэтых астаткаў было даволі шмат касьцей жывёлы, няшмат керамікі, абломак бронзы, бронзавая пласцінка і цьвік. У кв.кв. Е 15 Ж была ямка, запоўненая бітай цэглай.

Над вышэйапісанымі рэшткамі ляжаў насыпіл III, які займаў амаль такую ж плошчу, як ніжэйшыя насыпілы. Ён складаўся з сатлелых даволі добра захаваных дошак шырынёй каля 25 см., таўшчынёй да 3 см. Асобныя дошкі захаваліся ў даўжыню да 6.5 м. Зазоры паміж імі дасягалі 6 см.

Насыпіл III, арыентаваны так сама як і ніжэйлежавшіе насыпілы. З поўначы на полудзень ён ляжаў на глыбіні ад 180 да 214 см., з захаду на ўсход на глыбіні ад 183 да 221 см. Насыпіл прылягаў да фундаменту царквы XIV ст. (мал.).

На насыпіле акрамя абломкаў цэглы знаходак не было. Там, дзе можна было замерыць таўшчыню цэглы, яна была 9,5 см.

Насыпіл II.

Над насыпілам III, на глыбіні 172-179 см. ляжаў слой жвіру таўшчынёй да 3 см., шэры гумус і кавалачкі неабпаленай гліны. У кв. Е 13 на глыбіні 170 см. было скаплене камянёў, перамяшаных з бітай цэглай і вапнавым растворам. Сустракаюцца косьці жывёлы.

Насыпіл II, які ляжаў на гэтым развале, падзеньне якога з поўначы на полудзень было ад 151 да 164 см., а з захаду на ўсход ад 154 да 185 см., складзены з кепска захаваных сатлелых дошак шырынёй 20 см. Арыентацыя насыпілу такая ж як і насыпілаў папярэдняй пары (мал.).

Насыпіл I.

Насыпілы I і II раздзяляў тонкі слой шэрага гумуса (таўшчынёй да 4 см.). Насыпіл I, які складзены са згарэўшых дошак альбо гарбылёў, якія пакладзены зцясаным бокам дагары і мелі шырыню 20-22 см., у паўночнай частцы ляжаў на глыбіні 143-144 см., у паўднёвай на глыбіні да 190 см., а ў паўднёва-усходняй на глыбіні больш за 200 см. Арыентаваны так сама, як усе ніжэйшыя насыпілы. Аднак, у кв.кв. З 16-17 дошкі ляжалі перпендыкулярна астатняму насыпілу. У паўднёвай частцы насыпіл прытыкаўся да каменнай выбрукоўкі каля храма, але не заходзіў пад яе.

Дошкі і гарбылі былі добра прыгнаны паміж сабой, але часам паміж імі захаваліся невялікія зазоры (шырынёй 1-2 см.). У кв.кв. Е 13-14 замест насыпілу ацалеў толькі вугальны слой. У кв.кв. ЖЗ 13-14 безпарадкава ляжалі ўпаўшыя бярвеньні дыяметрам 20 см. (мал.).

На насыпіле ляжала бітая цэгла, абломкі дахоўкі, вапнавы раствор. Апошні пакрываў дошкі насыпілу, якія падыходзілі да каменнай выбрукоўкі храму.

Раскоп 2.[5]

Раскоп плошчай 24 кв. м. быў закладзены ў 10 м. ад Брамнай вежы. Маленькая плошча раскопа і магутны культурны слой у

гэтай частцы пляцоўкі Замкавай гары, далі магчымасьць дайсьці да мацярыка на абмежаваным кавалку. Таму матэрыялы гэтага раскопа апісваюцца ў храналагічным парадку без падзелу яго на асобныя будаўнічыя гарызонты.

На мацярыку, на глыбіні да 4,8 м. быў культурны слой таўшчынёй да 60 см. з будаўнічымі рэшткамі ў выглядзе абломкаў гарэлага дрэва, вугля, попелу і камянёў. У слоі знайдзена кераміка ад гаршкоў I і II тыпаў, касьцяная накладка, жалезны крук (мал.), жалезная спражка са срэбнай насечкай (мал.). З гэтым жа слоем трэба звязваць ляпны гаршчок (мал.) і дзьве пацеркі “лімонкі”, якія трапілі ў верхнія слаі ў выніку перакопаў.

Над гэтым культурным напластаваньнем ляжаў слой шэрага пяску з уключэньнем камянёў таўшчынёй да 1 м. У сьценцы раскопа відаць запушчаныя ў гэты слой бярвеньні са сплошчанымі канцамі. Знаходак у гэтам слоі не было і мы разглядаем яго як насып вала.

Над насыпам вала на глыбіні 2,24-2,88 см., адкрыты астаткі плятня і сатлелых дошак, арыентаваных з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Сярод знайдзенай керамікі гаршкі III і V тыпаў, донца гаршка з клеймом, абломак міскі, фрагменты сьценак ад амфар, наканечнік жалезнай стралы (мал.), бронзавая накладка (мал.), даволі шмат абломкаў шкляных бранзалетаў і асколак шкляной матавай пасудзіны з залатым роспісам (мал.).

Пабудова 4.

Над плятнём ляжаў шэры папялісты слой і нівеліровачныя пракладкі ў выглядзе шчапы і астаткаў дрэва, а таксама арганічныя астаткі. Рэшткі пабудовы знаходіліся на глыбіні 220-230 см. у слоі перагною і шчапы. У раскоп увайшоў вугал дома з урубкай бярвеньняў у абло. Шчыльна да зрубу прытыкаў дашчаты насьціл (шырыня дошак 20 см.). Пабудова арыентавана з паўнага-захаду на паўднёвы-усход (мал.).

Да паўднёва-усходняй сьценкі прытыкаў насьціл з шчыльна прыгнаных дошак, але без зруба. Уздоўж заходняй сьценкі сярод дошак насьцілу захаваліся астаткі слупоў, у якія, верагодна, былі забраны сьцены. На дошках ляжала жэрдка і частка дзьверы, якая мела з аднаго боку паўкруглае заканчэньне. Насьціл быў пакрыты гноем, слой якога дасягаў 25 см. Прастора паміж зрубнай пабудовай і насьцілам запоўнена гноем, шчапой і абломкамі дошак.

Да знаходак гэтага комплекса належаць абломкі гаршкоў V-IX тыпаў, драўляныя вырабы — абломак міскі, рыдлёука (мал.), крышка, лучыны. Сустрэлася даволі шмат шкляных бранзалетаў, асклепак сіняй пасудзіны з роспісам, фрагмент бронзавага люстэрка (мал.). Адзначым таксама абрыўкі скуранога абутку і

рэмянёў. На падлозе пабудовы ляжалі таксама косьці рыбы і шкарлупа гарэхаў.

Пабудова 3.

Гэтую пабудову, адкрытыую на глыбіні 177-190 см. ад ніжэйшай адлучаў слой перагною і шчапы. У раскоп трапілі бярвеньні зруба, астаткі дашчатай падлогі і развал печкі. Апошняя з поўначы і захаду была ўмацавана буйнымі камянямі. Пад аморфным развалам печкі захаваліся чатыры глінабітныя пода, паміж якімі былі праслойкі з дробных камянёў. Лепш захаваны ніжні под меў дыяметр 120 см. і ляжаў на вымастцы з камянёў, якую падсьцілалі жэрдкі і плахі. Да ўсходняй часткі печкі прытыкаў слуп дыяметрам 60 см., умацаваны камянямі. Захавалася частка апечка ў выглядзе цясін, пастаўленых на рабро (мал.).

Да пабудовы належалі абломкі гаршкоў V-IX тыпаў, наканечнік жалезной чарашковай стралы (мал.), жалезнае вушка ад драўлянай пасудзіны і адзінкавыя абломкі шкляных бранзалетаў.

Пабудовы 1 і 2.

Амаль непасрэдна над рэшткамі пабудовы 3, на глыбіні 150 см. знаходзіўся абвуглены венец ад усходняй і паўднёвай сьцен пабудовы і насьціл з дошак, пакрыты сатлелым дрэвам і саломай. У непасрэднай блізасьці ад гэтай пабудовы была яшчэ адна зрубная пабудова, да якой належылі рэшткі печы. Яна займала, прыкладна, такое ж месца як і печ стратыграфічна ніжэйшай пабудовы, але была бліжэй да сьценкі. Ад печы захаваліся неабпаленая і абпаленая гліна, кавалкі пода і камяні, а пры вугле знаходзіўся слуп такога ж дыяметра як слуп пабудовы 3, які падтрымліваў цясіну апечка. Супрацьлеглы бок апечка падтрымліваў маленькі слупок.

Сярод знайдзенай керамікі пераважалі гаршкі IX тыпу. Знайдзена ручка амфары, з выдрапаным на ёй знакам (мал.), шыфернае прасліца, жалезны выраб, паліваная галоўка аленя (мал.) і шкляная пацерка.

Верхні гарызонт культурнага слоя прадстаўляў з сябе шчыльную забіўку з камяню, глею і цэглы і быў насычаны бітым посудм чырванавата шэрага колеру. Наібольш устойлівымі формамі былі гаршкі, міскі, крышкі, патэльні і інш.

Раскоп 3.

Раскоп плошчай 240 кв. м. быў закладзены ў 20 м. на ўсход ад раскопа 2. У большей палове яго культурны слой in situ не захаваўся. Аднак, аб тым, што такі быў, сведчыць тыповая кераміка, абломкі амфар і шкляных бранзалетаў, наканечнікі стрэлаў старажытнарускага часу і іншыя характэрныя знаходкі.

Тамсама была знайдзена такая выдатная рэч, як ліцік з выявай раства Хрыста (мал.). Верагодна, што пры забудове гэтага месца ў познім Сярэднявеччы, пабудовы старажытнарускага часу былі знішчаны. Рэшткі пабудоў старажытнарускага часу адкрыты паблізу ўсходняй сьценкі раскопа.

Пабудова 27 (кв. кв. ЧШ 29-31).

На слоі шчэпак, што прыкрывалі мацярык, на глыбіні 4,20 см. адкрыты вугал зруба з сатлелых бярвеньняў дыяметрам 20 см.; чашка была высечана ў ніжнім бервяне. Па-за зрубам пачынаўся замошчаны дошкамі двор. Шырыня дошак 20-22 см., яны арыентаваны з паўночнанага захаду на паўднёвы усход. Пад гэтымі дошкамі ляжаў ніжні слой дошак, прыкрываючы перадмацярыковы слой. Зруб і рэшткі двара агарожваў плецены плот, ад якога захаваліся восем калоў, аплеценых гальлём. У некаторых месцах пляцень быў умацаваны камянямі. Каля плоту знаходзілася доўбленае карыта, прабітае адным з калоў (мал.). Карыта з падчасанымі ручкамі мела даўжыню 35 см., вышыню 22 см. (мал.).

На дошках і пад імі шмат рыб'яй лускі, знайдзены косьці жывёлы.

Да пабудовы належалі гаршкі VII і IX тыпаў, абломак міскі і дробныя абломкі амфар. Знайдзены таксама невыразны драўляны выраб, рог жывёлы са знакамі работы і абрэзкі скуры. Тут жа знайдзены абломкі трох сасудаў візантыйскага альбо блізкаўсходнега паходжаньня (мал.).

Пабудова 28 (кв. кв. ЧШ 28-31).

На глыбіні ад 365 см., у слоі гумуса са шчапой была адкрыта частка ніжняга вянца зруба негарэлай пабудовы. Ад яго захавалася бервяно дыяметрам 25 см., што цянулася з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад больш чым на 6 м. і ўваходзіла ў сьценку раскопа, а таксама частка бярвеньняў, якія ляжалі перпендыкулярна. Рубка ў абло. Пабудова моцна паніжалася ў заходнім накірунку, дзе бервяно знаходзілась на глыбіні 411 см. У месцы злучэньня абодвух бярвеньняў быў слупік дыяметрам 10 см. Верагодна, да гэтай пабудовы належаць яшчэ два слупа ў 75 см. ад вялікага бярвяна. Адзін з іх, дыяметрам 20 см., захаваўся на вышыню 55 см. і быў падгранёны і ўмацаваны камянямі. Другі дыяметрам 15 см., меў вышыню 35 см. У верхняй частцы яго мелася выемка. З пабудовай трэба таксама звязаць абломак негарэлай дошкі шырынёй 22 см., якая ляжала адвольна (мал.).

Пры разрэзе вялікага бярвяна выяўлена некалькі бярвеньняў ад сьцяны. Знаходак пры расчыстцы гэтага комплекса амаль не было. Знайдзены асобныя сьценкі гліняных пасудзін.

Пабудова 29 (кв.кв. ХШ 30-31). Гліняная вымастка (кв. кв. ХШ

27-29).

На інтэнсіўна гарэлым слоі, які знаходзіўся на глыбіні да 346 см. ляжаў насыціл з дошак шырынёй да 25 см. і арыентаваны з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход, які ўваходзіў у паўночную і ўсходнюю сьценкі раскопу. Плошча, якую ён займаў у раскопе складала 5х2,15 м. На дошках перпендыкулярна ім ляжалі дзьве вузкія плашкі на адлегласьці 2 м. адна ад другой. Яшчэ дзьве плашкі ляжалі не in situ (мал.).

Кераміка насьціла прадстаўлена гаршкамі V, VI і IX тыпаў. Амаль усе фрагменты са слядамі нагару. Знайдзены некалькі сьценак амфар з рыфленьнем і донца збанка, цеста якога падобна да цеста амфар (мал.). Сярод знаходак абломак жалезнага ключа, железная скаба, жалезная пласьцінка са скругленымі краямі, абломак рогу са слядамі работы, фрагмент шкляного бранзалета і абломак шкляной пасудзіны, якая распісана золатам і чырвонай і сіняй эмальлю (мал.).

На адлегласьці 1,20 м. на ўсход ад насьцілу на глыбіні 294-325 см. на тым жа гарэлым слоі, на якім знаходзіўся насьціл, ляжаў масіў неабпаленай гліны, які займаў плошчу 4х4 м. У гліну былі ўціснуты асобныя камяні. Гэты прамавугольнай формы масіў гліны, меў арыентацыю з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. З аднаго боку яго атачала вузкая паласа сатлелага дрэва.

На адлегласьці 150 см. ад глінянай вымасткі, на глыбіні 323-333 см. былі адкрыты астаткі яшчэ адной вымасткі такой самай формы і арыентацыі і таксама абмежаванай вузкай плашкай сатлелага дрэва. Гліна другой вымасткі была толькі абпаленай, месцамі на ёй былі скапленьні пяску (мал.).

Пры разрэзе глінянай вымасткі ў кв.кв. ЧШ 28-29 устаноўлена, што таўшчыня яе была 20 см. Гліну падсьцілаў цёмны гумус і ўжо ўспамянуты гарэлы слой.

Пры расчыстцы гліняных вымастак знайдзена кераміка ад гаршкоў IX тыпу і абломак шкляного бранзалета.

Комплексы гораду XIV ст. і больш позняга часу.

Над насьцілам пабудовы 29 і вымасткай гліны, на глыбіні ад 235 ???? у цэнтральнай, паўднёвай і ўсходняй частцы раскопа была вымастка з камянёў і асобныя камяні. У паўднёвай і цэнтральной частцы участку раскопа камяні ляжалі ў два а часам у тры слоі ў выглядзе суцэльнай выкладкі. Дыяметр камянёў ад 15 до 40 см. У цэнтры каменнай вымасткі былі пакладзены дзве цэглы шырынёй 14, таўшчынёй 8 см., тамсама адкрыты два слупкі абпаленай гліны. Каля паўночнай і ўсходняй сьценак раскопа ляжалі вялікія камяні (дыяметр больш за 50 см.). У кв. ХЦ 30-31 яны былі выкладзены ў два рады і арыентаваны з паўначнага ўсходу на паўднёвы захад. Уздоўж усходняй сьценкі безпарадкава

ляжалі вялікія камяні (мал.).

Сярод керамікі , знайдзенай пры даследваньні каменнай вымасткі гаршкі IX тыпу з атагнутым венчыкам, амаль без шыйкі з лінейным арнаментам, часам у спалучэньні з хваляй. Сустрэты абломак горла гаршка, фрагмент крышкі і некаторы іншы гліняны посуд. Зрэдку сустракаецца паліваная кераміка, сярод якой адзначым міску з жоўта-карычневай палівай. Знайдзены непаліваны абломак, магчыма, з больш верхняга слоя.

Акрамя керамікі да знаходак, звязаных з каменнай вымасткай належаць жалезная крыца, авальна-прамавугольная жалезная спражка і вялікая прамавугольная спражка з жалеза. Сустракаюцца таксама абломкі бронзы і дробныя абломкі шкла.

Печы.

У паўднёвай частцы раскопа на адлегласьці двух метраў адзін ад другога адкрыты развалы двух ідэнтычных печак.

Печ 1 (кв. кв. ЧШ 27-29).

Над каменнай вымасткай і гумусам на ёй, на глыбіні 2,30-2,60 м. стаялі рэшткі печы, захаваныя на вышыню да 40 см. Арыентаваная з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, печка мела памеры 3,40х2 м. і была складзена з цэглы памерамі 27х12х5; 28х13х8; 29х12х7 см. У кладцы печы зрэдку сустракалася цэгла-пальчатка. У цэглы там-сям былі ўстаўлены камяні, змацаваныя вапнавым растворам.

Печ складалася з двух акруглых камер. Дыяметр Заходняй камеры 130 см., усходняй 150 см. Камеры, топачныя каналы якіх знаходзіліся з палудня, былі раздзелены перамычкай подтревугальной формы шырынёй да 60 см. Слой унутры камер прадстаўляў з сябе чорны гумус са слядамі агню, у якім не было знаходак (мал.).

Каля краю Заходняй камеры ляжала група цаглін, якія не былі ва ўжытку і, верагодна, прызначаліся для рамонту печы.

Пасля таго як печка была расчышчана і абмерана, яе разрэз паказаў, што пад цаглянай кладкай ёсьць неабпаленая гліна, але вялікая частка кладкі ляжала непасрэдна на гумусе.

Пры даследваньні печы знайдзена няшмат рэчаў. Сярод нешматлікай керамікі абломак міскі з ружовага цеста, на ўнутранай частцы якой маюцца поласы, полая ручка і цьвік. Па ўсёй верагоднасьці з верхняга слоя трапілі абломак ружовай дахоўкі і гаршок IX тыпу.

Печ 2 (кв. кв. ШЧЫЭ 27-29).

На глыбіні 240-285 см., на слоі цёмнага гумуса стояла печка такой самай формы як печка 1, памерамі 3,9х2,4 м., арыентаваная з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад і выкладзеная з цэглы памерамі 28-29х13, 5-14х8-9 см. Часам цэгла мела памеры

27-30х12-16х4х6 см. У кутку пабудовы і паблізу яе ляжалі камяні дыяметрам да 40 см. У паўночным куце яны былі змацаваны растворам з белай і жоўтай вапны з дамесам пяску (мал.).

У двух акруглых камерах печы дыяметрам 1,20 і 1,40 см., уваходы былі з поўдня. На ўзроўні падлогі камер ляжала абпаленая гліна, якая пакрывала жоўта-шэры абпалены пясок. Камеры былі падзелены перамычкай таўшчынёй ад 40 до 80 см., выкладзенай з цэглы. Каля заходняй камеры печы адкрыта скапленьне цэглы, укладзенай насуха і невыкарыстанай. Скапленьне займала плошчу 1,4 кв. м.

Пры расчыстцы печы 2 знайдзена няшмат керамікі, сярод якой была паліваная.

У 1 м. ад заходняй камеры на глыбіні 305-310 см. ляжаў масіў неабпаленай гліны, плошчай 2,4 х 2,2 м. Добра атмучаная гліна ляжала тонкім слоям, у які ўключана бітая цэгла. Цэгла, галоўным чынам, брусчатая, шырынёй 15 см., таўшчынёй 6,5-8,5 см.

Негледзячы на перапад у глыбінях печы і масіву гліны, ободва комплексы, верагодна, звязаныя паміж сабой.

Насыпы.

На ўсходняй частцы раскопа, на мацярыку сустракаліся кавалкі дрэва і абгарэлы тлен. У квадратах Ю 22-23 на бруку, на глыбіні 345 см. ляжалі дзьве сатлелыя дошкі шырынёй 22 см. пры расчыстцы знайдзены абломак керамікі, фрагмент фаянсавай пасудзіны і каменнае ядро дыяметрам 28 см.

Над дошкамі, прыкрытымі слоем белага пяску, на глыбіні 330 см. ляжаў насыпі з негарэлых дошак (яны дасягалі шырыні 25 см.), арыентаваных з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Другі насыпі займаў плошчу 3х3 м., заходзячы ў сьценку раскопа. На ім ляжалі косьці жывёлы, а з перакопу трапіў абломак шкляного бранзалета.

Трэці насыпі ад другога адзяляў тонкі слой пяску. Ляжаў ён на глыбіні 306-325 см. Арыенаваны таксама як ніжэйшы, гэты насыпі складзены з сатлелых дошак дыяметрам 20 см. Частка дошак, рэзка падаючы на ўсход, ляжала перпендыкулярна асноўным дошкам. На гэтым насыпі знайдзена няшмат касьцей жывёлы і пяць каменных ядраў дыяметрам 25-40 см (мал.).

Пабудова з бітай цэглы (кв. кв. ЧШ 30-31).

На глыбіні 150-260 см. адкрыта пабудова прамавугольнай формы, плошчай 4,80х1,80 м., да якой прымыкаў выступ таксама прамавугольнай формы, плошчай 1,80х).8 м. Матэрыялам для пабудовы былі бітая (крышаная) цэгла, вапнавы раствор, дробныя камяні і пясок (мал.). Пры разрэзе высветлілася, што яна

складалася з двух слаёў — ніжняга таўшчынёй 30 см., перакрытага светлым гумусам таўшчынёй 50 см. і верхняга таўшчынёй 20 см. Такім чынам вышыня пабудовы складала 1 м. Абломкі цэглы ў ёй мелі шырыню 15 см., таўшчыню 8 см.

Пры разборцы пабудовы знайдзена кераміка — абломкі гаршкоў са скошаным манжэтападобным венчыкам і кароткай шыйкай. Знайдзена донца пасудзіны з ружовай гліны, з сярэдзіны пакрытай бароздкамі, абломкі палівных пасудзін, жалезнае кальцо, пласцінкі і абломкі бронзы і абломкі пацінаванага шкла.

Яма (кв. кв. ЮШ 26).

У паўночную сьцяну раскопа ішла яма, вырытая ў мацярыку, глыбіня якой 3 м. Сьценкі яе вертыкальныя, але па меры набліжэньня да дна рабіліся ступенчатымі. У запаўненьні ямы, асабліва ў прыдонным слоі, знайдзена шмат абломкаў дрэва і шчапы. Сустракаецца шмат касьцей жывёлы. Другіх знаходак амаль не было.

Манеты.

У культурным слоі Замкавай гары знайдзены наступныя манеты: срэбная залатаардынская (1355 г.), вызначэньне А.А. Быкава, і больш познія Аляксандра Ягелона (1492-1506), двайны дынарый, дзьве манеты Жыгімонта Аўгуста (1562 і 1570 гг.), шылінг Густава Адольфа II Вазы (1621 г.), тры соліды Яна Казіміра (60-е гг. XVII ст.) і бронзавая манета 1708 г. (вызначэньне В.М. Поціна).

Аб датаваньні культурнага слою Замкавай гары.

Наібольш раньнія астаткі будаўніцтва і археалагічныя матэрыялы адкрыты ў раскопах 1 і 2. Яны знаходіліся на невялікіх участках, перакрытых першапачатковым валам. Будаўнічыя астаткі невыразныя. Што датычыць керамікі, то набор глінянага посуду на 1 і 2 раскопах некалькі адрозніваецца адзін ад другога. У той час калі ў раскопе 1 кераміка прадстаўлена гаршкамі I-III і V тыпаў, на ўчастку раскопа 2 сустракаюцца гаршкі толькі I і II тыпаў. Аднак, гэтыя абставіны не перашкаджаюць таму, каб лічыць абодва ўчастка, што ляжаць пад валам сінхроннымі і бачыць у іх рэшткі пачатковага засяленьня Замкавай гары. Падобная карціна назіралася на Малым Замку, калі ў адных комплексах, прыналежных да аднаго будаўнічага перыяду сустракаецца кераміка I-V тыпаў, а в другіх толькі I і II тыпаў.[6] Дадзены будаўнічы перыяд датуецца першай паловай XI ст.[7] Гэтым же часам трэба датаваць разгледжаныя ўчасткі Замкавай гары.

Сярод рэчавых знаходак першапачатковага паселішча быў жалезны наканечнік утульчатай стралы — буйнейшая знаходка сярод стрэлаў гэтага тыпу ў Наваградку (даўжыня 8 см., дыяметр утулкі - 2 см.). Па назіраньню Р.С. Мінасяна, у наканечніках гэтага тыпу, якія з'явіліся ў абласьцях на поўначы ад Прыпяці і Дзясны ў IX-X стст. (пазней чым на Правабярэжжы і Левабярэжжы Дняпра) адбіваецца паэтапнае засяленьне славянамі Ўсходняй Еўропы.[8] Даце раньняга паселішча на Замкавай гары не супярэчыць раньняя знаходка жалезнага стрыжня з кручком, які, як гаварылася ў тэксьце работы, быў распаўсюджаны ў арэале качэўнікаў у пачатку II тысячагоддзя н.э.

Датаваньне раньняга паселішча некалькі парушае знаходка жалезнай спражкі з насечкай. Вядомая ёй аналогія паходзіць з каменнага могільніка Падляшша XII ст.[9] Застаецца мяркаваць, што падобныя вырабы сталі вырабляць у больш раньні час.

Як неаднаразова зазначалася, раньняе паселішча на Замкавай гары было неўмацаваным і магло ў такім выглядзе існаваць некалькі дзесяцігоддзяў, а потым было ўмацавана валам. У засыпу вала раскопа 2 знаходак не было, а ў раскопе 1 пры разборцы астаткаў вала знайдзена кераміка ў выглядзе гаршкоў тых жа тыпаў, якія характэрныя для раньняга паселішча. Там жа знайдзены ўтульчаты наканечнік двушыпнай стралы, нож і іншыя знаходкі, якія таксама адначасовыя археалагічным матэрыялам першапачатковага паселішча. Такім чынам, вал, які ўзведзены над неўмацаваным паселішчам, быў насыпаны не пазней сярэдзіны XI ст.

З пабудовай вала, пляцоўка Замкавай гары інтэнсіўна забудоўваецца. Да комплексаў другой паловы XI ст. можна аднесьці толькі агнішча і вялікую яму ў раскопе 1, дзе сярод керамікі гаршкі V тыпу прадстаўлены паловай глінянага посуду, а сярод знаходак сустракаюцца шыфернае прасліца і срэбны бранзалет. Форма апошняга адпавядае бранзалетам, якія з'явіліся ў Ноўгарадзе ў XI-XII ст.[10]

Наступны этап у забудове Замкавай гары звязаны з сатлеўшымі пабудовамі раскопа 1, пастаўленымі пры вале пабудовамі 18, 19, 24, пабудовай 25, якая ўваходзіла ў другі шэраг гаспадарчых пабудоў, пабудовай 26, якая зроблена трошку пазней і насьцілам V, што ляжаў на мацярыку, на раней незабудаванай частцы пляцоўкі. У раскопе 2 гэта была пабудова з плеценым плотам, пастаўленая на засыпе валу.

Масавая кераміка гэтага часу — гаршкі III-VI тыпаў. Сярод знаходак з'яўляюцца абломкі амфар і шкляных бранзалетаў, а ў пабудове з плеценым плотам быў знайдзены асколак візантыйскай шкляной пасудзіны з залатым роспісам.

Мяркуючы па комплексах Малага Замка амфары ў Навагрудку з'явіліся некалькі раней чым шкляныя бранзалеты і візантыйскі шкляны посуд. Так у багатай пабудове 6 знайдзены фрагменты трох амфар, але не было ніводнага асколку шклянога бранзалета ці імпартнага посуду, у той час як пабудаваныя крыху пазней жылішчы мелі ў сваім інвентары і тыя і другія знаходкі. На гэтай падставе пабудова 6 была аднесена да самага пачатку XII ст., а жыльлё ў гэты ж будаўнічы перыяд, але са знаходкамі шкляных бранзалетаў і візантыйскіх пасудзін, да другой чвэрці гэтага стагоддзя[11]. Пабудовы Замкавай гары, аб якіх ідзе размова, могуць быць таксама датаваны другой чвэрцю XII ст.

Над сатлелымі пабудовамі раскопа 1 захаваліся рэшткі згарэлых пабудоў 20/23, 21, 22, якія былі пастаўлены яшчэ ў межах старажытнага валу. У раскопе 2 над пабудовай з плятнём ставіцца пабудова 4, аддзеленая ад ніжэйляжачай слоем дрэва і шчапы, а ў раскопе 3 пабудова 27, якая стаяла на слоі шчапы, на мацярыку.

Па стратыграфічных умовах пабудовы ўсіх трох раскопаў, нібыта сінхронныя. Верхняя мяжа існаваньня пабудоў раскопа 1 вызначаецца пажарам, які знішчыў драўляныя канструкцыі першапачатковага валу і гаспадарчыя пабудовы, якія стаялі пад яго прыкрыццём. Для раскопа 2, уключыць пабудову 4 у дадзены будаўнічы перыяд дазваляе тая акалічнасьць, што яна замяняе пабудову з плеценым плотам, а пабудова 27 далучана на падставе падабенства яе інвентара са знаходкамі ў пабудове 4.

Знаходак у пабудовах раскопа 1 няшмат і яны не адрозніваюцца ад керамікі і другіх вырабаў ніжэйляжачых пабудоў. Час існаваньня згарэлых пабудоў супадае са спыненьнем функцыянаваньня старажытнага валу, і прыходзіцца, мяркуючы па кераміцы (гаршкі V-VI тыпаў, амфары, частка бронзавага энкалпіёна і іншыя знаходкі) на сярэдзіну XII ст.

Сатлелыя пабудовы раскопаў 2 і 3, што ўзніклі адначасова з вышэйназванымі, маглі фукцыянаваць толькі пазней. Аб гэтым сведчаць знаходкі гаршкоў IX тыпу і фрагменты шкляных пасудзін блізкаўсходняга паходжаньня. Такая кераміка і шкляны посуд на тэрыторыі Малага Замка з'яўляюцца ў жылых дамах другой паловы XII ст.[12]

Такім чынам, разглядаемы будаўнічы перыяд можна датаваць сярэдзінай і першым дзесяцігоддзем другой паловы XII ст.

У той час, калі ў раскопах 2 і 3 працягвалі стаяць пабудовы 4 і 27, у раскопе 1, на тэрыторыі засыпанага вала былі пастаўлены пабудовы 9/14 і 15, якія таксама загінулі ў пажары. Знаходкі, якія абільна былі прадстаўлены ў ніжнім ярусе пабудовы 9/14 даюць падставу лічыць, што абодва будынка належаць да комплексаў не

пазней трэцяй чвэрці XII ст.

Непасрэдна над пабудовай 9/14 у раскопе захаваўся згарэлы насьціл пабудовы 9а, а згарэлая пабудова 10, часткова перакрывала пабудову 15. У раскопе 2 гэтым будынкам адпавядае пабудова 3, якая змяніла пабудову 4, а ў раскопе 3, такой была пабудова 28. Кераміку і іншыя знаходкі гэтых будынкаў цяжка адрозніць ад матэрыялаў папярэдніх пабудоў. Па стратыграфічных дадзеных, комплексы гэтага будаўнічага гарызонту трэба аднесьці да апошняй чвэрці XII і пачатку XIII стст.

Апошні этап забудовы старажытнарускага гораду на Замкавай гары прадстаўлены ў раскопе 1 згарэлымі пабудовамі 6, 7/16, 8, 11, 17 і сатлелым насьцілам IV. У раскопе 2 — гэта былі пабудовы 1 і 2, а ў раскопе 3 — пабудова 29 з вымасткай з гліны.

У кераміцы гэтых будынкаў пераважаюць гаршкі IX тыпу, а сярод знаходак шарападобная пацерка з хвалістым роспісам, фрагмент шкляной пасудзіны з Сірыі (Алеппо) і іншыя вырабы, што з'яўляюцца не раней за XIII-е ст.

Наібольш позднія для старажытнарускага Наваградка будаўнічыя астаткі і характар знаходак дазваляюць, такім чынам, аднесьці дадзены гарызонт да XIII ст.

Сведчаньне летапісца, (якое можна аднесьці да Малога Замка) аб тым, што вакольны горад быў заваяваны князям Львом Данілавічам пад 1272 г., у свой час дало нам падставу датаваць верхнюю граніцу старажытнарускага перыяду гэтай часткі гораду 70-мі гадамі XIII ст.[13] Дзяцінец гораду, які быў на Замкавай гары, выстаяў пад гэтым націскам і таму няма падстаў удакладніць менавіта калі ў XIII ст. там заканчваецца гісторыя старажытнарускага часу.

Культурны слой старажытнарускага Наваградка на Замкавай гары мае пераканаўчыя зыходную і канечную дату з першай паловы XI да канца XIII стст. Больш умоўны ўнутраны падзел гэтага перыяду, які заснаваны на дадзеных стратыграфіі і знаходках. Аднак і ён не грашыць асаблівымі адхіленьнямі. Акрамя комплексаў з прыналежным ім інвентаром, перыядызацыю культурнага слоя можна было кантраляваць масавымі і характэрнымі знаходкамі, што знайдзены па-за пабудовамі. Так, як паказана вышэй, паміж насьцілам V першай паловы XII ст. і насьцілам IV, які адносіцца да XIII ст. ляжаў слой, звязаны з пажарамі, у якім было шмат знаходак, датаваных XII ст. На ўсходняй частцы раскопа, у культурным слоі былі знайдзены матрыцы для цісненьня крына і пацерак (мал.), верагодна, сінхронныя матрыцам, што паходзілі з пабудовы 9/14. Пры расчыстцы рэштак пабудоў раскопа 3 знайдзена няшмат рэчаў,

але ў культурным слое, які прылягае да гэтых пабудоў, іх было нашмат больш. Так на ўзроўні пабудовы 27 у слоі знайдзены цыліндрычны Замак (мал.), абломак паліванай пасудзіны з гранёным вушкам. За межамі пабудовы 29 знайдзена сякера з шырокім лязом (мал.), а ў паўночнай сьцяне раскопа на ўзроўні пабудовы — наканечнік стралы ў форме лапатачкі, тыповы для XIII ст.

У выніку ўсё прадстаўляецца наступным чынам:

Табліца. Культурны слой Замкавай гары ў старажытнарускі час.

Табліцы толькі ў PDF файле

У святле гэтых дадзеных больш інтэнсіўна чым іншыя, была заселена паўночная частка пляцоўкі, якая з XII ст. была гаспадарчай зонай дзяцінца. Меньшая забудова ў яе паўднёвай частцы, магчыма, тлумачыцца невялікім раскопам. Што датычыць паўднёва-усходняй часткі (раскоп 3), то як сказана вышэй, познесярэдневяковай забудовай былі знішчаны будынкі старажытнарускага часу. Там, дзе рэшткі будаўніцтва захаваліся in situ, відавочна, што забудова яе пачалася на стагоддзе пазней, чым у паўночнай і паўднёвай частцы пляцоўкі.

Шматлікія ямы раскопа 1, за выключэньнем вялікай ямы, можна датаваць шырока. Тыя з іх, якія былі ў мацярыку паселішча, што існавала да канца XI ст., датуюцца гэтым часам. Вялікая частка ямаў выкарыстоўвалася ў XII і XIII стст.

На Замкавай гары як і на Малым Замку ў старажытнарускім культурным слоі вылучаецца шэсьць будаўнічых перыядаў. Разам з тым у абедзьвух частках гораду яны храналагічна некалькі адрозніваюцца адзін ад другога.

Заканчэньне старажытнарускага перыяду ў гісторыі Замкавай гары праяўляецца, у першую чаргу, у тым, што знікаюць тыповыя рэчы, якія прывезены з Кіева альбо праз яго пасрэдніцтва (шыферныя прасліцы, амфары, шкляныя бранзалеты і інш.). Гэтыя імпартныя вырабы, якія трапілі ў Наваградак яшчэ да разгрому паўднёварускіх зямляў у 40-я гады XIII ст., служылі гарожанам аж да канца гэтага стагоддзя.

У забудове паўночнай часткі пляцоўкі Замкавай гары на мяжы XIII і XIV стст. і ў XIV стагоддзі адзначаецца пэўная пераемнасьць з забудовай гораду старажытнарускага часу. У пабудовах захоўваецца ранейшая арыентацыя. Упрытык да новага вала на краю пляцоўкі, які зрабілі пасля таго, як быў засыпаны стары вал, стаяць гаспадарчыя пабудовы зрубнай канструкцыі.

Насьцілы гораду XIV ст. немагчыма адрозніць ад насьцілаў старажытнарускага гораду. Насьціл III, аддзелены ад насьціла IV вугальным слоем, шчапой і выкінутымі драўлянымі рэчамі, па

ўсім нагадвае гэты апошні. Аднак, знайдзеная на ім цэгла таўшчынёй 9,5 см., паказвае на яго больш познюю прыналежнасць. Гэта ж можна сказать і аб іншых насьцілах, паложаных адзн на другі. Тут трэба вылучыць самы верхні насьціл 1, які прылягаў да каменнага бруку пры царкве XIV ст., на якім ляжала цэгла, вапнавы раствор і абломкі дахоўкі.

У раскопе 3, храналагічна блізкай старажытнарускаму культурнаму слою была вымастка з камянёў, якая часткова перакрывала пабудову 29. Сярод керамікі, знайдзенай пры разборцы вымасткі, побач з новымі формамі посуду, сустракаюцца абломкі гаршкоў IX тыпу. Знайдзеныя там крыцы паказываюць, што ў той час недалёка была кузня.

Такім чынам пабудовы і насьціл III раскопа 1 і каменную вымастку (забрукоўку) раскопа 3 трэба лічыць комплексамі, якія непасрэдна замянілі пабудовы старажытнарускага гораду. Да іх трэба далучыць насьцілы 1 і II блізкя па часу да насьціла III і прыналежныя да храма XIV ст.

Наступны этап забудовы прадстаўлены печкамі, адкрытымі ў раскопе 3. Л.Г. Панічава, характэрызуючы печку, адкрытыую ў 1983 г., вызначыла яе як горн XVI-XVII стст. на той пастаце, што ў культурным слоі знайдзены сплаўленая бронза, жалезны малаток, чорналашчоная і паліваная кераміка[14]. Аднак, гэтыя знаходкі належаць да таго часу, калі печка ўжо перастала існаваць. Стратыграфічнае яе становішча, (пабудавана над каменнай вымасткай і ідэнтычнасьць з другой печкай, а таксама прыналежныя да абодвух печаў знаходкі, дазваляюць мяркаваць, што яны не выходзяць за межы XIV ст., маючы, па ўсёй верагоднасьці, гаспадарчае прызначэньне. Памер цэглы печаў і іх вапна-пясчаны раствор, магчыма, паказвае на іх адначасовае існаваньне з “палатамі феадала”, што адкрыла М.У. Малеўскай в паўночнай частцы пляцоўкі Замкавай гары, якія датуюцца сярэдзінай альбо другой паловай XIV ст.[15]

Да наібольш позніх будаўнічых астаткаў належаць адкрытыя ў раскопе 3 драўляныя насьцілы, пабудова з бітай цэглы і яма, запоўненая познесярэдневечнай керамікай. У астатніх раскопах сінхронныя ім комплексы не захаваліся.

У культурным слоі Замкавай гары XIV ст. і больш позняга часу шмат знаходак. Гэта чорная і паліваная кераміка, кафля, дахоўка, каменныя ядры, рэчы з жалеза, бронзы і шкла. Сабраная калекція рэчаў чакае свайго даследчыка. Знаходкі манет XIV-XVIII стст. сведчаць аб тым, што яны былі ва ўжытку на працягу многіх стагоддзяў.

Спасылкі:

[1] Мы выкарыстоўваем тыпалогію наваградскай керамікі, якую выпрацавала М.У. Малеўская для масавага посуда Малога Замка // ДН. С. 14-15.

[2] ДН. С. 26; Павлова К.В. 1) Раскопки могильника близ Новогрудка // КСИА. 19???. Вып. 104. Мал. 37; 2) Раскопки курганов у д. Городиловки // КСИА. 1973. Вып. 135. мал. 10.11.

[3] Павлова К.В. Хозяйственные постройки XII-XIII вв. на детинце древненого Новогрудка // КСИА. 1972. Вып. 129. С. 79-80.

[4] Павлова К.В. Op. cit. С. 81, 83.

[5] Зильманович И.Д. Раскопки в детинце Новогрудка в 1962 г. // КСИА. 1965. Вып. 104. С. 93-98.

[6] ДН. С. 26.

[7] ДН. С. 117.

[8] Минасян Р.С. Втульчатые двушипные наконечники стрел // СГЭ. 1978. Вып. 43. С.37.

[9] Зильманович И.Д. Op. cit. С. 97.

[10] Седова М.В. Ювелирные изделия древнего Новгорода (X-XV вв.). М., С.96.

[11] ДН. С. 117.

[12] ДН. С. 57, 71, 78.

[13] ДН. С. 117.

[14] Паничева Л.Г. Раскопки Новогрудка // АО 1983 г. М., 1985. С. 402.

[15] Малевская М.В. Архитектурный комплекс новогрудского детинца XIII-XIV вв. // ДГС. С. 124.